Уладзімір Караткевіч

Блакіт
і золата дня

Мінск
Дзяржаўнае выдавецтва БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
1961

У ШАЛАШЫ

Міхал ледзь паспеў дабегчы да шалаша, калі неба раскалолася папалам і ў ірваную расколіну лінула такое сляпучае святло, што захацелася сесці на зямлю.Разам са святлом з расколіны вырваўся сухі кароткі трэск, быццам нехта зламаў над галавою дрэва.

Хлопец кінуўся ў чорны створ шалаша, зачапіўся аб нешта і сеў на салому.

– А каб цябе, каб, – плюнуў ён.

Бліскавіцы секлі неба так часта, што можна было разгледзець усё ў шалашы: саламяны ложак, зэдлік, кошык з бульбаю, кацялок на падлодзе, вязку цыбулі і старую ватоўку, што вісела каля ўваходу.

Вартаўніка не было: можа, абходзіў сад, а мо сядзеў у другім месцы.

Міхал высунуў галаву і, калі чарнільны змрок зноў успыхнуў святлом, пабачыў злева нешта падобнае на невялічкую пуньку: сцены з жэрдзя, саламяная, грыбам, страха.

“Яблыкі восенню насыпаць, ці што?” – падумаў ён.

І адразу адчуў далёкі, упэўнены, усё нарастаючы шолах дажджу. Пры святле кароткай маланкі вырасла на фоне недалёкага лесу серабыстая сцяна, насунулася, наляцела, прыціснула ўсё вакол.

Міхал раззлаваўся на самога сябе.

“Вось і трапіў на станцыю. А казалі ж, каб заначаваў. Яно і праўда – пасля дваццаці вёрст трэба было. Але ж да станцыі заставалася толькі пяць кіламетраў. Ну вось і начуй – не ў сваякоў, а ў невядомым шалашы”.

Дождж, відаць, распачаўся на ўсю ноч.

А салома між тым размаўляла з дажджом. Над самай галавою чулася лёгкае булькаценне і сухое патрэскванне звяшкі – мышынага гарошку.

Свежы вільготны вецер уварваўся ў шалаш, і дыхаць стала так лёгка, быццам ты толькі што нарадзіўся на свет.

Салома размаўляла з дажджом.

Не, гэта ўжо не салома, гэта сапраўдная ціхая размова далятала аднекуль: відаць, з суседняй пунькі. Мяркуючы па галасах, размаўлялі дзве жанчыны: адна ў гадах, другая мо маладзейшая.

Міхал не зварухнуўся. Хай балбочуць пра свае сакрэты. Ён усё адно не пабачыць іх, і яны назаўсёды застануцца для яго незнаёмкамі, ціхімі галасамі, якія прыйшлі з цемры і ў цемры знікнуць.

– Што ж мне рабіць, цётачка? Я ж так кахаю яго...

– А ён і глядзець на цябе не хоча. Учора зноў біўся. Адзін трох хлопцаў пабіў.

– Самі вінаваты. Прыставалі да яго сябра, а той слабы хлопец.

– Што казаць, – голас пажылой раптам памякчэў, – удалы юнак, бацькавіч, але...

– Але, ваша праўда, не хоча ён на мяне глядзець. Як мне цяжка! Гляджу на яго вочы, нахабныя, сінія, дзёрзкія. Чуб – салома такая бывае, трошкі ржавая. І рот вечна смяецца. Такі ён мне прыемны.

Міхал скінуў пінжак, лёг на спіну і закурыў. А маладая вяла далей.

– Ніколі я не думала пра гэта. Але не хачу саступаць. Хачу для яго быць... Абняў ён мяне аднойчы, выпадкова, проста так...

– Глядзі, дзеўка, – сказала пажылая, – так вось наша сястра і гіне.

– А я і рада б загінуць, ды ён, як вецер...

Міхал ціха паўтарыў яе апошнія словы... І тут было няладнае каханне. Ды што да гэтага яму?

“Вось цякуць кроплі, – думаў ён. – І я такая самая кропля. Яны, зліваючыся, утвараюць крыніцу, раку, мора. Ім усё адно, з кім зліцца. Але мне патрэбна толькі тая кропля, адзіная, з якой мы разам нарадзіліся ў зямной глыбіні.

Галасы сціхлі – можа, таму, што вецер налятаў парывамі, хапаў, нёс, кідаў у розныя бакі завесы дажджу. Рабілася халаднавата.

А тады, паўтара месяца назад, быў такі цёплы летні дзень! І Кіеў са сваімі будынкамі, каланадамі, залатымі купаламі, здавалася, плыў кудысьці насустрач поўным, як вымя, аблокам, насустрач сонцу і цеплыні.

Каштаны разгарнулі зялёныя ветразі. На ўскраінах горада сходкі вялі ад хаты да хаты, варыўся на цаглінах абед, надуваліся ветрам, як рыбацкі сак, кашулі на вяроўках, чулася паўдзённая бойкая гаворка.

І вецер гнаў і гнаў вулкамі таполевы пух, высцілаў ім, як сівай коўдраю, зямлю. Хлапчукі кідалі ў пух запалку, і ён выбухаў, як порах, на метр у кожны бок. І адразу, за хвіліну, гэта месца зацягвалася зноў сівой покрыўкай.

Ён быў у Кіеве на экскурсіі і выпадкова забрыў у лаўру, дзе грэцкі арэшнік гладзіў твары прахожых лапчастым лісцем. У зеляніне стаяў старажытны, маленькі, як лялька, храм Спаса на Берастове. Міхал паглядзеў на яго паласатыя сцены (вузенькія, на два пальцы цагліны і слой цамянкі шырынёю ў далонь) і зайшоў у сярэдзіну,

спусціўся ўніз па прыступках. Храм не вытрымаў цяжару год і, як Святагор, улез па калені ў зямлю.

У сярэдзіне храма было пуста і халаднавата, бы ў склепе. А праз акенцы віднелася гарачая, напоеная сонцам лістота. Там быў поўдзень, спякота, лянівыя крыкі пеўняў...

Было так ціха, што не хацелася ісці, і Міхал стаяў каля вельмі непрыгожага надмагільніка Юрыя Даўгарукага і думаў, што князю не пашанцавала. І помнік няважны, а тут яшчэ і саркафаг зрабілі такі, што толькі пужаць дзяцей.

– Вось дзядзька са скрынкі ўстане – ён табе!..

Ох, лепей бы не Юрый заснаваў Маскву, а хто-небудзь іншы! Тады не ставілі б гэтага надмагільнага саркафага.

Усе няшчасці для Міхала пачаліся з яго.

Таму што непадалёк стаялі тры хлопцы і дзяўчына. У дзяўчыны былі моцныя, як у хлопца, ногі, а рухі такія, быццам яна гуляла ў лапту: рэзкія, спрытныя, гожыя. І галава пасаджана на шыі так, што валасы заўсёды адкінуты назад. Тварык шчыры, жвавы, як у дзіцяці, і вельмі разумны. А вочы, ох, якія вочы!

Міхала толькі здзівіла, што хлопцы яе нейкія цельпукаватыя, з чорнымі, нячышчанымі пазногцямі. І глядзяць яны на яе без усялякай пачцівасці і папросту клічуць Мар’яшай.

А сам ён толькі зірнуў і адчуў, што прапаў.

Мар’яна між тым злёгку штурхнула аднаго з хлапцоў далонню ў лоб.

– Лёвачка, Лёвачка, гэта ж трэба такі кабак на плячах мець? Шукаць трэба было.

– Ну а каб нават і адшукалі касцяк, што тады? – апраўдваўся ён. – Як даведаліся б?

– А як Яраслава пазналі? – спытала замест адказу яна.

– “Яраслаў бысць хром”, – прабасіў другі юнак, у акулярах.

– Ды яшчэ па белай пляме на чэрапе, – жвава падхапіла яна. – След мяча. Неяк і гэтага пазналі б.

І тут Міхал не вытрымаў. Страшна было нават падумаць, што дзяўчына знікне некуды – і канец. Таму ён падышоў і глухім, бы ў бочку, ненатуральным голасам спытаў:

– Прабачце, хіба дакладна невядома, дзе пахаваны князь?

– Ну так, так, – загарэлася яна. – А хіба вы не ведаеце?

У Міхала быў выгляд чалавека, які праглынуў лом.

– Не ведаю, – сказаў ён, – я толькі паляўніцтвазнавец.

– А мы археолагі, – усміхнулася яна, – зараз тут, з украінцамі разам, працуем.

– Цікавая ў вас праца, – шчыра сказаў Міхал.

– А ў вас?

– Таксама. Але ў вас яна асаблівая: скарбы шукаць, закінутыя гарады.

Усе пырснулі. Толькі яна надзвычай уважліва глядзела на яго:

– Гэта не так прыгожа. Вы што, ніколі не бачылі раскопак?

– Не. Але вельмі хацеў бы.

– Хлопцы, – рашуча сказала яна, – бяром яго з сабой. Хочаце з намі?

– Вельмі, – загарэўся ён.

– Тады едзем. На Борычавым Узвозе пракладалі траншэю і натрапілі на цікавыя рэчы. Нас там чакаюць.

– Горача, – заныў Лёвачка, – піва хачу. Паспеем.

– Леў Пятровіч, – яна заклала рукі за спіну, тонкія рукі з залацістым пушком каля локцяў, – я думаю, з вас ніколі не выйдзе акадэмік. І не толькі акадэмік, а нават чалавек. Наш знаёмы імкнецца павысіць свой узровень, а вы... Фу, якая негасціннасць!

І ўсе паехалі. Відаць, Мар’яна была добрым завадатарам.

У трамваі Міхал сядзеў поруч з ёю і расказаў, па яе патрабаванню, аб тым, хто ён такі, ці надоўга тут (на два дні) і як палююць на лісіцу ў нары (з факстэр’ерам).

А ветрык гуляў яе валасамі, лашчыў твары ўсіх, сваволіў у лістоце каштанаў, прыгаршчамі кідаў на рукі дзяўчыны залатыя плямы.

Так Міхал, нечакана для самога сябе, папаў ад саркафага на раскопкі.

Э-ех, князь, князь, што ты са мною зрабіў!

На раскопцы было вельмі пыльна і горача. Усе хлопцы працавалі ў адных трусах, і Міхала таксама прымусілі распрануцца.

Булыжнік на ўзроўні вачэй блішчаў так, што вачам было балюча. І дзівосным караблём плыў над галавою блакітны, белы і залаты Андрэеўскі сабор.

Але Міхал больш глядзеў на дзяўчыну, якая пэндзлем і гнутаю голкай вельмі старанна ачышчала ад глеістай зямлі нейкую рэч.

Усе людзі падабаліся Міхалу. І адзін тоўсты чалавек, відаць, вялікая шышка, але таксама ў трусіках, ляпаў Міхала па плячы.

Такія слаўныя хлопцы былі гэтыя археолагі!

І раптам Міхал заўважыў, яе сінія халаднаватыя вочы, узнятыя на яго.

– Бачыце, Міхал, ёсць такія знаходкі, пра якія ніхто і дагэтуль не ведае, што гэта. Дорага дала б я, напрыклад, каб даведацца, што гэта такое. Але мне ніхто не скажа.

Лёвачка ў папяровай касцы (ён стаяў над траншэяй, як Банапарт) з'едліва сказаў:

– Мар'яша, абяцанне помніш?

І ўсе загулі:

– Абяцанне... Абяцанне...

– А што, – сур'ёзна сказала яна, – і сапраўды пацалавала б таго, хто б растлумачыў.

– Не спадзявайся, родненькая, – прытворна ўздыхнуў Лёвачка, – калі будзеш чакаць тлумачэння, так і памерці табе нецалаванай.

– Пакажыце мне, – сказаў міхал і працягнуў руку.

Пальцы яго, калі ён браў рэч, сутыкнуліся з пальцамі Мар'яны, і ён адчуў сябе так, быццам нейкая стрэмка мякка ўвайшла ў яго сэрца, напоўніўшы хваляваннем.

У Міхала ў руках была невялічкая штучка з рога: круг, перасечаны, перпендыкулярна па плоскасці, квадратам. І ў тым і ў другім былі прабітыя невялічкія дзірачкі. Мала таго, было прасвідравана нават месца перасячэння плоскасцяў, на ўсю даўжыню.

Міхал сядзеў на кукішках і моршчыў лоб. Усе глядзелі на яго, большасць з усмешкаю.

– Кінь, Міша, – сказаў Лёвачка, – гэта галава яшчэ спатрэбіцца для вырашэння праблема аб месцы, дзе паміраюць сланы.

Кругом відны былі ўсмешкі. Белазубыя, шырокія. І яшчэ панавала цішыня.

– Ведаю, – вельмі проста адказаў Міхал.

Нехта войкнуў.

– Што? – уся падаўшыся ўперад, спытала Мар'яна.

– Жыццё дрэнна ведаеце, археолагі, – зларадна сказаў Міхал, – каб ведалі добра, дык не давялося б вам думаць, ад якой бочкі гэты шпунт.

– Не здзекуйцеся, – сказала яна. – Для нас вельмі важна. Што гэта?

– Я ж і кажу: “шпунт”. Праўдзівей, дзіцячая цацка. Дзеці і цяпер ёю гуляюць. У некаторых вельмі глухіх вёсках Палесся. Бяруцца тры бутэлькі з гарбуза. У адной дзірка круглая, у другой – квадратная, у трэцяй – крыжападобная. І трэба зрабіць для ўсіх адзін шпунт, каб праз яго можна было напіцца з бутэлькі. І тады робіцца такая вось фігура.

– Ну добра, – сказаў Лёвачка, – ну квадрат, ну круг. Але дзе ж тут крыж? Нешта я не разумею.

– Галава яшчэ спатрэбіцца, калі акадэмікам будзеш. Кінь, Лёва, – сказаў Міхал.

І павярнуў прадмет так, што відны былі толькі бакі плоскасцяў.

– Вось табе і крыж. І дзірка, праз якую напіцца можна.

– Ч-чорт, як гэта я не здагадаўся, – пачухаў патыліцу Лёва.

– А дзеці палескія здагадаюцца. Ды і ў старажытным Кіеве, відаць, здагадваліся. Прагрэс.

– Апошні ўдар, – адмеціў нехта і задаволена зарагатаў.

Лёвачка схіліў галаву да пляча.

– Ну хлопцы, ну хлопцы, ну Міхал! Гэта ўжо забаронена: ляжачага не б'юць.

Агульны рогат заглушыў яго словы.

А яна глядзела на Міхала здзіўленымі і сур'ёзнымі вачыма.

– Каб вы толькі ведалі, Міхал, якую вы важную справу зрабілі.

– Глупства, – сказаў ён, – проста гэтыя палескія дагэтуль не далі ніводнага археолага.

– Як ваша прозвішча?

– Дарскі.

– А што, – ціха сказала яна, – "цацка Дарскага". Нядрэнна гучыць. І дадала: – Знойдзены дзве шыферныя прасніцы, каралі-"лімонкі" і адна "цацка Дарскага". Не, Міхал, вы ўсё ж малайчына. Гэта нас бог звёў.

Лёвачка зухавата стаяў на краі траншэі, абапіраючыся на рыдлёўку. Рот да вушэй, вочы хітрыя.

– Ты зубы не загаворвай, – прыжмурыў ён адно вока, – ты абяцанне выконвай.

– І сапраўды, – сказаў хлопец у акулярах.

– Абяцанне! Абяцанне! – загулі ўсе.

Зноў вакол блішчалі зубы, асабліва белыя на запыленых сонцам абліччах.

Потым ён перавёў вочы на дзяўчыну. Яна трохі зніякавела. Абое глядзелі адно на аднаго.

– Я думаю, сказаў Міхал, – Мар'яну Юр'еўну не трэба прымушаць. І лавіць яе на слове не варта. Яна пацалуе сама – каго захоча і калі захоча. І гэта будзе цудоўны чалавек, лепшы на зямлі. Яна кепскага не абярэ.

– Брава! – сказаў таўстун.

У трусіках і чырвонай з чорным каўбойцы, ушчэнт спалены сонцам, ён нагадваў афрыканца.

– Брава! – паўтарыў ён. – У наш век заняпаду рыцарскіх адносін вельмі прыемна чуць такое. Хвалю, малады чалавек!

Урэшце, нікуды Міхал не паехаў. Ні праз два дні, ні праз тыдзень. Ён адстаў ад групы і ўвесь водпуск правёў з гэтымі людзьмі. Яны вельмі спадабаліся яму, а ён – ім. Таму што ён быў вельмі кампанейскі і просты хлопец...

Міхал павярнуўся на бок і сціснуў далонямі скроні.

“Ах, божа мой, божа мой”, – застагнаў ён.

Дождж усё шумеў і шумеў за саламянай страхою. Лёгкія подыхі ветру даносілі водар абмытай лістоты, горкі павёў палыну, востры пах мяты.

Дождж... Менавіта так дождж шумеў тады, калі яны ўдваіх хадзілі паркамі па беразе Дняпра.

Шырокія сходы царскага палаца, бела-блакітныя муры, мокрыя дрэвы, кручаны струмень фантана, агні ліхтароў у начных шатах.

Дождж мацнеў і мацнеў. Яны ледзь паспелі дабегчы да пустой ракавіны для сімфанічнага аркестра і схавацца туды.

Слабае святло падала на падлогу, блішчалі мокрыя рады пустых лавак. І ветрык, такі, як цяпер, патыхаў з мокрых клёнаў.

– Холадна... – здрыганулася яна.

Ён накінуў ёй на плечы свой пінжак. Пінжак спаўзаў, і яму давялося прытрымаць яго рукою. Адчуваў пад далонню яе худыя моцныя плечы. І, неспадзявана для сябе, прыгарнуў яе да грудзей.

Аднойчы Міхал бачыў дзікую казу, якая папалася ў пастку. І вочы ў той казулі былі такія, як цяпер у гэтай дзяўчыны.

Яны прасілі яго, малілі – не чапаць, пусціць яе. І ён не вытрымаў, пусціў...

Пасля яны пачалі дурэць, разыгрываць перад пустымі лаўкамі, перад мокрым паркам, у якім не было ніводнага чалавека, сцэну з нейкай пышнай трагедыі.

– Вазьміце меч, – замагільным голасам стагнаў Міхал, – і мне прабіце грудзі. Клянуся пасівелай барадой і ўсёй гарэлкай у скляпах – вы любая і ясная...

– Прытым, – смеючыся падказвала яна, я вам не веру. У рыцараў палескіх ёсць у вачах жахлівая спакуса, каварства нізкае, падступнасць слоў. Яны хітруюць, і яны чаруюць. Яны даверлівых дзяўчатак крадуць і ў Турцыю султанам прадаюць.

– Ну, гэта паклёп, – не вытрымаў Міхал. – Мы такія людзі, што ў нас сабакі з-пад носа хлеб крадуць. Нас саміх у Турцыю прадаць можна.

І яны зарагаталі. Дождж перастаў. Толькі дрэвы ўсё яшчэ скідалі на жвір буйныя кроплі.

Яны выйшлі ў парк. І тут, ля агароджы стадыёна, яна выпадкова дакранулася плячом да яго пляча.

Пастка замкнулася зноў. Ён абняў яе і пацалаваў у дзіцячыя прыпухлыя вусны.

– Успомніў усё ж пра маё абяцанне, – прашаптала яна. – Злапамятны ты.

Пацяклі дні. Праца, дзе яго ўжо лічылі сваім, кпіны Лёвачкі, добры і трошкі зайздросны позірк таўстуна, дняпроўскі пляж, звон тугога мяча ў паветры. І яна, то задыханая і ружовая, з занесенай для ўдару па мячы рукой, то ціхая і пяшчотная, з адбіткам начных ліхтароў у вачах...

Аднойчы яны правялі ноч на вадзе. Проста так, селі і паехалі начным параходам.

З берагоў далятаў рэзкі голас драча, які недарэчна пераймаў цвыркуна, даносіла пахі водарасцяў і нагрэтых за дзень кіёўнікаў. Калі параход набліжаўся да берага, ясна чуліся ўсплёскі хваль аб бераг, журботныя і сонныя галасы начных птушак. Недзе далёка, па курсу парахода, гарэла нізкая сіняя зорка. Стоячы на носе парахода, яны плылі проста на яе.

– Не ведаю, сказаў Міхал,– што ў тваім сэрцы. Але маё поўнае. Мне больш нічога не трэба. Ёсць зямля, спрацаваныя мускулы, зорка і ты.

Яны ўжо ведалі, што былі першыя адно ў аднаго.

– Ты доўга будзеш кахаць мяне? – яна прынікла да яго плячом.

– Не ведаю, – проста адказаў ён.

– Чаму?

Ён маўчаў, потым сказаў не то жартам, не то сур'ёзна:

– Час смерці невядомы кожнаму з нас. Таму я і не ведаю, колькі год кахання дадзена мне...

Яны плылі і плылі... І бясконцы быў шлях да сіняй зоркі.

А потым быў світанак. Сонца выплывала з-за пяскоў і лазы левабярэжжа. І хвалі былі зеленавата-блакітныя. І на адзін кароткі момант самыя грабянцы іх успыхнулі крывавым, трывожным, а потым апельсінавым агнём, быццам там вось-вось павінен быў вынырнуць нехта прыгожы, пранікліва-пяшчотны, той, што прыносіць на зямлю вечную цеплыню і радасць...

– З пены народжаная, – ціха шапнуў Міхал, і яна зразумела.

Ах, дождж, дождж!.. Як магло здарыцца, што Міхал адзін тут, у шалашы? Як забыць тую размову ў начным скверыку каля Залатой Брамы?

– Ты сам разумееш, Міхал, я не магу з табою ехаць.

Яна сказала гэта жаласна і ціха, і плечы яе задрыжалі.

– Я ж кахаю цябе.

– Я кахаю больш. І я не еду не таму, што тваю месца заўсёды ў глушы. Я з табою і ў пустыню паехала б. Але ў меня таксама праца. А ў пушчах раскопак не вядуць, хіба што выпадкова. Абое мы з табою цыганы, але вандруем рознымі дарогамі. І бадай што нам цяжка сысціся. Я гнала ад сябе гэтыя думкі, я суцяшала сябе тым, што вось яшчэ застаецца ўвесь твой водпуск за два гады. Вось сорак дзён... Трыццаць... Сем... Цяпер хлусіць больш нельга, засталіся тры дні.

Вялізны рыжы кот пераходзіў непадалёк алею, замачыў лапы і грэбліва атрапаў ваду з лайкавых пятак. Гледзячы на ката, Міхал ціха сказаў:

– Як жа нам звесці дарогі?

– Пераходзь да нас. Ты ж так зацікаваўся працай. Будзеш пакуль што рабочым, брыгадзірам... Потым скончыш завочна інстытут. Табе ж толькі дваццаць тры гады.

– А ты ўжо скончыла. Практыкуеш. Быць мне вечна тваім падначаленым.

Ён падумаў, што яна і зарабляць будзе больш, але ўголас сказаў:

– Мне будзе нязручна...

– Фу, дамастрой які! – сказала яна. – Пакінь, мы ж сучасныя людзі.

– Не кахаеш ты мяне...

– Міхалка, дарагі. Я вельмі люблю свой шлях, мне нельга без яго, я без яго памру. Водар зямлі... Сонца... Аліўкавыя старыя камяні. Знаходкі. Боль у плячах. І вечная думка, што вось адкапаеш, ускрыеш нейкі склеп, а адтуль выпырхне песня, старая, забытая на зямлі...

Яна глядзела на пабітыя вякамі камяні Залатой Брамы, на шыльды “Гастранома” і “Марожанага” за імі, але Міхалу здавалася, што яе вочы бачаць далёкі, неабсяжны стэп, стэп і імклівыя цені палавецкіх коннікаў.

– Я таксама люблю сваю працу. Мяне таксама вучылі, трацілі грошы.

– Ты не вельмі любіш яе, калі ўспомніў пра грошы. Тут жа ты не будзеш гуляць. Усё адробіш...

– Я не магу. Я таксама прырос сэрцам...

– Ну, будзеш займацца як аматар, кнігі пісаць. Натураліст паўсюль на месцы. Пабачыш фауну Азіі, Крыма, пустынь, гор, а не толькі Беларусі. А жыццё дажываць будзем там, дзе ты хочаш, дзе-небудзь на Бярэзіне. Ты напішаш вялікую кнігу пра свае вандраванні. Ну, пашкадуй ты мяне. Не магу я іначай.

Дождж. Кроплі навесілі на дзверы шалаша бісерную фіранку.

Чаму ён не згадзіўся? Правільна не згадзіўся. Ён мужчына. А яна, відаць, мала кахала яго, калі не захацела ехаць з ім разам.

І помняцца толькі заламаныя рукі, трывожныя вочы ў змроку і голас:

– Міхал, любы мой. Аднаго толькі хачу: каб ты хоць у дзіцёнку, у сыне, быў поруч са мной. Каб падобны... Каб заўсёды... Што ж мне рабіць, калі я кахаю цябе?

Яны вырашылі расстацца. Якія цяжкія былі апошнія дні! Утрапёная пяшчота, рукі, якія абдымаюць так, што, здаецца, можна вырваць з іх чалавека толькі з жыццём...

Яны яшчэ казалі, што ўсё не скончана, што яны ў кожную вольную хвіліну будуць ляцець адно да аднаго, што будуць пісаць, але кожны ў глыбіні душы ведаў – гэта канец. Таму што яны не даруюць адзін аднаму гэтага нежадання ахвяраваць у імя друга сваёю дарогай.

Горкія дзіцячыя вусны, пасмачка валасоў, рух цела, як быццам дзяўчына гуляе ў лапту.

Што вам трэба? Чаго вы кожную ноч плывяце з цемры?

Міхал не змог вярнуцца на старое месца працы, адкуль ён ехаў насустрач шчасцю толькі два месяцы назад, а узяў разлік і раздаў рэчы, вырашыўшы перабрацца ў другі запаведнік.

І вось у дарозе дождж. Да станцыі пяць кіламетраў. І дзве дарогі. Адна з іх на ўсход: там Мар'яна раскопвае гарадзішча...

Але ён на паедзе на захад. У пушчу.

Дождж шалеў. Ён паласаваў зямлю, як градам, біў па лісцях, бушаваў у лужынах. І з гэтых лужын, з паветра, з лісцяў – адусюль даносіўся нізкі, нібы ўсхліпы, несамавіты гук. Бледныя далёкія маланкі распаўзаліся па дрэвах чырвоным агнём.

І зноў стаў чуваць голас з пунькі. Міхал лёг на жывот, нацягнуў пінжак на галаву. Яму не хацелася слухаць. Усё адно канец, усё адно нічога не патрэбна, усё адно не будзе шчасця ні заўтра, ні паслязаўтра.

Ніколі! Дарогі ляжаць у розныя бакі. Яна не кахае...

Але недалёкі голас пажылой не так лёгка было заглушыць:

– Кажаш, не кахае. А ты чакай. Глупства... Ты вось паслухай, што ў мяне было з маім Алесем. У Паволжы голад быў – елі траву. А нам, бежанцам, і таго горш. І тады Алесевы бацькі і мае паехалі на радзіму. А тут такая завіруха пайшла, ніхто нічога не разумее. Апынілася я ў сваёй вёсцы, у Літве, а ён у сваёй, у Польшчы. Паміж намі – мяжа. Толькі і можна глядзець, як ён каровы ганяе па ржэўніку. Зусім блізка.

Ён мне не падабаўся з дзяцінства. Вечна такі, быццам яго сабакі шкамуталі, вечна зубы выскаляе. Яршысты нейкі, злы. Аднойчы, ну зусім так, як твой, біўся адзін з чатырма... Гады праходзілі. І часта бывала: ён на адным баку рачулкі пасе, а я на другім. Прабіла аднойчы нагу на ржэўніку, сяджу, плачу. Чую, гукае ён:”Гэй, трыпутніку прыкладзі”. Праз некалькі дзён прыйшла на пашу – матляецца на лазовай галіне белая анучка. Я падышла – пад кустом лапцікі ляжаць, акуратненькія такія. А ён з таго боку зубы выскаляе. Пераплываў, чортаў сын. А маглі ж падстрэліць... І так добра сплёў, хоць ты квас імі пі.

Я тым часам добрая дзеўка выгадавалася, хоць снапы вазі. І ўвесь час заўважаю: вылуплівае ён на мяне вочы. Так і пайшло.

Калі ведаем, што нікога няма блізка – часам словам перакінемся.

Потым ён стаў гаварыць, што я вельмі яму падабаюся. А я ў адказ толькі пасмейваюся:

– Што ж з таго? Хіба з табою на гулянку пойдзеш?

У вас паны, у нас “попасы”. І вось яна – мяжа.

Узімку адночы сабраліся на папрадухі, спяваем. І раптам ён – шусь у хату.

Хлопцы хацелі былі яго набіць. Няма чаго нам, маўляў, “палякаў” гэтых літаваць. Ды я ім так сказала, што яны адразу змоўклі.

– Дурань, – кажу Алесю, – цябе ж заб’юць.

– А я назнарок такую ноч выбраў, – і смяецца. Зубы прадае. – Дуйка мяце. Дулю яны сляды заўважаць.

Танцавалі. Я яму шчыра сказала, што ён мне не патрэбен, што мне такімі хоць платы падпірай. Не верыць.

– Ты, – кажа, – усё маніш. Не можа гэтага быць, каб я не падабаўся.

І сказаў, што прыйдзе за мною, што няма яму ад мяне дарогі. Прызначыў ноч.

І толькі пайшоў, узнялася страляніна.

Так мы і згубілі адно аднаго. Потым – вайна. Я сувязной была.

Ну і закруцілася карусель. Немцы ганяюцца за партызанамі, партызаны за немцамі. І вось аднойчы прыходзіць перад світаннем чалавек. Глядзіць, усміхаецца.

– Не пазнаеш? – кажа.

Я глянула – божа мой, Алесь. Зарослы, жорсткі ўвесь нейкі. Але глядзіць з-пад калматых броваў весела. Выявілася, што ён таксама сувязны. І даведалася я, што нічога ён не забыў, што па-ранейшаму ажаніўся б, калі я не супроць.

А мяне як чорт які за язык торгае. Не хачу, і ўсё. І так цягнулася ўсё з год. Як ён ні прасіў мяне, якіх слоў ні казаў – не хачу. Кошчыны гульні – мышчыны слёзкі.

І вось аднойчы з’явіўся ён да мяне позна і не паспеў да раніцы пайсці. Вырашыла я схаваць яго ў старой бульбяной яме на гародзе. Там не знойдуць.

Я пажартавала яшчэ:

– Не крыўдна табе будзе цэлы дзень хату і мяне бачыць?

– Самы смак, – кажа.

І нанёс чорт у гэты дзень немцаў. Пачалі лавіць людзей для адпраўкі ў Германію.

Мяне ўжо і ў калону былі загналі, ды я неяк вырвалася і канавай, канавай, а потым ля платоў да сваёй хаты. Але заўважылі мяне здалёк – і за мной. Я скочыла на двор – і на гару.

А ён з ямы ўсё гэта бачыць.

На гары ў нас салома ляжала. Зашылася я ў салому за комінам і сяджу.

Чую – шукаюць. Ператраслі ўсё ў хаце. Рыпяць прыступкі, – лезе нехта па лесвіцы. Стаў, дыхае цяжка.

– Вайбе, – кажа выходзь.

Я сяджу як мыш пад венікам. І раптам аўтаматная чарга проста па саломе. Каб не комін...

А тут нехта на двары заліўся, як ганчак на зайца.

– Ай-я-я-яй, ай-я-яй. Вось ён! Вось ён!..

І чую, той, хто страляў, скаціўся з лесвіцы. Ушчалася страляніна. Раздаўся выбух.

Я зірнула ў шчыліну. А гэта мой Алесь выскачыў з ямы – і бегчы, як ліс, каб адцягнуць паляўнічага ад нары. Ён і гранату кінуў.

Бяжыць, бяжыць па роўным полі, а яны па ім страляюць.

Ён у хмызах знік, а пра мяне яны забыліся. Загэркалі нешта па-свойму і пайшлі.

Потым я кінулася па следу і знайшла яго ў раўчуку. Вочы пяском зацярушаны, кісць левая на жылачках вісіць.

Дацягнулі яго бабы да хаты. Ён руку памацаў і кажа:

– Рэжце…

– Далі мы яму самагону і адрэзалі мускулы, на якіх рука вісела. Потым, калі апрытомнеў, я схілілася над ім:

– Алеська, добры мой, дарагі.

– Нічога не бачу, – кажа ён глуха.

– Алесь, любы ты мой. Будзеш бачыць.

А ён павярнуўся да сцяны і глуха так адказаў:

– Не хачу я цябе бачыць. Ідзі…

Вядома, ён лічыў, што калі з ім такая бяда, дык не яму пра мяне думаць. Куды, маўляў…

А я толькі вуснамі яму да шчакі:

– Даруй ты мне… Я ж вельмі цябе кахаю. Ты такі мой добры, такі жаданы.

І вось з таго часу мы разам. Выхадзіла я яго ў атрадзе. Праз некаторы час пачаў ён бачыць. І такое мне было шчасце – нічога, здаецца, не трэба больш.

– Як жа так, цётка, – спытала маладая, – і дагэтуль добра пражылі? У вас жа небагата? І дзяцей многа?

– Глупства, – паблажліва адказала старэйшая, – жывём. Ён са мною – і досыць.

Міхал уздыхнуў. Гэтыя людзі разважалі іначай. Ён закурыў другую папяросу. Жанчыны змоўклі. Відаць, пакладіся спаць.

Дождж усё шамацеў над самай галавою, спорны, роўны. І пад шум дажджу Міхал непрыкметна заснуў.

Сніўся яму стэп, астравок таго стэпу, што трапляецца ўжо на поўдні Беларусі. Шырокая пыльная дарога, колкія промні сонца. На ўзвышшы, усе ў чырвоным марыве і самі чырвоныя, стаяць людзі з рыдлёўкамі. І раптам ён чуе здзіўлены вокліч. Нехта бяжыць да яго з узгорка.

– Вярнуўся! Вярнуўся, – задыхаецца яна.

Яе рукі бяруць чамадан…

– Хлопцы! – крычыць яна. – Ён вярнуўся! Ён з намі!

А сама прыціскаецца да яго.

– Не,– кажа ён,– я толькі паглядзець. Я мужчына. У мяне гонар.

І вось гасне, робіцца сумным яе аблічча. Ён разумее, што гэта яна, але не пазнае яе рысаў. Чужая, зусім чужая, – а калісь свая, – яна стаіць каля яго. Знікае…

Міхал застагнаў у сне, хапаючы пальцамі паветра. А яна ўсё знікае. Знікла. І стэп быў той самы, але трывожны, як перад навальніцай. А людзі на ўзвышшы расплываліся ў чырвоным марыве.

Гэта было так жахліва, без яе, так жахліва, як ніколі не было наяве. Ён прачнуўся ад жаху і сеў, увесь дрыжучы.

– Мар’яна! – крыкнуў ён, як толькі сон адпусціў яго горла.

Была ціша. У шалаш свяціла сонца. Кожная зёлка, упрыгожаная нізкай кропель, красавалася, зіхацела.

Міхал не помніў, як ён схапіў чамаданчык, як выкаціўся з шалаша.

Дымела мокрая чорная зямля, праменні купаліся ў лужынах, яблыні стаялі ў мокрай знямозе, раскашавалі. А на ліпы і хмызы было балюча глядзець.

І пырхала, пералятала з галіны на галіну, з дрэва на дрэва ў хмызы і зноў на дрэва ўзбуджаная да вар’яцтва малінаўка. Спявала, ажно сад звінеў:

– Разумееце, разумееце, разумееце?! Разумееце, сонца ёсць. Яго зусім не зжэрлі! Яно ёсць! Ёсць!!!

Далёка, садам, ішлі дзяўчына і мажная кабета, якую схілілі не гады, а праца. Яны аб нечым размаўлялі.

А малінаўка звінела і звінела:

– Сонца ёсць!.. Ёсць!..

І пад гэты спеў Міхал шпарка пакрочыў да дарогі. Ён плюхаў па лужынах, слізгаўся і ўсё паскараў крок.

Дарога звярнула да ракі, пайшла берагам. А свет увесь ператварыўся ў сімфонію гукаў, іскраў, пахаў.

“Я абавязкова ўсё раскажу, – думаў Міхал. – Усё будзе добра. Каханне не адступае, яно не адступае ніколі. Я пераканаю яе ці яна мяне – хіба не ўсё роўна? Хіба дрэнна стаць рабочым на раскопках? Паліцца пад промнямі, глядзець у яе вочы, цалаваць яе, гарачую ад сонца, калі за курганам згасае заранка і цені ад узгоркаў імчаць полем, як скіфскія коннікі?”

Рака ўся млела пад сонцам, прымаючы ва ўлонне сонечную цеплыню.

Каля берага плыў у чаўне дзед, самы лепшы з усіх дзядоў на свеце, сівы, лысы. Такі добры дзед.

І Міхал махнуў яму рукою і крыкнуў голасам, які сарваўся ад радасці:

– Лавіць табе не пералавіць, дзед!

І гэты дзед адказаў праз зубы, не таму, што быў мо не ў гуморы, а таму, што трымаў ў роце шнур:

– Хадзі шчасліва, сынок.

Гэта быў такі добры дзед, проста незвычайны!

Міхал засмяяўся ад радасці і пакрочыў дарогай. Свет, сонечны, іскрысты, як хвост паўліна, ляжаў перад ім.

З-за далёкага, зіхатлівага лесу паказаўся дымок, бы там хто піпчыў люльку, а потым даляцеў прызыўны гудок цягніка.

КАРНЕЙ – МЫШЫНАЯ СМЕРЦЬ

Мы, дзеці, гатовыя былі бегчы за ім хоць за самы свет. Калі на нашай вуліцы з’яўлялася началавеча-доўгая постаць і гучаў прарэзлівы крык: “М-мышы! Шчурры! Пацукі!”, мы былі проста на сёмым небе ад асалоды. Гэта было нават цікавей, чым тачыльшчык.

Чалавек гэты быў худы, з сухім і доўгім тварам, на тонкіх вуснах якога заўжды сядзела з’едлівая і таемная ўсмешка. І пахла ад яго неяк дзіўна: так пахнуць камяністыя мясціны, што зараслі пустазеллем. За спіною торба, у руках доўгі і моцны кій, куртка і нагавіцы ўсе ў рознакаляровых лапіках.

Ён падыходзіў да першай – лепшай хаты, крычаў і, калі з’яўляўся ў акне твар гаспадыні, пытаўся:

– А ці верыш ты, гаспадынька, у святую тройцу?

Гаспадынька, ашаломленая нечаканым нападам, ківала ў знак згоды.

– Ну дык вось, – казаў пацукалоў. – Тады, напэўна, ведаеш, што бог па літасці сваёй наслаў на чалавека, каб нудна яму не было, пацукоў і шчуроў.

Гаспадыня нарэшце прытомнела пасля нечаканай атакі:

– Не веру я ў святую тройцу, адчапіся ад мяне, рапуха драпястая!

І чалавек, не спрачаючыся, крочыў далей. Толькі калі ўжо занадта лаяліся, адказваў:

– Бач ты, якая жабіца-скурапея. Напэўна, трэцяга мужа даношваеш, каб цябе так у апраметнай д’яблы насілі.

А калі запрашалі ў хату – пачыналася цікавае. Чалавек аглядаў пацуковыя дзіркі, усміхаўся, выцягваў з торбы гнуткі пруток і клаў яго на далонь рукі. Пасля мармытаў нешта доўга, і пруток, павярнуўшыся, паказваў канцом у бок адной з дзірак:

– Бачыш, баба, унь дзе іхняя хата.

І, стаўшы на калені, мармытаў:

– Ёсць на моры выспа, на той выспе ляжыць залаты пранік, на тым праніку пацукі вяселле гуляюць. Цар пацучыны перамог цароў шчурыных, а я, раб божы, і тых і другіх. Цар пацучыны, ветахавы, няхрышчаны, цёмны, выходзь з залатога гнязда на імхі, на болаты, на тонкія патопы, на цвілёвыя падушкі. Там качайся, валяйся, на пясок рассыпайся, а гэтага дома не чапай. Ключ замыкаю. Аман!

Пасля ён звычайна прасіў гаспадыню пакінуць яго аднаго, сядзеў трохі, выходзіў з хаты і, калі лічыў патрэбным, капаў ля прадушыны ў падмурку глыбокую яму і наліваў яе вадою. Дзіўна, але

пацукі сапраўды ўцякалі з хаты, і раніцою ў яме можна было пабачыць да дзесятка вялізных шэрых пацукоў або рудых шчуроў.

Нам ён здаваўся ўсемагутным. У той час бацька купіў мне вядомую кнігу пра клятчастага флейтыста з горада Хэмліна, які знішчыў у горадзе пацукоў сваёй цудоўнай жалейкай, а пасля, калі яму не далі за гэта грошай, зачараваў спевам гэтай жалейкі ўсіх гарадскіх дзяцей і завёў іх у нетры гары ля горада. Наш пацукалоў здаваўся мне менавіта такім: і пацукоў знішчае, і куртка на ім клятчастая ад лапікаў, і дзеці за ім натоўпам ходзяць.

А наогул гэта быў варты жалю чалавек, які, акрамя гэтай сваёй няпэўнай работы, нічога не ведаў і не ўмеў. З яго смяяліся. І нічога дзіўнага тут не было. І толькі дзеці любілі яго, як яны заўсёды любяць тое, што непадобна на звычайнае жыццё.

Мне, памятаю, вельмі хацелася насіць стракатую куртку і мармытаць прыгожыя і незразумелыя словы, зусім непадобныя на будзённыя і нудныя словы, як “хлеб”, “боты”.

Бацька мой, якому я гэта сказаў і які з трывогай глядзеў на маю схільнасць да нябесных мігдалаў, аднойчы не на жарт здзівіў мяне.

Калі пацукалоў, зайшоўшы да нас, прамармытаў, як заўсёды, сваю дзіўную замову і папрасіў каб яго пакінулі на хвіліну сам-насам, бацька раптам усміхнуўся і сказаў яніва:

– І не сорамна табе, Карней, людзей дурыць? Я ж ведаю, што ты будзеш рабіць, ведаю нават, што сам ты ў свае замовы не верыш.

Вочы пацукалова апусціліся.

– Што вы, гаспадар, замовы – рэч карысная. І я, калі буду адзін, яшчэ мацней прачытаю.

– Не дуры, кажу, – пераканальна сказаў бацька. – Ты проста ў пацуковыя дзіркі касталом-травы напхаеш.

– Якой травы? – разгубіўся чалавек.

– А той, што ў нас яшчэ сабачнікам завуць, кветкі такія ў яе... цёмна-барвяныя, а лісты як шэрым лямцам абцягнутыя. На засмечаных пустках ля дарог і па ўзгорках расце. Мяккая такая, пушыстая.

І тут пацукалоў часта залыпаў вачыма.

– Пашкадуйце мяне, не выдавайце беднага чалавека... Усе самі... пачнуць. Што я тады есці буду?!.

Бацька, які чула ставіўся да чалавечага гора, замахаў рукой:

– Што ты, Карней, вядома не скажу. Жыві сабе... Хіба я што...

Фарба з’явілася на твары пацукалова.

– Хай вас благаславіць бог.

Да гэтага не хапала яшчэ звароту “гаспадар”.

А бацька пасля паказаў мне гэтую расліну з ланцэтападобнымі пушыстымі лісцямі і мяцельчатай верхавінай сцябла.

– Cinoglossum officinale. Я чуў і раней, што гэта моцны рацыфіцыд. А ты кажаш “таямніцы”, “мармытанне”. Эх ты!

Пацукалоў, аднак, з таго часу паглядаў на бацьку заўсёды са страхам.

Так ён і хадзіў па нашым ціхім гарадку: непрыкметны, непрыстасаваны да жыцця чалавечак, жорсткі вораг пацукоў, які, аднак, не мог бы пакрыўдзіць і мухі.

У маленькіх гарадках, напэўна, да другога прышэсця будуць вадзіцца плёткі. Адна такая плётка звязвала пацукалова з імем удавы Стучэўскай, што жыла наводшыбе, ля Старых Валоў, і з яе сынам, высокім, худзенькім юнаком.

Ці была тут праўда? Я думаю, не, хоць хлопчык меў, як казалі вулічныя “бабы багамерзкія”, нейкае падабенства з Карнеем. Рэдка бывае так, каб з плётак атрымлівалася што-небудзь вартае. Гэты выпадак быў шчаслівым выключэннем. Бала́чкі баб ля студні дайшлі да вушэй клятчастага чалавека, і той стаў наглядаць на хлопца з пяшчотай, якая ўсё ўзрастала. Такія чуткі, што ні кажы, прыемная рэч для самотнага мужчыны, у якога не за гарамі старасць і якому прафесія прынесла незайздросную славу дзівака.

Хлопец якраз скончыў школу. Жыццё ў хаце ўдавы было не такое і лёгкае. Усе думалі, што Янку Стучэўскаму давядзецца працаваць. Але тут здарылася нечаканае: хлопец паступіў у інстытут, а пацукалоў пасяліўся ва ўдавы. Як выявілася пазней, пацукалоў некалькі дзён хадзіў паўз яе вялікую запушчаную хату з зарослым садам, пры сустрэчах намагаўся нешта сказаць і нарэшце з’явіўся да гаспадыні ўвечары і са звычайнай сваёй прыдуркавата-хітрай усмешкай сказаў:

– Прабачце мне за тое, што я скажу. Але, мне здаецца, хлопчык павінен вучыцца. У яго светлая галоўка. Вы ведаеце, ходзяць плёткі, у якія я, вядома, ні сном ні духам не вінен. Жанчыны – гэта глупства, прабачце. Але рота людзям не замажаш. І я неяк палюбіў хлопца. Няхай здае экзамены, мне хочацца, каб ён быў інжынерам... Стыпендыя ж, кажуць, невялікая, дык няхай ён вучыцца і клопату не мае. Вы пытаеце, чаму я так хачу? Эх, пані, у мяне не было дзяцей, трэба думаць, што і не будзе. А ў хлопца, бачыце, мае вочы... І нос таксама. Так усе кажуць. Мог бы ён быць і сапраўда маім. І потым, калі гавораць, дык няхай ужо гавораць недарэмна. У мяне ёсць такія-

сякія грошы. Толькі я хітры. І мне гэта будзе зручна, бо калі вы дазволіце я пасялюся ў вашай садовай лазні.

Не ведаю, як ён угаварыў яе. Але ён сапраўды пасяліўся ў лазні, што схавалася ля яра ў бузіне і крушыне, а пасля, з восенню, перайшоў у дом. Жаночае сэрца схільна шкадаваць, іншым нават здаецца, што менавіта гэта галоўнае ў ім.

Яна прала на яго, карміла, цыравала яго шкарпэткі. Купіла нават аднойчы яму гарнітур, але ён паслаў яго хлопцу, “сыну”, і з упартасцю вала хадзіў у тым самым клятчастым строі, на якім жывога месца не было ад лапікаў. Калі ў яго пыталіся, нашто ён, маючы грошы, так ходзіць, ён адмоўчваўся, але бацьку майму аднойчы сказаў:

– Не той цяпер час, як тады, калі я быў хлапчуком. Але я не хачу, каб Янка хоць на волас зазнаў таго, што зазнаў я. Мы жылі бедна, маці мая была таксама ўдава. Таму, напэўна, я і атрымаўся такі: сухі, кашчавы, п’янею ад першай чаркі. Таму я і стаў такі слабы і, што казаць, дурнаваты, няздатны ні на што. Мазгі ў мяне не працуюць як трэба. Самыя простыя рэчы я не разумею. А ў мяне ж ёсць сэрца, я таксама хачу быць чалавекам. Гэта, напэўна, вельмі добра – сядзець з жонкаю дзе-небудзь пад грушаю і піць чай... А ў нас, дзяцей, нават портак даўжэй, чым у каго на вёсцы, не было. Аднойчы маці са свае старой спадніцы зрабіла нам, чацвярым, порткі. Мне, малодшаму, яны атрымаліся вельмі вузенькія. Але ж затое сапраўдныя крамныя порткі! Быў вялікдзень. І вось пайшлі мы, дзеці, гуляць. Прыдумалі гульню: хто скокне цераз агароджу, таму фарбаванку. У нас і курэй не было, а скакаў я добра. Хочацца мне фарбаванку. Вось я разагнаўся і – цыб! Пераскочыў і з разгону аж прысеў. Глянуў на порткі, а яны на каленях луснулі і між нагамі луснулі, так што атрымалася двое портак, па адной калошыне на кожнай назе, – і ззаду луснулі.

А зашываць няможна, свята. Так я і прасядзеў увесь вялікдзень у хаце ды горка плакаў. Не дай божа, калі дзецям чаго-небудзь не стае.

Ён зноў усміхнуўся прыдуркаватай усмешкаю:

– Так, атрымаў фарбаванку. Карычневая... Ад цыбульнага лушпіння.

Карней усе апошнія гады перад вайною працаваў, як пчала. Удзень – па хатах, увечары – з рыдлёўкаю ў садзе ўдавы. Ён абшаляваў дом і перакрыў яго новымі гонтамі, пабудаваў уласнымі рукамі веранду, зрабіў у гушчары альтанку і нават “упрыгожыў” яе слупкі вельмі непрыгожай разьбой. Разжыўся недзе саджанцамі

добрых яблынь. І калі яго пыталі, нашто гэта, ён адказваў кожнаму адно:

– Тут ён можа спаць улетку... А тут чай піць... Ведаеце, маладому вельмі карысна піць чай, ды яшчэ калі вакол такі вольны дух... А белы наліў, думаеце, не карысны маладому? У-га!

У яго бедных мазгах шчасце атаясамлівалася менавіта з тым, каб сесці пад дрэвам і піць смачны чай. Ды яшчэ калі з варэннем – ого-го!

Гэта былі гады яго залатога шчасця. Карміўся ён добра, нават папаўнеў. Янка, прыязджаючы на канікулы, часта хадзіў з Карнеем у кіно (ісці ўтраіх пацукалоў не згаджаўся, і сын пасля ішоў у кіно з маткай). Мне асабліва падабалася, што юнак не саромеецца гэтага чалавека, што яны пасля кіно разам п’юць па куфлю піва і адукаваны хлопец пачціва слухае блытаныя фразы Карнея.

– Бач ты, як ён яго... закруціў. А той яму на бульбе, значыцца, паказваў, як яно там... ваююць... А гэты, значыцца, вельмі прасіўся. А што ты думаеш, кожнаму стварэнню жыць хочацца. Вось яно, значыцца, і так. Але...

Аднойчы я разрагатаўся, пачуўшы яго тлумачэнні, і тата ўпершыню ў жыцці даў мне па карку. Мне было ўжо дзесяць год, і гэта было вельмі крыўдна.

А бацька сказаў:

– Пабачу я, колькі ты на сваім шляху знойдзеш людзей накшталт гэтага прыдуркаватага Карнея, ёлуп хвашчоўскі!

Але я не зусім паверыў яму. Не толькі я лічыў, што гэта глупства. Сапраўды, якія вялікія пачуцці маглі жыць у гэтых грудзях? Ніякія.

Вось на полюс ісці, у нетрах цэнтральнай Афрыкі гінуць у балотах, дзе архідэі і недзе далёка дзікуны б’юць у там-тамы – гэта так.

А тут... пацукоў выганяе чалавек.

Усе былі так упэўнены ў гэтым, што не здзівіліся, калі ён з’явіўся і пры немцах з той самай торбай і ў той самай вопратцы. “Сын” быў адрэзаны фронтам, удаву Карней адправіў кудысьці на вёску і застаўся ў доме адзін.

– Гэта мой дом, – пяшчотна казаў ён, пагладжваючы абсаду акна. – Бачыш, як я адгабляваў!.. І сад пачаў цвісці. Сын ужо інжынер, разумны хлопчык. Іх хутка прагоняць, а ў яго – дом. Прыедзе ён з жонкаю, будзе піць чай пад дрэвам. А калі я кіну дом – яго ж парасцягаюць... Якія ж гэта людзі, яны нічога не пабудавалі. І пацукоў усюды развялося... Хіба гэта гаспадары? Яны дрэнныя людзі,

яны нічога не будуюць. А чалавека павінен быць, як пчала... Іначай, што ж застанецца дзецям?

Але хутка “дрэнныя людзі” пачалі і будаваць. Надта ўжо выгаднае, наводшыбе, месца было ля хаты Карнея. Тут табе густы сад, далей – яр, які падыходзіў да рэчкі і густа зарос дрэвамі і хмызняком. Поруч толькі адзін будынак, былы рыбны склад з каменнымі сутарэннямі.

Склад абгарадзілі, накруцілі шмат дроту. Пасля з’явілася ля самага саду Карнея незразумелая рэч, падобная на літару “П”. Гаспадар установы, што пасяліўся ў Карнеевай хаце, быў пажылы, змучаны бяссонніцаю чалавек у акулярах, які сяк-так размаўляў па-руску. Прыязджалі сюды і другія, часцей за ўсё па начах.

Карнея выгналі. Ён суцяшаў сябе тым, што цяпер хаты ніхто ўжо не кране. Будзе стаяць цалюткая, як рэпка. Але ён кожны дзень хадзіў туды, пакуль яго не ўзяў нейкі падазроны вартавы. Афіцэр, даведаўшыся, у чым справа, доўга рагатаў і дазволіў Карнею жыць у старой лазні. Яму нават выдалі “аўсвайс”.

Жылося яму галадна: было не да пацукоў. Але ён быў задаволены, што жыве ля сваёй хаты, што пан не псуе яе, што яна застанецца цэлай. Аднойчы яго паклікалі да ганка, і там новы гаспадар паказаў яго гасцям.

– Бачыце, тубылец. Галава, як стаўбун. Рад, што я тут – бо хату не запаскудзяць. Сказаў, што цяпер горш, бо пацукоў не ловяць. Разбіраецца, бачыце, у палітыцы. Што ў гэтых пячорных мазгах можа быць?! І гэта называецца чалавек. Дэгенерат! Добра што хоць не шкодны... Ну ідзі, ідзі...

Карней пайшоў. Ён не пакрыўдзіўся. Ён не ведаў, што такое “дэгенерат”. Так ён хадзіў па горадзе. Бачыў надпіс “Зараза!” вакол лагера. Бачыў, што ў горадзе мала людзей, што з яўрэйскіх кладоў часам нясе тлустым дымам. Але ўсё гэта праходзіла паўз яго. Мазгі Карнея здатныя былі рэагаваць толькі на тое, што адбываецца вось тут, на яго вачах.

Пачынаўся зазімак. У лазні рабілася холадна.

Аднойчы на світанні нешта штурхнула яго ў сэрца. Сам не ведаючы чаму, ён занепакоіўся. Потым гэта невядомае прымусіла яго апрануцца і выйсці з лазні. Ніхто чамусьці не затрымаў яго, і ён дайшоў да самай ускраіны саду і ўбачыў там вялізную літару “П”, а ля яе людзей. Людзі рабілі нейкую звычайную сваю работу. Гаспадар хаты стаяў, пазяхаючы, непадалёку ад другога афіцэра, які чытаў з маленькага лістка. Было яшчэ некалькі людзей у зялёным і жанчына,

якой толькі што абрэзалі косы ў вялікі папяровы пакет. Жанчына стаяла і нібы нешта глытала, хоць ежы ў яе не было відаць.

Афіцэр павярнуўся і заўважыў Карнея.

– А-а, аўтахтон. Ну-ну, падыходзь. Бачыце, панове, вось і паняты з’явіўся.

Ён амаль любіў гэтага недапечанага чалавека (дрэнныя людзі любяць таго, хто ніжэй за іх) і размаўляў з ім заўсёды паблажліва і ласкава. Але другі афіцэр, той, што чытаў, сказаў яму нешта, і гаспадар занепакоіўся.

– І сапраўды, хадзем адсюль. Давай, давай.

Яму, відаць, вельмі хацелася дадому. Ён хранічна недасыпаў, гэты чалавек. Таму ён з радасцю пакінуў свой пост і павёў Карнея прэч.

– Што гэта тут робяць гэтыя людзі? – спытаў пацукалоў.

– Вешаць будуць. Злачынцаў, – лянiва адказаў афіцэр.

– Як вешаць? – здзівіўся Карней.

– А так, за шыю.

– Вешаць? За што? – Карней занепакоіўся. – І дыхаць нельга?

– Чаму нельга? Льга. Толькі не ротам.

І раптам пацукалоў загаварыў разважліва і павучальна:

– Няможна вешаць людзей за шыю, пан. Шыя дадзена, каб дыхаць. Іначай нельга дыхаць... Хіба можна так, за шыю? Няможна вешаць людзей. Яны людзі. Яны хочуць есці, піць ваду і піва, плаціць мне грошы, что я выганяю пацукоў. Нашто ж, замест таго каб шкадаваць людзей, раптам – за шыю? Шыя чалавеку не дзеля гэтага дадзена.

Афіцэр з цікавасцю паглядзеў на яго.

– Што гэта ты вярзеш, дурань? Марш адсюль!

Але Карней не пайшоў. Ён стаў ля афіцэра і пранікнёным, вельмі цвёрдым тонам сказаў:

– Яна ж памрэ, праўда? Пане, злітуйцеся над ёю, пашкадуйце яе. Яна ж чалавек, як і вы...

Афіцэр маўчаў. Напэўна, думкі яго былі ў гэты момант далёкімі ад устава. Вялізная вайсковая машына – і тут прыдурак. Урэшце ён паўтарыў яшчэ раз:

– Марш, дурань!

Пацукалоў глянуў назад. Жанчына ўжа вісела, а адзін салдат, абхапіўшы яе ногі, цягнуў уніз.

Карней жаласна застагнаў і пайшоў прэч. Сэрца яго аблілося крывёй.

У тую ноч абурыўся ўвесь яго маленькі свет, дзе людзі жывуць, смяюцца над ім, плацяць яму грошы, дзе дзеці любяць яго, дзе пацукі баяцца касталом-травы.

Ён пачаў унікаць афіцэра, але хутка яго паклікалі ва ўласны дом.

Справа была ў тым, што пацукі з разбуранага бровара, дзе яны раней жыviліся, кінуліся ў суседнія дамы, асабліва ў тыя, дзе была ежа. Атрута не памагла. Тады звярнуліся да яго, і "тубылец" нечакана згадзіўся, толькі папрасіў тры дні, да суботы.

– У суботу пан будзе гуляць у карты спакойна, пад падлогай ніхто не будзе шарудзець. А што доўгі тэрмін, дык шаптаць такому пану – не простая справа... У простага мужыка і пацук, значыцца, просты і выгнець яго проста... А тут пацук адгадаваны і шкодны.

Пасля многа гутарылі пра тое, што нехта бачыў пацукалова за горадам, на дарозе, у кампаніі з нейкай кабетай, якая вельмі нагадвала ўдаву Стучэўскую. Яна штосьці гаварыла, а пацукалоў адказаў толькі раз:

– Не ведаю. Галава ў мяне такая... Самыя простыя рэчы не разумее.

Пасля яны пастукалі ў нейкі домік на ўскраіне і доўгі час сядзелі там. Пацукалоў пабываў там яшчэ раз і выйшаў адтуль, моршчачы лоб.

Таго самага дня ён пабываў ва ўласнай хаце, стаяў там на каленях і шаптаў тое, што шаптаў тысячу разоў: "Цар пацучыны, ветахавы, цёмны, выходзь... на балаты... там... на пясок рассыпайся..."

Ён папрасіў дазволу прыйсці ў суботу ў шэсць гадзін для канчатковай замовы.

У той дзень выпаў першы сталы снег. Дом і сад выглядалі такімі прыгожымі пад белымі, мяккімі падушкамі.

І калі пацукалоў у суботу прыйшоў другі раз, ён доўга стаяў ля хаты, гледзячы на яе прагнымі вачыма. Торба вісела ў яго цераз плячо, стуль выглядалі сцяблiны травы. А вусны ўсё шапталі нешта.

Пасля ён выцер кулаком сухія вочы і хутка пайшоў да ганка. Салдат і паліцай з мясцовых адвялі яго ў сталовую.

– Зараз папросіць пакінуць аднаго, – сказаў паліцай. – Гэта ўжо заўсёды так.

Ён, сапраўды, папрасіў і, калі яго пакінулі, стаў на калені ў кут, да вялікай пацучынай пары. Вусны яго шапталі. Ён дастаў з торбы вялізны пучок касталом-травы, залез у яго пальцамі і, да болю моршчачы лоб, на невялічкім металічным прадмеце перавёў невялічкую стрэлку на лічбу дзевяць. Пасля апусціў усё гэта ў знарок пашыраную

дзірку і забіў яе дошчачкай. Перайшоў да наступнай дзіркі – і там паклаў пучок травы. Затым паклаў яшчэ ва ўсе норы. Ён прабавіўся так з гадзіну.

Пасля, ля выхаду, яго затрымалі і павялі ў кухню. Ён павагаўся, але пайшоў. Тут яго не пакінулі аднаго, бо так патрабаваў парадак. Усе з цікавасцю глядзелі, як ён піхаў траву ў норкі і шаптаў свае дзікунскія замовы.

Кухар нават панюхаў траву, і пацукалоў спытаў, ці добра яна пахне.

Спяшацца было нельга.

Ля дзвярэй яго зноў затрымалі, бо ён павінен быў адчытацца перад самім гаспадаром, а той яшчэ не прыехаў. Пасля ён прыехаў, а з ім яшчэ шэсць чалавек, сярод іх дзве дзяўчыны.

– Я ўсё зрабіў, пане ласкавы, – сказаў пацукалоў. – Вы будзеце вельмі спакойна спаць... І вашы цнатлівыя паненкі таксама.

Яны засмяяліся, а новы гаспадар даў яму каляровую паперку. Пацукалоў узяў яе і скамячыў у далоні. Толькі выходзячы, ён зірнуў на насценны гадзіннік. Маленькая стрэлка прайшла палову дарогі ад лічбы, падобнай да парсюковага хвосціка.

Ён выйшаў і пабрыў па снезе, не аглядаючыся назад. Ён ведаў, калі азірнецца і пабачыць веранду, дзе хлопчык піў чай, і акно таго пакоя, дзе хлопчык спаў, то можа вярнуцца. Каб разам... У хлопчыка быў такі неспакойны сон.

Пацукалоў пайшоў напрасткі. Ён спусціўся на лёд рачулкі паўз сваю лазню, пасля выбраўся на стромы супрацьлеглы бераг, чапляючыся за голы хмызняк. Там ён спыніўся на ўзгорку і стаў чакаць пад халоднымі зорамі. За спіною ў яго чарнеў недалёкі лес, куды цяпер ляжаў яго шлях.

Час цягнуўся надта-надта доўга.

І раптам за рачулкай нешта грымнула, ірвануліся ў паветра языкі полымя. Дом яго, лепшы на свеце, свой дом, палаў як свечка. Зарыва клалася на снягі. Яны сталі ружовымі. Ад складаў беглі маленькія чорныя фігуркі, але трапіць у дом яны не маглі. Мітусіліся вакол, сутыкаліся, беглі назад.

Чалавек на высокім беразе ўпаў на калені ў снег, заплакаў, выціраючы вочы лапленым рукавом, пасля засмяяўся:

– Пацукі! Дальбог, пацукі. Я яшчэ ніколі не бачыў такіх тлустых.

ЯК ЗВЯРГАЮЦЦА ІДАЛЫ

Алёнцы год і дзевяць месяцаў.

Але яна ўжо зусім вялікая дзяўчынка. Лічыць жа ж трэба не па ўзросту, а па тым, што ты паспеў зрабіць. А яна ўжо чалавек, таму што даўно навучылася прама хадзіць. І яшчэ навучылася так-сяк выказвацца, і сваякі, ва ўсякім разе, яе разумеюць.

І яшчэ адно, самае галоўнае: варта каму-небудзь зрабіць выгляд, што ён замахваецца на ката, сабаку альбо чалавека, – і адразу гучыць адчайдушна-ўмольны віск:

– І цеба.

Гэта азначае “не трэба”. Значыць, галоўнае, з чаго складаецца чалавек, ужо ёсць.

У Алёнкі вялізныя, як сподкі, сінія вочы, ніжняя губка чапялою (адразу бачна, што характар будзе злёгку фанабэрысты і самастойны), тугое, як мячык, цельца і ножкі, якія цэлы дзень тупаюць па доме, садзе і гародзе.

Гэта тып дзіцёнка-шкодніка. І гэта вельмі добра, таму што менавіта з такіх атрымліваюцца потым вартыя чагосьці людзі.

У Алёны ёсць мама, прыгожая распаўнелая жанчына, бацька, які застаўся ў іх горадзе, каб лётаць на “малётах”, дзед і бабуля, якія душы ў ёй не чуюць.

Акрамя таго, у яе ёсць яшчэ дзядзька, які зашмат думае над светавымі праблемамі.

Гэты дзядзька больш за ўсё любіць важдацца і няньчыцца з ёю і, адчуваючы на каленях яе цеплыню, шмат успамінае.

І тады твар яго робіцца змарнелым і пяшчотна сумным. А бабуля, пабачыўшы гэта, спяшаецца прайсці паўз яго, быццам не бачыць, і аб нечым размаўляе з дачкою, маткай Алёнкі. Часам маці Алёнкі не вытрымлівае і адбірае ў дзядзькі дачку.

– Чаго ты тут век з ёй сядзіш?

– Бо сваіх няма.

Дзед, дзядзькаў бацька, сядзіць пад бэзам у крэсле, і па яго абліччы прабягае цень. На яго тонкіх вуснах з'яўляецца гумарыстычная складка:

– А ты б зрабіў, як адзін сялянскі Рамэа: “Я за ёю ўпадаў, а яна на мяне і пляваць не хацела. Дык я ў царкву прыйшоў і ёй у кішэнь мёрзлых конскіх каўцюшкоў наклаў”. Вы ж, цяперашнія, усе такія.

У Алёнкі ўжо ёсць усе задаткі будучай жанчыны.

Вось яна сядзіць на руках у мамы, а дзядзька цягне да яе рукі і варушыць пальцамі. Яна нерашуча адрывае ад мамы цельца і,

выгнуўшы спіну, цягнецца да яго. І раптам – шырокая ўсмешка на твары, і дзіця зноў кідаецца на шыю маці, хаваецца. З-за пляча выглядае толькі гарэзлівае, круцельскае сіняе вока. Яно з радасцю назірае за выцягнутым абліччам дзядзькі.

І так без канца.

О Божа літасцівы, пакутаваць вам, мужчыны, ныня і прысна і давеку!..

Тупае яна па кветніку, а дзядзька сядзіць і думае. Шмат што прыпамінаецца яму. І галоўнае, вайна.

Дзядзька не без падставы лічыць, што людзі зямнога шара пакутуюць толькі з-за страху. З-за страху бяжыць у атаку каланіяльны салдат, з-за страху адрываюць з рота ў галоднага дзіцяці хлеб і нясуць яго на алтар бога, які ў гэтым зусім не жадзён.

Дзеля страху кленчаць, дзеля страху тысячы такіх вось дзяцей па ўсёй зямлі ператвараюцца ў ваўкоў і гадзюк.

Над светам стаіць "Нешта". І палова людства баіцца яго, хоць варта было б толькі ўсім людзям як адзін сказаць "не хачу", і гэтае ідалішча развеялася б дымам.

У дзядзькі ад гэтых думак баліць галава, нараджаецца няверʼе ў сябе і ў род чалавечы.

У Алёнкі таксама ёсць свае страхі. Яны, праўда, – маленькія, але хіба для такога кураняці шмат трэба?

Гэты страх – Пыласос!

Даўно, да прыезду ў гэты дом на адпачынак, ім на кватэру прынеслі падобнае на чарапаху страшыдла. І з таго часу яно напаўняла сваім трэскам пакоі.

Яно бурчала і паўзло, як жывое.

І дзікі, нечалавечы жах апаноўваў Алёнку. Яна нават не крычала, яна глядзела ў адну кропку і дрыжала ўсёй скурай.

Нарэшце дарослыя заўважылі гэта і сталі выносіць малое на вуліцу пад час работы страхоцця, але адразу, з усёй жорсткасцю дарослых, выкарысталі гэты страх.

Прывід Пыласоса вісеў над Алёнкай і тут.

Захочацца пайсці ў кусты і надзерці там поўныя жмені зялёных парэчак – і адразу ж гучыць грозны голас:

– Нельга. Пыласос!!!

Вочы яе адразу акругляюцца і застываюць. Рукі з ружовымі танюсенькімі пальцамі закладваюцца за спіну і там шаруюцца адна аб адну. Яна паварочваецца і непаслухмянымі губамі паўтарае:

– Там... пасёсь.

І глядзіць на маці вялізнымі вачыма.

Гэтыя вочы так нагадваюць дзядзьку другія вочы, што ён увесь уздрыгвае ад глыбокага і цёплага прыліву пяшчоты. Потым адбываецца размова з сястрой:

– Не смей яе палохаць.

– А ты сам тады глядзі за ёю ўвесь дзень. На ёй скура гарыць.

– Ну і дзякуй Богу. Можа, я гэтых парэчак не еў у дзяцінстве? Або ты? Усе гэтыя твае стрэптакокі – у стэрыльных бальніцах. А там, дзе бабы на полі бульбу капаюць, – аб іх і не чулі.

– Не ты ёй маці, а я. Мне і меркаваць.

Дзядзька маўкліва згаджаецца з бясспрэчнай ісцінай.

І зноў цэлымі днямі гучыць над дзіцёнкам імя страхоцця.

– Не хадзі туды, не рабі гэтага, не рві таго!

– Пыласос! Пыласос!! Пыласос!!!

Проста невыносна. Дарослы – і той бы з'ехаў з глузду ад такога, а тут жа маляўка.

Дзядзька сядзіць і думае. У кожнага ёсць свой Пыласос. І гэты Пыласос робіць з разумнай, гордай, прыгожай істоты, створанай для радасці і мастацтва, – пакорлівую жывёліну.

А сад такі гожы, столькі ў ім нябачных пладоў, столькі хмызнякоў і травяных зараснікаў. Ідзі па ім, тупай пакуль яшчэ слабымі нагамі. А ягады такія празрыстыя, такія сагрэтыя сонцам. Сонца пранізвае іх навылёт, нараджаючы ў каламутнай глыбіні невыразныя контуры семачак. Куст кліча да сябе, як дрэва пазнання. Ідзі ж, ідзі!

– Пыласос!!!

І закладваюцца назад рукі. А родныя вочы, сінія – як у той – застываюць. Напэўна, і тую, іншую, многа палохалі. Якіх жа намаганняў каштавала ёй вырасці такой, як яна ёсць!

І вось аднойчы, калі брат і сястра сядзяць поруч і брат выказвае свае невясёлыя думкі, з-за вугла дома выплывае касалапым упэўненым крокам круглая Алёнка.

Жывот – наперад, рукі за спіною, на тварыку стрыманы і прытворна раўнадушны выраз.

Яна тупае гаспадарскім, паважным крокам.

Вось падышла зусім блізка да маці, паклала ёй на калені кулачкі, расшчапіла іх.

На яе далонях ляжыць дзесятак зялёных парэчак.

І адразу яе мордачка робіцца круцельская, хітрая.

– Мама. Пасёсь.

І тут дзядзька не вытрымлівае. Ён хапае яе на рукі і шалёна цалуе ў брудныя лапкі, у шчокі, у хітрыя вочы.

– Дачушка ты мая! Дзіця ты маё чалавечае!

БЛАКІТ І ЗОЛАТА ДНЯ

Вясною палескія рэкі пачынаюць цячы назад, да вытокаў. Толькі адна Прыпяць з цяжкасцю гоніць да Дняпра талыя воды, заліваючы на дзесяткі кіламетраў палі і лясы.

Застаюцца толькі вёскі на выспах ды рэдкія барліны са стагамі сена ці шумлівым вяселлем. Часам — кірмаш на чаўнах, з'яднаных масткамі, плывучы кірмаш, што павольна набліжаецца да далёкага сяла.

Пахнуць добрым малаком каровы, коні баязліва касавурацца за борт фіялетавым, напружана-разумным вокам.

— Ну вас да д'ябла. Яшчэ патонеш тут з вамі.

Адзін такі кірмаш, па-палеску стрыманы, жартаўлівы і трохі п'яны, спазняўся з прыбыццём у сяло на цэлыя два дні.

Бяда была ў тым, што па дарозе, у вёсцы Разбіты Рог, старшы загуляў і зманіў з сабою на бераг усіх мужчын, усіх стырнавых.

Бабы паспрабавалі плысці далей адны, але мужыкі, раззлаваўшыся, дагналі іх і зноў паставілі ўвесь кірмаш — сто пяць чаўноў — на прыкол да сыпучай выспы, на якой стаяла вёска.

— Падумаеш, вельмі ім трэба спяшацца. На вялікдзень яны, бачыце, у Карпілавічы не паспеюць. А нам і тут добра.

Бабы хацелі былі пратэставаць, але з чаўноў узнялі такую катавасію, што яны толькі плюнулі.

— Няма на вас, нячысцікаў, управы.

— А што ўправа? Можа на тое, каб вы фарбаванкі свянцілі?

Цяпер мужыкі і самі разумелі, што ўчынілі дрэннае, але гонар перашкаджаў ім прызнацца ў гэтым. І таму яны, даволі пахмурныя, налягалі на шасты і вёслы, спяшаліся, хоць усім было зразумела: спазніліся.

Усе былі не ў гуморы: мужчыны — з пахмелу, жанчыны — ад крыўды. Толькі адной дзяўчыне — а было ёй год васемнаццаць — усё было хоць бы што. Яна сядзела на носе аднаго з пярэдніх чаўноў і ўсміхалася такой светлай усмешкай, што і сляпы ўсміхнуўся б ёй у адказ.

Празрыстыя славянскія вочы, — быццам майскае неба ў ранішнім тумане, — тупы носік, румяны рот з мяккімі ямачкамі ў куточках вуснаў. І лепей за ўсё была каса. Таўшчынёю з руку, залацістая, як сухі ліст каштана.

Хустку дзяўчына скінула і разаслала на каленях, бо сонца ў гэты дзень нечакана прыгрэла, і па вадзе скакалі залатыя іскры, ад якіх моршчыўся нос і хацелася чхаць.

З-пад хусткі была відаць клятчастая спадніца, пад ёю другая — белая. І ўсё на гэтым дзеўчаняці ляжала так ладна. І так забаўна жмурыліся ад сонца і ленай млявасці яе вочы, што кожны сказаў бы:

— Вось каму жыць добра.

А жыць было на самай справе добра! Наперадзе далёкая дарога сярод затопленых лясоў; верхавіны дрэў, што плаваюць у блакітнай смузе; дрымотныя крыкі пеўняў над вадою.

Куды было спяшацца? Наперадзе — жыццё. Аднаго не хапала: каб падышоў нехта ззаду, вялікі, цёплы, як сон, абняў за плечы і прынік шчакою да скроні.

Раней і думаць аб гэтым было страшна. І мужа яна ўяўляла сабе не іначай, як чужога хлопца, з якім трэба сядзець на покуце і, немаведама чаму, цалавацца.

А вакол зялёныя шклянкі і чырвоныя твары.

Але адышло насланнё, прыгрэлі промні, заказыталі ў носе. Захацелася скруціцца ў іх цеплыні, як котка.

І каб нехта гладзіў.

Вясна ўсё ж прыйшла, першая і апошняя такая. А можа і не апошняя. А дарога па разводдзі, сена, што плыве поруч з вялікімі чаўнамі, вячэрнія песні дапамаглі вясне.

І ніхто, нават маці, не разумела, што здарылася за гэтыя дні дзіва: узышла на бацькоўскую байду калючы і рэзкі падлетак, а цяпер плыве дарослая дзяўчына, што ўсё зразумела нейкімі глыбінямі душы.

Быццам зямля.

Драмала яна пад расталай вадой, была вязкая і спакойная. І раптам, сагрэтая сонцам, стала мяккай і цёплай, разварушыла ў сабе парасткі і толькі таго і чакае, каб прайшоў нехта, са свістам шпурнуў з сявенькі васковыя зярняты, — і песня жаўрука прывітае яго прыход.

І цеплыня. І знямога. І крыкі пеўняў.

— Прыйдзі, сейбіт!

Нічога такога яна не магла б расказаць. Яна магла толькі ўсміхацца, склаўшы рукі на каленях.

Нават маці не зразумела б гэтага. Як поле, якое ўсё аддало, не можа зразумець поля, якое чакае.

Яна і не разумела, а толькі бурчала на жаўтавусага мужа, лічыла грошы ў хусцінцы, пераклікалася з суседкамі на другіх чаўнах. І, як заўсёды вядзецца ў вельмі занятых жанчын, першай прыкмячала, што трэба і што не трэба.

Яна першая заўважыла лёгкі доўблены човен, вельмі вялікі і вёрткі. Човен выслізнуў з гаю, што стаяў па пояс у вадзе, і лёгка стаў даганяць непаваротлівую флатылію.

На карме сядзеў чалавек у шэрай ваўчынай шапцы і спрытна арудаваў адным вяслом.

— Хто ж гэта такі? Наталька! Наталька! Ну, зірні сваімі вачыма...

Дзяўчына павярнулася і з усмешкай, што ўсё яшчэ гуляла на яе вуснах, нездаволена сказала:

— Юрка з Выселкаў вяслуе.

І зноў адвярнулася. Таму што гэты Юрка зусім ёй не падабаўся. Увесь нейкі тугі, як спружына, вочы гарэзлівыя. І заўсёды скаромныя жарты на языку. І заўжды на бойку лезе. Без дай прычыны, проста так: пабачыць, што дзве кампаніі б'юцца, абярэ тую, у якой аднаго чалавека не хапае, — і давай.

Ды і не гэта ў ім самае дрэннае. Вочы ў яго трывогу наводзяць. Няладныя яны, не такія, як у астатніх.

Гэтай зімой ён паспрабаваў быў у сенцах абняць яе. Ёй было смешна, што ў яго дрыжаць рукі, што ён так няроўна дыхае.

І ўсё ж яна ўзвілася на дыбкі, як неаб'езджаны конь.

Людзі ў хаце чулі толькі, як грымнулі вёдры і ўпаў каромысел.

Калі яна ўвайшла ў хату, дзе сустрэлі яе песні скрыпкі, пералівы гармоніка і ўздыхі бубна, нехта спытаў яе:

— Што гэта там упала?

— Юрка вёдры зваліў. П'яны прыцягнуўся. — І прыбавіла: — Угаварыла, каб дадому ішоў.

Яе твар быў такі непранікнёна спакойны, што ўсе паверылі.

І вось цяпер яна злавала, што новы чалавек парушыць гэты сонны, гэты бяздумны і лянівы спакой.

А Юрка тым часам стаў на ногі і ўхапіўся за борт бліжэйшай байды карычневай ад загару рукою.

Човен глуха стукнуўся аб байду. Яго прывязалі. І тады Юрка нахіліўся і лянівым рыўком ускінуў на плечы двухгадовага секача, ашчаціненага, брудна-бурага, са злосна ашчэранай мордай.

Гуляючы, кінуў яго на байду.

— Ану, наваліся, таечкі. Разабраць адразу ж. Мужыкоў накарміць. Усё адно да горада сапсавацца можа.

Бабы з захапленнем загалёкалі над тушай. А Юрка глядзеў на іх падазрона-спакойнымі вачыма.

— Нашто ж квахтаць? — сказаў ён нарэшце. — Добра каб япрук, а то ж так, нядаўна з галавасцікаў выйшаў.

Галавасцікамі ён называў галавастых дзікіх парсюкоў.

— Ну, гэта ты не кажы, — сказаў Наталін бацька, — добры дзік. Бач, іклы ўжо якія!

— Добра, давайце, бабы. Тады ўжо і мне адваліце смажанага. Бо ў мяне ўвесь хлеб скончыўся, паміраю з голаду.

Ён нагнуўся ў чаўне. І раптам бабы з віскам кінуліся ў бакі. Над бортам байды з'явілася круглая галава рысі з грэбліва адкрытай пашчай, белазубай і крывава-чырвонай.

Вушы на галаве былі шчыльна прыціснуты, вочы — прымружаныя. У тую ж хвіліну паказаліся грудзі, моцныя лапы.

Рысь, здавалася, упаўзала ў байду.

І адразу ж над ёй вырасла галава Юркі. Ён рагатаў. У шэрых вачах хітрыкі, рудаватыя валасы хвалямі падаюць на лоб.

— Спужаліся? — спытаў ён. — Добра, кабеткі, не буду.

Ён шпурнуў забітую рысь на дно байды і сам пералез цераз борт.

— А гэта ўжо мне, — сказаў ён, падымаючы звера за карак. — Можа, будзе ў мяне жонка, дык буду класці ёй на ногі, каб са мною не мерзла.

— З табою змерзнеш, — іранічна сказаў Натальчын бацька.

— Дзень добры, людзі, — голасна сказаў Юрка і потым дадаў выразна: — Дзень добры, Наталечка.

Тая не адказала.

Ані не збянтэжаны такой акалічнасцю, ён палез у човен, дзе сядзела дзяўчына.

— Вы разбірайце, — растлумачыў ён бабам, — а я буду тут. Не каля мяса быць кацінаму паху... Ач ты, д'ябал, пра нож забыўся.

І зноў палез у човен. Наталя краем вока бачыла яго худую, налітую рухомай сілай постаць, шэрыя адчайныя вочы.

Юрка ўжо сядзеў на кукішках каля гарадскога хлопца, які другі год швэндаўся па Палессі з блакнотам.

Хлопец амаль любоўна казаў яму:

— Шыцікі цябе ведаюць, што ты за чалавек. Такі ўжо беларус тыповы — далей няма куды.

Губы Юркі скла́ліся ў іранічную ўсмешку.

— А што, гэта добра ці дрэнна?

— Па-мойму, нядрэнна... Здольны народ.

— У-у, — працягнуў Юрка, — выключна здольны народ...

Пакінуў хлопца, пералез у човен Наталі і кінуў перад ёй на лаўку серабрыстую вільготную рыбу.

— На вось, Наталечка.

— Нашто мне гэта?

— Кляпец. Няхай пакуль што ў вадзе паляжыць. А падвечар ён абсохне, і мы тады з табою дзіва пабачым.

— Ты што, думаеш, я так і буду з табою да вечара сядзець?

— Не з дзедам жа ж Бяскішкіным табе сядзець. Са мною весялей.

І зрабіў першыя надрэзы на лапах рысі.

Абое маўчалі. У вадзе нараджаліся, скакалі па зыбу і згасалі, каб зноў успыхнуць, залацістыя іскрачкі.

— Вы куды? — ціха спытаў ён.

— У Карпілавічы, — неахвотна адказала яна, — ды вось спазняемся.

— Ну так, — сказаў Юрка, — сёння ж вялікдзень. Не даплывеце раней, чым за суткі.

Памаўчаў трошкі:

— А табе нашто?

— Мне не трэба. Гэта старыя бабы так захацелі. Іх тут палова. Шкада, няхай бы пацешыліся на старасці год...

— Так, — сказаў Юрка і раптам зажмурыўся, нешта абдумваючы. Праз хвіліну ён паклікаў ужо да сябе дзеда Бяскішкіна і Натальчынага бацьку.

— У Карпілавічы не дабярацеся, бацькі. Спазніліся.

— Ну дык што, — раззлаваўся Бяскішкін, — ты што, таксама мяне гарэліцай папікаць хочаш?

— Позна, — сказаў Юрка, — ды я і не пра тое. Чаму б вам замест Карпілавічаў не падацца ў Пагост?

— Сяла няма, — сказаў дзед, — адна царква на востраве.

— Старым бабам гэта і трэба, — сказаў Юрка. — А вы ў сяло раніцай паспееце.

— Не ў тым справа, — сказаў Наталін бацька, — туды не праплывеш. Каса пясчаная па дарозе.

Размова ішла пра паласу выспаў, што цягнуліся паміж пратокай, дзе яны плылі, і Пагостам.

— Цю-цю твая каса, бацька, — сказаў Юрка, — вада верхам ідзе. Глыбіні палова сажня. Сам сёння мераў.

— Байды не пройдуць.

— А байды мы на касе пакінем. Самім да Пагоста і на чаўнах дабрацца можна. Падумайце, мужчыны... Старыя вунь як узрадуюцца.

Напамін аб старых вырашыў усё. Наталін бацька тут жа аддаў каманду і сам наваліўся на стырно, заварочваючы стырнавую байду, а з ёю і ўсю нехлямяжую флатылію ўлева.

Ударылі па вадзе вёслы, і хутка плынь панесла плывучы кірмаш яшчэ хутчэй, чым дагэтуль.

Юрка зноў сядзеў ля ног дзяўчыны. Рукі яго спрытна арудавалі нажом.

— Ну вось, паглядзіш сёння, як на Пагосце даўгагрывыя арудуюць. Нічога не скажаш, прыгожа.

Яго плячо раз-пораз дакраналася да яе ног. Яна бачыла буры загар на яго шыі, смуглату пад носам і на шчоках.

Гэтыя дотыкі, моцныя і лёгкія, чамусьці не турбавалі яе — ён жа ж працаваў, а не назнарок.

— Можа, і пахрыстосуемся, — сказаў Юрка, узнімаючы вочы.

— Са зверам сваім пахрыстосуйся, — спакойна адказала яна.

— Ды ён і так мяне сёння... пахрыстосаваў, — і агаліў руку.

Яна ўбачыла тры падоўжныя раны на яго прадплеччы. Адразу недзе ў глыбіні, пад лыжачкай, нарадзілася трывога.

— Ты чаго ж не сказаў нікому, дурны?

— Нічога, я порахам засыпаў.

— У-ух-х ты, — яна, спяшаючыся, выхапіла з-пад лаўкі свой хатулёк, выцягнула адтуль белую анучку, — дай сюды...

Юрка паклаў ёй на калені тонкую і моцную руку. Яна нават не заўважыла гэтага. Хіба што цеплыню, якая ішла ад яго рукі праз тканіну.

Гэтыя неглыбокія, але доўгія драпіны раптам абудзілі ў яе сэрцы нейкі амаль мацярынскі жаль да гэтага адчайнага хлопца.

— Ну вось, — сказала яна, не заўважаючы цяжару яго рукі, — парадак.

— Ясачка ты ў мяне, — сказаў Юрка.

— Ясачка, ды не твая, — сказала яна, таму што зноў з'явілася ў ёй ранейшая млявасць, чаканне чагосьці і дрымота.

— Крыўдуеш усё, — ціха сказаў ён, — а я як той алень увосень. Нават жывот яму падвяло, так ён кліча.

— З голаду ў цябе жывот падвяло. Хлеб, пэўна, з'еў увесь... паляўнічы.

Ад агнёў, раскладзеных на цаглінах, ужо даносіла пахам смажанага мяса.

— Правільна, — згадзіўся Юрка з ценем крыўды ў голасе, — трэба падсілкавацца.

Устаў і пайшоў да агню. Вярнуўся ён адтуль з бацькам Наталі.

Абодва прынеслі ежу. У руках у Юркі былі дзве лусты хлеба з заціснутым паміж імі кавалкам смажанай япручыны.

Румянае мяса раставала, прасякаючы тлушчам свежы наздраваты хлеб.

— На, еж, — сказаў Юрка да Наталі. Стары Даніла сеў поруч з Юркам ля ног дачкі і выцягнуў біклагу.

— Вазьмі глыні, сынок.

— Заборыстае віно, — сказаў Юрка, адпіўшы глыток, — як выпіў, так за забор хапаешся.

І ўзяўся за мяса. Наталька амаль не ела, а глядзела на хлопца.

Юрка еў без прагнасці, хоць бачна было, што ён вельмі згаладаўся: у вачах насалода, рукі спрытна падмінаюць хлеб.

І раптоўна яна спаймала сябе на нечаканай і цёплай думцы: «З гэтым і з адной місы есці прыемна».

І засаромелася.

Ежу прыкончылі. Даніла пайшоў. Юрка кончыў са скурай, скруціў яе і панёс у свой човен.

«І чаго пайшоў? — падумала яна. — Спакайней на месцы сядзець». І яшчэ падумала: «Нічога, зараз прыйдзе».

Потым адразу спахапілася.

«Чаго гэта я? Нашла аб чым шкадаваць! Прыйдзе — не прыйдзе».

Ён прыйшоў і зноў сеў ля яе ног. Зноў лётаў над плынямі пяшчотны і волкі ветрык, гуляў яго валасамі і махрамі яе хусткі.

Часам ён сціхаў і зноў вяртаўся слабымі ўздыхамі. І ў такт гэтым уздыхам нараджаліся ў вачах залатыя іскры. Мірыяды іскраў.

Блакітнае было ўверсе. Блакітнае было ўнізе.

Юрка прыхіліўся грудзьмі да яе нагі, і яна адчула, як моцна і пругка калоціцца ягонае сэрца. І зноў нешта перашкодзіла ёй адштурхнуць яго, не чуць гэтых удараў. Яна толькі варухнулася.

— Ты сядзі, — папрасіў ён, і ёй спадабалася, што ён быццам просіць у яе літасці — здаровы, смелы, а перад ёю такі слабы, што яна можа рабіць з ім што захоча.

Гэта ўсведамленне сваёй раптоўнай улады было небяспечным, але яна не ведала пра гэта. Бадай што гэта было і лепш.

Яна адчувала ўдары яго сэрца цэлы дзень. Гэты трывожны і пяшчотны стук паступова перапаўняў цеплынёй яе калені і рукі. А ён адчуваў, як мякка казычуць яго шыю махры квятчастай хусткі.

Урэшце яна пацягнула хустку вышэй, але адразу ёй стала шкада гэтых махроў, што сталі варушыцца дарэмна, і яна зноў апусціла хустку ніжэй. І ён усміхнуўся, зноў адчуўшы ласкавы дотык.

Чаўны плылі і плылі ў блакітным і залатым. Гэта лазурнае толькі часам перарывалася празрыстай сцяной затопленага лесу, — і зноў загаралася іскрамі. Сплюшчылі павекі, глыбокая цеплыня перапаўняла цела. Блакітнае і залатое, залатое і блакітнае.

Без канца. Без краю. Без мяжы.

Зрэдку ён мармытаў пад нос нейкія песні, таксама небывалыя, таксама сонна-трывожныя.

Дзень быў бязмежны. І бязмежным было падарожжа.

А калі пачаў спускацца лянівы надвячорак, стала яшчэ лепш.

Падсохла луска ў вынятага з вады кляпца.

Яны глядзелі і чакалі. І раптам у паўзмроку вочы кляпца загарэліся фіялетавым агнём. Гэта было так нечакана, што яна падалася наперад, і грудзі яе дакрануліся да галавы хлопца. Так усё і засталося.

А рыба сохнула. Луска на яе спіне стала цёмна-фіялетавай, збягаючы па баках да пяшчотна-сініх адценняў.

Здавалася нават, быццам водбліск гэтага слабага ззяння кладзецца на іхнія твары.

Яна ўздыхнула і падумала, што гэта ёй, толькі ёй, прынёс ён і паказаў гэткае дзіва.

А ён раптам амаль прашаптаў:

— Высахну вось па табе, як гэты кляпец. А каб ты са мною была — я ад хлеба толькі скарынку гарэлую браў бы, а астатняе табе.

— Не трэба, Юрка, — таксама шэптам сказала яна. І на повень лягла ноч. І паходня запалала на носе галаўной байды. Чырванаватае ззянне выхватвала з цемры дрыжачыя галіны дрэў з цэлымі шапкамі пены, што круціліся ў іх. А вакол была вада.

Дзяўчына накінула нарэшце хустку, як быццам для таго толькі, каб ён мог грэць пад ёю рукі. Абое маўчалі.

Юрка пакінуў яе толькі тады, калі трэба было ставіць на прыкол увесь караван. Града вырасла перад імі цёмнай смугою дрэў.

І раптам востры жаль пранізаў яе. Няхай бы бясконца сядзець вось так з ім, адчуваючы цеплыню яго рук.

А голас яго ўжо гучаў па ўсіх байдах.

— Пятрусь, ты чаго сядзіш? Заводзь нос, заводзь нос, табе кажу. Спрацаваўся мне, пад носам мух лавіўшы... Ану, узялі... І куды ты лявей тычкі прэш? Ану, яшчэ раз!

Нарэшце караван трывала стаў на водмелі. Людзі пачалі адвязваць чаўны. Але як толькі яна паспрабавала прабрацца да бацькавага чаўна, яго рука лягла ёй на далонь. Лёгка сціснула і адразу адпусціла пальцы.

— Не трэба. Сядай у мой човен. У вас будзе цесна.

Яна сказала сабе, што не хоча гэтага, але ногі самі па сабе пераступілі цераз борт. У яго човен.

Юрка марудзіў, адвязваючы канец. Апошнім сеў у чыйсці човен дзед Бяскішкін.

І толькі потым, калі астатнія чаўны аддзяліліся сажняў на сорак, пачала цурчаць вада за кармою іх чаўна.

Ноч адразу ахапіла іх, пагладзіла халаднаватай лапаю твары, заміргала ў вочы касматымі зоркамі.

Выразная — па вадзе — размова далятала ад чаўноў. А гэтыя двое маўчалі, і калені іхнія сутыкаліся. Яна адчувала, як ад кожнага руху вясла мерна скарачаюцца мускулы яго ног.

— Не паварочвайся, — шэптам сказаў ён, — пацярпі трошкі. Я табе сам скажу, калі трэба... Абагнём гай.

— Ды я і не хачу паварочвацца.

Ён быў вельмі ціхі. І чамусьці толькі адзін раз кінуў на хвіліну вясло і паклаў ёй руку на плячо. Якраз у гэтую хвіліну на ваду, маслíста-чорную і густую, на дрэвы, на іхні згублены човен упаў першы ўдар звана. Яна здрыганулася, і ён адчуў гэтае дрыжанне.

Ёй здалося, што па яго твары слізгоча нейкі дзіўны ружаваты водбліск. Гэты водбліск наліваўся святлом, гусцеў. І нарэшце ўвесь яго твар — з глыбокімі ценямі ў вачніцах, і таму асабліва дарагі і страшны, — абліўся глыбокім, трапяткім барвянцам.

— Глядзі, — сказаў ён.

Яна лягла на бок, на сена, і ўбачыла астравок, што ўзнімаўся з вады. Трохі ўбаку быў другі астравок, большы. На ім бялелі ствалы голых бяроз. Гэта былі клады.

А на маленькім астраўку ўздымалася да неба нешта як шацёр, белае, азоранае агнямі. Менавіта адтуль даляталі ўдары звана, а потым — спевы.

Востраў нягуста абляпілі чаўны.

Гарэлі паходні. Гарэла смаллё на невялічкіх плытах. Залаты водбліск клаўся на цяжкую, як ртуць, чорную ваду.

Юрка ўстаў і стаяў на карме, абапіраючыся на вясло. І ёй ужо не хацелася глядзець на маўклівы рэдкі натоўп, на агні па вадзе.

Толькі на яго.

Худы, з вузкімі клубамі, ён высіўся над ёю, медна-чырвоны, як індзеец. Валасы яго сталі зусім бурштынавымі. Цені і святло на твары. Зменлівы, добры, суровы.

Ёй стала страшна, што хутка ўсё скончыцца і зноў будзе плывучы кірмаш.

— Не трэба чакаць канца, — сказала яна, — лепш дамоў.

І ён паслухмяна павярнуў човен і стаў веславаць у цемру.

Азораная ззяннем паходняў, абкружаная шматкаляровымі карагодамі чаўноў згасала і танула ў водах адразу за імі імгненная праява. Дрэвы закрылі яе, пагльнулі воды і цемра, і адразу стала ясна, што тая праява чужая, што на шмат кіламетраў няма нічога, акрамя воднай роўнядзі, вычварнай вязі плыняў, пены ў вірах, пагружаных у ваду лясоў і цішыні.

І па гэтых водах, па залітай вадою зямлі імчаў толькі адзін іхні човен, іхні каўчэг. Недзе, напэўна, былі іншыя чаўны, але для гэтых двух нікога не існавала.

Наталя зноў падумала, што зноў давядзецца вярнуцца да сноў мінулага дня, што давядзецца расстацца з гэтым чалавекам, які цэлы дзень дакранаўся плячом да яе кален.

Яна ўзрадавалася і адначасна да дрыжыкаў спужалася, калі ён паклаў у човен вясло, і іх пачало плаўна праносіць паўз караван, што стаяў на якары. Яна яшчэ знайшла сілы спытаць:

— Нашто гэта?

— Ты хочаш туды? Я давязу... Яна не адказала яму нічога. Ён пачакаў трохі і падсеў да яе, абняў за моцныя і тонкія плечы. Лёг поруч у сена, што пахла ліпеньскім сонцам. Моцна і пяшчотна прытуліў да сябе.

Яе скура яшчэ не аддала цеплыні дня. І хлопец, заблытаўшыся пальцамі ў яе валасах, пачаў пакрываць яе твар незлічонымі пацалункамі. Яна адчувала шыяй цёплую футру рысі, вуснамі — цёплыя вусны хлопца, целам — усё яго напружанае гарачае цела.

Але яна дрыжала, як ад холаду, яму стала так шкада яе, што ён прыўстаў, выцягнуў з-пад ног тонкае і калючае навобмацак, вельмі цёплае пакрывала і старанна накрыў яе, падторкнуўшы краі пад гнуткую спіну.

Літасці ў яго хапіла толькі на гэта, таму што ён бачыў у змроку яе твар з вялізнымі вачніцамі. І ён ведаў: іншай дарогі няма ні яму, ні ёй. Усё вяло да гэтага: блакіт і золата дня, іскры на вадзе, фіялетавае свячэнне рыбы ў паўзмроку.

І гэтыя плечы, што дрыжалі пад яго рукой. — Юрка, любы, родны мой, не трэба, — казала яна, усё шчыльней прыціскаючыся да яго. І ён ведаў, і шкадаваў, і не мог злітавацца.

Таму што ўсё гэта была мана.

Каўчэг гнала, злёгку пагойдваючы на хвалях, і зверху глядзелі на яго зоры, якія тысячы разоў бачылі гэта і ўсё ж не стамляліся зайздросціць зямной цеплыні.

На хвіліну яму здалося, што ён памыліўся, што маны няма, — і ён адхіліўся. Але яна адчувала яго дыханне, ёй больш за ўсё на свеце было шкада яго. І яна, нясмела ўзяўшы яго руку, пацалавала павязку на яго прадплеччы. І ўжо нічога не засталося, акрамя дрыготкіх адбіткаў зор у яе вачах.

Яны не пачулі, што іх лодка стала, што плынь надзейна пасадзіла яе на схіл кургана, які ўздымаў над вадою сваю макаўку.

Ды гэта было між іншым. Галоўным быў дзень, ноч, што наступіла, жорсткія мужчынскія далоні на плячах і кароткія пацалункі.

А потым ён заснуў, прыціснуўшыся да яе. «І гэта ўсё? — спытала ў сябе яна. І сама сабе адказала: — Так, усё. І што я шчэ трэба? Ён са мною, я з ім».

І нячутна, баючыся разбудзіць, дакранулася вуснамі да яго рукі.

Яны вельмі моцна спалі, калі вада, прыбываючы ўсё вышэй, зняла каўчэг і зноў панесла яго па цячэнню. Мужчына спаў мёртвым сном. Жанчына прачнулася толькі на хвіліну і яшчэ шчыльней прынікла да соннага.

На верхавіне нейкага дрэва крычалі вароны.

— Хіба з такім можна загінуць? — шапнула яна. І апошнім сонным урыўкам думкі падумала:

«Дурныя вароны... Тут не канец. Тут пачатак». Яны спалі, а лодку несла і несла над затопленай зямлёй.

1960

ЛЯТУЧЫ ГАЛАНДЗЕЦ

I

Паэт Лявон Касачэўскі даведаўся, што яму здрадзіла нявеста.

Месца, у якое ён уцёк гаіць сардэчную рану, было рыбацкім латвійскім гарадком, маленькім, як цацка. Уранку Касачэўскі прачнуўся, пачуў, як дождж шапаціць па лісцях, і засмяяўся, што няма больш нявесты, усё засталося ззаду, што прыйшла, магчыма, другая маладосць.

Але такое пачуццё было толькі ў першы дзень, пасля вярнулася туга. Ён сумаваў па Анэлі, па яе бязвольных далонях, па нахабных прыжмураных вачах. Пасля адышло і гэта, і толькі травяністы пах першых астраў нагадваў яму часам мінулую восень, шчасце.

Гарадок быў увесь заплецены мокрымі сецямі, прапахнуў рыбай і ёдам. Гэта была спрадвечная Балтыка, не захватаная да агіды рукамі цікаўна-абыякавых турыстаў. Пасівераныя рыбакі, бабулі з вялікімі чорнымі рукамі, бялявыя дзяўчаты.

І, вядома, дзюны – прыбалтыйскія піраміды з іхнім халодным пяском, спічастымі верхавінамі і жоўтай, таксама халоднай істужкай вячэрняй зары, што гарыць над імі.

Лявон атрымаў якраз ганарар за кнігу і вырашыў жыць тут, сціпла і бедна, да таго часу, пакуль хопіць грошай. Яму абрыдлі камяніцы горада, брудная рэчка, спрэчкі ў рэдакцыях. Абрыдла і вёска, дзе жыла яго адзіная сястра і дзе ён стаў амаль такім самым паважаным чалавекам, як Аўтух Купа, сын цёткі Юхіміхі, сяржант мінскай міліцыі.

Ён не хацеў сустрэч з людзьмі, і людзі не ведалі, што гэты непрыгожы чалавек год трыццаці – вядомы паэт. Яны проста бачылі яго нязграбную моцную постаць, шырокія крокі, якімі ён мераў чысцюткія вуліцы гарадка. А ён любіў толькі кампанію дзяцей і вельмі старых рыбакоў, ды і то рэдка.

Звычайна ён браў з сабою сабаку гаспадыні, істоту рухавую і дрэнна выхаваную, і забрыдаў на цэлы дзень куды-небудзь далёка ў поле або на дзюны. Надыбаўшыся да таго, што ставала млосна ў нагах, ён сядаў на пясок і сумленна дзяліў хлеб з сабакам, пасля клаўся на зямлю дагары тварам і сачыў за хмарамі, а сабака, атрымаўшы ўсё, што трэба, здрадліва кідаў яго і бег кудысьці па сваіх сабачых справах.

Лявону было цяжка... Да дваццаці васьмі год ён жыў жыццём чыстым і халодным, не разумеючы сяброў, якія проста так хадзілі “на вечарок” сёння да адной, праз тыдзень да другой і казалі, што гэта

натуральна, што ўсім кабетам толькі таго і трэба. Ён быў па-пурытанску, насуперак усяму, упэўнены, што каханне – гэта зусім не тое, што рабілі сябры. Ён не папікаў сяброў, ён ведаў, што большасць людзей гэтага проста не ведае, – але для сябе выбраў другі шлях: або ўсё, або нічога.

І тут прарвалася тое, жахлівае, што аж дагэтуль мучыла ўсю яго істоту.

Яшчэ і яшчэ раз ставіў ён перад сабою пытанне, якое з пачатку дзён ставяць усе вельмі разумныя, але вельмі дурныя мужчыны: “Што я ў ёй знайшоў?” Гожая, з наўскос прарэзанымі вачыма, падобная на егіпцянку – людзі на вуліцах азіраліся на яе. Хіба што толькі гэта?

Аднак цэлы год ён гарнуўся да Анэлі, думаў толькі пра яе, не мог без яе.

І сяброўкі ў яе былі такія самыя. Флірт без ценю дасціпнасці, размовы пра тое, што нейкі французскі артыст накупляў у Маскве бялізны і пасля адкрыў у Парыжы выстаўку, на смех розным сытым ранцье. З захапленнем перадавалі словы нейкай этуалі: “Як у іх пры такой бялізне нараджаюцца дзеці?!”

Касачэўскі ніколі не быў артадоксам, але яго так абурыла іх слепата, што яго ўзарвала.

Некалькі дзён пасля таго ён не размаўляў з Анэляй, але яна прыйшла да яго сама і так міла шчабятала, рабіла такія нявінныя вочы, што ён не вытрымаў.

Ён памятаў, як аднойчы, калі яны ўжо былі жаніхом і нявестай, ім давялося сустракаць дзень нараджэння ў адной Анэлінай сяброўкі. Вечар скончыўся позна, дача была далёка за горадам.

Ім паслалі ў адным пакоі, перагарадзіўшы яго шырмаю. Пры гэтым гаспадыня дачы (Касачэўскі мог бы пабажыцца) з выразнасцю паглядзела на сяброўку, і ў вачах яе Лявон заўважыў прытоеную ўсмешку. Лявон, вядома, не думаў адмаўляцца, выглядаць у яе вачах смешным. Але гэта было так непрыкрыта і так бессаромна, што ён пайшоў на веранду і курыў там, пакуль усе не заснулі.

У пакоі ён доўга глядзеў на спячую. Напружаны нават у сне твар, раскрыты рот (паліпы ў носе, ці што?). Нічога ад яе дзённага зачаравання не было ў гэтым вобліку, толькі ніколі раней Лявона так не цягнула да яе, не быў ён такі блізкі з ёю – да апошняй мяжы. Насланнё нейкае!

Але ён шкадаваў нявесту і памятаў выразны позірк гаспадыні. Шырма засталася стаяць.

Што ж гэта было? Толькі не каханне, бо разляцелася ў трэскі ад першага позірку хлюста, што стаў на іхняй дарозе за месяц да вяселля. Ён выпадкова ўбачыў іх разам, але яна пры апошнім спатканні хлусіла яму, выкручвалася, як вужака пад віламі. І самае дрэннае было тое, што ён ведаў, ведаў усё, пагарджаў ёю, не паважаў ані на шэлег, – і ўсё ж гарнуўся да яе, так гарнуўся, што ўсё мог даравацъ.

А пасля было так цяжка, што ён уцёк сюды і толькі тут трошкі супакоіўся. Усё па-даўнейшаму. Сустрэне сапраўдную, адзіную сярод усіх, – адаб'е нават ад дзесяцёх. Не сустрэне – не трэба ніякай.

Пастулова Лявон уцягваўся ў жыццё гарадка. Яно было простым, як чаргаванне дзён і начэй, працы і адпачынку.

Уночы ён звачайна браў у гаспадыні човен і, карыстаючыся брызам, адплываў далёка ад берага.

Уздыхала мора, курылася лёгкім туманам. Галава рабілася мокрай ад расы. Ён спакойна засынаў на дне чоўна, ведаючы, што мора будзе спакойнае аж да самых асенніх бур падчас раўнадзенства. Сон быў чуйны: праз кожныя дзесяць хвілін ён знікаў, пасля зноў ахутваў вочы. Човен пагойдвала.

А калі сон не прыходзіў, Лявон ціха чытаў любімыя вершы:

У моры імчыць карабель-невідзімка,
Згас за марамі Альдэбаран.
З зорнага сяйва, расы і дымкі
Шлях пралягае за акіян.
Ванты спяваюць! Ванты спяваюць!
Ціша панавала над морам, плыў блакітны, празрысты туман.

Асабліва баяўся цяпер Лявон сустрэчы з якім-небудзь земляком-інтэлігентам. І ўсё ж лёс не ўбярог яго ад такога шчасця.

Часам Касачэўскі заходзіў у бар выпіць шклянку моцнага мясцовага піва. Часцей за ўсё ён рабіў гэта тады, калі ў бары было мала народу. Ды і садзіўся ён у кутку, ля самага ўваходу, за вялікай філадэндрай, мясістае лісце якой добра хавала яго.

Такія меры былі дарэчы, таму што ў гарадку з'явілася некалькі Лявонавых суайчыннікаў. Жылі яны не тут, а ў невялічкай гавані, базе маторных ботаў, даволі далёка ад пасёлка, на поўнач ад яго, і з'яўляліся ў гарадку, а значыць і ў бары, толькі часамі. Лявон у твар ведаў некаторых з іх і не вельмі любіў.

Адзін з іх быў высокі, вельмі спешчаны мужчына з маладой сівізною – вядомы рэжысёр. Другі –маленькі, са смешным памятым тварам – яго сябра, крытык Моршч (а для ўсіх проста Вінцук). Астатнія былі, напэўна, артысты: падкрэсленая выразнасць жэстаў,

што па-за сцэнай здаецца ненатуральнай, тэмбрыстыя галасы. Чаго яны тут, Лявон не ведаў. Ён чуў, праўда, што рэжысёр Грабоўскі заўзяты яхтсмен, таму і не здзіўляўся, што бачыў іх тут. Яго больш хвалявала тое, што хтосьці, напэўна, рэжысёр, заходзіў у адсутнасць Лявона да яго на кватэру. Гэта было непрыемна.

І трэба ж было так здарыцца, што ў той вечар Касачэўскі зайшоў у бар і не паспеў агледзецца, як пачуў размову гэтай вясёлай кампаніі амаль поруч з сабою, за вялікай філадэндрай.

Размаўлялі аб ім.

– Што, уласна кажучы, такое з гэтым Касачэўскім? – спытаў адзін з артыстаў.

Рэжысер прыгожым жэстам (ён трымаў папяросу ў выцягнутых і паўсагнутых пальцах, агнём да далоні) збіў попел:

– Уласна кажучы, звычайная гісторыя. Прафан у адносінах да жанчын. Звычайная дзяўчына была, я нават ведаў яе. Прыгожая. Абрыдла ёй занадта вялікая сумленнасць жаніха, і яна вырашыла ў чаканні шлюбных радасцей зрабіць размінку.

Малады чалавек з занадта калматай “канадкай” рагатнуў.

Яшчэ адзін сабутэльнік, чалавек з пароды тых, якіх завуць “грыбазвонамі”, усміхнуўся:

– Кіньце жартаваць, хлопчыкі. Гэта хоць і смешна, а чалавеку няшчасце... І ўсё ж, які шчанюк! “Ненавидя человечество, от него бежит спеша”.

Крытык Моршч усміхнуўся аднымі вачыма.

– Самае дзіўнае, што з усяго Бальманта нашы крытыкі ведаюць адзін толькі гэты радок. І жывуць гэтым капіталам да сівых валасоў.

– Не пра гэта справа ідзе, любы, – з паблажлівай пагардай сказаў Грабоўскі. – Можа, гэта і смешна, а я інстынктам не люблю гэтага чалавека. Ведаю – добры хлопец, ведаю – неблагі паэт, ведаю – не ханжа. А не люблю таму, што ён у адносінах, скажам, да мяне, – белая варона. Мне ён быў патрэбен – вы ведаеце па якой справе, – конча патрэбен. Песні мне патрэбны ў яго духу. Заходжу да яго – няма, пайшоў кудысьці. А на стале – я не цікавіўся, але адразу трапляе ў вочы – чаго толькі няма: “Сагі пра вікінгаў”, “Гісторыя конунгаў Нарвегіі”, раманы Канрада. І на самай сярэдзіне стала – “Легенды паўночных мораў”. Я па запрашэнню гаспадыні чакаў хвілін дваццаць і цікнýў у гэту кнігу. Адкрыта на гісторыі Лятучага Галандца. Ну нашто гэта патрэбна, каму? Разумее ж ён гэта. А ў асабістым жыцці... ах, дамы і трубадуры, ах, Гаральд Вілабароды!

Чалавек-рамантык, сцвярджаю гэта, у наш век тое самае, што жывы мамант.

Моршч рэзкім рухам адсунуў разам з сурвэткаю шклянку з вінам. З грымасай гідлівасці ўзяў чужую папяросу.

– Глупства кажаш, стары. Чалавек – гэта ўсё. Гэта метад кесоннай адліўкі і язычаскія абрадавыя песні, сучасная філасофія і лятучы галандзец, атамная фізіка і вершы галіярдаў. Усё патрэбна на зямлі, усё –чалавек. А ты кажаш звычайную пошласць. Што ж, адабраць у дзяцей беларускія легенды, адабраць Пакацілу, вужыную каралеву, Яна Прыгожага. Хто з іх вырасце? Голыя практыкі без фантазіі. Я не ведаю, але я ўпэўнены, што Эйнштэйн чытаў казкі Андэрсена.

– Увага, – з сумам азваўся рэжысёр, – прысутнічаем пры нараджэнні серыі новых артыкулаў.

– Так, новых артыкулаў, – выбухнуў чырвоны Моршч. – Чыгунныя мазгі ў вас, вось што. Я таксама лепей пайшоў бы на дзюны і слухаў там мора замест таго, каб слухаць твае жарты. Што ж, прымусьце чалавека пісаць тэхнічныя раманы ў духу “Рэльсаў” П’ера Ампа. Будзе ў літаратуры яшчэ адной нудотай больш.

– Пайшла, паехала, – махнуў рукою рэжысёр. – Любчык, не перабівай ты чалавека, які аж на тыдзень старэйшы за цябе. Зразумей, няхай сабе ён піша, што хоча, але няхай жыве, як кожны чалавек. Глядзі ты, не спадабалася яму звычайная дзяўчына.

– Не звычайная дзяўчына, а... сказаў бы, але баюся цябе пакрыўдзіць, такія ў тваім гусце.

– Ну няхай, няхай, супакойся, мая дзетухна. Не трэба чакаць ад жанчын надзвычайнага: казачнай прынцэсы, бога з машыны, трасцы з хваробай. А сам звычайнага асабістага жыцця не здолеў наладзіць.

– І гэта не твая справа, – адрэзаў Моршч. – Ведаеш, я малю бога, каб яму дасталася сапраўдная прынцэса. Так абрыдлі шлюбы толькі з-за таго, што мужчыне апрыкралі сталоўкі.

– Перабольшваеш, – сказаў “грыбазвон”.

– Ну добра, падвяду базіс. Жанчыне жахліва, калі пустэча ў ёй самой, а мужчына баіцца пустэчы вакол сябе. Сумна, цяжка, хочацца, каб пашкадаваў нехта. Ну і з’яўляецца дзяўчына, добрая, простая. Каханне. Пажаніліся. Пасля каханне або ломіцца – тады развод, – або пераходзіць у прывычку.

Моршч паклаў далонь на вочы і скалануў галавой. Пасля сказаў нейкім незвычайным, цёплым голасам:

– Магчыма, яно і лепей, што чалавек адзін з нямногіх не жадае задавальняцца проста жонкаю, а чакае сапраўднага кахання, што як удар бліскавіцы. Прыходзіць яно – чалавек шчаслівейшы за ўсіх на зямлі, а калі няма, дык лепей ужо нічога не трэба.

Рэжысёр, відаць, не адразу пазбавіўся ўражання ад гэтых слоў і таму сказаў ненатуральна фатаўскім тонам:

– Ты сёння, бачу я, проста п’яны... А я не магу так разважаць. Няма казачных прынцэс. Дзікае сцвярджэнне, але я асабіста ўпэўнены ў гэтым: няма на свеце кахання. Фізіялогія – гэта так, сям’я – гэта так. І дурань твой Касачэўскі, што шукае фей там, дзе іх няма. Вымерлі феі.

Мімаволі ў яго словах за п’янай зухаватасцю прагучаў сум, і Моршч гэта зразумеў. Сказаў упрашальным, душэўным голасам:

– А можа, яны ёсць, не зніклі, толькі ты іх не заўважаеш, бо каратказоры, бо не ўмееш шукаць?

– Не ведаю, – змрочна сказаў Грабоўскі.

– Што ж, напэўна ў яго асаблівы зрок, калі ён бачыць прыгажосць нават там, дзе мы нічога не заўважылі б, акрамя гною. Памятаеш яго “Ветракі”? Крыжы над раўнінаю, стаяў снег, асабліва суха ля пачатага стога саломы, сустракае вясну ля стога стары конь. Добра! І, ведаеш, мы, напэўна, самі вінаваты ў тым, што рамантызм вымірае: не прызвычаіліся бачыць прыгажосць нават у бочцы з зялёнай вадою ля плота, нават у зламанай вярбе. У нас даўно ўжо не дзіцячы зрок, мы не чакаем ад жыцця незвычайнага. А такія, як ён, заўсёды трошкі дзеці. Ён чакае, ён верыць – і жыццё пойдзе яму насустрач. Я ведаю, ён ва ўсім убачыць надзвычайны бок. Выпадак, які для нас проста смешны, для яго паўстае ў такім павароце, што ён бачыць: гэта казка, гэта паэзія. А мы, суровыя практыкі, застанёмся ў дурнях нават і з практычнага боку. Таму што ён жыве і не міне сапраўды рэдкага і прыгожага.

Грабоўскі скрывіўся, як ад зубнога болю:

– О-ох, з якою ахвотаю я даў бы яму андэрсенаўскія чароўныя галёшы! У якіх дурнях апынуліся б гэтыя толькі што спечаныя рамантыкі, каб іх паставіць тварам у твар перад дзейснасцю, дзейснасцю будзённай, толькі звонку афарбаванай у колер казкі. З ахвотаю паглядзеў бы на гэта!

– Ну і дурань.

Касачэўскі знік, не дачакаўшыся канца размовы. Абрыдла. Пустыя, п’яныя пабрахенькі, і больш нічога. Чуў яшчэ толькі, што сярод кампаніі выбухнула нейкая спрэчка.

Ён пайшоў з горада і накіраваўся ў дзюны. Глупства, усё гэта глупства! Ніколі ён не быў рамантыкам, хіба што шукаў незвычайнага, без якога нельга, цяжка, нудна жыць. Асабліва брыдка было, што Грабоўскі перагортваў кнігу, выпадкова забытую на стале.

Ноч плыла над халодным морам, цягнуліся рэдкія пёрыстыя аблокі. Мора шырокае, як душа чалавечая, каціла на пясок лянівыя хвалі. Ах, мора, мора! Хіба не на гэтых бедных берагах, на якія і дагэтуль выкідваюць хвалі абломкі бурштынавага палаца, хіба не на гэтых берагах зарадзілася казка, хіба не тут ёй жыць? На гэтыя берагі выходзілі калісь легіёны паўдзённых воінаў у медных шаломах. Адкуль з'явіліся ў муміях фараонаў вочы з бурштынаў, тваіх бурштынаў, мора? Ты ляжала спакойнае, бутэлечна-зялёнае, шапацела лёгкімі хвалямі. Плылі па іх у тумане ганзейскія караблі; плылі на Готланд і Руген, дзе яшчэ не астыў попел ля храма Святавіта, галеры беларускага князя Вячка.

Гатландцы пудамі жэмчуг грабуць.
Самацветы ламаюць там спіны каней.
Іх жонкі на пралках прадуць залатых,
З сярэбраных чопаў кормяць свіней.

Бягуць быстраногія коні марэй, плывуць па іх незвычайныя караблі. Мора, мора! Ранкам, калі туман укрывае твае воды, можа, сам лятучы галандзец, карабель, асуджаны вечна вандраваць, імчыць у тваім тумане. Вецер надзімае ружовыя ветразі, падобныя на дзявочыя грудзі. Капітан стаіць пад мачтай, стаяць на пастах нерухомыя маракі. Раз у год, калі ад зямлі павее вецер, з карабля спускаюць шлюпку. Капітан аддае самотнаму рыбаку сумку з лістамі, якіх нельга даставіць па адрасу, бо гэтыя людзі даўно памерлі. Але над прывідамі не імчыць час. І зноў яны, раз у год, сумуючы па цёплай зямлі, перадаюць лісты да бацькоў, якія не дачакаліся з мора разудалых сыноў, да сёстраў, якія выплакалі ўсе вочы, да залатакосых нявест.

II

Мора, як люстра. Зноў то прыходзіць, то знікае нячутны сон. Ноч толькі-толькі пачала святлець, і лёгкі перадранішні туман вісіць смугою над морам. Ён адлівае шэрым, попельна-жамчужным, слаба блакітным. Плыве кудысь над чоўнам, хістаецца, звіваецца ў пасмы і ляціць у неба.

І човен пагойдваецца. І галава мокрая ад расы. Сон схіляе галаву на банку чоўна. У такі час прыходзяць сны і здані.

І таму Касачэўскі ў першую хвіліну амаль не здзівіўся, калі непадалёку ад яго, але амаль зусім нябачны за туманам, праплыў сілуэт карабля. Стройны, выцягнуты, з прыгожымі абводамі, з трыма мачтамі, на якіх былі слаба напятыя ветразі, ён плыў павольна-павольна. Ён здаваўся б сном, калі б не лёгкія вусы пены, што беглі ад яго ў бакі, ледзь бачныя ў тумане.

Касачэўскі, як большасць сучасных людзей, быў поўным прафанам, што датычыцца старажытных караблёў, але тут нават ён, праціраючы заспаныя вочы, войкнуў ад здзіўлення: карабель семнаццатага стагоддзя, прывідны ў тумане, ходкі, як мара, праплываў перад ім. Лявон быў вельмі сучасным чалавекам і, вядома, нікому не паверыў бы, каб яму сказалі такое. Але не верыць уласным вачам было немагчыма. Карабель быў тут, такі прыгожы, такі імпэтны.

Яму здалося, што ён спіць. Але не. Адчынены порты, ля парэнчаў з пузатымі балясамі стаяць невыразныя ў тумане, нерухомыя постаці.

Што ж гэта такое? Звар’яцеў ён або, можа, сапраўды ў сярэдзіне дваццатага стагоддзя плаваюць па морах караблі-прывіды? Не, гэта сон.

І толькі ён паспеў падумаць пра гэта, як роўны, мёртвы голас пачаў аддаваць словы каманды.

Касачэўскі чуў, што галандскай мове ўласціва падаўжэнне галосных. Да таго ж, ён чытаў “Уленшпігеля”, дзе таксама трапляюцца галандскія словы. Але ў тую хвіліну ён не думаў пра гэта. Ён арганічна адчуваў, што гэта менавіта галандскія словы.

Што за дябал?! Але які голас, які мёртвы голас!

У тую самую хвіліну ён пачуў, як другі голас, малады і жаласны, пачаў прасіць аб нечым. Гэты раз мова здалася яму нямецкай, якую ён трохі ведаў. Ён нават разабраў паасобныя словы:

– Нявеста... нявеста... Яна чакае... Злітуйцеся... Гэта тут, блізка.

У адказ зноў той самы мёртвы голас і незразумелыя словы.

– Марыя! Марыя! – зноў пачаў жаласна стагнаць малады голас. – Марыя!

Касачэўскі адчуў, што ў яго пачало падазрона паколваць у каранях валасоў. Гэты голас гучаў такой непрыхаванай прагай, такой адвечнай тугой, што мурашкі прабеглі ў яго па спіне.

– Пусціце яго, – сіпата крыкнуў Касачэўскі.

Але ў тую самую хвіліну нешта пераляцела цераз борт і пляснулася ў ваду, а карабель, змяніўшы трохі курс, пачаў аддаляцца і канчаткова растаў у тумане.

Толькі голас яшчэ маліў недзе з такім жарам і безнадзейнасцю, што, здавалася, памеркне святло. Але гэта была ўжо невядомая мова:

– Марыя! Марыя! Тамуз! Панмегас тэфнеке!

Касачэўскі ўзяўся за вёслы і пачаў падграбаць да таго месца, дзе, ён бачыў, нешта ўпала ў ваду. Ён падплыў бліжэй і раптам убачыў пузатую, дзіўнай формы бутэльку, што плыла, паблісквaючы мокрым шклом.

Ён працягнуў да яе руку, спадзеючыся, што яна растане ў паветры. Але бутэлька лягла ў яго руку зусім адчувальным цяжарам. Ён паклаў яе ў човен і некаторы час сядзеў з закрытымі вачыма. Пасля расплюшчыў іх – бутэлька была на месцы, і ў ёй жаўцеў скрутачак паперы. Сэрца тахкала. Лявон акунуў галаву ў ваду. Парныя кроплі падалі яму за каўнер. Пасля пачаў машынальна выграбаць да берага.

Толькі калі сталі бачны дзюны на беразе і туман пачаў звівацца і знікаць, Касачэўскі ўзяў бутэльку і абчысціў яе рыльца. Шматок жоўтай паперы ўпаў яму на далонь. Востры гатычны шрыфт, які з цяжкасцю разбіраеш.

“Anno 1657. Божа, злітуйся над душамі маракоў. Я, Хрысціян Рабе, марак з праклятага карабля, невядома колькі год блукаю тут. Нашто я не слухаўся бацькоў, нашто я ўцёк у любімае, страшнае мора? Мяне чакаюць дома. Дні цякуць над намі, як хвіліны, годы – як дні. Я не ведаю, ці жывыя яны, усе, каго я любіў. Калі хто вылавіць гэтае маё апошняе прывітанне, хай занясе яго ў горад на вуліцу Літасцівых Юзафітаў у дом ля самай Старой Вежы на другі паверх. Даруй мне, сівая маці. Даруй мне, Марыя. Ты дарэмна гадавала свой вясельны мірт. Мы будзем імчацца, пакуль нас не праглыне мора, бо “Лятучы Галандзец” – імя нашага карабля”.

Лявон выйшаў на бераг у поўным неўразуменні. Што гэта можа быць? Міраж! Але вось у руках бутэлька. Жарт! Але хто можа цяпер разыгрываць такія дарагія жарты? Адкуль гэты стары, хуткі, як песня, карабель? Не, гэта немагчыма. Застаецца адно: можа, я пачынаю вар’яцець і ўсё гэта напісаў сам, у трансе? Таксама неверагодна. Божа мой, што ж гэта такое робіцца?

Але ён ведае адно. Гісторыя гэтая цалкам незразумелая, дзіўная, небывалая ніколі на зямлі. Калі ён сапраўды не хоча звар’яцець, ён павінен пайсці па гэтаму старажытнаму адрасу, паглядзець, ці не захаваўся той дом. Яму, нарэшце, проста цікава.

Але што гэта, што гэта такое, што?

III

Ён пакутліва думаў пра гэта ўвесь час, пакуль ехаў цалкам сучасным аўтобусам да горада. Не пераставаў думаць і тады, калі ў старым горадзе сапраўды адшукаў вуліцу Літасцівых Юзафітаў.

Гэта быў старажытны заімшэлы горад, пабудаваны, вядома, яшчэ ў часы нямецкага панавання. Круглыя і квадратныя вежы, муры, вулачкі такія блытаныя, што можна было, пакруціўшыся па іх, самога сябе пабачыць у спіну. Аўтамабілі тут не з'яўляліся, бо нават два чалавекі ледзь маглі тут размінуцца.

"Чорт пабяры, а раптам і праўда?" – варухнулася ў галаве Касачэўскага неспадзяваная думка.

Адагнаўшы яе, ён блытаў вулкай Юзафітаў яшчэ з паўгадзіны, пакуль не натрапіў на Старую Вежу, або Вежу Германа, як яе называлі.

Сапраўды, вуліца тут канчалася, і да самай вежы прыляпіўся домік, ад якога так і веяла старасветчынай. Маленькі, шэры другі паверх выступае над першым, дах стромы. І спічастая вежа прыляпілася на ім – проста хоць малюй.

Напэўна, выгляд у Касачэўскага быў такі дзіўны, што нейкі малады чалавек у стракатым гальштуку паглядзеў на яго і ўсміхнуўся на поўны рот. Але Лявону было не да яго. Ён хутка перасек вуліцу і, нырнуўшы ў дзверы, пачаў павольна лезці кудысь па вінтавых сходах. Было цёмна. Пахла цвіллю.

Вось і другі паверх, а на ім адзіныя, абабітыя самай празаічнай цыратаю дзверы. Званка няма. "Добра хоць гэта", – падумаў Касачэўскі.

Ён стукнуў у дзверы раз, пасля другі – ніхто не адказвае. Злёгку штурхануў іх – падаліся. Уціснуўся ў цёмную прыхожую і адразу пабачыў прамень дзённага святла, што падаў з прачыненых дзвярэй. Ён сабраўся ўжо крыкнуць, ці ёсць хто-небудзь, калі раптам пачуў жаночы голас і аслупянеў.

Кара́лі гэтыя мне сціснуць шыю,
Вянец вясельны галаву прыгне.
Нашто ён мне? Іх косці мора мые.
Іх карабель даўно ляжыць на дне.

Голас зазвінеў тугою. Такая маладая, моцная горыч была ў ім, такі боль, што ў Касачэўскага зашчымела ў горле.

І дна марскога нежывыя цені
Схавалі ад мяне і ад бацькоў
Адвагу іх, іх ярасць і сумленне,
І да радзімы верную любоў.

А голас пытаў, клікаў. Слёзы чуліся ў ім. А пасля ярасць:
Дзе ён, каханы? О, як сэрца ные.
Зірнуць бы ў вочы родныя яго,
Арлiныя, халодныя, стальныя,
Жахлівыя для лютых варагоў.
Хто памятае іх? О божа, божа!
Палае ўсё, і гіне наш народ.

Такой задушэўнасцю гучаў гэты невядомы голас, што ў Касачэўскага слёзы прасіліся на вочы. Што гэта было? Казка?

Я не аддам яму кахання руту.
О дарагі мой, мой няшчасны край,
Я паміраю. Вось яна, атрута.
Бывай, зямля. Каханы мой, бывай.

Голас сарваўся ад хвалявання, ад відавочнага болю.

О, як пячэ! Каханы мой, мой любы.
Хутчэй сюды праз хвалі ўсіх марэй.
Цалуй мяне ў мярцвеючыя губы.
Канец... канец...

Голас заміраў. Адначасова пачулася шапаценне і стук ад падзення цела. Не памятаючы сябе, Касачэўскі кінуўся ў пакой:

– Што вы робіце?! Супыніцеся!

І асекся, разумеючы, што зрабіў вялікае глупства і недалікатнасць.

У пакоі на падлозе ляжала дзяўчына. Касачэўскі не паспеў заўважыць, прыгожая яна ці не. Ён заўважыў толькі яе ўбор, аксамітную вішнёвую сукню старажытнага крою і сярэбраны, ткань "караблік" на доўгіх косах.

Дзяўчына павольна ўстала з падлогі.

– Што гэта такое?

Ніхто не мог бы сказаць гэта больш годным тонам, і Касачэўскі мармытнуў:

– Прабачце, я стукаў. Але вы не адказалі. Пасля я пачуў... і кінуўся...

– Я зусім яшчэ не збіраюся паміраць.

Касачэўскі быў гатовы праваліцца праз зямлю. Ён стаяў нязграбны, вялікі, пераступаў з нагі на нагу. Бялявыя валасы, як страха, падалі ў яго на сінія, як неба, вочы.

– Даруйце, я проста не ведаю, у якое стагоддзе я трапіў.

Яна замест адказу сказала горка, наступаючы на яго:

Пакіньце гэты дом, шаноўны пане.
Чакаюць коні вас. Грыміць труба.

А тут жалоба, слёзы на світанні,
І па забітых вечная журба.

Лявон не заўважыў дзіўнага агеньчыка ў яе вачах і збянтэжана пакланіўся. Пасля падаўся задам да дзвярэй.

– Д-добра. Я... пайду. Прабачце. Я перашкодзіў з гэтай атрутай...

І тут яна разрагаталася.

– Чакайце, куды вы? Раз вы зайшлі, дык растлумачце хоць, нашто я вам.

І тут Касачэўскі выпаліў:

– Слухайце, калі вы пакінеце дурыць мне галаву? Што тут, уласна кажучы, адбываецца? Ці, можа, усе людзі звар'яцелі, ці я адзін вар'ят? Дзе я, нарэшце?

Яна зноў стала сур'ёзнай.

– Вядома, у... наццатым стагоддзі. Чуеце, коні грукаюць капытамі. Бачыце, у гэтым пакоі адна толькі люстра; а там, за сцяной, зала і зброя на сценах... І мой жаніх загінуў у моры.

Касачэўскі зажмурыў вочы і скалануў галавою:

– Хто ж вы, нарэшце? Марыя?

– Так. Нашто завітаў сюды вандроўны рыцар? Я сапраўды Марыя.

– Тады гэта вам, – сказаў Лявон, канчаткова адмаўляючыся зразумець што-небудзь у гэтай фантасмагорыі.

Яна ўзяла ліст і пачала чытаць. Вочы яе сталі вялікімі.

– Прабачце, я дрэнна ведаю нямецкую мову. Адкуль у вас гэта? Можа, я не так зразумела?

Касачэўскі пераклаў.

– Адкуль? Што гэта такое?

– Я сёння атрымаў гэты ліст непасрэдна з "Лятучага Галандца", у моры.

Настала яе чарга аслупянець.

– Што гэта, жарты? Хіба гэта магчыма?

– Нічуць не больш, чым у цэнтры сучаснага горада сустрэць здань, якой амаль трыста год, жывую здань.

Яна задумалася, пасля ціха сказала:

– Так, гэта не менш дзіўна. Гэта... як лёс. І ўсё ж гэта толькі непаразуменне.

Касачэўскі толькі тут разгледзеў яе твар. Добры прамы нос, рот цвёрды, з гумарыстычнай складкаю, у агромністых шэрых вачах скачуць вясёлыя чорцікі. Вейкі доўгія, загнутыя бровы стрэламі, свае, нявышчыпаныя. І гордая пасадка галавы. Відаць, што дзяўчына з

характарам. Дзіўна толькі, чаму такі знаёмы-знаёмы твар, такія да апошняга знаёмыя прыгожыя рухі.

– Недзе я вас бачыў... І ведаю, што не знаёмы.

– Напэўна, у мінулым жыцці.

Касачэўскі пакрыўдзіўся. У яго таксама быў характар, хоць сам ён выгляд меў вельмі вясковы, немудрагелісты, – як рубель для сена.

Магчыма, гэта і прывяло да наступнага. Адчуваючы, што жарты завялі надта далёка, яна сказала:

– Там вы біліся за мяне на турніры.

– Які ў мяне тады, быў, аднак, дрэнны густ, – злосна сказаў Касачэўскі.

– Ого! Гэта пачынае мяне цікавіць. – Яна нахіліла набок галаву. І раптам дадала вельмі проста і шчыра:

– Ведаеце што, раз ужо так атрымалася, дык пасядзіце тут. Мне хочацца выявіць усё да канца. Я зараз

згатую чай.

Касачэўскі зняможана сеў на крэсла ля стала. Яна выйшла. Чортава асоба! Штохвілінна новы характар, новы чалавек. Глупства, вядома, сядзець тут і пасля такой прэлюдыі папіваць чаёк, але ж цікава ведаць, чым гэта скончыцца.

За чаем яна тым самым спакойным і даверлівым тонам спытала:

– Што ж гэта такое было? Раскажыце мне падрабязна.

Лявон нічога не ўтаіў.

– І вы адразу пайшлі сюды? – Яна глянула на яго з цікавасцю, як быццам упершыню пабачыла.

– А вы што зрабілі б на маім месцы?

Яна задумалася, паціраючы пальцамі скроні:

– Таксама пайшла б. Адразу ж. Такое бывае раз у жыцці... Але напэўна ніхто больш не пайшоў бы. Гэта рэдкасць. Для гэтага трэба вельмі верыць у жыццё, у тое, што яно не падманіць.

Яна ўсё больш цікавіла Лявона.

– Хто ж вы такая?

– Я Марыя, – сказала яна, глянуўшы на яго глыбокімі вачыма. – Я сапраўды Марыя. Шкода толькі, што не тая. Я артыстка Марыя Якубовіч. Вы рэдка бываеце ў тэатры?

– Дык вось дзе я мог вас бачыць! Я толькі ніяк не думаў, што вы тут.

– О, справа простая. Няўжо вы не чулі, што Чарада напісаў новую гістарычную п’есу?

– Баюся, што я апошні год быў надта заняты сваімі справамі. Чуў нешта такое. Назва, здаецца, “Краіна палае”?

– Так, з часоў пасля паўстання Вашчылы. Цудоўная рэч! Вы колькі тут ужо?

– Амаль тры месяцы.

– Ну дык вы тады і ведаць не можаце. Вырашылі круціць па п’есе фільм. А там палова сцэн тут, ля балтыйскіх берагоў, куды ўцякае герой. Ён вязе морам зброю.... Простыя людзі дапамагаюць яму. Пасля ён знікае на доўгі час. Нявесту яго прымушаюць выйсці за другога, і яна выпівае атруту. Вось гэтую сцэну вы і чулі выпадкова.

– Чакайце, няўжо сцэнарый у вершах?

– Што вы. П’есу пакуль што не ўзяліся ставіць. Але я маю звычай чытаць усё, што датычыцца героя. Дакументы, успаміны, іншыя творы пра яго. Ну і ролю гэтую цалкам вывучыла. Так мне лягчэй. Да таго ж, я думаю, што пасля таго як фільм выйдзе на экраны, п’есу будзе ставіць наш тэатр. Спахопіцца...

– Я думаю, што гэта будзе здорава, – шчыра сказаў Касачэўскі. – Роля ў вашых магчымасцях. Добрая будзе штука.

І калі яна раптам глянула на яго падазрона, ён шчыра разрагатаўся.

– А я... а я, дурань, ледзь не паверыў немажліваму. Чорт яго ведае, думаю, калі лісты перадаюць з “Лятучага Галандца”, калі захаваўся гэты дом ля старой вежы, – чаму, думаю, не жыць у ім ценю былога, які пражыў тры стагоддзі і якраз збіраецца атруціцца.

Яна глянула на яго сур’ёзна:

– Не трэба смяяцца з гэтага. Каб я не бачыла, што вы на хвіліну ўсур’ёз паверылі, я адразу выгнала б вас за дзверы. Можа, вы і не такі чалавек, але за гэтую хвіліну вам многае даруецца.

– Ваша праўда, – пасур’ёзнеў Лявон. – Але ж гэты карабель...

– І гэта проста, вельмі проста. Калі ехалі сюды, многа гаварылі пра тое, што патрэбен карабель. Напэўна адшукалі недзе старую пасудзіну, адрамантавалі, падгрыміравалі пад старажытнасць – і вось яно ўсё і адбылося.

Лявон пасуравеў:

– Дык, значыцца, гэта ўсё нечы жарт. Дурны жарт, нявартый сапраўднага чалавека. Я, вядома, не верыў, але ўсё ж...

– Але ўсё ж у глыбіні душы вашай жыла вера. І гэта добра.

– Гэта мне пакаранне, – сказаў Лявон. – Я занадта замкнуўся. Дзюны, мора, захад сонца, кнігі. У бойцы з рэалізмам я адхіснуўся ад апошняга і атрымаў па галаве... Дрэнна мне, крыўдна...

Яна разззлавалася:

– Прабачце, але гэта лухта. Усё адбылося як трэба. На хвіліну мы паверылі, што казкі будуюцца не на пяску. Як вам не сорамна крыўдаваць на жыццё? Мне бывае больш цяжка: няма на свеце людзей больш празаічных, чым артысты. Яны рэалісты да самага нутра, бо палац прынцэсы для іх – проста палаценца з груба наляпанай фарбай. Яны добрыя людзі, і ўсё ж з імі вельмі цяжка, – даводзіцца хаваць душу і выглядаць дзікай коткай.

Лявону стала сорамна. Ён паказаў сябе слабейшым за гэтую дзяўчыну. Таму ён проста сказаў:

– Я начытаўся старых балад. Яны чароўныя. І раптам атрымалася ўсё, як у іх:

Карабель плыве ў чароўным сне.
Трыста год не прыходзіць спакой.
Хай нявеста больш не чакае мяне,
Хай засушыць мірт, што чакае мяне, –
Мы не вернемся болей дамоў.

Я іду за гэтай жывой легендай і вось...

Марыя ўсміхнулася:

– І дзякуй богу, што так. Лёгкі налёт легенды – гэта добра. А ўся легенда ў нашыя дні – гэта смешна. Ну ўявіце сабе, што вы адшукалі б тут чатырохсотгадовую дзяўчыну, а я пабачыла б марака ў панцыры, пабітым іржою. У яго, вядома, была б нежыць, бо нельга трыста год правесці ў тумане на палубе і не захварэць абрыдлівай, хранічнай нежыццю. Напэўна, ён звярнуўся б да мяне так: “Адчыдзіце бде, гэта я, дяшчасды жадіх”.

Памаўчала хвіліну:

– Не, голай легенды ў нашы дні не можа быць. Але каб мы не зачарсцвелі душой, каб не сталі людзьмі, у якіх толькі і ёсць за душою, што зарплата, яна павінна быць патроху ва ўсім: у кавалку хлеба, у таўстуне, які сядзіць, гледзячы на паплавок, у метале пад молатам, нават у тым, што чалавек часам бяжыць на бераг лясной пратокі і запальвае вогнішча, як тады, калі легенд было многа, а хлеба мала.

– І нават у тым чалавеку, які ўрываецца ў чужы пакой і пудзіць яго жыхароў, якія зусім не думаюць піць атруту.

– Нават у тым, – проста сказала яна.

– І гэта вельмі-вельмі добра, – зусім ужо суцешыўся Касачэўскі.

Абаім стала лёгка і весела, калі ўсё цяжкае засталося ў мінулым.

– Піце, чай, – сказала яна. – Ахалоне. І ўсё ж гэта вельмі дрэнны жарт. Так можна і забіць у чалавеку добрае.

– Гэта не так лёгка зрабіць, – цвёрда сказаў Касачэўскі.

– Жарт задуманы грунтоўна, разважліва і... злосна. На гэта некаторыя нашы сябры вялікія мастакі. І за гэта я іх вельмі не люблю. Не люблю пшутаў і нахабнікаў. Вонкавы лоск, вытанчаная прыгажосць – фу!

– Пакіньце, Марыя Сяргееўна, – мірна сказаў Лявон. – Я не крыўдую. Ну іх! Я нават рад. Горш было б, каб яны накіравалі мяне на вялікую кухню і я там аддаў ліст першай-лепшай Марыі, а пасля мяне адвезлі б у дом для вар'ятаў.

– Вы не разумееце, – сказала яна. – Гэты жарт задуманы як палка на два канцы. Яны далі не першы – лепшы адрас, а менавіта мой, бо ведалі яго. Хацелі стукнуць не толькі па вас, а і па мне, бо я заўжды смяюся над сантыментамі, мяне лічаць за асобу рэзкую і жорсткую, якая не належыць да пароды коцікаў, якіх гладзяць, а яны зажмурваюць вочы ад асалоды.

– Праўдзівей кажучы, вы проста не жадаеце з імі быць такой, – зазначыў Касачэўскі.

Яна не стала прыкідвацца:

– Так, мне проста брыдка. Гэтыя рукі дабіваюцца ўсяго самастойна.

– І гэтым рукам будзе вельмі цяжка, – дадаў Лявон.

– Затое сэрцу гэтаму будзе лёгка. А рукі, што ж? У мяне яны здаровыя, мужыцкія. Смешна мне было б прыжмурваць вочы. Вось чаму я і трымаю сябе так: някепская артыстка і вельмі непрыемная асоба. Рэжысёр Грабоўскі наогул лічыць мяне мужычкай і памялом у сукенцы... пасля аднаго выпадку.

І дадала з выразным націскам:

– Прывабны, пераканаўчы такі кавалер.

Касачэўскі чамусьці заўсёды абараняў нават несімпатычных яму людзей.

– Пакіньце. Ён не такі ўжо благі хлопец, як я чуў.

– І гэта праўда. Я яго не за тое не люблю, што ён дрэнны, а за тое, што ён прыкідваецца такім. Гэта кепска, калі чалавек бравіруе разбэшчанасцю, якой у яго няма. Значыцца, ён слабы ў душы і не хоча быць мужным насуперак асяроддзю.

– Адкуль вы родам? – з усмешкаю спытаў Лявон.

– Мсціслаўская.

– О, мсціслаўцы – недасекі. Зразумела, адкуль у вас такі язычок. Гэта народ, што на сваёй лаве не памірае.

– А вы адкуль?

– З Магілёва.

– О, – у тон яму сказала Якубовіч, – тады зразумела, адкуль у вас такая даверлівасць. Гэта вы, здаецца, студні салілі?

– Я асабіста – не. Мне чамусьці здавалася, што капуста проста са студні будзе нясмачнай.

– А-а, тады гэта вы, напэўна, у Вільні сваю варону пазналі і кулагу на локці мералі. Вельмі прыемна.

– Пашкадуйце, – узмаліўся Касачэўскі. – Не буду больш.

– То-та ж бо, – важна сказала яна. – Ведайце, як мсціслаўцаў чапаць.

І зноў яны разрагаталіся.

– Між іншым, не такія ўжо мсціслаўцы злыя на язык, – сказала яна. – Я нідзе не бачыла такіх добрых людзей, як у нас.

Раптам пасур’ёзнела:

– Часам вельмі хочацца туды. Абрыдне бойка, абрыдне быць больш злой, чым на самай справе. Хочацца цішыні, мяшчанскай бальзаміны на вокнах.

– Я ведаю, – проста адказаў Лявон. – Толькі чаму такая назва “бальзаміна”? Яе ў нас лепей завуць: “Слёзы Алёнчыны”. Яна плача перад дажджом, бо яе калісьці, калі была яна дзяўчынай, выганялі ў зрэб’і на асенні дождж пасвіць каровы. Бог злітаваўся над ёю, ператварыў яе ў кветку.

– Добрая літасць, – іранічна і смутна сказала яна. – Хочацца туды. Напэўна ва мне ў глыбіне сядзіць звычайная вясковая баба, якой бы грады палівацць або сена варушыць. Гэта добра ці не?

– Гэта вельмі добра. Я часам думаю, што таму мы такі моцны, трывалы народ, што праз усё наноснае ва ўсіх нас сядзіць звычайны мужык альбо баба. І культура, здаецца, і вытанчанасць, і размова пра Сомерсета Моэма, а павеяла сенам – і хочацца бабе басанож на траву; павеяла небяспекай – і празмерна культурны мужык лаецца беларускімі праклёнамі. Гэта сапраўднае, гэта, як у лялькі-матрунцы: самая сярэдняя – самая **наша** лялька. Так што не трэба непакоіцца.

Якубовіч раптам звяла бровы.

– Прабачце, я такая нецікаўлівая... А магчыма, і проста не хацела запытаць... З кім, уласна кажучы, я размаўляю?

Лявон нахмурыўся.

– Гэта, магчыма, было і лепш. Як у вагоне: асабліва лёгка размаўляецца, бо не ведаеш, з кім.

– Але ж гэта не таямніца?

– Не, вядома. Маё прозвішча Лявон Касачэўскі.

Звычайна за гэтым ішло трохі здзіўленае “о-о” і пасля пусценькі шчэбет. Менавіта так было з Анэляй, і таму Лявон не любіў і баяўся

свайго прозвішча. Ён лічыў, што яго трэба прымаць такім, які ён ёсць, а вершы – гэта другараднае.

Але ён памыліўся, яна не глянула на яго з большай цікаўнасцю, чым дагэтуль. Сказала проста:

– Я чытала. І “Ветракі”, і “Ignis nocturnis”, і іншыя. Але партрэта ва ўсіх вашых кнігах чамусьці не было.

– А-а,– ён махнуў рукой,– каму гэта цікава?– І заварушыў пальцамі ля галавы, зрабіўшы задуменны твар.– Паэт павінен быць вось такі... А такога, як я, і чытаць не будуць. Таму і хітрую. Не люблю сябе.

– Вам не трэба скардзіца на аблічча. У вас звычайны твар бялявага вясковага хлопца. М-м... не вельмі прыгожы, але харошы.

– Сказалі б хоць “мілы”, – засмяяўся Лявон.

– А вам што, вельм хочацца? Не, ён у вас нават не мілы, проста добры.

Калі ён выходзіў, яна вывела яго на сходы. Раптам сказала:

– А хто вам падстроіў гэты жарт, я бадай што ведаю... Які ён з’едлівы чалавек! Гэта ён і са мною думаў. Ну, няхай чакае.

– Ліха яго бяры, Марыя Сяргееўна.

– Мне не за сябе крыўдна, мне крыўдна за вас. – І сур’ёзна дадала: – Над вамі нельга жартаваць. Вы для гэтага занадта сапраўдны.

Лявон спусціўся на дзве прыступкі, так што твар яго апынуўся на адным узроўні з яе тварам, павагаўся трошкі і, адчуваючы, што не можа пайсці адсюль проста так, сказаў:

– Мы не павінны цяпер выпусціць з-пад увагі адно аднаго. Гэта будзе... проста жахліва.

Яна глядзела ўбок:

– Заходзьце, я буду рада.

Лявон выйшаў на вузкую ціхую вуліцу крыху прыгаломшаны. Вецер адразу растрапаў яго валасы, паімчаў далей, салёны, марскі.

– Чалавек думаў, што досыць з яго, што ён апёкся. Чалавек – дурань.

Малады чалавек са стракатым гальштукам, што зноў аціраўся вулкаю, паглядзеў на яго засяроджаны твар і хіхікнуў яму ў спіну. Лявон не заўважыў.

IV

Бурштынавае мора стала цёмна-бутэлечным, і першыя агні загарэліся ў гавані, калі Лявон падагнаў шлюпку да прычала і дапамог

Марыі Сяргееўне выйсці з яе. Іх пахіствала, твары сталі зусім бронзавымі. Ад солі і цяжкіх вёслаў у Лявона гарэла скура на руках.

Гэта было праз два дні пасля іх першай сустрэчы. Цэлы гэты дзень яны правялі на беразе, а пасля ў моры. Цяпер быў толькі позні вечар, шапацелі дрэвы. Жахліва хацелася есці.

Калі праходзілі паўз рэстаран, з веранды якога лілося на пясок няяркае святло, Касачэўскі прапанаваў:

– Зойдзем?

– Мне прапаноўвалі, – сказала яна. – Я ніколі не хадзіла. Не люблю. Але...

Яна паглядзела на яго твар, што раптам зрабіўся няшчасным.

– Добра, зойдзем. Толькі сядзем убаку, ціха.

Стары афіцыянт-латыш правёў іх на веранду і пасадзіў за столік, у куток. Грала ціхая музыка, вецер шапацеў накрухмаленымі абрусамі. Праз шкло келіха клаўся на твар Марыі блакітны адбітак. Яна сядзела, закрыўшы вочы. Напэўна стамілася. А ён сядзеў і глядзеў на яе і нечакана падумаў, што вось век бы так сядзець і глядзець на гэты зусім просты твар.

– Пра што вы думаеце? – спытаў ён.

Яна расплюшчыла вочы, усміхнулася:

– Я думала пра тое, што гэтыя дні – добрыя дні. Я стала вельмі моцнай. Я ведаю цяпер, што ёсць на зямлі мары і добрыя прывіды. А пра што думалі вы?

– Я думаю, што жыццё маё было бедным да гэтых дзён, што я быў ёлуп і хлапчук, пакуль не атрымаў гэтага ліста з казачнага карабля.

– Не трэба, – ледзь чутна сказала яна. – Гэта проста выдумка, нас выдумаў другі чалавек.

– І добра, – рашуча адказаў ён.

У гэты час пачуліся громкія галасы ля дзвярэй: у рэстаран уваходзіла новая кампанія, ужо злёгку падпіўшы.

Яны селі непадалёку ад іх, за сцяной кветак: Грабоўскі, даўні малады чалавек з занадта калматай канадкаю, “грыбазвон” і... той самы хлопец са стракатым гальштукам, якога Лявон сустрэў тады на вуліцы, ля Марыіных дзвярэй. Яны смяяліся, размаўлялі, але іхняя весялосць здавалася Касачэўскаму такой ненатуральнай, што ён скрывіўся, як ад болю. Марыя ўзяла яго за плячо.

– Не трэба так.

Галасы выбухнулі смехам: ад дзвярэй ішоў Моршч, маленькі, смешны, з памятым тварам. Кінарэжысёр махнуў яму рукою, запрашаючы за стол. Моршч усміхнуўся, сеў.

– Дзе ты быў, стары? – спытаўся Грабоўскі.

– У Мінск ездзіў на тры дні, справы былі.

– Хо, душа цёмная, дык, значыцца, ты нічога не ведаеш? Мы тут добра пазабаўляліся, напэўна ўвесь Мінск смяяцца будзе.

– Вось Вінцук яшчэ не чуў, раскажы яму, – папрасіў “грыбазвон”. – Смяяцца будзеш, сэрца маё.

Грабоўскага не трэба было прасіць. Ён зручна сеў, паглядзеў на памяты твар Моршча і закурыў:

– М-ну, сынок, ты памятаеш нашу спрэчку наконт Лявона. Мы тады вельмі раззлаваліся на цябе. Памятаеш, як ты казаў пра каханне, што як удар бліскавіцы, пра казачных прынцэс і пра тое, што ў Касачэўскага асаблівы зрок на казку ў жыцці, а мы з тобою каратказорыя, бо не бачым гэтага, незвычайнага, у кожнай рэчы.

– Так, – сказаў Моршч. – Магу напомніць: “Выпадак, які для нас проста смешны, для яго паўстае ў такім павароце, што ён бачыць: гэта казка, гэта паэзія... Таму што ён жыве. А мы...”

– Ну хопіць, хопіць. Скажы яшчэ, што мы толькі жывацеем. Вось мы і вырашылі разыграць яго, каб стаў твар у твар з жорсткай рэчаіснасцю, афарбаванай пад казку. Я ж кажу: мара заўжды разаб’ецца аб жыццё, як шклянка аб .чыгун.

– Ну, – непрыхільна прабурчаў Моршч.

– Ну і вырашылі стварыць яму такія умовы і паглядзець, што з гэтага будзе. Ты ведаеш, мы з гэтай старой пасудзіны зрабілі цудоўнае судна, сапраўдны даўні брыг. Для кіназдымак проста ідэальны: прыгожы, рухлівы, імпэтны. Аж у маім сэрцы нешта варухнулася, як пабачыў... А ідэю я ўзяў з той кнігі, што ляжала ў яго на стале: “Лятучы Галандзец” часам перадае на бераг лісты да людзей, якія даўно памерлі. Мы ведалі, дзе паддоследны бывае па начах.

Касачэўскі спуджана паглядзеў на Марыю. Вось нечакана нарваліся.

Яна сядзела ў белай сукенцы і жакеце, у белых туфліках, сядзела вельмі спакойна. Слухала. Лявон падумаў, што пайсці зараз адсюль нядобра, атрымаецца, што ён спудзіўся размоў аб сабе. Таму змаўчаў.

А Грабоўскі вёў размову далей. Кіўнуў на “грыбазвона”.

– Валодзя вось звярнуўся да бутафора, і яму адбухалі геніяльную пісульку, цалкам натуральную. І бутэльку далі старую. Вырашылі мы падпільнаваць нашага хлопца ў моры і паглядзець, што будзе.

І ён прачытаў крытыку тэкст ліста. Моршч пажаваў вуснамі. Пасля каротка спытаў:

– Да каго быў ліст?

Грабоўскі ўсміхнуўся, юнак з канадкай пырснуў:

– Да Марыйкі Якубовіч. У дом ля вежы.

– Чаму да яе?

– Ну-у так, бо гэта чалавек рэзкі. Вось.у кім я ўжо рамантыкі ані на шэлег не бачу. Цікава было іх звесці.

– А я ведаю, хлопча, чаму ты да яе яго направіў, – падазрона спакойна сказаў Моршч. – Аскандаліўся ты тады з ёю, непераможны кавалер, як дарэчы і яшчэ той-сёй. І вось за адсцябаную годнасць помсціш. Эх ты, не ў гэтым мужчынскае самалюбства, не ў тым яно.

– Ідзі ты… – кіўнуў Грабоўскі. – Многа ты разумееш. Проста гонару залішне, уяўляе сябе прынцэсай. А я ўпэўнены, каб захацеў – была б яна маёй жонкай. Толькі не такі я дурань, каб столькі сіл на гэта траціць. Ну ты надумай: ніякай жаночай прывабнасці, рэзкая, пырхае на ўсіх, як дзікая кошка. Твар каменны. У рэстаран пайсці, на чаўне паехаць – ані-ні! Ды яшчэ і адчытае, абрэжа.

Касачэўскі вельмі спакойна сказаў:

– Зараз я пайду, набю яму морду.

Хацеў устаць – яна ўладна паклала яму далонь на руку.

– Не трэба, мілы вы чалавек. Такую насалоду вы можаце дазволіць сабе другім разам, калі захочаце. Слухайце, яны ж нічога дрэннага пра мяне не скажуць, нічога рэальнага. Няхай лаюцца. А адносна таго, ці падобна я на “дзікую кошку“, калі бываю з сапраўднымі людзьмі, мяркуйце самі. Слухайце. Гэта цікава.

– Не падабаецца яна мне, – гуляў голасам Грабоўскі. – Дасціпная жанчына – гэта нядрэнна, але дасціпная дзяўчына – жахлівая рэч. Словам, не падступіся. Вырашылі мы, значыцца, звесці рэзкую, незразумелую і ганарлівую асобу з нашым “пуэтам“. А тут якраз пробны рэйс нашых начовак. І якраз раніцай. Легендарны туман вісіць. На другім заходзе налезлі проста на яго, ляжыць у чаўне. Я пачынаю вярзці розную лухту, абы было надобна на галандскую мову. Мёртвым такім голасам.

Малады чалавек з канадкай засмяяўся:

– А я таксама падрыхтаваў ролю. Чуў, што нямецкую ён ведае…

Грабоўскі падхапіў:

– І вось Васюк пачынае благаць і стагнаць: “нявеста“, “пусціце”, “яна тут“. Я яму буркаю螺 рознае глупства. Гляджу, чалавек у чаўне ўстаў і крычыць: “Пусціце яго“. Зусім ашалеў хлопец.

– Не ад жаху ашалеў, – спакойна заўважыў Моршч.

– Усё адно. Тут Васюк шпурляе бутэльку – яна падае ў ваду. Мы праплываем далей. Я ўжо бачу, што Васюк ад смеху курчыцца, але

нічога, вытрымка ёсць, іграе ролю. Дурасць нейкая на яго найшла. Калісьці грэкі плылі ля берагоў Сірыі і пачулі на беразе крыкі: “Тамуз! Тамуз! Бог Пан вялікі памёр!“ Не ведаю, што Васюку забрыло ў галаву, толькі і ён пачынае крычаць тое самае: “Тамуз! Тамуз! Панмегас тэфнеке!“ Смяецца нутром, а крычыць так, што валасы дыбам устаюць.

– Добры акцёр, брат, і... вялікае быдла, – сказаў Моршч.

– Ну, у цябе гумару ніколі не было... Адплылі мы далей і ад смеху качацца па палубе пачалі. Паміраем проста. Васюк так скіснуў, што ўжо хрыпіць толькі.

– А далей? – спытаў крытык.

– Чакай, брат, чакай. Ля таго дома, дзе яна пакой часова наняла, у нас вось Пятро дзяжурыў. Вырашыў хоць тыдзень сядзець. – Грабоўскі засмяяўся. – Але чакаць яму доўга не давялося. Гадзіны з тры прайшло, аж бач, ідзе галубчык, даверлівы, як цялятка. Нырнуў у яе пад'езд – Пятро чакае. Гадзіна мінула – Пятро чакае. Цікава, у якім выглядзе ён пабачыў старадаўнюю фею. Дала яна яму там, напэўна, чосу, як мне калісьці, таму што выйшаў ён стуль разгублены, як мыла з'еўшы. Ну, ці не смех гэта? А яна ўчора была на месцы здымак такая сур'ёзная, што проста жах бярэ. Не жадаў бы я быць на месцы Лявона.

Кампанія зарагатала. Моршч паківаў галавою.

– Свінні вы, – пераканальна заявіў ён. – Паршывыя свінні! Разбілі мару чалавеку. Яшчэ адной добрай ілюзіяй менш на зямлі.

Музыка заіграла вальс. Марыя нясмела сказала Лявону:

– Мо патанцуем трохі?

Лявон кіўнуў галавою, згаджаючыся. Хваля захаплення гэтым маленькім, цвёрдым дзяўчом абліла ягонае сэрца. Якой трэба было ёй быць цвёрдай, каб усе гэтыя гады так стаяць на сваім.

Ён вывеў яе пад руку з-за фікусаў, і яна нясмела паклала яму руку на плячо. Яна нават не глянула ў той бок, дзе сядзела кампанія.

– Чорт пабяры, – сказаў у захапленні Лявон. – Сапраўдная рэдкасць вы, вось што.

Ён паглядаў скоса на кампанію і бачыў, як яны вырачылі вочы, калі ён, дачакаўшы такта, вывеў дзяўчыну на сярэдзіну пляцоўкі. Валасы Марыі на паваротках ледзь адчувальна датыкаліся да яго шчакі.

І глядзела яна на яго з кранаючым даверам, такімі дзіцячымі, зачараванымі вачыма, што ў Лявона сэрца зайшлося ад радасці і жаху: а раптам ён не варты гэтага, не апраўдае гэты давер.

Ён бачыў, што і тыя, за сталом, заўважылі гэта. Грабоўскі заскроб шчаку кончыкамі пальцаў, і ў голасе яго адчулася небывалае здзіўленне:

– М-да.

– М-да, – у тон яму, але з’едліва працягнуў Моршч.

– Пажартавалі, – сказаў Грабоўскі.

Запанавала маўчанне. Пасля Моршч рэзка кінуў:

– Так, пажартавалі. Бачыце цяпер ці не? Права на казку прадалі, а гэты чакаў – і дачакаўся. Я ж казаў, што вы застанецеся ў дурнях нават і з практычнага боку.

І з’едліва:

– Вялікі сэрцазнаўца, рэжысёр. Не мог душы гэтай дзяўчыны разгледзець. А гэты, паэцік даверлівы, ёлуп у сардэчных справах – гэты разгледзеў. Варта было, бо гэта... ах, якая дзяўчына! “Купілі“ што называецца чалавека, зрабілі яму горш сваім неразумным.жартам. Над кім, пытаюся я вас, будзе цяпер Мінск смяяцца, га?

Грабоўскі пачырванеў. Сядзеў, не зводзячы вачэй з танцуючай пары, на якую многія ў рэстаране пазіралі цяпер з адкрытым захапленнем.

– А глядзіць як, – сказаў ён, – вось каб на мяне...

– Рылам не выйшаў, – падкалоў крытык. – Не для цябе кармушку ставілі.

Калі яны адыходзілі з рэстарана, Грабоўскі спыніў Моршча і вельмі ціха сказаў яму:

– Даруй, Вінцук, я быў дурань і, шчыра кажу, свіння. Хочаш, я папрашу прабачэння ў Касачэўскага.

– Нашто? – прагудзеў Моршч. – Ты ж ім горш зрабіў. І не лезь ты да іх, ім зараз і без нашых храп добра.

Грабоўскі прамаўчаў і толькі пасля сказаў ціха і ўпэўнена:

– Трэба верыць.

А Марыя і Лявон даўно ўжо ішлі па беразе мора ўсё далей ад горада. Маўчалі. Ён проста трымаў яе пад руку і ішоў далей і далей ля гэтага мора, што слаба ўздыхала пад бледным паўночным небам.

Толькі пасля сказаў:

– Дзякуй яму, гэтаму дурню.

– Дзякуй гэтаму “Лятучаму Галандцу“, – сказала яна. – Такія вялікія гарады і так губляюцца ў іх людзі. І вось з карабля-прывіду прыйшоў ліст. Добрыя-добрыя старыя начоўкі.

– Вы зусім не такая сёння, – ціха сказаў ён. – Вы такая пакорлівая лёсу, і гэтаму небу, і мору.

– Так, – сказала яна. – Можна хоць тут апусціць рукі, адчуваць сябе звычайнай, слабай дзяўчынай.

Касачэўскі павярнуўся да яе, да любых стомленых вачэй у зорным сяйве небагатага неба.

– Марыя, – цвёрда і любоўна сказаў ён. – Мне не хочацца расставацца з вамі, Марыя. Мы ведаем адно аднаго не тры дні, а трыста год. Ісці другой вуліцай, не ведаць вас, забыць пра вас – гэта будзе няшчасцем.

Яна ў адказ апусціла веі і ледзь чутна абапёрлася на яго руку.

Непрыкметна ўздыхала спакойнае мора, коцячы з глыбінь на пясок ашчапкі янтарнага палаца, разбітага некалі з-за першага на зямлі моцнага кахання. У бірузовым тумане, у лёгкім вэлюме, што ўкрываў сонныя воды, імчаліся недзе ў моры караблі-прывіды.

ІДЫЛІЯ Ў ДУХУ ВАТО

Прыгожы парк, які любіў Вато...
М. Багдановіч

Кіпяць жаданні. І няма жаданняў:
Як вогнішча пад восеньскім дажджом.
М. Заранка

Падала лісце.

Часам пад парывамі ветру лісты асыпаліся тысячамі, і тады нават у паветры чуўся іх шолах. А потым вецер сціхаў і лісты пачыналі падаць па адным.

А зямля паміж дрэвамі шапацела звонка і настойліва; раптам нехта нябачны пачынаў пятляць па апалай лістоце, уздымаючы ў паветра чырвоныя, жоўтыя, зялёныя з лімоннымі пражылкамі лісты.

У гэты празрысты кастрычніцкі дзень Архангельскае здавалася пакінутым, як дача з забітымі вокнамі.

Людзей не было. Была цішыня і закінутасць.

Маладая пара, якая сышла з аўтобуса, не спяшаючыся, увайшла ў парк.

– Што гэта ты з босай галавой? – быццам упершыню заўважыўшы, сказала дзяўчына.

Ён адмаўчаўся. Ішоў поруч з ёю вельмі прамы, глядзеў на свет халоднымі зеленаватымі вачыма. Светлыя бровы насуплены, вялікі рот сціснуты нават занадта характэрна.

Трохі пляскатым носам, жаўтавата-смуглай скурай, буйнай грывай каштанавых валасоў ён вельмі нагадваў льва. І не таго льва, абавязак якога гойсаць па пустыні, а таго, якога аблыталі цянётамі і вось-вось унясуць у клетку.

Таму што на гэтым разумным твары быў дзіўны выраз насцярожанасці, чакання і яшчэ чагосьці.

Добры сэрцазнаўца сказаў бы, што гэта выраз заўсёднай і закаранелай тугі. А яна была птушка-весялушка, маленькая, разумненькая. Скура малочна-белая, валасы занадта жорсткія і цяжкія. Затое вочы былі дзівосныя: вялізарныя, чорныя, з глыбокім бляскам.

Гэтыя двое трымаліся занадта цёпла для брата і сястры, занадта разважна для каханкаў, занадта ўважліва для мужа і жонкі.

Яны апынуліся на ўнутраным двары зачыненага музея, дзе мармуровы Ахіл з манерна-адчыйным тварам трымаў паміраючага Патрокла.

Яны не заўважылі гэтай манернасці і прынялі яе сур'ёзна. Як усім людзям, занадта перапоўненым сабою, ім здавалася, што іншыя таксама адчуваць глыбока і моцна. Нават самотная старая, што дрэмле ў шэзлонгу на тэрасе, нават гэты мармуровы Ахіл.

– Яго знявечылі. Ён зусім не Патрокл, а прыгонны, – сказала яна.

– Так, – згадзіўся ён, – гэты хлопец хацеў будаваць, а яго прымушалі аўсянку сабакам варыць.

– Што ты, ён музыка, – запярэчыла яна, – бачыш, якія пальцы. А наконт аўсянкі твая праўда.

Яны ішлі суцэльным тунелем, які спускаўся ўніз, да грота. І раптам яна з перарывістым уздыхам прыпала да яго.

– Любы, – сказала яна, – мы адны. Як добра!

І падалася да яго з закрытымі вачыма, уся пасур'ёзнеўшы тварам.

Ён цалаваў яе, спачатку стрымана, потым усё больш моцна, усё больш пяшчотна.

Прахожы з тоўстым партфелем у руках адарваў іх ад гэтага карыснага занятку. Прайшоў, пачырванеўшы патыліцай, пакруціў галавой.

– Ну і ну. Р-распусціўся народ.

Яна паглядзела яму ўслед і ціха сказала спадарожніку:

– У яго партфель з мамантавай скуры.

Спадарожнік засмяяўся. Абое пайшлі далей і хутка выйшлі на балюстраду. Безудзельна глядзелі на іх твары мармуровых багоў і герояў. Вільготна зелянеў пад нагамі партэр.

Вусны дзяўчыны раптам склаліся ў манерную ўсмешку:

– У мяне няма рэшпекту да такіх пагулянак. І супірант мой нешта маўклівы. Зусім, відаць, не кахае.

Ён, здавалася, не чуў. І яна зразумела: нешта не дазваляе яму жартаваць.

– Раскажы хаця, як твае справы. Шэсць... не, нават дзевяць год мы не бачыліся, – спытала яна.

– Так. З пяцьдзесят першага.

– І што ты робіш?

– Даганяю. Часу мала. Я і тады зрабіў памылку, што пайшоў ва універсітэт. Я ж любіў жывапіс больш за ўсё. А думаў, што будзе больш карысці.

– Чым займаўся гэтыя гады?

Ён усміхнуўся:

– Жыццё вывучаў. Усялякае было. Спачатку на шахтах працаваў, потым... Ды гэта цябе не павінна цікавіць.

Твар яго перасмыкнуўся, але дзяўчына, здавалася, не заўважыла.

– Мне дваццаць сем, а я амаль нічога не зрабіў. Зараз вось партрэт маці скончу, а потым ёсць у мяне задума. Гістарычная. Іван Вецер, здраджаны сябрам.

Яна ўважліва паглядзела на яго.

– Гэта ў паўстанні?

– Так. Разумееш, здорава павінна атрымацца. Пястрыцкі ў парчы і гэты, пасінелы на снягу. Ядловец такі, разумееш, дымчата-зялёны, неба цяжкае.

– Так, – сказала яна, – гэта было гістарычнае свінства: гарматы супраць бяззбройных... – правяла позіркам па голых мурмуровых фігурах і неяк нават паспешліва сказала: – Бр-р, як ім холадна.

Абое збеглі па прыступках уніз, і тут, у алеі, каля грота Кацярыны, яна зноў прытулілася да яго.

– Пацалуй мяне.

– Не магу, – сказаў ён, – надта ўжо гэтая баба зайздросна глядзіць. Сурочыць, бадай што...

– Не жартуй.

– Ды я і не жартую. Проста небяспечна мне быць з табою. І табе... таксама.

Яна апусціла вочы ўніз. Лімонныя, барвяныя, іржава-чырвоныя лісты клёнаў стракатай мазаікай ляжалі на зямлі. Дзяўчына нагнулася і стала збіраць іх. Хлопец дапамагаў.

– Ты дзе спынілася?

– У сваякоў. Станцыя па Яраслаўскай дарозе.

– Ведала, што я тут?

– Нядаўна даведалася.

– Здзівілася?

– Не вельмі.

Хлопец працягнуў ёй велічэзны, зялёны, у пунсовых кропках ліст.

– Бачыш, прыгожы які... Ты развялася?

– З кім?

– З Барысам.

– Каб развесціся, трэба спачатку выйсці замуж, – сказала яна.

– Гэта праўда.

Зноў пачуўся звонкі шолах у паветры. Яна прыўзняла бліскучыя вочы.

– Мінулае не забываецца. А наша было цудоўным. Ты не пісаў, я разумею, ты не мог. Але потым…

– Што потым?

– Потым, калі… боль прайшоў. Я даведалася, што яны ўзвялі на цябе паклёп, што гэта яны выжылі цябе з універсітэта, і не магла ім даравацъ. Я так чакала, мне было так цяжка.

– Барыс не вінаваты, – сказаў ён, – гэта ўсё Толька, яго дружок. Падумаеш, вакцына супрацьчумная. Змагар. Дбайнік.

Дзяўчына здрыганулася:

– Гэта была вялізная подласць: наклеіць на цябе, такога добрага да людзей, той паршывы ярлык. Але ж ты памятаеш, які быў час? І я адхіснулася ад цябе, паверыла. Потым мне сказалі, што ты абразіў мяне, назваў дурніцай-энтузіясткай…

Хлопец сумна ўсміхнуўся:

– Потым бойка была. Борка стукнуў мяне. І зусім нечакана…

– Ведаеш… гэта ж я вінавата. Гэта я сказала яму, што раней мужчыны ведалі, як ім дзейнічаць у такіх выпадках. Ён пайшоў неахвотна, ён вельмі любіў цябе.

– Цябе ён любіў больш.

Яна не слухала яго:

– А потым Толька вырашыў зрабіць такое. А я не магла памагчы табе. Не знайшлося ў мяне сілы, каб памагчы табе, свайму ворагу, калі ўбачыла такую несправядлівасць.

– Добра, – сказаў ён. – Чаго там.

Насустрач сталі трапляцца хворыя з санаторыя на абрыве. І дзяўчына зноў – у які ўжо раз – заўважала, як спахмурнеў твар прыяцеля.

Ён заўважыў аднаго, высокага, натапыранага, сутулага. Высокі ішоў у самы канец алеі, да апошняга ўказальніка. Крокі даваліся яму цяжка, але, відаць, ён упарта хацеў узяць апошнюю, паўкіламетровую дыстанцыю, якая нібы адна толькі і аддзяляла яго ад выздараўлення. І хлопец раптам узяў дзяўчыну пад руку і хуткімі крокамі павёў яе па алеі.

Хутчэй. Хутчэй. Усё хутчэй.

Яна ішла за ім і не разумела, што здарылася, прыціскаючы да высокіх грудзей ахапак вільготных пярэстых лісцяў.

Чалавек з санаторыя застаўся ўжо далёка ззаду, яны збеглі ўніз па адхоне, па забрукаванай цаглінамі сцежцы, узрытай і ўспучанай карэннямі таполяў, якія прагна прабіваліся да паветра, да жыцця.

Гэта быў ужо не бег, а палёт сярод чырвоных, быццам крывёю аблітых хмызнякоў. Галіны хвасталі іх па руках; двума каметнымі хвастамі ўзляталі за спіной у паветра жоўтыя і барвяныя лісты.

І перад позіркам маладога чалавека ўстаў прывід мінулага: гон двух маладых, здаровых аленяў у нетрах асенняй пушчы. Галінастыя, закінутыя рогі аленя, белая "сурвэтка" яго сяброўкі.

Трубны аленяў крык. Далёкае рэха кахання.

Тады і ён паляваў. Нашто? Гэта вельмі страшна зверу: адчуваць недзе, за кожным кустом, невядомага стралка.

І ўсё ж ён бег, спачатку ўніз, пасля міма спортпляцоўкі, заваленай бронзавымі лістамі, пасля ўгору, па адхоне. І паступова ўсё больш акрыленым рабіўся яго твар. І калі яны спыніліся зноў у алеі, яна, паглядзеўшы на гэтыя крылатыя бровы, на дрыжачыя ноздры, на моцныя, як кавальскі мех, грудзі, ціха сказала:

– Божа, каб жа ты і тады, на тых сходах, быў такі. Ты б іх усіх раскідаў. Ты б і мяне пераканаў...

– Я заўжды баяўся несправядлівасці, пасаваў перад ёю.

– Ведаю. Ты яршысты і злы. І вельмі добры і безабаронны. Я рада, што зноў з табою.

Яна павярнулася да маленькага бюста Пушкіна і кінула да падножжа калоны ахапак лапчастых лістоў, што адразу рассыпаліся веерам.

– Дзякуй табе.

Маленькая язычніца, яна быццам святкавала невядомы абрад. Ёй было ўсё адно, хто перад ёю. Ён даў ёй вочы спадарожніка, і яна была ўдзячна яму.

Мокрыя лісты пахнулі віном.

Хлопец сеў на кукішкі перад помнікам і прачытаў глыбока ўрэзаныя літары:

Ты понял жизни цель, счастливый человек.
Для жизни ты живешь.

І раптам засмяяўся – так шырока і шчыра, што яна здзівілася.

– А Юсупаў так і не заўважыў, што яго абсмяялі. Гэтага часта не заўважаюць.

Дрэвы былі нейкія ненатуральныя. Вільгаць прасякала іхнюю кару, і яны здаваліся чорнымі, абвугленымі ў полымі ўласнай лістоты.

– Глядзі, – сказала яна.

Каля самога партэра было відаць некалькі дрэўцаў, лістота якіх была бледна-зялёнай, але сярод вогненнага індзейскага пажару астатніх дрэў здавалася слаба-блакітнай.

– Феі скачуць, – занурыла яна галаву, – метрэскі Пана. Ведаеш, я заўсёды адчуваю з імі крэўную сувязь. Быццам гэта мяне так...

І яна заспявала на матыў старога пастараля:

Je vous embrasse bien tendrement[1].

Ён з пяшчотай, як на маленькую, глядзеў на яе.

– Намалюй гэта, – сказала яна.

– Ды гэта ж Вато. У горшым выпадку Сомаў... Можна і пасвойму. Ідзе алеяй такі селадон на чырвоных абцасах. Твар зморшчакаваты, прыязна-салодкі, бы арангутана. Адзін арап вядзе яго пад руку, другі ззаду нясе табакерку.

– Не трэба арапаў, – сказала яна, – няхай лепей дзве жывыя красуні. Арапам што! А гэтыя дзве бачылі, як на звычайнай, добрай зямлі чужое вырастала: чужыя тэатры, чужыя палацы, звычаі. Нядобрая, чужая сіла. Страшна...

– Ну, я гэтыя дзіцячыя страхі перажыў, – усміхнуўся ён, – яшчэ тады, калі ты не ведала, што робіш.

Яны паснедалі у бедным кафэ, пасля бясконца блукалі алеямі, моўчкі пасядзелі на лаўцы ў парадзелым садовым цяньку.

І яна сама потым не заўважыла, як перамагла, як, непрыкметна для яго, адвяла яго прэч ад людных алей.

Старая царква ўрасла ў зямлю, праваленыя ямы склепаў былі напалову занесены лістотай і смеццем.

А ўнізе трапятаў залатымі і зялёнымі манетамі ўвесь пранізаны касым сумным святлом бярозавы гай.

З Масквы-ракі павявала журботным грыбным халадком.

Яны спускаліся, несучы за нагамі цэлыя вадаспады, цэлыя лавіны лістоў. Над абрывам навісла выгнутая бяроза. І тут ён прачытаў у вачах дзяўчыны нешта такое, чаго нельга было не заўважыць.

Ён прыхіліў яе спіною да гэтага выгнутага дрэва, прыпаў да яе, абняў, адчуваючы мускуламі пляча яе плечы, а рукамі – шурпата-атласную бярозавую кару.

Паварушыцца было нельга, бо яны абавязкова ўпалі б. Ды ім і не хацелася варушыцца. Ён нахіліўся, пацалаваў яе ў прыадкрыты рот.

І амаль адразу закруціўся віхор, ускінуўся над абрывам чырвоны лісцяны смерч. Хлопец падхапіў яе на рукі, збег уніз.

Міліцыянер, які вечна трапляецца на вочы ў нязручны час і ў самых лепшых месцах, крыкнуў ім наўздагон:

---

[1] Я вас цалую вельмі пяшчотна.

– Не дазволена туды.

Куды там! Яны праімчаліся паўз яго, звярнулі, забарабанілі па мастках, якія ўрываліся ў ціхую затоку, што зелянела рэзкай асакой.

Сонца сядала, сплюшчанае, чырвонае, як апельсін. Кармінам узяліся грабеньчыкі шэрага зыбу там, па-за плёсам.

Плыў ценем на сонцы самотны рыбак, а яны не ведалі, што для людзей на беразе яны таксама толькі два цені, якія спляліся ў адно на фоне пунсовага дыска.

Яна пырснула яму ў твар вадой. Вада пахла рыбай. Дзяўчына кінулася ад яго прэч, як спуджаная лясная каза. У лёгкіх скачках. Амаль не дакранаючыся зямлі, толькі правяраючы, ці тут яна.

І ён гнаў яе, гнаў, захлынаючыся ветрам.

Валасы, што лятуць па ветры, і працягнутыя рукі за імі.

Потым ён кудысьці знік. Яна азірнулася на бягу, яшчэ раз азірнулася расчараваная і стала.

Яго голас даляцеў зверху. Агромністае дрэва амаль лягло над вадой, звесіўшыся з нізкага абрыву. Ён стаяў на ім, недзе сярод галін, і, смеючыся, клікаў яе:

– Ну хадзі сюды. Хадзі ж. Не? Ну то я сам.

І лёгка збег па пахілай галіне, па якой забраўся туды.

Яна кінулася была бегчы, але адразу стала, таму што ўбачыла перад сабою топкае месца. Ён не даў ёй апамятацца, падхапіў яе на рукі, у два скачкі перакрыў балацявіну, вынес на сухі бераг і наблізіў да яе вачэй жорсткія, пірацкія вочы.

– Ну, – сказаў ён.

– Ну, – паўтарыла яна.

І раптам, адразу за гэтым, яна пабачыла ў гэтых вачах спалох, глыбокі бязвыхадны, нават яшчэ большы, чым ля санаторыя, Хлопец апусціў яе на зямлю.

– Што з табой? Задыхаўся?

– Пачакай хвілінку, – глуха сказаў ён.

І, пасля паўзы, зусім іншым голасам сказаў:

– Хадзем да аўтобуса. Там... лес па другі бок шашы.

І, быццам хацеў адвесці яе ад таго, што ледзь не здарылася, дадаў:

– Ён не такі людны.

Надрэчная балюстрада была пустой. За роўняддзю ракі, за паплавамі з манашымі шапкамі стагоў, за сінімі хваёвымі лясамі палымнеў, барвавеў, разліваўся, прарочачы вецер, трывожны захад. Расплаўленае золата, вадкая барва ліліся на зямлю.

І ў гэтай чырвані ўставалі дымныя, наскрозь залатыя і зіхатлівыя контуры нябачаных крамлёў.

Дзяўчына глянула на яго і ўбачыла твар, заліты гэтым нетутэйшым святлом. І ўспамін, упершыню за гэты дзень, нарадзіўся ў яе.

...Капліца ў далёкім гарадку. Бронзавы анёл, што высіцца над галовамі людзей. А пад ім, проста на каменных плітах, раскладзена вогнішча. І адбіткі, дрыготкія, зменлівыя, заліваюць крывёй твар гэтага анёла, робяць яго жывым, пагрозлівым.

З алтара рэзка пахне, – людзей не выпускаюць ужо некалькі дзён, – людзі сядзяць вакол апошняга вогнішча, якое ім дазволілі раскласці. І адна з гэтай купкі паклала руку на галаву дзяўчынкі, на яе галаву, і добрым, бязмерна добрым голасам кажа:

– Мы з табою доўга не пабачымся, донька. Але ты ведай, свае хутка знойдуць цябе. Радзіма цябе не забудзе. Памятай, ты з Расіі. Ты – савецкая. І ў Крамлі ёсць чалавек, які цябе не пакіне.

А потым чыесьці рукі, што пахнуць шорсткім салдацкім сукном, нясуць яе, а здалёк даносяцца нахабныя, грубыя галасы:

“Мадонна, мадонна”.

Яе не забылі.

Дагарае захад, і гэты, з такім самым тварам, трывожна глядзіць удалячынь.

“Пашкадуй мяне, злітуйся, – хацелася сказаць ёй, – расплясці мае косы. Вось я ўся тут, перад табой”.

Але замест гэтага яна павольна пайшла па вузкіх у прыцемку алеях. Ён ішоў за ёй, баючыся згубіць яе ў шэрай імгле.

І толькі каля сходаў тэрасы яна спынілася ля мармуровага льва, нахілілася над ім, глянула скоса на спадарожніка.

– Гэта ты, – сказала яна.

І пацалавала каменную разумную морду.

Ён стаяў каля бялеючага ў змроку сфінкса.

– А гэта ты , – сказаў ён.

І яго рука з трапяткою пяшчотай пагладзіла мармуровую галаву.

Потым яны перасеклі шасэ і ўвайшлі ў гай. Холадна свяцілі ў імгле белыя, як дзявочыя рукі, ствалы бяроз.

Была ціша і спакой.

Ён бачыў, што яе вочы з чаканнем глядзяць на яго. Ён адчуваў, што так больш нельга, што яна выклікае яго на канчатковае рашэнне.

І ён рашуча сеў на пень.

– Слухай, – сказаў ён, – ты ведаеш, чаму я сёння пераганяў хворага?

– Не ведаю. Але ты быццам хацеў давесці нешта...

– І не давёў.

– У чым справа? Ты сёння такі дзіўны. Ты не можаш мне даравацъ мінулага? А я ж...

– Глупства, – сказаў ён, – ты проста нічога не ведаеш. А між тым я скончаны чалавек. У мяне ангіна пекторыс. І незвычайна моцная.

– Што гэта? – спытала яна. У самых гуках гэтых слоў падалося ёй нешта пагражальнае.

– Гэта хвароба. Грудная жаба. Яна звычайна ў старых. Зрэдку-зрэдку ў маладых, якія не па сіле працавалі і шмат перанеслі... І мне такая радасць. – Ён памаўчаў, потым дадаў: – Страшна. І сам гіпнатызуеш сябе...

– Як гэта?

– Пакуль у кішэні лекі – прыпадкі радзейшыя. Але варта забыць іх дома і толькі прыгадаць, як страх, – і амаль заўсёды прыпадак... Часам у пакоі не хапае паветра. Хочацца выбіць вокны. Напэўна, гэта адна секунда, але здаецца – вякі.

– Родны мой, – яна апусцілася перад ім на калені, – гэта ўсё я вінаватая.

– Пры чым тут ты?

– Але ж я зараз зусім, зусім не тая.

– Не трэба, – сказаў ён. – Не думай, што я складаю лапкі. Я адчайна змагаюся, я вельмі, вельмі хачу жыць...

Ён маўчаў, і дзяўчыне на хвіліну здалося, што твар яго свеціцца знутры нейкім дзіўным святлом.

– Я Тольку і іншым гэтага дня ў Архангельскім не дарую, – сказаў ён.

– Але ты забываеш , што я з табою... Я ж кахаю цябе.

– А я не магу, таму што таксама кахаю. І смерць. І ты – удава. І, напэўна, нездаровыя дзеці...

– Але ж я цябе кахаю.

Яна гаварыла гэта так, быццам хацела пераканаць

– Я павінен працаваць, – сказаў ён. – Я і так амаль загубіў жыццё. За два гады – калі мне іх літасціва дадуць – я зраблю ўсё і тады з лёгкім сэрцам... Я не магу страціць яшчэ і гэта.

Твар дзяўчыны застыў.

– Любая мая, іначай нельга. Я памыліўся. Не трэба было, каб ты прыходзіла, не трэба Архангельскага, алей, гэтага дня. Не трэба

было гэтага. Але што я мог зрабіць? Мне хацелася хоць адзін дзень, як усе, а потым... Я змаладушнічаў.

– А мы маглі б...

– Не.

І, быццам баючыся самога сябе, ён устаў і пайшоў гаем да аўтобуснага прыпынку. Ён пачуў ззаду – ці гэта яму здалося – слабы вокліч.

Потым яна дагнала яго і моўчкі пайшла поруч.

Яны сядзелі на лаўцы, а паўз іх раз-пораз з рэвам праляталі грузавікі, вырываючы з небыцця і зноў агортваючы змрокам ствалы і шаты бяроз.

– В-ву-у, в-ву-у, в-ву.

Потым прыйшоў аўтобус. Пусты. І яны селі ў ім на задняе сядзенне. Кандуктар падала ім білеты, уважліва паглядзела на маладую пару і, перасмыкнуўшы, быццам з марозу, плячыма, села ў другім канцы машыны.

Ёй на хвіліну стала страшна сам-насам з гэтым хлопцам.

Усю дарогу яны ехалі моўчкі. І маўчанне было цяжкім. Першай не вытрымала яна:

– Ды кажы ж ты што-небудзь.

І ён стаў задаваць пытанні, не чакаючы адказаў:

– Ну як жывеш? Як працуецца?

Гэты голас усё яшчэ гучаў у яе вушах, калі яны стаялі на прыгараднай платформе Яраслаўскага вакзала. Ён вырашыў праводзіць яе.

Але лёс, здавалася, апошні раз пайшоў ім насустрач: з рэпрадуктара данёсся браскучы змрочны голас:

– Грамадзяне пасажыры! Па тэхнічным прычынам адыход прыгарадных цягнікоў затрымліваецца. Тым, хто можа дабрацца гарадскім транспартам, раім скарыстаць гэту магчымасць.

– Пачакаем, – упарта сказаў ён.

– Дарагі мой, – ціха сказала яна, – чаму ты адмаўляешся ад кахання, чаму ты так лёгка адмаўляешся ад мяне? Я зраблю бясхмарнымі твае дні, я зраблю так, што табе будзе стакрат лягчэй. Я ўліла б у цябе ўсё сваё жыццё. Я ж кахаю. Я кахаю цябе.

– Ты загубіш сабе жыццё, – сказаў ён. – А я не хачу гэтага. Таму што кахаю. Кахаў нават тады, калі мне трэба было б ненавідзець.

Тагасветны голас з рэпрадуктара:

– Грамадзяне пасажыры. Па тэхнічных прычынах... раім выкарыстаць гэту магчымасць.

– Дарагі мой, мы паедзем адсюль. Будзе цёплае мора. Яно будзе цалаваць ногі. Мае і твае... І ты пабачыш, ты пабачыш, табе стане лягчэй.

– Не трэба, – ціха сказаў ён, – не заваблівай, не дабівай.

– Грамадзяне пасажыры... раім скарыстаць гэту магчымасць.

Яны стаялі так каля гадзіны, упарта чакаючы цягнікоў, якія не пойдуць. І яна гаварыла, гаварыла, верачы ў магію слоў, якія ўжо нічога не маглі змяніць. І словы яе гучалі ў яго вушах пад жалобны, нечалавечы голас з рэпрадуктара:

– Грамадзяне пасажыры... грамадзяне пасажыры... раім скарыстаць гэту магчымасць... раім скарыстаць...

І раптам ён сказаў, гледзячы ёй проста ў вочы:

– А ты мне не верыш. Ты думаеш, я проста не кахаю цябе пасля таго, што было.

Яна пільна паглядзела на яго:

– Не... цяпер веру.

– Грамадзяне пасажыры, – бразгацеў голас у рэпрадуктары.

І тут хлопец паглядзеў на дзяўчыну, быццам упершыню заўважыўшы яе. Убачыў, як яна ўся дрыжыць ад холаду. І востры, ні з чым не параўнальны жаль разануў яго па сэрцы.

– Едзем да мяне. Мы сёння не дачакаемся цягніка. Пераначуеш у мяне.

І амаль бягом павёў яе да прыпынку таксі, прэч ад перона.

Калі яны ўвайшлі ў пакой, дзяўчына бяссільна апусцілася ў крэсла. Ён пстрыкнуў выключальнікам – і за акном адразу ўвесь свет агарнуўся змрокам і непрытульна пацямнелі ствалы напалову голых дрэў.

Яна дрыжала, седзячы ў крэсле. А хлопец замкнуў дзверы, спехам уключыў рэфлектар – у пакоі было халаднавата, таму што яшчэ не пачыналі паліць, – і выцягнуў з шафы ваўняны пуловер.

– Прэч гэта, – сказаў ён, стаючы перад ёй на калені.

Ён адкінуў туфлі ўбок і захутаў яе ногі, з пакутлівым шкадаваннем адчуваючы, якія яны халодныя.

Потым спешна наліў ёй шклянку віна, адчыніў пісьмовы стол. У пакоі адразу разліўся добры, зусім хатні водар саду. Ён выцягнуў усю шуфляду, напоўненую зеленавата-васковымі моцнымі яблыкамі, і паставіў перад ёю.

– Выпі. Еж, – сказаў ён.

Яны моўчкі пілі. У непрытульным змроку за акном, за шумнай цемрай парку дрыжалі гарадскія агні.

І абаім здавалася, што гэта не той няўтульны і любы і пагражальны горад глядзіць у іх пакой, а проста закінуты хутар недзе на краі зямлі, і гарыць печ, і сумуе ў садзе закінуты шалаш вартаўніка, і моцны водар яблык, што аддае вінoм, поўніць усё вакол. Гэты прывід шчасця, немагчымага цяпер для іх, быў такі пакутлівы, што яна сказала:

– Пакажы мне свае работы.

Ён нават з нейкай радасцю адшмаргнуў шторы.

І яна міжвольна падалася назад: з палатна, што стаяла перад ёю, лілося такое трывожнае чырвонае святло, што хацелася закрыць вочы.

Яна зразумела, што гэты водбліск пагрознага не мог быць звычайнай зарой.

Усё было проста: насычанае чырвоным неба, барвовы адбітак у спакойнай вадзе, схіленая пад уласным цяжарам вадзяная чарацінка, што перакрэсліла палосу. Рабілася шкода чагосьці, нешта пагражала, нараджалася ў сэрцы няўмольная любоў.

– Гэта называецца “радзіма”, – сказаў ён.

– Так яшчэ ніхто не рабіў, – сказала яна.

– А вось яшчэ.

Яна ўбачыла пакрыўлены рог дома, акно, з якога, як сцяг, вырывалася фіранка, – відаць, па пакоях гуляла пройма – і двух сабак, якія пілі ваду пад дзіраваю рынай. Убаку трэці пёс, пужліва азіраючыся, капаў сабе ў зямлі нару.

– Гэта называецца “вайна”? – спытала дзяўчына.

– Так.

Потым была бязмежная роўнядзь вады, сусветны патоп, а над ёю юнак, што ўздымаў на руках непрытомную дзяўчыну. Вада ўсё прыбывала, і на твары юнака можна было чытаць:

“Любая, дыхай, пакуль мае вусны не зніклі пад вадой”. І яшчэ нібы чыталася: “Я не баюся цябе, бог! Таму што я чалавек. Нават перад смерцю”.

Яны глядзелі далей. Перад дзяўчынай праходзілі людзі – людзі са спрацаванымі рукамі, людзі шахт, людзі непалітых ніў, маладыя альбо старыя, добрыя ці благія, але ўсе чалавечныя.

– Я ненавіджу смерць, – сказаў ён, – я ненавіджу яе.

– А як ты змагаешся з ёю?

– Глядзі.

На новым палатне быў лес, светла-зялёная, пранізаная сонцам папарацць. І ў ёй, бы ў зялёных аблоках, быццам зусім не

дакранаючыся да зямлі, сутыкнуліся два магутныя кані, счапіліся ў апошняй стычцы два коннікі.

Гэта было зроблена з такою дзікай экспрэсіяй, з такім драматызмам, што міжвольна прыходзіла думка: адзін з іх, той, што ў чорным, нікуды не ўцячэ.

Гэта Ян Прыгожы дабіваў Балотнага Уладара.

Дзяўчына ўздыхнула:

– Ты ведаеш, што ты геній?

– У мяне няма часу на тое, каб стаць ім.

І, апусціўшы штору, быццам адрэзаў:

– Спі.

– Пачакай, я яшчэ пабуду з табою... Трошкі. Я не хачу спаць.

– Добра, – у яго загарэліся вочы. – І я таксама.

Яны яшчэ каля гадзіны гаварылі. І гэта былі ўспаміны, словы аб мінулым каханні, аб тым, што кожны з іх пераклыў потым.

Пасля гэтага ён адкінуў рог коўдры, папраўіў халаднаватую прасціну, узбіў падушку.

– Кладзіся. Я ў суседа, за сцяной. Яго няма. Трэба будзе – пастукай.

Яна запытальна глядзела на яго. Ён паставіў на начны столік графін з вадою, талерку з яблыкамі.

– Піжама ў шафе, калі хочаш.

Твар яго здаваўся каменным. Ён узяў з шыфаньера прыбор для галення, развітаўся і выйшаў.

Яна ляжала ў ложку і доўга чакала. Ён не вярнуўся.

А ў гэты час ён пастукаў у пакой трэцяга суседа і сказаў яму:

– Ты прасіў у мяне брытву?

Добрыя блакітныя вочы пад белымі вейкамі заміргалі:

– Калі? А-а... добра, мне якраз патрэбна.

І хлопец пайшоў у суседаў пакой.

Ён пагасіў святло, выцягнуўся пад коўдраю, адчуваючы сябе, як зрынуты волат.

У цемры праплыў перад яго вачыма белы твар, прызыўныя цені вачніц, голыя рукі паўзверх коўдры.

“Вось яна лягла. Вось упалі на падлогу туфлі. Вось яе глыбокі ўздых. Божа, як я кахаю, як жадаю яе!”

Ён да болю сціснуў зубы.

“Кахаю... І забіваю? Не, яна маладая, здаровая. Гэтыя гады праляцелі над ёй краем. Яна яшчэ можа быць шчаслівай, знойдзе сябра, дзяцей...”

Зноў вырастаў у душы страх.

“Як быццам прыпадак? Выбіць акно? Не. Памыліўся. Горш за ўсё, што яго так і не было за гэты дзень. Толькі прадчуванне. Можа, я перабольшваю? Можа, пайсці да яе?”

Ён чыркнуў запалкай. Трапяткі агеньчык выхапіў з цемры точаную, амаль безвалосую, прыгожае формы руку.

“Жыць бы табе і жыць, рука...”

У цемры мігцеў агеньчык папяросы.

“Здаецца нехта ходзіць па пакоі? Магчыма, прыйдзе сябра, у яго ключы. Адчыніць. А, д’ябал...”

Нейкае падабенства рэўнасці нарадзілася ў сэрцы.

“Пайсці? Не”.

А потым усё гэта перастала быць праблемай.

Так яны ляжалі без сну, кожны ў сваім пакоі. Толькі вузкая перагародка, але ўсё адно што акіяны.

“Працаваць, працаваць, працаваць. Толькі працаваць. Гэта адно”.

Успыхваў чырвоны светлячок.

“Смерць, я не баюся цябе! Я кідаю табе выклік. Я чалавек... Хоць сёння, як грубая жывёла, адштурхнуў тую, што на руках насіў бы ўсё жыццё... Але ж я кахаю яе. Я кахаю яе, кахаю, кахаю!..”

Ён ляжаў, гледзячы ў цемру. А на начным століку нястомна цікаў гадзіннік, адбіваючы бег часу.

СІВАЯ ЛЕГЕНДА

I

Светлейший отец, подавай нам деньгу,
Иль скарб твой достанется в руки врагу.
К.Меер

На пачатку мая ў Быхаў прымчаў на ўзмыленым кані ганец.

Конь зваліўся ля самай брамы замкавай вежы, а коннік пераляцеў цераз яго галаву і, як мёртвы, расцягнууўся ў пылу.

Гэты ледзь жывы чалавек прывёз мне загад майго гаспадара, пана Аляхно Кізгайлы. Я, Канрад Цхакен, павінен быў не марудзячы пакінуць Быхаў і на чале сваіх трох соцень швейцарцаў спяшацца ў замак Кізгайлы. Разам з граматай прыбылі грошы на куплю новых коней і вусны загад аб тым, што жывёлы не трэбы шкадаваць.

На пытанне, што прымусіла пана быць такім паспешлівым і марнатраўным, ганец ледзь здолеў прахрыпець:

– Воўк вырваўся з логава...

Яму ўжо сядлалі другога каня, і праз хвіліну ён памчаў у трэці замак Кізгайлы, у Збароў.

Я не ведаў, хто быў гэты воўк. Але швейцарац, калі яму добра плацяць, не патрабуе паўторнага загаду.

Кізгайлу было пажадана, каб мы загналі коней, – мы загналі іх і роўна праз суткі прыскакалі ў Кісцяні, дзе нас гэтак нецярпліва чакалі і дзе чагосьці так моцна баяліся. Баяліся, аднак мост, на наша здзіўленне, быў апушчаны.

Коней мы загналі бязлітасна, да дыхавіцы. Кізгайла страціў на гэтым не менш сотні залатых. Але гэта была не мая справа. Я, Канрад Цхакен, ураджэнец кантона Швіц, вядома, не так раскідаўся б, але я ўжо дзевяць год бачыў гэтых людзей і ведаў, што ад іх заўсёды можна чакаць самых вар'яцкіх учынкаў, за іх ніколі нельга паручыцца, таму што ў іх вецер свішча ў галаве.

Я жыў сярод іх дзевяць год, часам пачынаў нават думаць па-беларусінску, а ўсё ж ведаў іх ненашмат лепей, чым у першы дзень.

Яны будуць крычаць: "Воўк вырваўся з логава" і ніколі не зробяць ласкі толкам растлумачыць, што здарылася, каб добры хрысціянін зразумеў іх. Як быццам гэта наш абавязак – разумець іхнія тропы і іншасказы? Крый божа, калі сярод іх з'явіцца першы паэт – яны затопяць вершамі ўвесь свет і нікому не дадуць спакою.

Яны трацяць шалёныя грошы на цэлы табун загадзя асуджаных коней – і пакідаюць пад'ёмны мост апушчаным.

Іхнія старыя крэпасці, як Смаляны, Ворша, Магілёў, – страшныя. Я не згадзіўся б абараняць іх нават пад пагрозай пазбаўлення раю (я ўсё адно, бадай што, туды не траплю), нават калі б мне плацілі не пяцьдзесят талераў, а сто. Сапраўды, каб выстаяць за такім плотам, патрэбна вялікая мужнасць і вялікая легкадумнасць. А яны не толькі выстойваюць, але і наносяць страты ворагу.

Яны ўмудрыліся, седзячы ў гэтых быдлячых загонах, адбіцца ад татар і сто год, абяскроўленыя, супраціўляліся Літве – гэтага досыць.

Я кажу вам, ніхто не назваў бы такія загарадкі крэпасцямі.

Аднак гэта не датычыцца замка Кізгайлы. Хто панюхае паветра каталіцкага храма, той ніколі не будзе такі, як раней. А новая знаць нюхнула яго ў ахвоту. Яна будуе такія замкі, быццам у кожны з іх вось-вось могуць прынесці крыж пана бога, які давядзецца абараняць ад усіх язычнікаў зямлі.

Ёсць славуты горад Кёльн. І ў гэтым славутым горадзе ёсць помнік дурасці і непасільнаму пачынанню – недабудаваны сабор. І ёсць паэт Газельберг, які хоць і размаўляе са мною на адной мове, а даволі-такі немалы дурань.

Дык вось, ён напісаў, гэты дурань, аб тым саборы:

Dem wunder deth ich duch nachlduffen.

Sach nie kein grössern stein hauffen![1]

Паглядзеў бы ён на замак майго гаспадара ў наваколлі Кісцянёў!

Над шырокім лянівым Дняпром узвышаецца ўзгорак. Пяць тысяч тутэйшых мужыкоў нацягалі на яго зямлі, узвысілі і ўмацавалі. Цяпер рэчка ўпадае ў Дняпро двума рукавамі. Пасярэдзіне іх – груз-капец. Ён абведзены падвойным валам. А на яго верхавіне шэры каменны гмах.

Часам мне здаецца, што сатана менавіта тут абараняўся ад усявышняга і што менавіта гэты пагорак бамбардзіравалі каменнямі яго анёлы. Чалавеку цяжка ўзвесці такое.

Пад'ёмны мост, брама з падвойнымі кратамі, муры вышынёю ў сорак пяць локцяў. А над імі, яшчэ вышэй, тры вежы.

Імя ім: Саляная, Стралецкая і Жабіна.

Унутры хапае месца для жылля, стайняў, палаца, дзвюх цэркваў і іншага, чаго і не злічыць.

[1] Гэтаму дзіву дзівіўся і я: ніколі не бачыў такой вялікай кучы каменняў.

І гэта звачайны замак двараніна, нават не першага па багаццю і знатнасці. Бог няроўна дзеліць: ён дае порткі менавіта таму, у каго яны будуць спадаць з мізэрнага азадка.

У гэты вечар над вежамі свяціў месяц – такі пяшчотны, аліўкавы, ружовы, – так бы і з'еў яго. А ў байніцах таксама сям-там гарэлі агеньчыкі. І на сэрцы было лёгка, таму што ў нас, ваякаў, ад нараджэння заўсёды лёгка на сэрцы, калі мы жывыя.

У адказ на трохкратны гук нашага рога з вежы над брамай тройчы праспявала дуда, і гукі яе ў майскім вячэрнім паветры таксама былі асабліва сумнымі і празрыстымі. Гэта было такое паветра, што яго хацелася піць.

Хрушч ударыўся аб маю кірасу і ўпаў на грыву каня, бездапаможна перабіраючы лапкамі.

Хрушчы на гэтай вар'яцкай зямлі зусім такія, як на маёй радзіме, – гэта трохі прымірае.

На майго каня ўпаў прамень святла са спадзорнага акна.

– Хто ідзе?

– Святы Юры і Русь,– сказаў я звычайны кліч воінаў гэтай зямлі.

– Дзякуй богу, – стаў жагнацца вартаўнік брамы. – Чакалі вас.

Пачалі круціць калаўрот, разышліся акаваныя жалезам дубовыя форткі, павольна папаўзла ўгору рашотка.

Нас сустрэў сам гаспадар – рэч небывалая. Я недарэмна намякаў на людзей, у якіх спадаюць порткі. Кізгайла якраз такі. Яму трыццаць чатыры гады, і ён худы, як бядняцкая каза. Але моцны і жылісты.

Ён паспрабаваў узяць майго каня за повад – здорава яму прыперла, калі ён аказвае наёмніку такую павагу, – але я спешыўся і сам павёў каня.

Кізгайлу мне давялося бачыць не больш як тры разы, я быў толькі яго кулаком у Быхаўскай акрузе. Нядаўна ён ажаніўся, я яшчэ не бачыў яго жонкі.

Але нават я здзівіўся той змене, што адбылася з ім. Спіна сагнулася, твар жоўты не па-чалавечы, вочы, як у вар'ята. А быў жа ладны і таністы. І пастава высакародная.

– Ты добра зрабіў, што паспяшаўся, Канрад, – сказаў ён, – у мяне вялікая бяда.

І змоўк. І маўчаў, пакуль хлопцам не адвялі жыллё, пакуль не выкацілі ім бочку віна і не накармілі тлуста і смачна.

Я глядзеў на яго высокі вузкі лоб, на валасы, ледзь падвітыя на канцах, але без бляску, бы ў сухотніка якога-небудзь, на вузкія карыя вочы і думаў: “Вось і зразумей цябе, чорта, што ў цябе ў галаве”.

Гэтых людзей нельга зразумець. То яны маўчаць, то загадваюць без дай прычыны загнаць добрых коней.

Калі ўсіх напаілі і накармілі, ён падаў мне знак ісці за ім. Мы ішлі бясконцымі пераходамі і вісячымі галерэямі, ён ціха, як кот, я грукочучы, як вядро на цыганскім возе.

На вісячай пляцоўцы, вельмі прыдатнай для агляду, ён раптам спыніўся.

– Як ты думаеш, Цхакен, ці доўга можна абараняць такі замак?

Я паглядзеў на гмах, заліты месячным святлом, на кучы каменняў, што абцяжарвалі забрала, на вежы, што лёгка і трывала стаялі на зямлі.

Я ведаў, што на гэтых мурах устаноўлены два дзесяткі гармат і пры іх, як сцвярджае роспіс, ёсць дзесяць custodes arcis et bombardarum magistros[1].

А каб жэрці і піць, дык гэтага ў склепах хопіць на ўсіх – хоць год сядзі.

І ўсё ж я спытаў, якія сілы ёсць у замку акрамя маіх малайцоў. Ён адказаў, што на другім замкавым двары стаіць сотня конных кірасіраў.

– Нядрэнна, – сказаў я, – але ж гэта для вылазак, гаспадар. А нашто нам іхнія коні? Хіба што жэрці, калі будзем галадаваць? Вядома, гэта ежа для басурмана, але голад не цётка.

– Ёсць яшчэ каля дзвюх соцень дваран.

– Адчайныя і кончаныя душы, – сказаў я, – але зноў-ткі для бою ў шырокім полі.

Словам, я зразумеў, што муры павінны абараняць мае хлопцы.

– Не нам жа каменне цягаць, пан Кізгайла? Дайце нам на гэтую работу з паўсотні мужыкоў.

– Нельга мужыкоў, – амаль ускіпеў ён. – Іх зусім не будзе.

Я пацісnуў плячыма:

– У чым усё ж справа, гаспадар?

– Пытаць будзеш потым. Кажы, колькі тут можна пратрымацца?

– Год, – суха сказаў я, – год я пратрымаюся тут нават супраць Сатаніїла. Два гады я пратрымаўся б тут з гаспадаром, які мне

---

[1] Замкавых вартаўнікоў і бамбардных майстраў.

давярае. І я не паручуся нават за тыдзень абароны, калі гаспадар не давярае сам сабе.

– Цхакен, праяцель, – сказаў ён трохі мякчэй, – я проста не хацеў пасяляць у тваёй галаве скажоных меркаванняў наконт лёгкасці і цяжкасці гэтай аблогі.

– Дык хто ўсё ж ткі ідзе?

– Хамы ідуць.

Мне спадабаліся гэтыя словы. Швейцарцы ўсе былі мужыкамі яшчэ сто год назад. Але ён пакрыўдзіў не маіх землякоў. Акрамя таго, ён плаціў грошы. Таму я змоўчаў.

– Хамы ідуць, – паўтарыў ён.

– Гэта не вельмі страшна, – сказаў я, злёгку пакрывіўшы душою.

– Ты не бачыў іх у Віцебску, – сказаў ён, – калі там была смута. А я дагэтуль памятаю набат.

– Але ж трыццаць год у гэтым краі быў спакой.

– А цяпер яны ўзялі замак. У Рагачыку.

– Сорак міль па рацэ адсюль, – усміхнуўся я. – Хто паручыцца, што яны пойдуць у гэты бок?

– Яны пойдуць. Я гэта ведаю. Ім няма іншага шляху, акрамя таго, што вядзе праз Кісцяні. Праз мяне.

– І ўсё адно мы адседзімся. Вашы мужыкі, вядома, не зусім прыемная рэч. Але гэта не рэгулярная армія.

– Гэта горш, – ён пачынаў злавацць.

– Чаму?

– Таму што сёння ў іх ёсць галава.

Па маіх вантробах прабег мароз: гэта сапраўды горш. Але я ведаў, што гэтага чалавека яшчэ ў раннім юнацтве да смерці напужалі зверскія морды, сякеры, паходні, труп епіскапа, які валачылі за ногі па вуліцах, вынішчэнне яго гвардыі. Неразумна было б палохаць яго. Таму я адмахнуўся ад яго слоў.

– Глупства, – сказаў я, – галава ў час вайны рызыкуе не менш, чым ногі. На што ўжо быў хітры шведскі кароль, а і той не мінуў кулі.

– О, Канрад, вы ж біліся з ім, – раптам загарэўся ён. – Што гэта быў за чалавек?

Я ўсміхнуўся сам сабе. Клянуся касой маці божай, на гэтай зямлі кожны марыць аб славе. Нідзе не чытаюць і не распытваюць так прагна пра Аляксандра, Цэзара і іншых разбойнікаў. Нават гэты, якому сядзець бы дома і пладзіць дзяцей, чалавек хутчэй люты, чым мужны, загарэўся, ледзь патыхнула дымам вайны.

Я пацісну плячымі з прытворнай абыякавасцю:

– Гэты галандскі мазіла Ван-Дэйк напісаў партрэт шведа, але ён не падобны. Ён на ім чысценькі, як хлопчык, якога мама вядзе ў царкву. А гэта быў здаровы мужалап, які лаяўся мужыцкімі словамі, як залатар з Вюрцбурга.

Яго зноў перасмыкнула пры слове “мужыцкі”, але я супакоіў яго:

– Нават такая галава нічога не магла зрабіць з мужнасцю праціўніка. Будзем біцца.

Мы спусціліся ў другі ўнутраны двор. Тут, пад павеццю, віселі на сцяне кірасы, пырхалі коні і ля агнёў сядзелі кірасіры. На каменных плітах двара сям-там дыміўся гной. Худы мужычок у світцы падмятаў ляніва і непаваротліва.

Гаспадар, відаць, знайшоў, на кім спагнаць гнеў.

– Дамінік, – сказаў ён, – калі двор будзе запаскуджаны раніцай, я пастаўлю цябе вышэй за сябе.

Я ведаў гэты брыдкі выраз. І мімаволі паглядзеў на верхні двор, дзе вялізным “пакоем” вымалёўвалася на сінявата-зялёным месячным небе шыбеніца.

– Зробім, паночак, – сказаў Дамінік, і я ўбачыў у цемры яго светлыя, трохі прытушаныя вейкамі вочы. Яны былі незвычайныя, гэтыя вочы.

У Еўропе я толькі аднойчы бачыў такія вочы, у мужыка пад Вольміріштэтам, калі нямецкія сабраты ў кірасах забіралі ў яго сена. Праз хвіліну ён торкнуў віламі ў бок сяржанту. Калі я ўпершыню з’явіўся тут, то штохвіліны асцерагаўся такога ўдару: у іх ва ўсіх былі такія вочы. Але потым супакоіўся. Гэта ціхманы і вельмі цярплівы народ.

І толькі цяпер зноў штосьці непрыемнае варухнулася ў мяне ўнутры.

– Я б адправіў гэтага мужыка ў роднае сяло, – сказаў я.

– Зусім застацца без іх нельга, – раздражнёна сказаў Кізгайла, – а гэты яшчэ і каталік. Я павінен яму верыць.

Я ўсміхнуўся сам сабе і падумаў, што чалавек, які аднойчы здрадзіў веры, можа здрадзіць і другі раз. Але я спахапіўся і не сказаў гэтага ўголас, з боязі абразіць гаспадара.

Сам гаспадар таксама быў свежы каталік, а жонка яго, Любка, заставалася праваслаўнай. Жонак няма чаго прымушаць. Ды і сам Кізгайла – я ўпэўнены ў гэтым – адчувае сябе ў новым храме, як п’яны ландскнехт сярод святош.

І ўсё ж у замку ёсць невялічкі касцёл, патрон якога святы Антоній, і царква Пакрова Маці Божай. Іх падзяляе палац, і з яго

вядуць у храмы дзве галерэі, кожная ў свой бок. Калі палац спаляць – храмы ўбычаць адзін аднаго і вельмі здзівяцца. Зрэшты, гэта не перашкаджае абедзвюм рэлігіям спаць на адной падушцы.

Ад гэтых гуллівых і, прызнаюся, не вельмі пачцівых думак мне стала весела. Ну які з гэтага чалавека католік?! Ён не ведае па-латыні ні inibus, ні atibus. І добра, бо я таксама ведаю ненашмат больш.

Ды і адкуль мне ведаць? Я не поп, я салдат. Я Канрад Цхакен, і я трыццаць год крывёю плачу за свой хлеб.

Шырокімі драўлянымі сходамі мы прайшлі ў малую залу замка. У гэтай малой зале маглі б учыніць папойку ўсе мае малайцы, ды яшчэ з дзеўкамі. І нікому не было б цесна.

Шэсць вялікіх, бы ў царкве, акон. У іх, акрамя звычайных зашклёных пераплётаў, уштукаваны яшчэ і вітражы. Зрэшты, іх пачалі ўжо вымаць, відаць, для таго, каб перанесці ў бяспечнае месца. Таму палова залы ў чырвоных, сініх і карычневых плямах, а другая заліта месячным святлом.

Каменная гладкая падлога, сцены, абабітыя цяжкай тканінай, фіялетавай з золатам. Каля сценак цяжкія і доўгія, як труны, разьблёныя скрыні, яны ж услоны. Паміж імі шафы, знарок адчыненыя, каб быў відаць залаты і срэбны посуд.

Як хутка яны пераймаюць ад фальшывых нямецкіх і італьянскіх купцоў, ад хлуслівых тамтэйшых дваран! Навучыліся і іншаму, зусім недарэчнаму: у пярэдняй сцяне – камін. Гэта пры тутэйшых страшных маразах! Ды я ні на што ў свеце не змяняю мясцовай печы!

У часе італьянскага паходу – а зіма была надта суровая для Ламбардыі – мне аднойчы давялося ўсю ноч праляскаць зубамі ля такога каміна. Я напалову засмажыўся і напалову змёрз, як пекар.

Затое я з асаблівай прыемнасцю ўбачыў ужо накрыты стол, крэслы без спінак каля яго, полымя свечак у шасцёх пяцісвечніках.

І яшчэ жанчыну ў крэсле, у баку ад стала.

Яны былі зусім не падобныя адно на аднаго, муж і жонка. У яго сухі жоўты твар, які пачынаў друзнуць, вочы фанатыка, шалёныя і вартыя жалю, валасы да плячэй. А яна – з яе анёла можна было б маляваць. Толькі, ведаеце, не дужа добрага анёла. Каса доўгая, залацістая, вочы цёмна-блакітныя і таксама трошкі шалёныя, як ва ўсіх тутэйшых. Рот ружовы і вельмі прыемны для пацалункаў, вясёлы і прынадны.

А сама як літая: усё на месцы, што павінна быць у жанчыны, па думцы ўсякага добрага швейцарца. Я, праўда, не ведаў, якая ў яе хада. У мясцовых жанчын вельмі зграбная хада. І яшчэ рукі, такія, як

у гэтай: белыя, не худыя, з тонкімі пальцамі, якія звужаюцца пад канец.

Але што іх асабліва рабіла непадобнымі, дык гэта вопратка. Да вопраткі трэба прывучваць не адно пакаленне. І, можа, толькі ўнукі пана прызвычаяцца да адзення, якое насіў ён сам. Шырокая і вельмі кароткая аксамітная безрукаўка на куніцах. Ярка-чырвоная сарочка, якая гладка прыставала да цела. Карункавы каўнер і з-пад яго, на жывот, залаты ланцужок. На поясе цацачны кінжальчык. (Божа, ды гэтым людзям толькі доўбня і з рукі.) І куды яму, да д’ябла, з яго худымі нагамі і таўставатымі каленнымі суставамі, насіць гладкія, у абцяжку, залацістыя панчохі і мяккія боцікі з доўгімі наскамі?

Дражняць нас бусланогімі, а самі вучацца.

А на пані Любцы ўсё дарэчы. Шырокая ў падоле блакітная з золатам сукня. Пояс, што завязваецца па клубах і падае спераду двума канцамі, быццам падзяляючы ногі. Тонкая ў поясе казнатка[1], таксама блакітная.

І што лепей за ўсё – на галаве іхні “караблік”, быццам ляжачы маладзік, быццам рожкі над вушамі. Рожкі тыя залацяцца, а на іх зверху накінуты рантух, зусім празрыстае блакітнае пакрывала паміж каленяў.

Сядзіць, бы ў воблаку.

І на каленях скруціўся свойскі белы гарнастай.

Яна ўстала мне насустрач, усміхнулася злёгку жарсткаватай і прыемнай усмешкай. Гарнастай паспрабаваў быў учапіцца за сукню, але не ўтрымаўся і скаціўся ўніз.

У мяне сівізна ў галаве, і тут я ўпершыню пашкадаваў аб гэтым. А сам сабе падумаў, што мужа як мужа, а гэту буду бараніць да самага скону. У мяне ж, каб я не валачыўся па свеце, а жаніўся, як усе добрыя людзі, магла б быць вось такая дачка. І я абавязкова назваў бы яе Гертрудай.

Я падышоў да яе і схіліўся, каб пацалаваць руку. Не дала рукі:

– Гэта ўжо, бацька, па нашых звычаях зусім без патрэбы.

– У іх свой звычай, – сказаў пан Кізгайла, але я пабачыў, што ён узрадаваўся.

А потым я пераканаўся, што ён яе і наогул неяк безнадзейна раўнуе. Я злавіў сябе на думцы, што стаў думаць на іхняй варварскай гаворцы, і крыху раззлаваўся. Я ўсё ж з кантона Швіц, чорт мяне забірай!

---

[1] Шнураваная жаночая вопратка.

Праўда, тут усе, акамя палякаў, вельмі памяркоўныя да любога народа і любой веры, так што мне тут добра.

– А вы сядайце за стол, пан Кандрат, – сказала яна, і я не раззлаваўся за перакручанае імя, – зараз усе прыйдуць.

– Ваенную раду ўчынім, – сказаў муж.

Я падзівіўся толькі, якія дзіўныя тут норавы. Я не перастаю здзіўляцца дзевяць год. За ежаю – і ваенная рада.

Я, грукочучы, падышоў да стала і сеў з імі. Першым прыйшоў пан Фелікс, капуцын – і надзіва чысты для свайго ордэна. Зрэшты, я ўсё адно лепей сядзеў бы з дзесяццю смярдзючымі капуцынамі, чым з адным езуітам. Душэўны смурод горшы.

Гэты, выяўляецца, мыўся і нават дужа старанна, бо прыстаўлены быў акрамя выканання службы яшчэ да варкі мёду. Капуцыны разумеюць у выпіўцы.

Потым з'явіўся попік, айцец Іякінф (язык зломіш на гэтых імёнах!), ускудлачаны, сухі і хітранькі.

Кожны сеў з боку "свайго" гаспадара, у канцы стала і, на маё здзіўленне, надта мірна прывітаўся з законным ворагам.

– Прыгразілі, што іначай выганім, – шапнула пані Любка.

– А зараз іх наогул вадою не разальеш, – буркнуў Кізгайла, – п'юць разам і зневажаюць бога. Такія блюзнеры. Нядаўна пан Фелікс, напіўшыся, крычаў, што з беларускай зямлі трэба павыганяць і папоў, і ксяндзоў, а богам прасіць на цараванне Бахуса. А разумны ж і бывалы чалавек: у Венецыйскай зямлі быў і яшчэ недзе.

– Нічога, бог за легкадумнасць даруе, – сказала гаспадыня.

– Яшчэ манахі ёсць? – спытаў я.

– Цяпер ужо другі тыдзень служаць запрошаныя. Уратаванне каралевы на вадзе. Тры тыдні будуць выць, – скрывіла яна губку.

– Якія?

– У шэрых расах.

Я ўвесь пахаладзеў. З гэтай кампаніяй я зусім не хачу мець спраў. І я вырашыў паспрабаваць заўтра справадзіць "сыноў Ісуса", указаўшы ім на небяспеку.

З-за мяркуемай рады запрошаных да стала было мала. Прыйшлі яшчэ толькі два: капітан конных кірасіраў, сапраўдны разбойнік з закручанымі вусамі і ў ботах, падобных на вёдры, а сам – ні даць ні ўзяць картачны ніжнік.

І яшчэ выбраны камандзір шляхты ў чузе з буркацелі – тайнай парчы, і ў шэрай футры паўзверх яе нягледзячы на вясновы час. У гэтага былі маленькія вочкі і маленькія крывыя далонькі. Хай мяне бог шасне, калі я не ўспомніў крата.

Калі мы сунялі першы голад – а на гэта пайшоў немалы час, – я спытаў, калі чакаецца прыход ворага да муроў і ці не абяцаў канцлер Сапега ўзброенай дапамогі.

– Яны ўзялі Рагачык з налёту, – хрыпла сказаў капітан. – А цяпер кудысьці зніклі.

– Рыхтуюцца, – з прыкметным хваляваннем сказаў Кізгайла, – разумеюць, што тут нечаканасцю нічога не зробіш, і нешта рыхтуюць. Сядзяць недзе ў пушчы... як павукі.

– Сяпега ж абяцаў падмогу, – з адценнем пагарды сказала гаспадыня.

– Кату ён пад хвост вырас, твой Сапега, – ускіпеў пан, – ці можна яму верыць? Сама памятаеш, як ён за народ беларускі распінаўся. А цяпер надта ўжо скора па-польску пачаў балбатаць. Пярэварацень.

– Дый ты ж, – усё з той самай лёгкай і жорсткай усмешкай сказала яна.

Твар Кізгайлы так па-пакутніцку скрывіўся, што я пашкадаваў яго.

– Ён першы перабег, – скрыпнуў пан зубамі, – а за ім іншыя разышліся на ўсе застаўкі. Як пацукі з карабля. А астатнім чыняць уціск.

– Нобілі[1] не бягуць, – сказала яна.

– Таму і галеюць. Ды і гэтых, першых, тры чалавекі засталося. І тых бы для спакою – на плаху.

– Сапега прышле дапамогу. Сапега вораг яму.

– Не веру, – сказаў пан, – я і на сабе не спадзяюся пасля “схілення”. І хто ведае, ці не пакарае мяне за гэта пан бог.

– Што такое, – не зразумеў я, – каму вораг Сапега?

– Галаве мужыкоў, – ваўкавата гледзячы ў падлогу, сказаў Кізгайла.

– А ён хто?

– Нобіль. Раман Грынка з Ракутовічаў, – адказаў пан.

Прызнаюся, што я даволі непачціва свіснуў.

Справа паварочвалася зусім дрэнна. Нобілі – самыя знатныя і самыя паважаныя народам людзі на гэтай зямлі. Яны не проста маюць дрэва продкаў, яны вядуць яго ад якога-небудзь слаўнага чалавека.

Іхні закон гонару: кожнае пакаленне павінна прымножыць славу гэтага продка сваімі дзеяннямі. Таму большасць з іх

[1] Найбольш радавітая частка магнацтва.

вызначаецца справядлівасцю, шчырым норавам і неўтаймаванай адвагай у баі.

Гэтыя тры добрыя якасці – я заўсёды казаў гэта – зусім не садзейнічаюць працвітанню. Таму гэта парода належыць да ліку выміраючах. Зніклі нашчадкі князя Вячка, няма прамых нашчадкаў Андрэя Полацкага, нястомнага ворага Крэўскай уніі. Іх забылі. І па заслузе – няма чаго дарэмна геройстваваць. Чалавек створаны на тое, каб пладзіцца, а не на тое, каб знішчаць сябе. Які толк у тым, што іх імёны занесены ў які-небудзь гарадзельскі прывілей або першы статут, калі носьбітаў гэтых імён не засталося на зямлі.

Але я заўсёды казаў, што ў гэтага народа галава змайстравана не так. Я не ведаю, мякіна ў іхняй галаве ці інакшыя мазгі (калі здарыцца выпадак, трэба будзе паглядзець), але яны абкружаюць гэтую пароду ўвагай і пяшчотай. Мужыкі асабліва любяць іх, бо тыя амаль заўсёды небагатыя і лічаць празмернае багацце за ганьбу.

Аднойчы, пасля разгрому татар пад Крутагор'ем, трэцюю частку здабычы прапанавалі аднаму з Ракутовічаў (не памятаю ўжо, што ён зрабіў, здаецца, закалоў ці ўзяў у палон хана Койдана), і ён аддаў яе мужыкам, якія прыйшлі пад яго сцяг. Тыя потым маліліся на яго, як на бога, і калі іхні бажок паклікаў іх з сабою ў паход на яцвягаў – кінулі ўзбагацелыя гаспадаркі і пайшлі за ім. Вядома, гэта ўсё скончылася дрэнна – з правадыра-завадатая знялі скуру, узяўшы яго ў палон.

І даніну з гэтых яцвягаў можна было ўзяць толькі венікамі для лазні і лыкам. Неразумная рызыка!

Я ведаў усё гэта ад аднаго быхаўскага манаха. Ён пратрубіў нам усе вушы гэтай мінулай славай.

І ўсё ж я ўстрывожыўся. Кіраўнікі яны нядрэнныя, і, калі чуткі спраўдзяцца, значыць, у мужыцкага цела вырасла някепская галава.

Гаспадар з гаспадыняй між тым сварыліся. Ён крычаў на жонку:

– А ўсё ты! Патрэбна мне была тая халопка. Вось зараз і расхлёбвайце кашу, пані Любка.

Тая ласкава гладзіла гарнастая, які ляжаў у яе на плячы, лянiва выгнуўшыся, і лашчыўся галоўкай. Потым сказала холадна:

– Не бойся, ён цябе адсюль не дастане. Ён не мацнейшы за цябе.

І спытала ў капітана:

– Тую дзеўку адправілі ў Магілёў?

Капітан ледзь не ўдавіўся кавалкам і пачырванеў:

– Праз гадзіну адправяць. Разам з астатнімі.

– Загадайце берагчы яе. Калі з ёй што-небудзь здарыцца ў дарозе і той даведаецца – ён не пакіне ад Кісцянёў каменя на камені.

– Слухаю вас, – буркнуў капітан.

Я не пытаў ні аб чам. Занадта многа таямніц на адзін вечар.

Потым мы спехам вырашылі, каму які мур абараняць, а Кізгайла даў загад трымаць напагатове смалу і дровы і змазаць пад'ёмнік другой рашоткі.

Загадзя ведаючы, што гэта бескарысна, вырашылі ўзняць на супраціўленне мужыкоў з замкавых вёсак Кізгайлы.

Потым Кізгайла прачытаў загад збароўскім мяшчанам, на якіх таксама маглі напасці. Ім належала: "Стрэльбу ўсякую, то бок гакаўніцы, ручніцы і сагадайкі, і іншую абарону, то бок шыбні і што іного да той абароны належыць, у дамех сваіх мацi; а хто не можа больш, іно хаця адну ручніцу і рацішча няхай маець, а без абароны ў даму няхай не мешкае".

– Не атрымаецца і гэта, – усміхнуўся Крот.

– Гэта чаму? – узвіўся Кізгайла.

Крот выцер ільсняныя губы:

– Яны ў нас пра падатак прасілі?

– Ну, прасілі.

– А ты не зняў?

– Не зняў...

– Таму і не атрымаецца. Скажуць, як п'юць ды ядуць, дык нас не завуць, а як с... і д... дык нас ішчуць.

– Не лайся, Іван, – скрывіўся гаспадар, – баба за сталом.

– Калі яна баба, – нахабна адказаў той, – няма чаго ёй за нашым сталом сядзець. А калі села, няхай слухае. Воінам без лаянкі нельга. Прыцерпіцца.

І тут пані Любка мяне здзівіла. Глянула на Крата цёмна-блакітнымі вачыма і сказала цвёрда:

– Калі пан хоча лаяцца, няхай пакіне замак і за мурамі лаецца з тым, хто ідзе.

Крот наліўся крывёй:

– А ці не хоча пані, каб дваране і яе адправілі за муры сустракаць гэтага чалавека?

– Добра, – усміхнулася яна, – пагроза за пагрозу.

І раптам устала.

– Пан Цхакен, клікніце сваіх людзей. Я загадваю вам выкінуць гэты зброд за браму. Няхай абараняюцца ў чыстым полі.

– Любка, – уступіўся муж, – гэта ж кожны трэці абаронца.

Спалоханы сваркай гарнастай шмыгнуў пад рантух і хутка ўжо высоўваў сваю трохкутную мордачку з рукава гаспадыні.

– Нам не патрэбен такі трэці, – сказала яна, – здрада крочыць цераз самыя высокія вежы. Пан Цхакен...

Я ўстаў і бразнуў шпорамі. Гарнастай зашыпеў на мяне з рукава, як васіліск.

Але Крот ужо звяў. Ён раптам усміхнуўся гаспадыні:

– Добра, пані. Даруйце мне. Добрыя мы будзем, распачаўшы бойку, калі справа зайшла аб скуры. Паасобку будзе дрэнна і вам і нам.

Воблака рассеялася. Вячэра цягнулася далей. Вырашылі паспрабаваць заўтра выслаць Дамініка лазутчыкам, каб даведацца, дзе вораг.

Усё астатняе для абароны было падрыхтавана. Мы толькі не ведалі колькасці ворага. Мяцеж, выяўляецца, узгарэўся ў наваколлі Зверына. Адтуль не ўцёк ніводзін дваранін. Было гэта за тры тыдні, а першая чутка аб бунце прыйшла тыдзень назад, калі паўстанцы ўзялі Рагачык. І тады ўжо на чале іх быў гэты Раман.

Дрэнна, вельмі дрэнна. Я ніколі не верыў людзям, якія занадта доўга церпяць. Калі іх нянавісць загарыцца, яна гарыць, пакуль не спапяліць праціўніка або самога сябе.

І толькі цяпер я даведаўся нарэшце, у чым рэч, і сам сабе падзівіўся неразумнасці Кізгайлы.

А расказаў мне гэта попік з цяжкавымоўным імем.

Аказваецца, паўтара года таму назад Раман прапанаваў пану Аляхну пяцьдзесят бітых талераў за тое, каб ён адпусціў на волю сваю халопку Ірыну.

Яны сядзелі і пілі разам, і Аляхно спытаў Рамана, нашто яму гэта. Той адказаў, што паспрабуе пасля гэтага завалодаць яе сэрцам і ажаніцца на ёй.

– Сэрца, як я мяркую, табе без патрэбы, ласкавы пане, – легкадумна адказаў нежанаты тады пан Аляхно.

– Аднак ты ж прынёс сваё да ног панны Любкі.

– Гэта зусім іншая рэч. Яна высокага роду. А нобілю сорамна браць за сябе халопку.

– Ажаніўся ж на дачцэ смерда мурамскі Пётр, – сказаў Ракутовіч.

– Рабы татар могуць рабіць, што ім хочацца.

– Не папікай, сусед. Падобна на тое, што прыйшла чарга нам трапіць у рабства. Варшава задушыць нас, мы згубілі памяць. І невядома, чыё рабства будзе даўжэйшае.

– І ўсё ж гэта ганьба для нобіля – мяшаць сваю кроў з халопскай.

– Ты дазволь мне самому меркаваць пра гэта.

– Слухай, Раман, – усміхнуўся Аляхно, – можна пакінуць сытымі ваўкоў і цэлымі авечак. Бяры яе, на колькі спатрэбіцца. Ты ведаеш, я прыцель твой і сусед і ніколі не запатрабую яе назад. Мне вельмі не хочацца, каб ты ажаніўся з ёю.

– Не, – сказаў Раман.

– Сур'ёзна, вазьмі яе, калі ўжа так захацеў. Зрабі ёй дзіця і супакоішся.

– А калі яна мяне ненавідзіць?

– А хто пытае пра гэта ў быдла?

– Не да ладу кажаш, сусед, – сказаў Раман, – дзяўчат гэтага "быдла" таксама нядобра псаваць, як і ўсякіх другіх. Гэтае быдла адкінула і збіла татарскую конніцу, седзячы на конях, узятых ад сахі. Ды і Ірына паважаная дзеўка.

– Ну і вазьмі яе сабе, – засмяяўся Кізгайла.

– Браць сілком, браць у ланцугах – гэта трэба не паважаць сябе.

– Ды хто ж табе кажа сілком? Ты ўлашчы яе падарункамі.

– І ўсё адно яна зняволеная. Не хачу. Брыдка. Трэба каб па любові, іначай якая ж тут радасць?

– Гм... Дык ты ж яе ў другую няволю цягнеш. Бо калі дазнаюцца, што ты адкупіў, дык зноў звязанай будзе. І сабака хвастом віляе, калі кінеш яму кавалак.

– Вось я і хачу цябе прасіць, каб ты адпусціў і маўчаў. Быццам сам адпусціў.

Кізгайла падумаў крыху.

– Не, не адпушчу, – сказаў ён. – Хочаш – бяры. Не хочаш – не бяры. Нобілю нельга быць жанатым з халопкай.

Ён занатурыўся, і Раман паехаў пакрыўджаны. Яшчэ раз ён паспрабаваў завесці размову аб гэтым і ледзь не маліў Кізгайлу, але той стаяў на сваім.

Пасля гэтага Раман пакінуў ездзіць да Кізгайлы. Той перапалохаўся – суседзі сталі коса глядзець на яго. Яму зусім не хацелася варагаваць з Ракутовічамі, і ён вырашыў адпусціць Ірыну на волю. Але вяселле яго з паннай Любкай, што неяк раптоўна згадзілася пайсці за яго, вось-вось павінна было загрымець на ўсё ваяводства званамі і шамкамі коней. І ён, як варты павагі жаніх, спытаў у нявесты, ці трэба даваць Ірыне вольную.

Любка ж была ўжо амаль гаспадыняй. А тая раптам уся страпянулася і холадна сказала:

– Не.

Ён паглядзеў на яе халодны твар, на прыжмураныя вочы, што глядзелі ўбок.

– Не, – паўтарыла яна. – Нобіль і халопка? Калі ты гэта зробіш, пра мяне можаш не думаць.

І Аляхно не паехаў да Ракутовіча.

А неўзабаве пасля вяселля Кізгайлы з Любкай да яго прымчаў на кані стрыечны брат Рамана, Якуб.

– Аляхно, – маліў ён Кізгайлу, – зрабі гэта, дзеля пакут Хрыстовых, калі хочаш, каб Раман памёр. Ён зусім звар'яцеў, мы вынеслі з яго пакояў усю зброю. Ён раве, як грэшная душа ў пекле, і лае караля, Літву і палякаў. Ён пагражае разнесці ўсё. Ты ведаеш, ён і раней ненавідзеў уціск, на які нас прыракаюць. Цяпер ён ненавідзіць яго стакратна. І гэта твая дзеўка штурхнула яго на гэта. Адпусці яе. Разумееш, я яшчэ не бачыў, каб чалавек так кахаў і шкадаваў.

– Не, – сказаў Аляхно і сказаў гэта не сваімі вуснамі, а вуснамі жонкі.

– Ты ведаеш, – сказаў Якуб, – ён крычыць, што гэта цяперашнія выскачкі зрабілі такімі цяжкімі ланцугі халопства, што хутка стануць халопамі і паны, увесь народ... Аляхно, ён не есць, і не п'е, і не спіць па начах. Адпусці!

– Не, – сказаў Аляхно.

– Добра, – ускіпеў Якуб, – ты будзеш вінен у пагібелі дзвюх душ. Яго і гэтай дзеўкі, таму што яна таксама шкадуе яго, я ведаю. Сорам табе, Аляхно! Дзяды часта жаніліся так, як хоча Раман. І гэтыя новыя парадкі нам не даспадобы.

– Не, – сказаў Аляхно.

– Добра ж, – і Якуб кінуў на стол корд[1], – тады слухай, Аляхно. Ракутовічы табе абвяшчаюць варожасць. Беражыся.

Кізгайла пагаварыў яшчэ раз з жонкай, але тая ўпарта і тупа стаяла на сваім. А праз месяц Якуб, спасцерагаючы згасанне брата, выклікаў Аляхно на бой і быў забіты.

Смерць брата крыху працверазіла Ракутовіча. Ён стаў на ногі. І ніхто не ведаў, што ён думае. Перапалоханы гэтым нядобрым маўчаннем, Кізгайла вырашыў напасці на адну з вёсак суседа, каб паскорыць вырашальную сустрэчу.

---

[1] Кароткі меч.

Па дарозе туды ён быў паранены стралою з сялянскага самастрэла. Страляў адзін хлопец з аховы Якуба. Помсціў за нябожчыка.

Загонавыя дваране адступілі, забраўшы з сабой Кізгайлу. Той не дазволіў ім дакранацца да сябе і адлежваўся ў Кісцянях, нікога не пускаючы ў свой пакой.

І вось цяпер мужыцкія орды ўзначаліў гэты чалавек, смяротны вораг майго гаспадара.

Я плюнуў, выслухаўшы гэтую гісторыю. Калі ў справу ўмешваецца баба – дабра не чакай. І ахвота яму было пытацца парады ў свае жонкі!

Але ўсё адно яна была гожая, а гэтага Ракутовіча я не разумеў.

Толькі вар'ят мог, калі яму дакляруюць такую раскошу, – патрабаваць сабе ланцугоў на шыю.

"Не мая справа. Мая справа біцца", – вось што вырашыў я.

Між тым мяне выклікаў капітан.

– Слухай, калега, – сказаў ён, – я зараз адлучуся на малы час, а потым мы з табою пагаворым, як падтрымліваць адзін аднаго ў час вылазак, калі прыйдзе хам.

– А ці патрэбныя тыя вылазкі? Нас мала.

– Затое мы ў жалезе. Адзін латнік варты трыццацёх мужыкоў.

Я ведаў, што гэта так, але параіў вылазак не рабіць.

– А нашто ж тады конніца ў чатырох сценах? – засмяяўся ён. – Ды і хлеб я атрымоўваю не за сядню. Плацяць – скачы і сячы.

– А калі гэта неразумна?

– Пла-ацяць, – працягнуў ён, быццам давёў, і выйшаў.

Я пачакаў крыху і пайшоў за ім. Мне цікава было, якіх людзей ён адпраўляе з крэпасці напярэдадні аблогі.

Я прайшоў пераходамі і выйшаў на галерэю, што выходзіла ва ўнутраны двор. Я думаў, што я адзін, але потым заўважыў, што ў адным канцы галерэі стаіць гаспадар з жонкай. І тады я адышоў у другі канец, дзе было цямней, і там успёрся на парэнчы.

Унізе ярка палалі паходні, асвятляючы дзесятак вазоў. Будучая варта – чалавек трыццаць верхавых дваран, закаваных у латы, і пяць кірасіраў – трымалася трохі правей, ля брамы. З нізкіх дзвярэй, што вялі, відаць, у нейкае сутарэнне, даносілася бразганне молата – разбівалі ланцугі.

А потым з гэтых дзвярэй пачалі выводзіць людзей – абадраных, зарослых. Яны ледзь ішлі.

Вывелі дзесяць чалавек.

Дзесятую я не адразу і заўважыў, такая яна была худзенькая. Выйшла яна сама і сама села ў дзесятыя, апошнія, драбіны. За ёй выйшаў закураны замкавы каваль з зубілам і молатам у руцэ.

Паходня, якую трымаў шляхціц, кідала дрыготкія водсветы на гэтае дзяўчо ў белым. Я зверху бачыў толькі валасы, якія здаваліся мядзянымі, але на самай справе былі, напэўна, попельна-залацістыя. І твар цяпер адліваў бронзай, а ў натуры быў, вядома, бледны, як ва ўсіх пасаджаных пад замок.

Мне стала неяк не па сабе. Мала душы ў людзях, вось што я вам скажу. І дзіўна толькі, як гэта бог яшчэ церпіць нашы грахі і нашу бессардэчнасць. Напэўна, за нямногіх праведнікаў. Ды вось толькі дзе яны?

– Рыхтуйся, – скамандаваў капітан.

Коннікі пачалі збірацца вакол вазоў, бразгаючы зброяй і пераклікаючыся.

А я ўсё глядзў на гэтае хударлявае дзяўчо. Найбольш крыўдна, што і ногі ў яе былі пекныя, і ўсё астатняе, і рухі гожыя, – а гэта самая галоўная прыгажосць, калі не лічыць вачэй. Нельга такіх пад замок.

– Пан, – крыкнуў каваль, – усе ўжо раскутыя. Да вазоў куць не трэба?

– Не, – сказаў Кізгайла.

І тут дзяўчына прыўзняла на яго вочы, і я ўпершыню ўбачыў яе твар. Бровы зламаныя, вочы вялікія, шэрыя, глядзяць, як алень на паляўнічага, безабаронна і стрымана. А рот вялікаваты, і нос не зусім роўны.

Няправільнае аблічча, і ўсё адно – такіх не забываюць.

І, як здагадка, мяне кальнула іголкай у сэрца.

– Ірына.

Дык вось каго яны вывозяць! Рызыкаваць не жадаюць. Думаюць, што выручаць паляціць і зніме аблогу. Нядобра, паны.

А ў яе вейкі задрыжалі і рот прыадкрыўся:

– Радуйся, пан, радуйся, пані Любка, загубілі вы жыццё маё. Ды, відаць, ляціць сокал, калі вароны ўзграялі з перапуду.

– Рушай! – махнуў рукой пан.

І загрукаталі па плітах вазы, заскакала полымя паходняў. І стала ўсё гэта падобна на д'ябальскі шабас.

А твар пані Любкі стаў зусім страшны, нават зубы выскаліліся не як у чалавека. І ўжо калі драбіны пачалі ўязджаць у браму – даляцеў адтуль добра чутны голас:

– Запраданец. Юда. Веру прадаў, братоў прадаў. Хай згіне твой род.

Астатнія ўзвылі на калёсах – шмат хто, напэўна, і гаварыць развучыўся. Але начальнік варты стрэліў некалькі разоў, і стала цішыня.

А Кізгайла стаў пры апошніх словах такі страшны, якім я ніколі не бачыў чалавека: скулы абцягнутыя, вочы ўтрапёныя, губу закусіў.

Любка паклала яму руку на плячо – скінуў. І адразу сагнуўся ў хрыбце.

А ад брамы, з-пад самай аркі, той самы голас, усё яшчэ ціхі і на музыку падобны:

– Здохні, Кізгайла.

А потым упала за імі рашотка. Быццам адрэзала.

І пайшоў да сябе ў пакой, не вытрымаў.

Лёг на пасцель у ботах – назнарок – і назнарок стаў глядзець на свечку і думаць на сваёй мове. Я пачаў занадта шкадаваць гэтых чужых людзей і, калі шкадую, думаю па-іхняму. А гэта не на дабро.

А я ж толькі ўраджэнец кантона Швіц. І наёмнік. Я служу за грошы, і не мая справа судзіць таго, хто мне плаціць. Вось калі ён пакіне мне плаціць – я яго самога прадам, каб заплаціць хлопцам, ды яшчэ і праламлю яму чэрап – за бессаромнасць.

І трэба, трэба думаць на сваёй мове не толькі ў баі. Божа, як даўно я адрэзаны ад радзімы, і няма мне звароту туды.

Ужо дзевяць год. Нават пятнаццаць.

Дзевяць год назад я зразумеў, што ў Германіі мне і маім хлопцам няма чаго рабіць, што там стаў прастор для баязлівасці, вераломства і скнарлівасці. А мы халодныя на полі бітвы і ўскіпаем, калі нам не плацяць.

Акрамя таго, гэтыя немцы называлі нас валляватымі чарцямі і белымі неграмі, хаця ні валляватых, ні альбіносаў сярод нас не было, а былі ўсе такія хлопцы, што адзін мог аддубасіць трох ураджэнцаў кілбаснага раю.

Калі нам усё гэта абрыдла, мы падаліся сюды. Калі грошы ў руках – ці не ўсё адно, якое неба над галавою?

І вось я тут і нават крыху стаў разумець гэтых людзей (да канца іх, відаць, і сам пан бог не зразумее).

У іх халодныя зімы, пякучыя леты і ў крыві то мароз, то агон. Яны верныя, як немцы, але больш за іх неразважлівыя і ярасныя ў бойцы.

Але самае надзвычайнае – іхняя смерць.

Калі памірае іспанец – гэта жудасна. Я не бачыў больш вартага жалю відовішча. Ён мужны і жорсткі, але тут ён дрыжыць і цалуе

каўчэжац з мошчамі. У іх ды яшчэ ў тых, што на поўдзень ад ракі По, бязлітасны і няўмольны бог, чысцец і полымя. Калі памірае швейцарац, немец або француз-гугенот – ён памірае цярпліва, бо спадзяецца на літасць пасля раскаяння.

А гэтыя паміраюць спакойна – за іх заступаецца божая маць, – так спакойна, быццам у іх шчырыя сяброўскія адносіны і з богам і з чортам. І мне здаецца, што яны не вераць у тое і ў другое. Уголас я гэтага не скажу – надта смярдзіць на зямлі смаленым.

Я не бачыў больш незласлівага, лагоднага і кампанейскага народа. І я не бачыў горшых паноў, чым тыя, што стаяць над ім. Яны ўзялі горшае ў Літвы і шляхты, не пакваліўшыся на іх дабрачыннасці і згубіўшы свае.

Каб я быў тутэйшым каралём, маё царства было б даўжэйшым за евангельскае. Тутэйшым людзям мала трэба: толькі штодзённая луста хлеба з салам, гарэлка на свята. І яшчэ дабрата. Калі з імі добры – яны зробяць усё. Нават калі не будзе сала і гарэлкі, толькі павага.

А тыя, хто пастаўлены над імі, – бедная дзяўчынка, бедныя шэрыя вочы! – тыя, хто пастаўлены над імі воляю Сатаніїла, па неразумнасці і карысталюбству свайму даўно пазбавілі іх павагі, а цяпер адбіраюць хлеб і дрыжаць у замках, выдаткуюць у сто разоў больш на нямецкіх, шведскіх і вергерскіх наёмнікаў, бо свае не хочуць іх абараняць.

Я, вядома, не кажу пра швейцарцаў. Паноў на тое і стварылі, каб даць нам хлеб надзённы, калі ўжо яго не могуць на даць нашы ледавікі.

Ах, зямля ты, зямля, чужая і ўсё ж як быццам ужо трошкі і свая! Не да ладу, не да ладу нешта на табе. І, верыцца, хутка тут усё затрашчыць.

Я перавярнуўся на спіну і зноў непракметна стаў думаць па-іхняму. Спахапіўся і пакінуў: ленаваўся. Ды пра такое па-нашаму і нельга падумаць.

Цяжкія ішлі часы. Развялося шмат жабракоў, юродзівых, разбойнікаў. Агнявыя слупы гулялі ў небе, чаго зроду не было.

І ўціск рос, і голад дзяцей, і ганьба дарослых. І ў гэтыя цяжкія гады сталі людзі верыць у такое, ад чаго раней адхрысціліся б і забылі.

Беларусы чакалі прыходу мужыцкага Хрыста. Яўрэі – Месію з Турцыі. Першыя ведалі, што мужыцкі Хрыстос ужо тут, ды пакуль не аб'явіўся. Ведалі, што ўжо і конь яму расце ў мужыцкай хаце – пакуль яшчэ жарабя, белы, а вочы, грыва і хвост залатыя. І хтосьці яго ўжо бачыў і балбатаў аб гэтым у карчме.

– Хутка паедзе, чака-айце. Калі толькі антыхрыст раней не прыйдзе.

Антыхрыста таксама можна было чакаць. Надта ўжо вялікім стала няшчасце, надта злымі сталі людзі.

Нездарма слупы гулялі.

А яшчэ тады ж адбываліся незразумелыя падзеі. У Магілёве, як і на ўсёй прасторы Белай Русі і Літвы, невядома хто і як ставіў нечытальныя пісьмёны чырвонага колеру па цэрквах і касцёлах і другіх будынінах вышыні ў некалькі сажняў, куды існаму не дастаць, і ў замкнёных скрынях; таксама незразумелым чынам былі астрыжаны авечкі, у мужчын бароды, а ў жанчын – косы і іншае.

Ішла цемра.

Непрасвяцімая.

II

Ох і жорсткі быў наш татачка, мужыцкі цар.
Ён баяр ды князёў павыважываў.
Песня

Мне не ўдалося праспаць да раніцы.

Была яшчэ ноч, калі мяне разбудзіў сам Кізгайла. Я запаліў свечку і, нацягваючы вопратку, кінуў на яго позірк. Твар быў бледны, спатнелы, перакрыўлены. І ў вачніцах ад свечкі цені.

"Баіцца? – падумаў я. – Не. Ненавідзіць? Не. Баіцца і ненавідзіць больш баязлівасці, вось што. Але чаму?"

Урэшце, думаць пра гэта не было калі. Я спяшаўся.

– На муры, – сказаў гаспадар.

Праз некалькі імгненняў мы беглі ўжо да Жабінай вежы, што выходзіла на Княгініна поле.

Трывогі пакуль што яшчэ не было чуваць ні сярод прыслугі, ні сярод салдат. На забрале ля вежы стаяў вартаўнік брамы і з ім яшчэ чалавек, жанчына, як я пазней даведаўся, яго дачка, удава Дар'я. Абое маўчалі і глядзелі кудысьці ў ноч. Мы сталі поруч з імі.

Месяц, ужо нізкі і барвовы, хіліўся да далёкага лесу. Ад усіх, нават ад самых маленькіх, узгорачкаў леглі вялізныя трывожныя цені. І толькі лапікі, малюсенькія кавалачкі поля, былі азораны няпэўным аранжавым святлом.

– Што там? – чамусьці ціхім голасам спытаў я.

Дар'я моўчкі ўзняла руку, паказваючы ёю ўдалячынь.

Але ноч была спакойнай, толькі дзесьці чулася песня драча.

– Яна і ўчула, – сказаў вартаўнік, – я сам глухаваты стаў.

– Ды што такое? – зноў спытаў я.

– Вішчыць, – сказала Дар'я.

– Драч? – як бы пытаючы, сказаў гаспадар.

– Не. Вішчыць, – сказала яна.

– Хочаш сказаць "рыпіць"? – спытаў Кізгайла.

– Вішчыць.

Я ведаў, што мясцовыя людзі часам не знаходзяць слоў, што не перашкаджае ім быць някепскімі людзьмі. Адна дзеўка, тлумачачы мне колер сукна, сказала: "Кармазынавы, зеляненькі, як васілёчак". Але цяпер не час быў чапляцца да слоў, і я стаў слухаць, што ж такое "вішчыць".

Песня драчоў стала як быццам галаснейшай. У полі ставала ўсё больш ценю: пранізліва-чырвоны месяц ужо напалову схаваўся за пушчу. Спяваў ужо не адзін драч, а некалькі. А цемра ўсё агортвала поле, і ў гэтай цемры ўсё нарастала птушыная песня.

І раптам я зразумеў: гэта не драч, гэта рыпяць... вазы. Так, гэта рыпелі вазы. Многа, магчыма, сотні вазоў. І гэтая песня нарастала і ўжо рабілася пранізлівай, заглушаючы ўсё.

Я не ведаў, хто гэта едзе ў такой нямой цішыні, калі нічога не чуваць, акрамя песні колаў, але я адчуў, што ў мяне мурашкі пабеглі па спіне.

– Ён, – сказаў Кізгайла, і я зразумеў, хто гэта "ён".

А вазы рыпелі і рыпелі ўначы, і ўжо не заставалася нічога, акрамя гэтага рыпення.

– З'явіўся, варажына, – сказаў гаспадар праз зубы, – што ж, рыхтуйся, Цхакен, заўтра будзем біцца. Насмерць.

Я баяўся за гаспадара, але цяпер мой страх мінуўся. Ён проста быў з той пароды, для якой чакаць небяспекі горш за самую небяспеку.

Я цяпер ведаў, што ён будзе і баяцца, і ненавідзець, але будзе трымацца і не дасць зразумець гэтага. Гэта дрэнна, але ўсё ж гэта лепей, чым відовішча дрыготкай жывёліны.

– Што ж, – сказаў я, – біцца дык біцца. Я доўгі час атрымліваў вашу плату дарма. Праўда, лепей было б мне, як таму ўрачу, усё жыццё атрымліваць яе дарэмна. Але калі так ужо сталася – не трэба непакоіцца, пане.

Я вырашыў не турбаваць людзей і даць ім выспацца. Толькі падвоіў каравул і паставіў каля спячых аднаго хлопца, каб па першым трывожным сігнале падняў усіх. А сам я, захінуўшыся ў плашч, сеў на забрале каля вартаўніка і яго дачкі і стаў драмаць, штохвілінна

прачынаючыся. Гэтыя ночы, калі спіна прыхілена да дрэва ці каменя, былі мне вельмі знаёмыя. Засынаеш і раптам падаеш кудысь. Такія сны, напэўна, бачаць малпы на сваіх дрэвах. Але чым лепшы за малпу салдат-наёмнік? Дурное, агіднае рамяство – вайна.

Такія думкі прыходзілі да мяне за апошні час усё часцей: відаць, я пачаў старэць. Я засынаў і прачынаўся, глядзеў на гэтую жанчыну, якую ніхто не прымушаў сядзець на муры, і бачыў яе закураны белы твар пад хусткаю, вачніцы ў ценях.

Нічога няма прыгажэй за жаночы твар у прыцемку. Таму, напэўна, і кахаюць у гэты час.

У адно з такіх абуджэнняў я ўбачыў, што ўжо не толькі светла, але вось-вось узыдзе сонца. За намі быў блакітны туманны Дняпро. Перад намі – роў, невялікае, ледзь узгорыстае поле, а далей – лясістыя ўзгоркі і сярод іх ружавеючая роўнядзь Святога возера.

Сонца ўжо выкінула з-за лесу тысячы чырвоных дзід, заліло расплаўленым золатам маленькія воблачкі ля далягляду. Але я пазіраў не на яго.

Поле за гэтую ноч, здавалася, абрасло маладым лесам. Па абодвух баках вялікай лагчыны сядзелі, хадзілі, ляжалі тысячы людзей. Дзіды, уторкнутыя ў зямлю, рацішчы[1], адагнутыя ў шыйцы косы. Далей, каля лесу, сотні вазоў выставілі да неба свае аглоблі.

Падымаўся ў бязвоблачную вышыню дым вогнішчаў. Мы бачылі як на далоні ўсё поле, акрамя шырокай лагчыны. Але, напэўна, і там былі дюдзі.

На адным з недалёкіх узгоркаў стаяла кучка людзей. І гэтыя людзі былі не ў белай вопратцы, значыць, не мужыкі.

У мяне добрая падзорная труба са шкельцамі галандскай ручной шліфоўкі. Я навёў яе на ўзгорак і ўбачыў трох чалавек.

Сярэдні быў высокі і тонкі ў касці. На ім – барвяны плашч, што падаў амаль да зямлі. Доўгія, да плячэй, валасы, ладная пастава, вельмі вузкія клубы. Гэты чалавек нешта казаў двум другім, паказваючы рукою на муры. Поруч з ім стаяў юнак ці малады мужчына, крыху падобны да сярэдняга. На ім былі светлыя латы і таксама плашч, толькі блакітны. А з другога боку стаяў каржакаваты чалавек, ніжэйшы за іх ростам і моцна сутулы. Ён быў без барады і вусоў, хоць па гадах мог быць бацькам маладому. На бязвусым латы былі цёмныя, а плашч зялёны з чорным.

– Дай, – сказаў мне Кізгайла, які зноў выйшаў на мур.

Ён прынік да трубы, аж падаўся наперад.

---

[1] Рагаціны.

– Яны, – сказаў ён пасля нядоўгага маўчання. – Той, што ў барвяным, – сам Раман, ваўчына драпежная. Ну, пападзіся ты мне – я табе пакажу, як гэта быдла ўзнімаць.

– А астатнія?

– У светлых латах – Лаўр, з Раманавай варты. Байструк.

– Яны чамусьці падобныя.

– Баюць, што там не абышлося без Якуба, якога я на той свет адправіў. А чорны – Пятро, таксама брат Раманаў. Родны... Адроддзе дэйноўскае! Здохлага зубра запалявалі...

Лаянка Кізгайлы мне здалася непрыстойнай. Усякае нараджэнне законнае, калі ад яго нараджаецца добры воін ці дзеўка, створаная для радасці і кахання.

А лаяцца тым, што людзі родам з былога Дэйноўскага княства, краіны лясоў і балот, і зусім бязглузда.

Яны не пасылалі да нас вяшчальніка, не марнавалі часу. Кожны разумеў, што адзін не адмовіцца ад аблогі, а другі не здасца.

– Ану, майстра, – сказаў я пушкару, – даўбані па гэтых, на пагорку.

Гармата вырыгнула полымя і рэзка адкацілася назад.

Я ў падзорную трубу бачыў, як дасланы намі чыгунны мяч ударыў у схіл узгорка, ніжэй военачальнікаў. Там узнялося лёгкае таючае воблачка. Заржаў і стаў на дыбкі гожы белы конь, якога трымаў за повад хлопец у белай кашулі.

Раман стаяў усё так жа спакойна, не зрабіўшы і кроку ўбок. Потым ён махнуў рукою і стаў спускацца з узгорка. За ім – два астатнія. Мы так на іх заглядзеліся, што не заўважылі, як з лагчыны, зусім блізка ад нас, пачалі, быццам самі сабою, выпаўзаць вазы. Адзін, другі, дзесяты, дваццаты.

На іх было навалена нейкае дзіўнае рыжае сена, і яны паўзлі лугам, а людзі, якія штурхалі іх, хаваліся за гэтым сенам.

Я доўга не разумеў, у чым справа, аж датуль, пакуль яны не падзяліліся на два патокі. І гэтыя дзве змяі павольна паўзлі да драўляных брам у нашым вале.

– Бі па вазах! – крыкнуў я.

Мур расцвіў клубамі парахавога дыму. Але было позна ўжо. Вазы паспелі ўпрытык падваліць да абедзвюх брам, і раптам, амаль адначасова, да неба ўзняліся вялізныя, рудыя, як хвост лісіцы, палаючыя языкі агню. Палала сена, аблітае нечым гаручым, палала сама зямля вакол. Пад прыкрыццём агню беглі да пагорка мужыкі.

Цяпер мне стала ясна, чаму Ракутовіч спусціўся з узгорка, чаму адзін з мужыцкіх атрадаў пайшоў за ім: яны рыхтаваліся бараніць вазы, калі б нам уздумалася зрабіць вылазку.

У нас не было сілы на абарону вала: занадта нечакана ўстала пагроза. Мы свядома абмежавалі сябе мурамі замка. Але ўсё адно гэты пажар быў непрыемны. Вал перастаў існаваць як перашкода. Цяпер ужо нішто не перашкаджала паднесці да муроў лесвіцы або падкаціць таран, каб ён у іх быў.

Мы зрабілі першую памылку.

Затое тыя, што рыхтаваліся абараняць вазы, і сам Раман былі цяпер амаль у нашых руках. Я паставіў на мур сотню сваіх хлопцаў з мушкетамі і стаў падаваць каманду:

– Ступі! Стой! Мушкет да бока! Фіціль – з курка! Фіціль – на месца! Мушкет да рота! З брамкі здзьмухай! Набой бяры! Мушкет уніз! Порах на брамку – сып! Утрасі! Брамку зачыні! Страсі! Здзьмухай! Мушкет да левага бока! Порах і кульку – у мушкет! Клак – на брамку! Забойнік бяры! Кульку і клак дабі! Забойнік на месца ўсунь! Правай рукой мушкет падымі! Левай падсошак рыхтуй! Мушкет на вілкі! Гатоўся!

Я ведаў гэтыя каманды на памяць ужо дваццаць восем год. А мае хлопцы былі лепшыя стралкі з усіх, якіх я ведаў. Не мінула і дзесятай часткі гадзіны, як мур ашчацініўся гатовымі да стральбы ручніцамі.

– Палі! – крыкнуў я.

Зубцы завалакло едкім парахавым дымам. Я праз яго бачыў, як падалі, круціліся ў віхуры, мітусіліся людзі ў белай вопратцы.

І яшчэ бачыў я чалавека ў барвяным плашчы. Ён крычаў нешта жахлівым голасам, узнімаючы адной рукою старадаўні двухручны меч.

Сашчэраны рот і грыва валасоў, што ўстала дыбарам, – ад іх нельга было адарваць вачэй. Калі дым разышоўся, на траве засталося дзесяткі тры нерухомых белых цел.

І яшчэ я пабачыў, што на лініі ўзгоркаў стаіць надзіва роўны строй мужыкоў. Я не ведаў, нашто ім спатрэбілася стаяць там. За іхнімі спінамі былі толькі вазы. Другі атрад – іначай не назавеш, бо гэта было войска, а не бязладны мужыцкі натоўп – набліжаўся здалёк строем у тры плутонгі. Ён стаў значна лявей Жабінай вежы. І пад маўклівай аховай гэтых людзей натоўп мужыкоў, узброеных чым папала, цягнуў ад пагоркаў дзесятак доўгіх асадных лесвіц.

Чорт бы пабраў гэтага мужыцкага караля! Ён ваяваў зусім не па правілах. Праўдзівей, не па тых правілах, па якіх ваююць ва ўсім

свеце. І незразумела па якіх. Я глядзеў на яго вялізную постаць, што махала мячом. Мы далі другі залп па натоўпе з лесвіцамі і па ім. Але ён быў цэлы і здаровы, быццам і агонь яго літаваў.

Я ўбачыў перакошаны твар Кізгайлы. Ён кідаўся па забралу, лаяў пушкароў самымі чорнымі словамі. Схапіў ядро, паляпаў, быццам кавун, па крутых баках і заштурхнуў у жарало “Маркабруна”, гарматы французскага ліцця, самай вялікай з тых, што стаялі на мурах. Потым затрос кулакамі ў паветры:

– Палі!!!

“Маркабрун” раўнуў. І зноў, як заварожаны, стаяў на месцы чалавек у плашчы. Ядро вырвала з рук хлапчыны, што стаяў поруч з ім, прапар і ў трэскі разбіла адну з лесвіц.

Астатнія лесвіцы паўзлі далей у атачэнні кос, сякер і віл. Кізгайла і я адначасова зразумелі, што, калі лесвіцы ўкрыюць за валам, паблізу ад спаленай брамы (ад яе засталіся ўжо толькі вуголлі і палаючыя бэлькі), наша справа пагоршыцца. Тады атрад маўклівых вартаўнікоў кінецца да іх, і ніхто не ўратуе муроў ад штурму.

Унізе, ля брамы, стаяла напагатове кірасірская сотня.

– Капітан, – крыкнуў Кізгайла, – падрыхтуйся! Зламі іх, знішчы лесвіцы, пастарайся ўзяць Рамана.

– Добра, – глухім голасам адказаў з-пад забрала капітан.

Форткі брамы разышліся з цяжкім рыпам, упаў пад'ёмны мост, і адразу ўсё запаланіў трывожны нарастаючы грукат капытоў па жалезе моста.

Кірасіры рынуліся ў атаку.

Усе на вараных конях, усе ў чорных латах і шаломах, увянчаных чорнымі пер'ямі, яны імчалі выцягнутым клінам, і я не ведаю, што здолела б устаяць перад іхнім імклівым ударам. Сам Аляксандр не адмовіўся б камандаваць такой сотняй.

Абаронцы на мурах праводзілі іх лямантам захаплення, і нават мая халодная кроў ускіпела, як у першым баі, калі мне было пятнаццаць год.

– Сячы іх! Хапай!

Мужыччо каля лесвіц замітусілася, але не стала ўцякаць. Яны, праўда, кінулі лесвіцы, але не ўцякалі, а адступалі. І апошнімі падаваліся задам людзі з косамі ў руках.

Капітан, яка скакаў наперадзе, падаў знак рукою ў жалезнай пальчатцы. І адразу, як зладжаны хітравумны механізм, жалезны клін пачаў мяняць строй: дваццаць ці трыццаць латнікаў аддзяліліся ад лятучага атрада і паскакалі да тых маўклівых, што стаялі на схіле строем у тры плутонгі.

Астатнія на хаду ператварылі кінутыя лесвіцы ў кучу ашчэпкаў. Яны падазрона лёгка ламаліся, і я ўжо ў той момант западозрыў няладнае. Але думаць не было калі. Я наогул не ведаў, на каго глядзець, на тых, што ляцелі да маўклівай аховы, ці на тых, што спасцігалі атрад уцекачоў.

Я паспеў толькі заўважыць, што першая плутонга мужыцкага атрада раптоўна апусцілася на калені, выставіўшы наперад доўгія дзіды, а другая, стоячы, пачала весці беглы агонь паўзверх яе галоў. Адзін коннік пакаціўся цераз галаву каня, другі, трэці. Гэта было жахліва! Трапнасць стральбы можна было растлумачыць толькі так: Ракутовіч паставіў у гэты атрад паляўнічых. Але як ён мог за тыдзень навучыць людзей так спрытна арудаваць дзідамі?

Поўны трыумфу лямант перарваў мае думкі. Я ўбачыў, што кірасіры дагналі ўцекачоў і ўрэзаліся ў іх усім цяжарам сямідзесяці закутых у жалеза коннікаў, усім цяжарам сямідзесяці конскіх цел. Мужыкі яшчэ спрабавалі супраціўляцца, яны з размахам секлі косамі ля самай зямлі, спадзеючыся падрэзаць коням сухажыллі ля бабак. Але гэта была безнадзейная справа.

Ракутовічу – краем вока заўважыў гэта – падвялі каня, і ён памчаў да тых, каго забівалі: толькі барвяніца запаласкалася на ветры. Ён, напэўна, хацеў біцца разам з гэтымі асуджанымі на смерць.

Цяпер яго аддзяляла ад чорнага коннага атрада толькі вузкая палоса людзей у белым адзенні. І тая палоса радзела на вачах.

Калі кірасіры адкінулі вісклівы натоўп сажняў на сорак, на вызваленай прасторы калаціліся ў сутаргах шэсцьдзесят коней і бялела не менш трыццаці мужыцкіх цел. Ракутовіч, размахваючы мячом, крычаў нешта, але ўсё ўжо было скончана: мяцежнікі рассеяліся ў розныя бакі, кінуліся ўрассыпную.

Ён быў храбрым, але дурным военачальнікам, гэты чалавек у барвяніцы. Ён рушыў лесвіцы да муроў без прыкрыцця, без гарматнай пальбы, нават без конніцы, пад аховай дрэнна ўзброенага зброду.

Між тым меншаму атраду, значна парадзеламу, удалося ўсё ж пацясніць мужыцкі атрад з узгорка. На гэтым яны супакоіліся і кінуліся даганяць астатніх. Але тым і самім не было чаго рабіць: не гнацца ж за мужыкамі, што разбягаліся па адным.

Чалавек у барвяніцы ўсё яшчэ гойсаў ля перадавых кірасіраў. Скінуў з каня аднаго, выбіў цяжкі палаш з рук у другога. Смерці мо хацеў ці шукаў выпадку, каб вызначыцца? Крычаў нешта – відаць, здзеклівае.

Чырвонае так і развявалася на ветры. І толькі калі кінулася за ім уся сотня, раптам крыкнуў страшным голасам і прыпусціў каня да сваіх.

Чорны атрад ляцеў за ім, і адлегласць паміж чорнай плямай і чырвонай іскрай павольна скарачалася.

Коннік ляцеў да таго строю, што прыкрываў вазы. І гэта было дарэмна. Капітан казаў праўду: адзін латнік варты трыццацёх, нават храбрых, нават тых, што не ўцякаюць. Раскіданы па ўсім полі мужыцкі натоўп, што адчайна ўцякаў, быў прыкладам гэтаму. Зараз і ад тых, што наперадзе, не застанецца мокрага месца.

Чалавек у барвяніцы прышпорыў каня і стаў лёгка адрывацца ад спасцігачоў. Звярнуў направа, нябачным скачком паслаў каня цераз шырокую канаву і праваліўся за ўзгоркам, толькі яго і бачылі.

А маўклівы чорны касяк з ходу ўрэзаўся ў мужыкоў, што абараняλі вазы.

... Не, не ўрэзаўся. У апошняе імгненне тыя кінуліся бегчы хто куды. Большасць знікла пад коламі вазоў. Нейкіх дзіўных высокіх вазоў...

Сляза набегла на вочы. Я змахнуў яе далонню, зноў прынік да трубы і...

– Назад! – закрычаў я такім голасам, што сам спалохаўся.

Гэта былі не простыя вазы. Гэта былі вазы, акутыя меддзю па градках і на сажань вышэй градкі. І нават уніз, прыкрываючы колы, спускалася медная “спадніца” з выразамі, і раптам гэтыя вазы ўсе ашчацініліся: зверху дзідамі і нечым незразумелым, а знізу, з-пад “спадніцы”, бусакамі.

– Назад! – роў я.

Куды там! Хто б мог пачуць? Ды яны і не маглі стрымацца, з ходу наляцеўшы на вазы.

І раптам бусакі знізу сталі прагна шнарыць у паветры, хапаць прыцёртых упрытык коннікаў за што папала, сцягваць іх з коней ці прыгінаць да меднай абшыўкі. А зверху пачалі рытмічна ўзлятаць і апускацца на галовы людзей – я цяпер зразумеў, што гэта, – мужыцкія, акутыя на такі выпадак жалезам, цапы.

Так, гэтыя людзі ўмелі арудаваць бусакамі і малаціць – гэта ж была іх штодзённая праца. І яны малацілі, малацілі адчайна. У іх было мала мушкетаў, і яны ведалі, што страла, ці каса, ці меч не возьмуць міланскіх і нюрнбергскіх латаў, што чалавека, закутага ў іх, можна толькі аглушыць.

Яны малацілі. Нават да нашых муроў даляцелі немыя крыкі тых, каго забівалі, і дзікае гігатанне спалоханых коней.

Божа! Цяпер я зразумеў усё. Зараз і ад тых, што наперадзе, не застанецца мокрага месца. Гэтыя падазрона слабыя лесвіцы, гэты натоўп, што загадзя асудзіў сябе на смерць, гэты коннік, якога наганяе сотня, – усё гэта было падсадкай, усё гэта было прыманкай. І капітан, як пячкур, папаўся на гэтую вуду, на хітрыкі гэтага азіята і варвара. Варвар мог цяпер быць спакойны наконт конных вылазак.

– Дык прападай жа, дурань, – плюнуў я са злосці.

Парадзелая больш чам напалову сотня адхлынула нарэшце ад дзівоснай спаруды і пачала адступаць да муроў, спадзеючыся, як сказаў нейкі пісака, “больш на шпоры, чым на мячы”.

Іх падбадзёрваў роў з муроў, але я ўжо ведаў, з кім мы маем справу, ведаў, што гэты не выпусціць іх так проста са сваіх рук.

Я здзівіўся толькі аднаму: што магло прымусіць гэтых, з лесвіцамі, пайсці на справу, якая не абяцала жыцця, а толькі смерць? Напэўна, нясцерпным стала жыццё.

Рэшткі атрадаў кірасіраў скакалі на ўсю моц, а я ўсё паўтараў сам сабе:

– Не спадзявайцеся, гэты не выпусціць, гэты не з тых.

І я не здзівіўся, калі з лагчыны, напярэймы адступаючым, вылецела конніца. На чале яе імчаў чалавек у барвяным плашчы са сваімі двума спадарожнікамі. І было гэтых конных людзей не больш за дзве сотні, але я пазнаў па шэрых ваўчыных шапках з заломам на левае вуха, што гэта за людзі.

Так носяць шапкі толькі конныя пастухі, што вандруюць з панскімі чародамі па ўсіх пясчаных і вапняковых пустэчах гэтай зямлі.

Божа, умяшаліся ў бойку нават гэтыя людзі, што ўдарам канца карбача[1] па носе забіваюць ваўка! Каго ж ты не пакрыўдзіла, панства гэтай зямлі?!.

Я ўжо амаль не глядзеў, як яны дагналі кірасіраў, урэзаліся ім ва фланг, змялі і адрэзалі ад замка. Я толькі глядзеў, як гэты барвяны д’ябал арудаваў двухручным мячом – па-даўнейшаму.

І яшчэ бачыў я, як чорна-зялёны, быццам тванню запэцканы, галаморды Пятро – у яго, як у многіх дэйноўцаў, кепска расла барада – збіў сваім канём цяжкага каня капітана, на хаду выхапіў кірасіра са страмёнаў, перакінуў яго цераз сядло і загікаў, засвістаў разбойніцкім посвістам, памчаў прэч ад месца сутычкі – каб не адбілі.

Не ўцёк ні адзін кірасір, яны расправіліся з імі хутка, як галодны швейцарац з засмажаным трусом. Частка засталася ляжаць

[1] Карбач – кароткі бізун.

на зямлі, і з іх на месцы здзіралі латы, частку пагналі на вяроўках у бок лясістых узгоркаў.

А гэтыя прыскакалі амаль да самых муроў і пачалі нахабна гарцаваць пад імі. Пасля я ўжо і сам не мог разабрацца, хто каго лае – такія праклёныя сыпаліся з муроў і з поля:

– Зямлянікі, рыдлёўшчыкі!

– Воўчая сыць! Недаедкі!

– Студні салілі!

– Шклоўскія іспанцы!

– Недасекі! Сабаку з’елі!

– Хамаўшчына чарнаногая!

– Гудзі, дуброва, едзе князь па дровы! Матку на суку-харта змянялі! Польская косць, ды сабачам мясам абрасла!

Я загадаў страляць, але тыя так і пырснулі на ўсе бакі. Чалавекі тры звалілася, ды і тых яны падхапілі на ляту, забралі.

Цяпер мы маглі страляць без апаскі. І мы стралялі з гадзіну па асобных кучках людзей. Трымаліся яны нахабна. Два праехалі пад самымі мурамі на кірасірскіх конях і ў латах. Адзін – на кані, пакрытым замест падкладкі ксяндзоўскай рызай (з Рагачыка, відаць, узялі).

Я супакоіўся, нават перамаргнуўся з Дар’яй, што блукала па двары. Усміхнулася і яна мне.

Тыя таксама, відаць, адпачывалі.

А потым стала не да адпачынку. Таму што вазы, тыя самыя, акутыя, пачалі паўзці з-пад лесу да цытадэльных муроў. Іх кацілі надзейна прыкрытыя мужыкі.

Зноў з’явілася конніца і замаячыла па ўзгорках. Так, з вазамі яны прыдумалі хітра, амаль як чэшскія ерэтыкі калісьці. Праўда, “Вагенбург” Ракутовіча быў лягчэйшы і, відаць, больш рухомы. Калі ён прапоўз палову адлегласці да крапасных муроў – мы пачалі паліць па ім з гармат. Пару разоў трапілі. Але праз імгненне адтуль таксама груккнулі гарматы, шэсць штук, роўна столькі, колькі было на мурах у Рагачыку.

Пырснулі каменныя асколкі ля самага майго твару, паваліўся і застагнаў адзін з маіх хлопцаў.

А яны палілі, пасоўваючыся бліжэй і бліжэй. Абваліліся два-тры зубцы на сцяне.

Пятро, які нешта гарланіў пушкарам, раптам шалёным намётам памчаў да Жабінай Вежы. Асадзіў каня і, прымушаючы яго гарачыцца, закрычаў дурным матам:

– Здавайцеся, штурмаваць будзем!

Кізгайла вырваў у пушкара, што наводзіў гармату, фіціль, вылаяўся, сунуў яго ў запальнік. Пашча гарматы вырыгнула агонь.

Мы пачулі глухі ўдар. Потым на тым самым месцы, дзе куражыўся Пятро, устаў косы, завіты, як гляйсар, слуп дыму. Конь узняўся на дыбкі і перакуліўся на спіну, прыціснуўшы сабою седака.

Муры завылі трыумфуючы.

Я не бачыў, як яго падхапілі, – агонь стаяў жахлівым. “Вагенбург” усё набліжаўся, і поле за ім варушылася: ішоў народ. Зноў неслі лесвіцы.

... Прыйшла наша чарга. Я загадаў Аўгусту Тухеру, адзінаму сярод нас немцу, стаць на маё месца, сачыць за боем і падаваць мне сігналы гукамі ражка, а сам спусціўся да брамы. Вылазка стала неабходная бо мая абарона – гэта напад. “Вагенбург” трэба было знішчыць. Трэба было пазбавіць іх гармат.

Мы выйшлі з крэпасці і рушылі на іх трыма плутонгамі, па чарзе страляючы цераз галовы пярэдніх.

Яны кінуліся на нас утрапёна, але швейцарца цяжка збянтэжыць. Мы вялі свой беглы агонь і ішлі.

Нядобра выхваляцца сваімі дзеяннямі, і я скажу толькі, што мы прымусілі да ўцёкаў пярэднія гурты, праніклі да “Вагенбурга” і закляпалі тры гарматы з шасці.

А потым прыйшла расплата.

З дыму, што, як коўдра, укрываў поле, паказаліся раптоўна конныя і пешыя гурты ў белым. Іх было многа. І наперадзе ішоў чалавек, які трос двухручным мячом. І яны ішлі не спяшаючыся, а над іхнімі галовамі лунаў дзікі і суровы харал:

Пан бог цвярдыня,
Цвярдыня мая,
Узняў ён длань маю.
Як Давід на Галіяфа –
Узняў.
Вось мой народ,
Як ільвіца, устае.
Пан бог над намі,
З намі ў гневе,
З намі ў гневе
Наш народ.

І раптам яны кінуліся наперад. Гэта была нібы лавіна.

– Святы Юры! Русь! – крыкнуў Ракутовіч, і конь Лаўра шарахнуўся ў бок ад гэтага страшнага голасу.

Яны сутыкнуліся з намі, і нас не выручылі нашы дзіды, абцяжараныя целамі, абсечаныя кароткімі кордамі мужыкоў.

Ракутовіч сек двухручным мячом. І яго атрад не адступаў ад яго. А мы падаваліся задам, захлынаючыся сваёй і чужой крывёю. Падаваліся занадта паспешліва, каб гэта можна было назваць адступленнем.

Хутка за намі, патрапанымі і зраненымі, з трэскам зачыніліся форткі брамы. Я ўцякаў другі раз: першы раз пры Брэйтэнфельдзе[1] – я быў тады ў імператарскай арміі, і намі камандаваў Цілі, а супраць нас быў шалёны швед – і тут, ад мужыкоў.

І я не стыдаюся гэтага. Калі б гэтаму варвару даць тых самых утрапёных мужыкоў, але закутых у латы і ўзброеных сталлю, ад яго ўцякаў бы і сам Густаў[2]. На наша шчасце, у іх былі мяккія шапкі з вяровачным шаломам паўзверх. Гэта ратавала іх ад удару шаблі, але не ад дзіды і свінцу.

А потым пачалося пекла аблогі: лесвіцы, што паўзуць уверх, агнявыя патокі смалы, каменні.

Мы кідалі таксама гліняныя збаны з чалавечым калам. Гэта прыдумаў Кізгайла, і гэта была добрая выдумка, бо я не бачыў людзей больш ахайных, чым русіны. Яны тройчы ў тыдзень мыюцца ў сваёй лазні, змываючы з сябе выпарэнні. А па суботах яны ператвараюць гэта ў свяшчэннадзейства, хвошчуць адзін аднаго венікамі, п'юць ягадныя воды і качаюцца ў снезе. Таму яны заўжды моцныя і здаровыя, і, кажуць, гэта вельмі спрыяе добрым паводзінам у ложку. Аднойчы я паспрабаваў залезці на гэты іхні "палок" і скажу вам, што свінец і агонь, якімі асыпалі нас пры Бургштале паблізу Вольмірштэта, дзе нас упершыню адлупцаваў швед, – дзіцячыя забаўкі ў параўнанні з той лазняй. Я адчуваў сябе, як у пекле.

Але не было выдумкі горш за гэту, бо, скажу я вам, гэтыя людзі надта адчувальныя да абразы. Іх не так абражала унія і зняслаўленыя цэрквы, як тое, што іхніх праваслаўных нябожчыкаў не дазвалялі вывозіць з горада іначай, як праз тую браму, праз якую вывозілі нечыстоты і іншы бруд.

Гэты штурм! Я радаваўся толькі таму, што, як заўсёды падчас бойкі, думаў на мове маёй радзімы. Гэта добра.

Але ўсё адно жахлівей не было нічога. Падалі лесвіцы, а яны лезлі і лезлі, як чэрці, і хутка сеча закіпела на мурах.

---

[1] Месца бітвы ў германа-шведскай вайне.
[2] Густаў-Адальф – шведскі кароль.

Кізгайла, я і мае людзі секліся адчайна, але яны цяснілі нас, а наперадзе іх выў і крыўляўся сівы і маленькі, як кобальд[3], чалавечак у рыззі – іхні святы.

І яшчэ бачыў я, як сек двухручным мячом дэман у барвяніцы. Яго скінулі ўніз разам з лесвіцай, але яна зачапілася за рог вежы і спаўзла ўніз, і ніхто, здаецца, не загінуў.

Мужыкі з навакольных вёсак сцякаліся на ўзгоркі і глядзелі на пабоішча, як на бойку ля шынка.

– Зляцелася груганнё, – хрыпеў Кізгайла, гледзячы на іх і з нянавісцю адбіваючыся ад тых, што нападалі.

Потым ён кудысьці знік.

А нас адцяснілі да сцяны глухой Саляной вежы, і тут мы, сорак швейцарцаў, стаялі, ашчаціні ўшыся зброяй, і рыкалі на абкружаўшых нас ворагаў.

Гэта было ўжо толькі справай гонару, таму што абараняць не было чаго.

Замак быў узяты.

Дзіды абкружалі нас з усіх бакоў, нават зверху, з забрала сцяны. Варта было нам вякнуць – і з нас зрабілі б вожыкаў. Нас засталося сорак. Астатніх забілі альбо ўзялі ў палон. Вачыма, затуманенымі стомай, я ўбачыў, як перад намі з'явіўся Лаўр у светлых латах, у блакітным плашчы, у блакітных саф'янавых чаравіках, усмешлівы, млява-зняможаны, быццам не з сечы, а са спаткання. Ён крыху нагадваў архангела Гаўрыіла, і гэты архангел кінуў нам словы, поўныя лянівай паблажлівасці:

– Кідайце зброю, ці што.

– Не, сынок, – адказаў я, – не ты нам гэтую зброю даў, не табе і загадваць.

– Не строй дурня, бацька, пашкадуй хлопцаў.

І раптам аднекуль з вышыні, з балюстрады, пачуўся безжыццёвы голас:

– Складзі зброю, Канрад, я дазваляю. Ты зрабіў усё, што мог.

Гэта быў голас Кізгайлы. І я ўбачыў пана на балюстрадзе. А за ім стаяў Дамінік з дзідай. І Дамінік кінуў зверху да ног Лаўра ключ і крыкнуў:

– Трымайце. Я замкнуў дзверы ў кутні пакой.

– Які пакой? – узняў бровы Лаўр.

– У той, адкуль падземны лаз.

---

[3] Дух лясоў у германскай міфалогіі.

Я апусціў галаву. Дзіўнае чынілася тут. Гаспадар хацеў уцячы, пакінуўшы нас на ярасць мужыкоў. А схілены ім да каталіцтва мужык, яго апора, не даў яму гэтага зрабіць. І тады я наступіў нагою на свой клінок і зламаў яго, а кавалкі кінуў да Лаўравых ног. Нас абяззброілі. А Кізгайлу, напэўна, разарвалі б на месцы, каб не зарыпелі форткі брамы і не заляскалі ланцугі моста, які апусціўся. Я ўбачыў проста перад сабою дарогу, гурмы людзей па абодва бакі і конніка на белым кані, што ехаў да брамы. Твар яго быў запэцканы сажай, барвяны плашч раздзёрты, але вочы палалі агнём, што ўсяляў жах.

Народ выў. Я бачыў змардаваныя твары, па якіх цяклі слёзы, і іншыя твары, ярасныя. Але і на тыя і на другія было страшна глядзець.

– Раман! Нарог божы! – Роў рабіўся нязносны. – Ратуй! Дай зброю! Рай будуюць на нашым пекле! Ратуй нас! Ратуй!

Я ўбачыў, як некалькі чалавек кінуліся цалаваць сляды капытоў яго каня, і, слова гонару, гэта не было смешна.

А ён крычаў у адказ сваім страшным трубным голасам:

– Праваслаўныя, усё бярыце! Зямля – ваша, хлеб – ваш, вера – ваша! І доўбні – вашы! А гэтым нечасціўцам – меч!

Але нават яго голас заглушыў роў і крыкі “ратуй!”. Калі ён мінуў арку брамы і ўехаў у двор – да ног яго каня сталі шпурляць скручаных шляхціцаў, усіх, хто ўцалеў пасля бітвы на мурах.

А народ усё роў, і тут я ўпершыню пачуў, як выгукнулі тое яго імя, якое праз месяц стала крылатым:

– Барвяны ўладар! Барвяны ваяўнік!

Конь мерна ступаў паміж целамі, і капыты звонка білі аб камень. Белы конь з залацістымі вачыма. А гэты сядзеў на ім як уліты. Бачыў я грыву непаслухмяных і бліскучых попельных валасоў, што адлівалі золатам, ёмісты чэрап з вялікім ілбом, цвёрда сціснуты вялікі рот, жорсткія жаўлакі на шчоках, прамы і крыху кірпаты нос.

Аблічча, што наганяе жах. Але жахлівей за ўсё былі вочы, незразумелыя па колеру, то шэрыя, то сталёвыя. То залацістае ў ім прамільгне, то нават трохі зялёнае, разъюшанае. Доўгія, светлыя, незразумелыя вочы.

І гэта галава была закінутая назад, бы ў нязмернай гардыні, а жылістая рука ўладна сціскала павады. І конь адчуваў гэтую руку і ішоў палухмяна, дрыжучы кожнай жылкай, касавурачы шалёным вокам і стрыгучы вушамі.

Потым я даведаўся, што такая пасадка галавы ад нараджэння, а позірк ад неастылага яшчэ ап'янення бітвай, але тады ён здаўся мне такім жахлівым, што я жахнуўся за кожнага, кінутага да яго ног.

Конь стаў пасярод распластаных цел. А ён сядзеў і глядзеў на мяне.

– Найміт, – усміхнуўся ён. – Але ты добра біўся. Развяжыце іх.

Народ кінуўся выконваць яго загад.

– Хочаш служыць мне?

– Не, пане.

– Называй па імені.

– Не, Раман.

– Правільна, сорам ад аднаго гаспадара адразу пераходзіць да пераможцы. Ты эшчэ не да канца запрадаў душу. Вось табе загад: вартуй пакоі...

І ўзвысіў голас:

– Рабунку не будзе, людзі. Лаўр, падлічы хлеб, срэбра, худобу. Падзялі на дзве паловы. Адну няхай бяруць мужыкі і раздзеляць па беднасці. Ад другой паловы трэцюю частку – на зброю і харч, а дзве трэці – падзяліць паміж сем'ямі тых, хто браў замак. Па храбрасці. І не забудзь тых, што загінулі ля фальшывых лесвіц.

Змоўк на імгненне.

– А замак не ўзрывай. Ён нам яшчэ можа спатрэбіцца.

Народ адказаў радасным ровам. Паляцелі ўгору магеркі і ваўчыныя шапкі.

– А з гэтымі што рабіць, Раман? – спытаў мужык з рацішчам.

– Шляхта, – быццам упершыню заўважыўшы, сказаў ваяўнік. – Паглядзіце, што ў іх на шыі. З праваслаўным крыжам – пакіньце заложнікамі. У каго рымскі агнусек[1]...

Ён замяўся:

– Хай мужыкі і сярод праваслаўных, і сярод каталікаў адшукаюць злых. Аддаю іх у вашы рукі. Добрых – пусціце на ўсе чатыры вятры і адбярыце слова не чыніць шкоды. Няхай крыж цалуюць. Астатніх – у заложнікі.

Пачалася сумятня. Хутка меншую частку палонных павялі за браму – далей ад граху. Засталося чалавек сорак, і сярод іх Крот.

– Пастаўце на калені, – сказаў Ракутовіч, – няхай і яны на мужыкоў знізу паглядзяць.

Крот супраціўляўся як мог. Твар яго быў наліты крывёй і, калі выбарнага ўсё ж паставілі на калені, стаў жахлівым.

– Сволач, прадажнік, блакітнай крыві здрадзіў! Ну, трымайся, Раман! Забыў, хто ў краіне станавы хрыбет? Нобілі, баярства, дваране! Яны табе даруюць, думаеш?

---

[1] Агнец божы; каталіцкі нашыйны знак.

– Ваша дараванне – сабаку пад хвост, – загрымеў Ракутовіч. – Мужык – станавы хрыбет усяму. А вы яго ў пекла ўвергнулі.

Крот выгінаўся ў дужых руках, спрабуючы ўстаць. Ён ужо не крычаў, а хрыпеў:

– Юда! Ці не мужыцкая зязюля пабывала ў тваім гняздзе? Юда!

На лбе Ракутовіча набракла жыла. І такога голасу я таксама яшчэ ніколі не чуў. Ціхі, ён узняўся на канец да трубнага:

– Аспід. Васіліск. Выпоўзіна змяіная. Ты ці многа разумееш у гонары? Ваш гонар у Варшаве Жыгімонту пяткі лізаў. Ваш гонар адзінаверцаў маскоўскіх пад Воршай разграміў і пакуты ім чыніў смяротныя. Ваш гонар сваіх беларусцаў на прэнг вешае. Да чаго вы народ русінскі, божы народ, давялі ў подласці сваёй? Дзеў на чужацкі ложак шпурнулі. Краіну ўсю! Слёзы яе вам сэрца не абцяжарваюць?! Веру змянілі, хрыстапрадаўцы! Народ прадалі, гандляры! Сваімі рукамі пятлю на яго звілі ды самі і надзелі. Ва ўніжэнні, ва ўціску ён небу вапіе, а вы лікуеце!

І захрыпеў горлам:

– Я дваран здрадзіў, а ты здрадзіў край. Мне гарэць, а табе пакі. Ды мне, можа, яшчэ і даруе пан бог, бачачы, што скроні ў мяне ад мучэнняў сівеюць. А табе – няма літасці.

– Ды не бядуй ты так, – жаласна сказаў мужык. – Кажы, што рабіць з імі, ды і канцы.

– Твая праўда,– сказац Раман,– вядзіце іх за муры. Пад корань!

Натоўп закіпеў, цягнучы пад арку палонных. Цішу прарэзаў чыйсьці немы лямант. Потым усё сціхла.

Сціхла таму, што пад арку з-за муроў ішло павольнае і маўклівае шэсце. На плячах мужыкоў плылі насілы з вялізным каржакаватым целам Пятра.

Распасцёрты на іх, велічэзны, з закінутым падбароддзем і раскіданымі валасамі, ён павольна плыў нагамі ўперад. Латаў на ім не было. Чорна-зялёны плашч прыкрываў калені, што тырчалі ўгару.

Знялі шапкі. Раман прыдушаным голасам спытаў:

– Панцыр дзе?

– Знялі, бацька.

– Правільна. Жывому жывое. У нас мала.

Пад’ехаў да насіл, схіліўся:

– Прабач, брат. Не ўбярог я цябе. А ты – спі. Усім спаць... Многім – скора.

І, падняўшы галаву, абвёў шляхту вачыма, пасвятлелымі і жорсткімі. Потым слізгануў позіркам па шасцёх чалавеках у шэрых

расах, што смірна стаялі каля сцяны, узняўшы вочы ўгору. Поруч з імі стаяў служка з біклагай ля пояса.

– І вы тут? Прыпаўзлі, га́ды. Доўга ж вам дазваляе бог сваім імем празывацца.

Калі ён пацалаваў нябожчыка ў лоб, я ўбачыў, як дрыжалі яго вусны.

– Падлу цалуе, – выразна далящеў голас з натоўпу дваран. – Сам скора падлай будзеш.

Ракутовіч узняў галаву, агледзеў стракаты ад парчы натоўп.

– Плахі сюды, – свісцячым шэптам сказў ён і раптам выбухнуў: – Плахі!!! Спявай памінальную, поп! І вы, шэрыя расы, спявайце. На сваёй д'ябальскай гаворцы.

Іякінф заспяваў. Да неба панесліся гукі памінальнай абедні. А ад сцяны ціхмана і здаўлена загучалі іншыя гукі, нязладжаныя басы:

– Dies irae, dies illa, dies magna et amara valde[1].

Мужыкі прыцягнулі ўжо тры сасновыя калоды і кінулі іх перад капытамі белага каня. Але Ракутовіч раптам апусціў галаву.

– Добра, – сказаў ён, – не трэба плах. Не нам пэцкаць сякераю рукі. Гэтая сволач не храбрэйшая за жанчын… Вазьміце іх, мужыкі.

Дваран пацягнулі далей пад арку. Большасць маўчала, разумеючы, што пажынае свой пасеў.

– А гэтага куды? – спытаў пастух уваўчынай шапцы, паказваючы на Кізгайлу, якога ўжо звялі з балюстрады.

– Гэтага не чапай.

– Дай мне яго забіць, – сказаў пастух, – з-за яго ў мяне брата павесілі.

– Ведай сваё месца, Іван, – суха сказаў Ракутовіч, – гэта мой вораг, не твой.

Два ворагі глядзелі адзін на аднаго. І ў аднаго не было ў вачах боязі, а ў другога – злосці. Кізгайла стаяў, прыняўшы самавітую паставу, разумеючы, што яго ўжо нішто не ўратуе.

– Ну вось, – сказаў Раман, – ты думаў, я не дабяруся да цябе, Кізгайла? А я тут, і я разграміў тваё гняздо.

Адзін вецер бязважна гуляў каштанавымі валасамі Кізгайлы і грывай Ракутовіча, Кізгайла дыхаў гэтым ветрам і адказаў не адразу:

– Чаму ты не выклікаў і не забіў мяне тады?

– Вас усіх трэба пад корань – вось што я падумаў тады… Дзе Ірына?

---

[1] Дзень гневу, дзень слёз, дзень велічы і горычы.

– Ты не знойдзеш яе, Раман. Яна цябе ніколі, ніколі на пабачыць. Родам панскім на зямлі клянуся. Я адправіў яе далёка, куды ты не дастанеш.

– Я дастану... Як да цябе дастаў.

– Ты і без гэтага пакараў мяне, – на твары Кізгайлы я ўбачыў тую самую маску, што ўначы, калі Ірына кідала яму праклёны. – Дык забівай ужо да канца. – Усміхнуўся: – Толькі для мяне трох плах зашмат, Рамане. Усіх трох крывёю аднаго не напоіш.

– Я не буду сячы табе галавы. Я проста зраблю тое, чаго не зрабіў тады. Прымай выклік. Лаўр, дай яму каня.

Вочы Кізгайлы загарэліся:

– А калі я цябе звалю?

– Тады ты будзеш вольны. З жонкаю. Чуеце, мужыкі?! Я слова даю.

Кізгайла кінуўся да гнядога каня, якога падвёў яму Лаўр, коршакам узляцеў у сядло.

– Ну, тады трымайся, Ракутовіч! Я табе за дваранскую ганьбу адплачу. Шаблю мне!

– І мне шаблю. Горшую. Каб не выхваляўся потым.

– Мужыкі, – загарланіў Лаўр, трасучы хваляй валасоў, – а ну, лезь куды вышай. Ачышчай месца.

Народ з гаманой і смехам палез на балюстраду, на лесвіцы, на забрала. Адусюль глядзелі зверавата-лагодныя вусатыя морды.

Коней развялі па кутах двара. Кізгайла, прыгнуўшы галаву, шнарыў вачыма па постаці ворага. Ракутовіч спакойна чакаў.

– Давай, – махнуў рукою Лаўр.

Цішу раздзёр звонкі пошчак капытоў. Ворагі рынуліся адзін на аднаго, сутыкнуліся, скрыжавалі сталь.

Дзве блакітныя палосы затрапяталі ў паветры.

Секлі, выварочваліся з-пад udараў, з запалам хакалі пры кожным удары.

– Трымайся, Рамане,– з экстазам выў Кізгайла, выскаляючы зубы.

– І ты трымайся, – з прытоенай нянавісцю адказаў Раман.

– Блакітную кроў спахабіў.

– Людажэр. Напіўся дзявочых слёз. Вось табе...

Звон зброі аддаваўся ў мурах і запаўняў увесь двор, як на бяседзе ў таго грэцкага прахвоста, калі даводзілася ганяць птушак.

Раман ужо два разы зачапіў Кізгайлу. Абодва разы мы выразна пачулі трэск лат. Нарэшце Кізгайла злаўчыўся і рассек на Ракутовічу шалом. Рана была, напэўна, неглыбокая, але струменьчык крыві

прасачыўся праз падшаломнік і павольна папоўз цераз правае брыво Рамана, закапаў на жалеза нагрудніка.

– Вось табе першая метка, – зарагатаў Кізгайла, – выкласці б цябе, сукінага сына.

І тут Раман, сціснуўшы зубы, кароткім і моцным ударам адбіў правую руку Кізгайлы ўбок.

Яго шабля занеслася і бліскавічна слізганула ўніз.

Мы пачулі Раманаў крык:

– За Ірыну табе, ваўкарэз.

Раздаўся глухі ўдар. Цела Кізгайлы хіснулася ўбок, потым павольна перавярнулася ў паветры і ўдарылася спіной аб пліты.

Шабля вылецела з непаслухмянай рукі і, звонячы, заскакала на каменнях.

Чырвоны, разгарачаны, з валасамі, якія зліпліся на лбе, высіўся над забітым Раман. І я не заўважыў на яго твары радасці, звычайнай для пераможцы. Ён працягнуў руку і здзічэлым хрыплым голасам кінуў адно слова:

– Піць.

Служка, што стаяў побач з шэрымі манахамі, спешна сарваў з пояса біклагу і, усміхаючыся ліслівай і жалкай усмешкай, стаў наліваць з яе віно ў вялікую срэбную чару, якую дастаў з-за пазухі. Потым трушком падбег да Ракутовіча.

Рука Рамана імпэтна схапіла чару.

І тут Лаўр зноў здзівіў мяне. Яго скуласты прыгожы твар стаў раптам грубаваты і халодны. Ён паклаў руку на локаць Ракутовіча:

– Не пі, гаспадар.

– Гэта чаму? – Раман здзіўлена глядзеў у шэрыя доўгія вочы хлопца.

А ён ужо перавёў упарты позірк на аднаго з манахаў. У таго былі таксама шэрыя халодныя вочы, толькі пад вялікімі верхнімі павекамі, і ён спакойна вытрымаў позірк Лаўра.

– Хлопчык непакоіцца, – з халоднай кплівай усмешкай сказаў езуіт. – Ну што, дайце віно мне. Вып'ю я. Яно такое ж чыстае, як кроў Хрыстова.

– Дурная галава, – з грубаватай пяшчотай працягнуў Раман, – хто ж гэта скурай рызыкаваць будзе? Кеміць трэба.

– Дайце. Дайце мне, – спакойна сказаў езуіт.

– Ну не. Ты не працаваў, табе потым, – і Раман пацягнуўся да віна.

– І ўсё ж не пі, – упарта сказаў Лаўр.

Вочы яго з-пад доўгіх, як стрэлы, вей глядзелі падазрона і пільна.

– Глупства.

– А я кажу – не пі!

І ўзмахам рукі выбіў чару з рук Ракутовіча. Пунсовы, як кроў, цурок слізгануў па беласнежнай скуры каня. Бразнула чара. Расплылася па каменнях чырвоная лужынка.

– Ну і дам я табе зараз лупцоўку, – сказаў Раман.

– І дай. А іхняе віно ўсё адно няможна піць. Ніколі.

– Хлапчыска дурны.

У гэты час вялікая белая хортая Кізгайлы, цемнавокая і дрыжачая, як спружына, пацягнулася падціснутым жыватом, падышла, стукаючы кіпцямі, да конніка і, соладка прыжмурыўшыся, лізнула лужынку языком. Потым лягла, паклала доўгі шчыпец на складзеныя крыжыкам лапы і зажмурылася, уздрыгваючы бровамі.

– Бачыў, – хітнуў галавою Раман, – у пса разумення болей.

Лаўр усё глядзеў на езуіта. Потым падышоў да хортай і штурхнуў яе нагою. Яна бязвольна, як ватная, асунулася набок.

– Бачыў, – перадражніў Лаўр. – У пса разумення болей. Столькі, колькі ў цябе, бацька.

Ракутовіч не звярнуў увагі на дзёрзкасць. Ён глядеў на жывёліну, вокамгненна забітую ядам. Потым перавёў позірк на езуітаў:

– Што ж вы, панотцы, маруднага яду не ўзялі? Каб праз тыдзень забіў. Не знайшлося? Каб ведалі – прыгатавалі б?

Веі-стрэлы Лаўра сярдзіта дрыжалі. Ён, надзьмуўшыся, глядзеў на манахаў. А езуіт усміхнуўся і па-ранейшаму спакойна адказаў:

– Так, трошкі сарвалася. Не пашанцавала збавіць гэты няшчасны край ад лішняй смуты. Але цябе нішто не зберажэ, Раман. Пры жаданні і ў яйка можна пакласці адплату.

І ўсмешка яго была разумнай, з'едліва-хітрай і чымсьці нават прыгожай.

І Раман паглядзеў на яго таксама з усмешкай, якая, аднак, адразу знікла.

– Маладзец.

Я не разумеў, чым можа скончыцца гэтая сцэна, але ў гэты час Дамінік падвёў да ног Раманавага каня пані Любку і капуцына Фелікса.

– Канчай і гэтых адразу, бацька, – змрочна сказаў ён.

– З бабамі не ваюю, – кінуў Раман.

Любка глядзела на яго нейкім незнаёмым мне шырока адкрытым позіркам.

– А гэты? – сказаў Дамінік, падштурхоўваючы Фелікса.

– А што гэты? – іранічна спытаў Ракутовіч.

– Ты што ж, гаспадар, не бачыш, хто гэта?

– Бачу. Ціхі п’яніца.

Іякінф кінуўся да сабутэльніка і замітусіўся вакол яго. З рук Фелікса ўпалі вяроўкі, і капуцын шырока ўсміхнуўся.

– Ну вось, ну вось, – задыхаючыся, сказаў Іякінф, – літуй мя, божа, ды і на алтар твой цяльцы.

А Раман, ужо не звяртаючы на іх увагі, павярнуўся да Лаўра:

– Ты даруй мне мой грэх.

І паказаў рукою на езуітаў:

– Бяры іх, Лаўр. Ваўка не заўсёды забіваюць, але змяі раструшчваюць галаву заўсёды.

Цвёрда і сурова кінуў:

– На зубцы.

III

> “І калі жонка засталася ўдавой без дзяцей, што мацуюць дом, – дай ёй па сэрцу ладу на час кароткі, дабы не паклаў бог канца і мяжы дому і роду мёртвага... Але не для ворага дай, бо пракляне цябе зямля, і дом, і народ твой”.
>
> *Старажытны закон*

Познім вечарам гэтага дня я стаяў на вахце ля дзвярэй замкнёнай бібліятэкі. Гэты загад даў мне сам Раман. Пані Любка дабілася праз Лаўра размовы з гаспадаром і хутка павінна была прыйсці. А вартаваць іх павінен быў я, і я сцяміў, што яны не хочуць, каб пра гэта ведаў нехта са сваіх.

Дзверы былі прычынены няшчыльна, і мне можна было бачыць цёмны дуб сцен, кнігі ў нішах за драўлянымі кратамі, цяжкі васьміногі стол, вялізны глобус і зорную сферу, абхваченыя меднымі бліскучымі абручамі. Тут быў спакой, і мір, і кніжны пыл.

А перавёўшы позірк правей, я праз вузкае акно бачыў замкавы двор, вогнішчы, раскладзеныя на плітах, узброеных мужыкоў, залітых чырвоным вадкім святлом. Адтуль ляцела ціхая і страшнаватая песня аб наплываючай хмары і наступаючым турэцкім цару. І твары тых, хто спяваў, былі задумлівыя і, як заўсёды ў тых, хто спявае,

прыгожыя. Але ж я ведаў, якія яны бываюць жахлівыя. Песня. Агонь. Косы.

І гэта было жыццё.

А ў бібліятэцы Раман казаў Лаўру:

– Ну, забіў. А ўсё ж так шкада дурня, быццам не загубіў ён майго жыцця... Разам галубоў з дурнем ганялі. Собіла ж яму пярэваратнем стаць, людзей мучыць. І мучыў, можа, таму, што сумленне было неспакойнае.

– Не таму ты турбуешся, – холадна сказаў Лаўр. – Надта ўжо ты, дзядзька, сэрцам да аксамітнікаў прырос.

Ракутовіч доўга маўчаў. Потым уздыхнуў:

– І тут твая праўда. Душа разрываецца. Крычаў сёння, што мужык – хрыбет усяму. І ведаю, што гэта так. І ведаю, што ягоная праўда, таму што ніхто так не пакутуе. А сэрца ліпне і ліпне да гэтых. З імі ўздзіць вучыўся, сокалаў пушчаў, з імі скакаў, з імі ўпершыню напіўся.

– Дурыш, – непачціва сказаў Лаўр, – а яны табе на кожным кроку бязлітасна здраджвалі. Яны спяць і ў сне бачаць выспацца на тваёй скуры.

– Ведаю. І ўсё ж, каб не былі яны павей-ветрамі, каб не перкінулася ўся гэтая зграя да Варшавы і Рыма, – не пайшоў бы я з вамі. Дабром бы іх упрошваў добрымі быць з людзьмі.

– Іх упро-сіш, – працягнуў Лаўр. – Хіба сякерай толькі...

– Ведаю, – сказаў Раман. – Ды з гэтым скончана. І хопіць балакаць.

– А Ірына? – не сунімаўся Лаўр. – З ёю яны што зрабілі? Ці, можа, і яе забудзеш? Закруціш з багатай?

– Не магу забыць. Верны ёй. І няма мне забыцця. Ідзі, Лаўр. Ідзі...

Лаўр моўчкі прайшоў паўз мяне ў пакой насупраць.

Некаторы час я чуў і бібліятэцы толькі гулкія крокі. Потым убачыў праз шчыліну гаспадара, які падышоў да стала і адкрыў кнігу не кнігу – аркушы былі занадта розныя, – а хутчэй нейкія пасланні ды граматы, пераплеценыя ў агульную цялячую вокладку.

Ён чытаў, варушачы вуснамі, і раптам я пачуў знаёмыя мне словы, словы васьмігадовай даўнасці, словы з прашэння беларускага народа на сейм. Усе ведалі, хто яго склаў.

І гэтыя словы шмат у каго былі на вуснах. Ведаў іх і я.

– “Усяму свету вядома, – чытаў гаспадар, – у якім быў стане слаўны старажытны народ за некалькі перад сім год, аныня оный, падобна ўлюбёнаму богам народу ізраільскаму, з плачам аб стане

сваім вапіе: се мы днесь унічыжэнны, пачэ ўсіх жывучых на зямлі, не імамы князя, ні правадыра, ні прарока...”

Гаспадар скалануў грывай валасоў. Заплюшчыў вочы і чытаў, можа, па памяці:

– “Не даволі, што славуты народ рускі даведзены да такой вялікай бяды і толь цяжкага ўцяснення, будучы бог весць за што ганімы... пазбавілі нас яшчэ і бясцэннага скарбу – златой волі, нахабным чынам прысвоіўшы оную”.

Голас Рамана сарваўся. Ён бясшумна закрыў кодэкс і ціха сказаў:

– Такія словы сказаўшы, адрачыся ад іх. Эх, людзі...

І яшчэ цішэй, з нейкім жаласным дзіцячым непаразуменнем спытаў:

– Як жа гэта ты, Леў?..

Паглынуты гэтай споведдзю, я здрыгануўся ад нечаканасці, калі вузкая жаночая рука апусцілася на маё плячо. Перада мною стаяла пані Любка, накінуўшы на плечы белую – на знак жалобы – хустку.

– Можна да яго?

– Ідзіце, пані.

Яна ўвайшла і зачыніла за сабою дзверы. Нейкі час я нічога не чуў, але гэтыя дзверы былі з норавам: спачатку з’явілася вузкая шчыліна, пасля шырэйшая, потым такая, як раней. Я не стаў іх зачыняць – няхай сабе стаяць, як ім падабаецца.

І я пачуў мяккі, зусім не такі, як раней голас жанчыны:

– ... і бяздзетных выганяюць з маёнтка другія сваякі. Хто абароніць, калі абаронцы забітыя?

– Чаму ж раней не было?

Дзверы адчыніліся яшчэ крыху шырэй. Праз рэдкую штору я ўбачыў гаспадара, які сядзеў на шырокай ложы, накрытай ручным русінскім кілімам, і жанчыну, што сядзела насупроць, праўдзівей, яе галаву, залацістую, злёгку нахіленую ўперад.

І гэтая галава ціха сказала:

– Ты нічога не ведаеш. Праз паўтара месяца пасля вяселля яны ішлі граміць цябе, і страла пазбавіла яго мужнасці.

Я сам сабе свіснуў. Так, нявесела было Кізгайле. Вось чаму ён быў такі кіслы, калі Ірына праклінала яго.

– Ну што ж, – сказаў Ракутовіч, і я ўбачыў яго вялізныя шалёныя вочы, – вы ж і мяне пазбавілі кахання, пазбавілі роду. Ён гадзюка. Няхай згасне яго род!

– Ты сам разумееш, як гэта страшна, гаспадар, – ціха сказала яна.

– А што ты зрабіла для мяне добрага? – нахіліўся ён. – Забойства Якуба? Упартасць? Стрэл у брата? Яд? Другі вас бы з зямлі сцёр.

Жанчына, здавалася, вось-вось заплача. І я не чуў больш кранаючага голасу, чым той, якім яна загаварыла:

– А ты памятаеш, як мы збіралі пярэсны і лотаць? Мне было трынаццаць, ты – трохі старэйшы. Ты прывёз мяне ў лес на сваім кані. І я адчувала спіной руку, якой ты мяне трымаў, такую цвёрдую руку... Або калі ты прынёс мне крылы сіваваронкі, каб я магла ўбрацца мятлушкай[1].

– Ты была мне, як сястра... Але я не дарую вам, што вы пад замком Ірыну трымалі.

– Тады забі мяне. Не трымала я. Гэта ён.

– Я не ваюю з жонкамі, – сказаў ён, – я нобіль, і нас тры, чый род застаўся.

І раптам я пачуў яго крокі.

– Цхакен, – сказаў ён, з’явіўшыся на парозе (я стаяў, павярнуўшыся спіною да дзвярэй), – пакліч Лаўра.

Насуплены Лаўр прайшоў у бібліятэку, і хутка там загучаў голас Ракутовіча:

– Бачыш гэтага хлопца? Падабаецца ён табе?

– Так, ён вельмі падобны да цябе, Раман.

– А яна табе падабаецца?

– Так, гаспадыня вельмі прыгожая.

– Дык вырашай, калі хочаш, я зараз, тут, зраблю яго дваранінам. Гэта будзе апошні дваранін.

– Не хочаш выслухаць мяне, Раман, – з дакорам сказала яна.

– А ты бяры яе ў жонкі. Будзеш трымаць гэты замак маёю рукой на выпадак, калі трэба будзе адседзецца.

Я бачыў упартую спіну Лаўра. Потым блазнюк падкінуў падбародак і з папрокам, відаць, жадаючы ўкалоць, сказаў:

– Не, гаспадар. Куды ўжо вароне... Ды і не хачу я дваранінам быць.

І Раман зразумеў укол.

– Тады ідзі, – сказаў ён сурова, – і чакай майго загаду.

Яны засталіся адны. І дзверы зноў былі прачынены. Не надта тыя клапаціліся аб таемнасці.

---

[1] Лясное стварэнне ў старажытнай беларускай народнай паэзіі. Дзяўчына з крыльцамі матыля або птушкі – тое самае, што віла ў сербаў і фея ў старажытных брэтонцаў.

Цяпер гаварыла пані Любка:

– Ты так і не зразумеў мяне. Ты нічога, нічога не зразумеў. Гэта ж я вінаватая. Гэта я не дазволіла Аляхну аддаць табе Ірыну. Я не магла. – І я з жахам прадбачыў словы, якія зляцелі з яе вуснаў. – Цябе я кахаю, ты адзін мой жаданы... А ты не глядзеў на мяне: сястра і сястра. А Кізгайла спытаў на маю згоду... Як я магла... сваімі рукамі аддаць. – Голас яе перарваўся. – Раман, даруй мне мой грэх. Гэта ўсё я. Але ж я не магла іначай...

Раман маўчаў, сурова гледзячы ўбок. Я бачыў яго круты лоб, насупленыя бровы. Потым ён сказаў:

– Другая ніколі ў такім не сазналася б. Адна ты... Таму і не магу я цябе ненавідзець. І калі што перашкодзіла б мне цябе кахаць, дык не гэта тваё прызнанне.

– Раман... – сказала яна.

Ён маўчаў, і яна сказала яшчэ цішэй:

– Ды вазьмі ж ты мяне. Няўжо не разумееш, няўжо сляпы?

– А табе не брыдка, што я без любасці буду ляжаць з табой?

– Я кахаю цябе, – сказала яна. – Ці не ўсё адно.

– А Ірына? – глуха спытаў ён.

– Ты яе не пабачыш, гаспадар. Іх, напэўна, ужо затачылі. Яны адвезены ў Магулёў.

Ён устаў і павярнуўся да жанчыны спіною. Яна не бачыла, але ж я-то бачыў яго твар. Гэта было, як... як алень, што кліча вясной каханне, якое загубіў стралок. А ён не ведае, а ён кліча, і ў вачах неўразуменне, крыўда і няўтоленая пяшчота.

– Што ж ты, гаспадар?

– Не, – сказаў ён. – Я з табою не магу быць. Са мною ніводная не была з той пары.

Голас яго крыху ўзмацнеў:

– Але першае, аб чым ты прасіла, я не перашкоджу табе выканаць. Бяры хоць Лаўра. Калі дзіця з'явіцца ўчасна – ніхто не асмеліцца думаць, што яно не Аляхнова. Толькі не ведаю, нашто я раблю гэта. За тваю праўду? Ці шкада цябе? Ці я дурны?

– Дзякуй і на гэтым, – сказала яна горка. – Не даеш любові, але даеш хлеб.

Ракутовіч зрабіў крок да мяне, спыніўся:

– Швейцарац, прапусціць сюды гэтага хлопца. Помсты не будзе. Род не памрэ. – І дадаў: – І нават, можа, будзе праследаваць маіх нашчадкаў.

– Якіх, гаспадар?

Ён скалануў галавой.

– Я прыйду ў яе турму, – са страшнай упартасцю сказаў ён. – Выпалю ўсе замкі. Конскім хвастом попел размяту. Але з мячом ці ў ланцугах – прыйду. Жывы ці мёртвы – вазьму. Я яе вазьму з Магілёвам, з усёй нашай зямлёй, з воляй або смерцю.

– Са смерцю? – узняла яна бровы. – Не верыш, значыцца?

– Не, але біцца буду нават без веры. Справа не толькі ў Ірыне.

– Але чаму не верыш?

– Ужо другая старая варожыць, што Ірына ніколі не ўбачыць мяне. А сёння тое самае крычаў Кізгайла.

– Ён панствам кляўся, – сумна ўсміхнулася яна, – а ты ж яго збіраешся звесці, панства.

– Не, – сказаў ён, – цуда не будзе. Няпраўду так скора не вынішчыш. Патрушу хіба вас трошкі?

– Нашто ж ты ішоў тады?

– Думаеш, не ведаю, што на смерць асуджаны? Ведаю. Людзей шкада. Зямлі дзядоў шкада.

– Тады здайся ... Здайся, любы.

Ён засмяяўся, як дарослы над неразумным дзіцёнкам, крыху насмешліва і з паблажлівасцю:

– Не-е, такое я і праўнукам забараню. Калі няма шчасця для сябе, для суседа – чаго галаву берагчы? Тады яе назнарок ламаць трэба. – І дадаў: – Біцца трэба да канца, да іклоў, да апошняга хрыпу. Вы гэтага не зразумееце, вы спешчаныя. У вас і душы сталі не тыя.

– Раман, – сказала яна, – мне шкада цябе, мне страшна за цябе. Навошта ты нада мною злітаваўся?!

– Зла і так – мора. Не мне яго множыць. Жыві. Можа, сумленне заварушыцца?

– Ворагу даў літасць, – сказала яна.

– Праўда, ты ж самы страшны мой вораг.

– Гэты вораг кахае цябе, – ледзь чутна сказала яна.

Але ён ужо ўстаў, падняў яе і паставіў перад сабою.

– Бывай, варагіня. Бог з табою.

І пацалаваў яе у галаву.

Я чуў яго крокі па калідоры,чуў яго кароткую размову з Лаўрам, чуў, як Лаўр паспрабаваў быў за нешта дакараць яго і як Раман на яго прыкрыкнуў. І я чуў потым ціхую размову юнака, падобнага на архангела, з пані Любкай. І чуў, як іхнія галасы рабіліся больш мяккія.

Я не зразумеў толькі, чаму яна называла яго Раманам. Хіба што падобны? Але потым я адышоў ад дзвярэй. Мы цікаўныя таксама толькі да пэўнай мяжы...

...А раніцай мужыцкі цар выступіў з замка ў паход. Войска яго, што ўзрасло на трэць, аброслае нашай зброяй, закутае на чвэрць у нашы даспехі, стала сапраўды страшным. Валіла конніца, везлі пятнаццаць гармат, знятых з муроў, рыпелі вазы.

Косы. Вілы. Доўбні.

І я ведаў, што гэты чалавек за два тыдніператворыць паляўнічых – у стралкоў, сялян – у баявых малацьбітоў, вуглепалаў, што звыклі да пешні, – у пікінёраў.

І ўсіх ператворыць у воінаў.

Перад тым як выехаць за браму, ён пад'ехаў да мяне, па-ранейшаму ў барвяніцы, па-ранейшаму на белым кані, падняў руку ў жалезнай пальчатцы і паказаў на замак:

– З табою людзі застаюцца. І баба. І муры. Беражы і брамы перада мною не зачыняй. Зімаваць прыйду.

Вочы яго гарэлі.

– Зберагу, гаспадар,– сказаў я.– І не зачыню. І другому не дам.

Ён кіўнуў мне галавою і паскакаў за сваім войскам.

Мільгануў удалечыні барвяны плашч. А потым усё закрыла бясконцая хмара пылу.

Нізавошта на свеце я не згадзіўся б другі раз стаяць на мурах супраць гэтага чалавека!

IV

Скардзіся, звон!
Без надзеі на цуда,
Кату аддадзены,
Ў змроку стаю,
Адрынуты богам,
Адрынуты людам,
Адрынуты сонцам
У гэтым краю.
Скардзіся, звон!
Адное каханне,
Песню маю,
Сляпую ад мук,
Пакуль у грудзях
Не згасне дыханне,
Цемра не вырве з бяспалых рук.
Балада пра барвянага ваяўніка

Зніклі. Рассеяўся пыл.

І над Кісцянямі пацягнуліся лянівыя і пагодныя дні. У замку амаль не было мужчын, акрамя мяне і невялічкай варты. Ды і ў вёсках засталіся амаль толькі адны бабы.

Адшумеў май, адзвінела конікамі лета, адшапацеў лістапад. А потым пачаліся снягі, сінія, ваўчыныя, бясконцыя.

За гэтыя месяцы адбылася толькі адна нечаканая гісторыя. Я ажаніўся. Абкруціла мяне тая самая вартаўнікова дачка, Дар'я. Хлопцы мае не хацелі сядзець і пайшлі. Засталося чалавек дзесяць з тых, што былі ў гадах, не хацелі цягаць сваю скуру па брудных палёх пад свінцовым дожджыкам і запрагнулі спакою. Большасць таксама пераженілася. І пачалося ціхае жыццё з ежаю, ды пітвом, ды цішынёй.

Жонка трапілася харошая, памяркоўная, несварлівая. Ды я і сам такі. Так што жылі добра, па-божаму. І я пачаў уставаць уначы, каб паесці, і звыкнуў да іхняга палявання, і гаварыў з імі, як яны. І пачаў нават звыкаць да іхняй лазні, хоць і не падымаўся высока на гэты жахлівы палок.

А вакол вылі снягі, ды заяц пляміў шарон сваімі скачкамі. Зрэдку даходзілі чуткі пра мужыцкую вайну, але лёзныя[1] так іх перакручвалі, што і верыць не хацелася.

Ракутовіч не прыйшоў зімаваць, як абяцаў.

Ніхто не прыйшоў да цёплых нашых печак. Ніхто не прыйшоў і потым, калі зіма пачала чахнуць і сплываць адлігамі.

Мы даведваліся, што замкі падаюць далей, што ўсіх дваран апанаваў люты жах, што нястрымныя і перамаганосныя, як раней, мужыцкія палкі. Ды і як ім не быць храбрымі? Самая ж смерць была лепшай за такое жыццё.

А потым была ракавая бітва на Урэчаскім полі, калі панскае войска раздавіла сваім жалезам мужычыя палкі. Яны ўцякалі, і завея космамі снегу залізвала іх сляды.

Прайшла чутка, што барвяны ўладар забіты ў гэтай сечы. Але гэта была няпраўда.

І акурат у лютаўскія дні, крыху раней празначанага, – і гэта было добра, таму што забівала сумненні, – у нас у замку заплакаў новы жыхар, сын пані Любкі, Якуб Кізгайла. Гаспадыня занадта перапалохалася, калі прыйшла звестка з Урэчаскага поля. І я не бачыў твару больш радаснага, чым у яе, калі мы даведаліся, што частка войска, на чале з правадыром, адступіла, разграміўшы нашчэнт галаўны полк шляхецкага апалчэння, і шнырыць паміж панскімі атрадамі, прарываючыся на ўсход, да маскоўскага рубяжа.

[1] Вандроўныя.

А яшчэ праз месяц прыйшла вестка, што Рамана разбілі і вязуць у ланцугах у Магілёў.

Пані Любка разбудзіла мяне ўначы. Твар бледны, вусны сінія. Толькі і здолела сказаць:

– За ім!

І памчаўся наш вазок па сакавіцкім расталым снезе да славутага горада. У вазку пані з немаўляткам, – харошы, здаровы хлопчык! – а вакол дзесяць чалавек коннай варты з паходнямі ды я. Давялося-ткі нацягнуць даспехі на разгультаенае цела.

Скакалі ўдзень і ўначы, змоклыя, галодныя, заляпаныя праснакамі расталага снегу. На дарозе адзічэлыя сабакі, ды зрэдку панскія раз'езды, ды па начах глухія і безнадзейныя пажары вёсак.

А ў гаспадыні твар, як маска, як крэйдай набелены, і непаслухмяныя вусны толькі і могуць вымавіць:

– Хутчэй! Хутчэй!

І я ўжо не называў гэтых людзей вар'ятамі. Прывык. Гэта добра – загнаць каня, калі душа патрабуе.

Пад Дарамі Лыкаўскімі сталі трапляцца слупы з павешанымі людзьмі. А потым, яшчэ здалёк, заўважылі мы натоўп народу наўсцяж дарогі. Вялі палонных, і кожны з натоўпу хацеў даведацца, ці няма сярод іх свайго чалавека. Тыя ішлі моўчкі, суровыя, з непакрытымі льнянымі галовамі. І зусім іх было мала. Амаль ніхто не здаваўся, а астатнюю, большую, частку Раман выкупіў сваім целам: паставіў умову, што здасца, калі іх адпусцяць.

І здаўся. Пасля гэтага кінуліся лавіць адпушчаных уцекачоў, ды куды там. Ад людзей мы і даведаліся, што Рамана правезлі яшчэ ўчора. У гнойных драбінах. Прыкутага за нагу да градкі. Сядзеў быццам маўклівы і зусім не хмурны, з светлым абліччам, быццам усё зрабіў на зямлі і замкнуў свой круг.

Вельмі шляхта над ім здзекавалася. Самога яго баяліся зачапіць, нават скутага, дык яны меч ягоны двухручны ззаду на вяроўцы прывязалі, і валачыўся ён усю дарогу за возам па снезе ў разбоўтанай гразі. Народ плакаў, гледзячы на ганьбу.

Шляхта плявала на меч.

А ён быццам сказаў толькі:

– Нічога, вашы пляўкі зямля сатрэ.

І яшчэ мы даведаліся, што Лаўр, хлопчык-архангел, прабаваў адбіць Ракутовіча і паў падчас стычкі, забіты ўдарам чакана ў залатую галаву.

Пані занурылася крыху – і толькі.

А народ валіў за палоннымі, і над натоўпам стаяў ціхі, амаль нячутны стогн.

Лепей бы ўжо крычалі.

Пані яшчэ мацней загадала гнаць коней. І мы прыскакалі ў горад і спыніліся на Лупалаўскім прадмесці, у парафіі святой тройцы.

І адразу, не адпачыўшы, ілба не перахрысціўшы, удваіх з паняй памчаліся ў крэпасць – яна ў вазку, я – вярхом.

Здзівіла нас мноства п'яных у прадмесці, а потым і ў самым горадзе. Выявілася, што пакуль звестка пра злоў яшчэ не прыйшла – з ганцом прыбыло дазваленне лішнія дні чатыры супраць Магдэбургскага права, і не ў тэрмін, варыць піва, і гарэлку, і мёд.

Горад увесь праваслаўны, багаты і ганарлівы, муры каменныя, купалы залатыя, валы, равы, вежы. А людзі – хоць у сані запрагай, такія біцюгі. І ўсе п'яныя.

Пачалі шукаць спосаб, як трапіць у горад. Праехалі праз каменную Быхаўскую браму ў вале, а потым памучыліся. Торкнуліся да Каралеўскай брамы – нельга, паехалі да другой – нельга. Праз Малую Пешаходную, да ракі Дубровенкі, – нельга. Баяліся, што ўварвецца мужыччо ў горад і будуць разня і смута.

Нарэшце трапілі праз Алейную, ля якой яўрэйская школа. Пад брамаю парахавыя склады, а на браме ікона божай маці. Направільна магілёўцаў дражняць, што яны яе прадалі, а грошы прапілі разам з войтам. Непарушна сцеражэцца ікона!

І толькі тут пані загадала спыніць вазок, выйшла з яго і па костачкі ў расталай жыжцы, змешанай з гноем, пайшла да брамы. Я таксама злез з каня і глядзеў.

А яна падышла бліжэй і проста ў футры, у вішнёвай фалендышавай[1] сукні павалілася на калені ў снег, прынікла галавой да зямлі.

– Маці божая, заступніца, святыя вочы, чыстыя. Ты хоць даруй грахі нашы. Прайдзі стапою лёгкай, пачуй нашы мукі.

А зверху глядзіць на яе цёмны валавокі лік. І па ім цені: мітусіцца знічка. І здалося мне, быццам з болем, са спагадай глядзіць лік на зрынутага чалавека, а нічога не можа зрабіць. І рука, тонкая, вузкая, блакітная, толькі запясцем сына лёгка трымае: "Вазьміце, людзі, калі лягчэй вам будзе. А я нічога зрабіць не магу. Цяжкі ён, крыжовы шлях."

А ў пані ўжо голас здзічэў:

– Маці божая, кахання не дала, шчасця не дала – яго ж хаця пашкадуй. Сама бачыш, крыж з народа твайго здзіраюць, каб ярмо

---

[1] Фелендыш – галандскае сукно.

нацягнуць. За яго, за люд твой пакутаваць чалавек будзе… Не давай выгаляцца… Не папусці агнявой пакуты, не папусці сякеры. Уратуй, злітуйся міласэрным сэрцам сваім.

Ледзь я яе падняў, адчайную, з голаю галавой. Каб яе ў гэты час нажом рэзаў – не адчула б. І пайшлі мы па горадзе, таму што хутка з вазком праехаць нельга было: столькі народу набілася ў галоўныя вуліцы.

Каля драўлянай Спасапрэабражэнскай царквы, распісной, лядаштай, цэлы натоўп мяшчан, больш цвярозых, раіўся, як быць. Крычалі, хапалі адзін аднаго загрудкі; адразу было відаць – нічога талковага не атрымаецца.

Ландвойта[1], што прыехаў сунімаць крык і агіднасць, закідалі расталым конскім гноем і наўздагон свісталі ў два пальцы і ўлюлюкалі. А на Замкавай вуліцы і таго горай. Цяжкае гарадское пахмелле.

Ды толькі позна ўжо: за два дні паспелі сцягнуць у Магілёў такое войска, што кожны трэці чалавек на вуліцы – латнік або ўзброены дваранін.

Даведаліся мы толькі, што Ірына жывая. Сядзіць у склепе, у клетцы, на Ветранай вуліцы, каля драўлянай брамы. І нават на пробу вогненную яе яшчэ не ставілі і наўрад ці паставяць – усім ясна, невінаватая.

Гамарня, носяць на каромыслах цэбры з яблыкамі, мяшчане журавіны марожаныя з рук ірвуць – на пахмелку, штурхаюцца разносчыкі, непатрэбныя дзеўкі.

І раптам зараўлі дуды, расступіўся народ, і – як паміж сцен – прайшла гарадская варта, а за ёю шэсць чалавек у дарагім сукне, з пальцамі, унізанымі золатам і каменнямі.

– Магістрат ідзе. Войт, – зашапталіся ў натоўпе.

Ішлі яны, апусціўшы вочы. Толькі што самі аддалі Ракутовіча ў рукі замкаваму правасуддзю. Ды і нічога нельга было зрабіць – дваране замкавай юрысдыкцыі падпадаюць. Вытаргавалі толькі, каб судзілі ў ратушы і каб у складзе судзілішча быць войту і двум радцам, і на тым дзякуй.

Некалькі дзён кідалася пані Любка па горадзе. Усе яе прынялі, і ласкава аднесліся, і шкадавалі за ўдовіна гора і сіроцтва сына. Сказалі, што быць ёй галоўнай сведкай і пры вынясенні выраку дадзены ёй “цяжкі голас” права выказаць сваю думку. Яны ўздыхнула. Ясна было, куды вядзе справу каптуровы[2] суддзя.

---

[1] Намеснік войта, адзін з упраўляючых горадам.

[2] Суддзя, якога выбіраюць з дваран на час смуты або міжцарства.

А на Аляксея, божага чалавека, да Замкавай столькі народу збеглася – не прапхнуцца праз натоўп. Ледзь нам удалося ўзабрацца на ганак у доме былога войта Славенскага. Сам ён ужо год трыццаць як у зямлі спачываў, а ў доме жыла яго звар'яцелая жонка-дваранка ды дачка-пярэстарак.

Стаім, ціскаемся. Сырасць такая золкая.

І раптам зашумеў, неахвотна даў дарогу магілёўскі люд. Убачыў я перш за ўсё коннага чалавека ў чорным, насатага, са шчокамі, якія быццам да зубоў прыліпалі. Галава непакрытая – яшчэ б, скруха: нобіля, што зганьбіў саслоўе, судзіць давядзецца.

А за насатым яшчэ і яшчэ коннікі, у парчы, сабалях, утэрфіне[3]. Шаблі рознакаляровымі агеньчыкамі ззяюць.

Прыехалі Дэспат-Зяновіч, Загорскі, Сапега, князь Друцкі – судзіць у ратушу. І павезлі з сабою універсал караля, згоду рэляцыйнага суда на любое рашэнне дваран аб нобілю Ракутовічу.

І не паспелі праехаць – завыў, загаласіў юродзівы, прабег за імі, закрываючы пальцамі – у засохлай крыві – вочы.

– Дэманаў бачу, чорныя ўсе... лятуць! Светленькага агнца хочуць зарэзаць, кішкі ягоныя зубамі валачыць.

Народ шарахнуўся ўбок. А тыя праехалі да ратушы, і дзверы зачынілі.

Да вечара яны там прэлі. І наступнага дня. А мы абодва дні стаялі ля дзвярэй ратушы і на ганку. Пані Любку выклікалі сведкай, але яна сказала, што Раман мужа ў баі забіў і езуітаў павесіў за атруту, усяму ж астатняму даў літасць. І пад канец самлела.

Суд застаўся ёю вельмі незадаволены.

А народ усё больш шумеў ля дзвярэй ратушы і на плошчах. Я сам чуў, як багаты хлопец з мяшчан, абуты ў саф'янавы кабці, у лісіным кітліку наапашкі, крычаў нема:

– Не даць ім Рамана на разарванне. Ён веру правую ўратаваць хацеў, як продак ягоны ратаваў ад татар. Усім вядома, што не Міндоўг іх біў ля Крутагор'я. Ён і граматы дагары нагамі трымаў, кажух смярдзючы. Хто конніцу татарскую апракінуў? Ракута, Раманаў продак!.. Таму мы і белыя, што татар не нюхалі!

Людзі рваліся і да дзвярэй ратушы, крычалі:

– Няправедная гэта справа, нобіля судзіць.

І ім паказалі ўдаву Кізгайлы, жывое абвінавачанне, і немаўлятка Якуба паказвалі з гульбішча, лаялі Ракутовіча:

---

[3] Тонкае, вельмі дарагое сукно.

– Немаўля нявіннае яшчэ ў чэраве асірацiў. Ірад! Вораг усіх беларусцаў з існымі!

А спрэчкі ў ратушы ўсё цягнуліся. Сапега з Друцкім стаялі за смерць. Але магістрат быў супраць. І на яго бок схіліліся Дэспат-Зяновіч і Загорскі. Апасаліся, не было б спакусы для малых.

Крычалі да хрыпаты, лаялі адзін аднаго псамі і па-іншаму. І, можа, нічога б не вырашылі, каб не прыйшлі людзі з Лупалава і Падуспення. У натаўпе адразу засмярдзела скурамі і рогам, і крычаць пачаў натоўп зусім іначай:

– Заб'яце яго – смута будзе! Забылі, як пры магілёўскім бунце ў порткі клалі, будзеце і цяпер. Стаха Мітковіча ды Гаўрылкі Іванова[1] на вас няма. Памяць кацiная! Забылі, як дзверы судовай залы адбілі? Набату не чулі даўно?! Будзе і вам тое ж!

І тады Загорскі сказаў апошняе слова:

– Добра. Нобіляў на пласе не забіваюць. Няхай быдла верыць.

Мы з ганка, а пасля з акна вазка бачылі, як рухаліся на гару, пад аховай крылатай варты, драбіны. І ў драбінах той, хто загадаў мне трымаць замак. Пасівелы на скронях, бледны, але спакойны.

Толькі на імгненне кароткае ён спакой свой згубіў. Падвезлі яго ўжо да самых дзвярэй ратушы і спынілі воз. А тут з акна дома Славенскага ашалелая войтава жонка закрычала і стала яму пальцамі вілы рабіць:

– Антыхрыст! Дваран пабіў, прымучыў. Судзіце яго, людзі добрыя, ды не патурайце. Калі ягоная дзеўка гэтага ірада яшчэ хоць раз пабачыць – канец панству на зямлі, а славуты горад у смутах зняможацца.

Я заўважыў – шмат хто сумеўся ад гэтых слоў. Нават сам Друцкі, што стаяў на высокім ганку з граматай у руцэ, апусціў вочы.

А Раман справіўся і нават з усмешкай і са светлымі вачыма слухаў прысуд. Мы далёка стаялі і толькі-толькі да сэнсу дайшлі па асобных словах:

– Маетнасці пазбавіць... адсячы рукі, дабы падступнага мяча не ўздымалі... шчыт ганьбаванню падвергнуць і адусюль, акрамя Гарадзельскага прывілею і статута, самае імя вытравіць на застрашэнне другім іншым.

І яшчэ зразумелі: баніцыя[2] за межы Мсціслаўскага ваяводства: вечная ссылка ў малую весь.

---

[1] Стахор Мітковіч і Гаўрыла Іваноў – верхаводы паўстання горада Магілёва супраць караля (1606 – 1610 гг.).

[2] Выгнанне.

Ударыў бізун па конскіх спінах. І давялося Раману праехаць увесь шлях. Правезлі яго ад вазніцы да замка, да насыпной гары, міма храма Сарака Пакутнікаў да Спаскай царквы. Па ўсім горадзе, дабы бачылі, як караецца ліхадзейства.

Прывезлі на плашчу ўжо ўвечары, змяркацца пачало. Там паклалі на насілы, прыкруцілі і, накрыўшы саванам, панеслі ў храм – жывога адпяваць.

На ўсё жыццё я гэта запомню. Снягі ліловеюць, з акон на снег – цёплыя жоўтыя агеньчыкі. І спевы – ох, якія страшныя спевы!

Юрод на паперці заскакаў:

– За гарэлку бога прадалі! Возьмуць вас за гэта чорт Савул і чорт Калдун! Брамы вашы паваляцца, магілы мышакоўскія ўвесь Мікалаеўскі спуск зоймуць. Косткамі ён заваліцца. Быць крумкаччу сытым! Костку быдлячую знойдзеце ў зямлі – і ад той пойдзе паморак і пошасць.

Стала нельга слухаць – так страшна завыў народ.

А Рамана ўжо вывелі – ён і сапраўды быў бялейшы за труп, хоць ішоў цвёрда, – узвялі на памост, на якім стаяў містр, а папростаму кат у чырвонай доўгай сарочцы. Так яны і стаялі, чырваны і белы на Рамане быў саван.

І сталі падаць на натоўп цяжкія словы:

– Меч яго зламай, кат... Вось нарог ад ніў яго – аддай яго другому, кат.

І пад канец узяў містр шчыт і ўцяў сякераю яго востры канец, а верхняе поле замазаў дзёгцем і сажаю.

Жонкі дваранскія так загаласілі – хоць затыкай вушы: няма кары страшнейшай за гэту для двараніна.

А Ракутовіч паглядзеў на іх вялікімі незразумелымі вачыма і толькі ўсміхнуўся:

– Нічога, затое шчыт цяпер на вашы непадобны, на чысценькія.

А сам сеў, абняў плаху нагамі, каб на калені не станавіцца.

Твар ката, барадаты да самых вачэй, пацямнеў, і рукі дрыжаць.

– А ты смялей, – кажа яму Раман, і голас такі просты.

Кат узяў сякеру.

– Пачакай,– кажа Раман,– дай апошні раз на пальцы паглядзець.

Сагнуў іх некалькі разоў. І раптам шырока перахрысціў народ. Крыкнуў:

– Ударыць за цябе яшчэ раз не магу, дык прымі хоць апошняе маё бласлаўленне.

Плач узняўся, стогн. А Раман паклаў ужо рукі на цурбан:

– Сячы.

Занеслася сякера. І мы толькі ўчулі глухі ўдар.

Ж-жак!

Задрыжаў лядашчы памост.

А Раман устаў, стаіць і рукі ўздымае, Правая рука вышэй кісці адсечана, левая – наўскос, засталіся на вузкім абрэзку мезены і безыменны палец. Ці то пашкадаваў кат, ці не разлічыў.

І тут лекар з яўрэйскага кагалу замітусіўся: толькі жоўтая галаўная павязка мільгае. Памазаў чымсьці абрэзкі, і кроў свістаць перастала. Ледзь капае.

А Раман быў такі моцны, што нават прытомнасці не страціў і застаўся стаяць на нагах.

Так і скончылася ўсё гэта. Не атрымалася ўстрашэння.

Цяпер трэба было толькі лёс "дзеўкі" вырашыць. І прымеркавалі гэтае рашэнне да таго дня, калі везці належала Рамана ў выгнанне.

Напярэдадні гэтага пані Любка дабілася спаткання з Ірынай.

Суправаджаў яе і я. Спусціліся мы ў сутарэнне ля драўлянай брамы, і зноў я ўбачыў аленевыя вочы ды надламаныя бровы. Праз краты.

Любка расказала ёй аб усім. А тая ўсміхалася:

– З-за мяне... А я праз горшае прайшла б, толькі б ён маё каханне ўбачыў.

Ох, якія гэта вочы былі! Шэрыя, прамяністыя, такія зіхатлівыя!

У пані Любкі нават ярасць на твары выступіла.

– Загубіла нобіля сваім чараўніцтвам. У ссылцы цяпер будзе. Аддай яго другім. Здымі чары.

– Не, пані, гэтых чараў не знімеш. А калі нават магла б – не зняла б. Ён – сонца маё. Хіба што з сэрцам толькі гэтае святло ў мяне ўзяць можна.

Любка ўстала, пайшла да дзвярэй.

– Дык не аддасі?

– Не, гаспадыня. Загубіла ты нам жыццё, а шкада мне цябе. Дзеля дзіцяці свайго – не цкуй, не ўціскай да канца Рамана. А мяне хоць і забі. Усё адно я цябе шкадую, я ж мацнейшая.

Наступнага дня мы зноў прыехалі ў вазку да Замкавай плошчы. Вырашаўся лёс Ірыны, а лёс халопкі без гаспадыні не вырашаецца.

І ледзь паспелі мы праехаць праз гурты народныя – узняўся на вуліцах плач:

– Дзяўчынанька, бедная!

– Не быць вам разам!

– Не ўбачаць яго твае вачаняткі.

Ад Сарака Пакутнікаў ехаў просты воз, і ў яго толькі ледзь саломкі падкінута. А на возе скутая Ірына ў белай сукенцы і казнатцы[1] з каразеі – белага сукна. Прыбралі. Учора ж у рыззі была.

Едзе, глядзіць на людзей ззяючымі вачыма, велікаваты рот усміхаецца. Рада, даўно ж не бачыла нікога. Такое яшчэ дзяўчо, таненькая – двума пальцамі зламаць можна.

А плач коціцца хвалямі:

– Ясачка ты наша, заступніца. Даруй табе бог. А і ты нам даруй.

І яна кланяецца і радасным голасам – усё адно канцу нейкаму быць – кажа:

– Даруй, люд праваслаўны, даруй.

Спынілі воз ля вузкага высокага дома: замкавага суда. А Ірыну знялі з воза, павялі пераходамі ўгору.

У зале доўгі стол, крэслы без спінак, смярдзіць атрамантам са скураных чарніліц. І з акон так мала святла, што запалены тры свечкі. Ад адной струмень курודыму на нізкую скляпенчатую столь.

Больш нічога. Хіба што цяжкія дзверы ў правай сцяне. У катавальню. За сталом Друцкі, Дэспат-Зяновіч ды два пісцы. І яшчэ радца з магістрата.

Гаспадыня села і сядзіць, бледная, нерухомая, як ідал. І павекі самкнёныя. А на высокай прычосцы футраная шапачка з заморскімі пер’ямі.

Разбор быў кароткі. Іспісалі правіны, якіх не аказалася, акрамя цягі да мужыцкага цара. Ніякіх пошчакаў – падстаў для падазрэння, ніякіх рахаванняў – нарад з мяцежнікамі. І ніякіх падстаў меркаваць аб зламысным, хіба што толькі паспрабуе пабачыцца з Раманам.

Што рабіць?

У Друцкага яшэ больш сухая скура да зубоў прыліпла.

– На прэнг[2] павесіць – няма чаго. Катаваць дарэмна не трэба. Але і пусціць небяспечна... У замкавае сутарэнне, на вечнае зняволенне. Або – лепей – на агнявую страту. Прываражыла былога нобіля.

---

[1] Жаночая верхняя вопратка.

[2] Дыба.

– Чаму? – пытае Дэспат-Зяновіч.

– Не абышлося тут без чараўніцтва, – з'едліва кажа Друцкі. – Не такое каханне ўсявышні ў Кане галілейскай бласлаўляў.

А Дэспат усміхаецца:

– Каханне... А што ты ў ім разумееш? Яно ўсякае, каханне. Ці богам, ці чортам дадзенае, а ўсё адно лепшага за яго нічога няма. – І звяртаецца да радцы: – А твая думка якая?

– Пусціць, – уздыхнуў той, – аддаць гэтаму іраду. На Рамане Ракутовічаву роду канец. Нядобра.

– Ясна, – кажа Дэспат.

І тут ускочыў князь Друцкі – замітусіўся цень па століі.

– Пусціць? Аддаць? А Кізгайла-пакутнік у чым перад смерцю кляўся? А апантаная надоечы што прарочыла? Хочаш смуты вечнай, хочаш канца панству? Страціць вядзьмарку!

А Ірына стаіць перад ім, глядзіць прамяністымі вачыма:

– Не кахаў ты, відаць, князь. Свечачны агарак у цябе замест сэрца. Якое ж тут чараўніцтва? – І да Дэспата: – Не чаравала я. Калі і чаравала, дык вачыма, голасам, словам.

Пані Любка глянула на яе і апусціла вочы. А Дэспат-Зяновіч глядзіць на падсудную. Твар у яго здаровы, нязграбны. А вочы разумныя, як у сабакі.

– Ну скажы, пан, чым я яго чаравала? Крыж на мне.

Той усміхаецца сумна:

– Бачу, чым ты яго чаравала. Бачу, дачушка.

І вочы прыкрыў. Я амаль ведаў, аб чым ён думае. Ведаў, як ён у Варшаве жыў маладым, у каго па дурасці закахаўся. І чым гэта скончылася.

Але ён нядоўга думаў. Заміргаў раптам вачыма і, жорстка так, кажа Друцкаму:

– Яно не пытае, калі прыходзіць і куды. Можа і сатыр закахацца ў Геру. Ды і яна яго можа пажадаць. Бліскавіц не баючыся.

– Табе лепей ведаць, – з'едліва кажа той.

Але Дэспат ужо ўзняў павекі:

– Тваё слова якое, пані Любка?

– У Кісцяні Ракутовіча нельга саслаць?

Дэспат прыжмурыў вочы. Глянуў на паню спадылба. І быццам адрэзаў:

– Не.

Любка ўзняла вочы, уважліва паглядзела на Ірыну. І выдыхнула:

– Аддайце тады яму... Чаго ўжо...

– А прарочыцы словы? – узвіўся Друцкі.

– Усё адно аддайце.

Друцкі фаліянт на падлогу змахнуў. Потым устаў. Галава пад самаю столлю.

– Што ж, аддайце, калі ўсе на аднаго. Але вось вам і мой голас: чарадзейству ў Магілёве не бываць, мяжы панству нашаму – не быць. І таму няхай кат раней аслепіць яе.

– Ах, Друцкі, Друцкі, – паківаў галавою Дэспат-Зяновіч.

І паглядзеў на Ірыну:

– Бачыш, дзяўчынка, у што ўперліся. А ты як мысліш?

Тая ўся так і падалася да яго:

– Пане літасцівы, абы з ім.

– Падумай, – ціха кажа той, – можам проста адпусціць. Ідзі ў свет. Мужыкоў многа.

А ў той вочы раптам светлымі сталі больш ранейшага. Такія вочы, шэрыя, мяккія, невыказныя.

– Няхай сляпая. Няма свету без яго.

– Ну глядзі, – адвярнуўся Дэспат. – Няхай будзе па-твойму... Ідзі.

Кат у дзвярах з'явіўся. І яна пайшла да яго, пайшла спяшаючыся, лёгкай ступою. Быццам у паветры плыла. І ўсё паскарала, паскарала крок.

А на парозе павярнулася, паглядзела на нас:

– Дзякуй усім. Зараз-то я ўжо з ім. З ім.

Ах, вочы, вочы! Шэтыя, пушыстыя ад веек. З блакітнымі іскрачкамі.

І я чамусьці старую нямецкую песню ўспомніў. Адвыкнуў зусім, а тут успомніў:

Жыццё сказала:
“Свет гэты – мой.
З праха вырасце кветка вясной.
Каласамі ўзыдзе пад дажджом перагной”.
Жыццё сказала:
“Свет гэты – мой”.

А потым цяжка бухнулі за ёю дзверы. І зараўло там, за дзвярыма, полымя.

Я не мог гэтага вытрымаць. Я выйшаў на крыты ганак і стаў за калону. А народ ужо даведаўся аднекуль. Стогн каціўся над усімі, хто быў на двары і па-за ім.

І ўсе глядзелі на высокі ганак, на дзверы суда.

І яшчэ адны вочы глядзелі, доўгія, светлыя, незразумелыя.

Ля самага ганка, абкружаны вартай, стаяў воз, усланы саломай. Вялізны воз, падобны на труну, запрэжаную шасцю шкапамі.

На дне каша быў умацаваны слуп, а ля яго стаяў чалавек, прыкуты да слупа доўгім ланцугом за пояс. Грыва валасоў, круты лоб, жорсткі і горкі рот. Нават на Рамана не глядзеў зараз натоўп.

Я спусціўся з ганка і стаў каля варот. З заснежаных стрэх капала, віселі ледзяшы, раз'езджаны, зярністы, жоўты ад гною, шоргаў пад нагамі снег. І на ўсё гэта з неба лілося такое шэрае і такое ўсё ж па-вясенняму яркае святло, што балелі вочы.

Заснежаныя дахі, заснежаныя, падталыя з поўдня купалы, шэрыя драніцы, што адлівалі зялёным.

І над усім такая ціша, што страшна. Змоўклі раптам усе. Ніхто нават з нагі на нагу не пераступіў. Чакалі.

І вось зарыпелі дзверы. Павольна адчыніліся. І ў дзвярах паказаўся Дэспат-Зяновіч. А за ім – Ірына. Адной рукой трымаецца за Дэспатаву руку, а другая ў паветры працягнута. За імі кат вываліўся. Стаіць.

Кат пашкадаваў яе. Толькі зроку пазбавіў, а вочы не вырваў. Ідзе яна і проста быццам спіць на хаду, закрыты вочы, пушыстыя веі апушчаны.

І Дэспат – першы яе павадыр.

Яны зусім былі падышлі да сходаў, калі кат раптам зрабіў следам некалькі крокаў і стаў на калені.

– Даруй мне, даруй, – варушыць тоўстымі губамі.

І яна папрасіла, каб стаў ён ёй пад руку. І паклала далонь на шорсткую, як поўсць, грыву.

– Даруй табе неба. Ты нас зноўку звёў.

Выйшаў з дзвярэй на балюстраду Друцкі-князь. Стаіць, глядзіць на гэта, усміхаецца. Гурма, пабачыўшы ўсмешку гэтую, натапырылася ўся. Такія ўжо мы люддзі: лепей галаву сячы, чым плюнь з усмешачкай. Будзь катам, толькі ў душы катаўство не трымай.

А гэтыя два ўсё яшчэ спускаліся з ганка.

Ах, доўгі, доўгі гэта быў шлях! Не карацей усяго жыцця, што яшчэ заставалася.

А ў спіну тым, што спускаліся, Друцкі крыкнуў:

– Бяры яе, Раман. Вядзі па дарогах няпраўды, па якіх пайшоў. Радзі дзяцей, напалову халопаў, напалову ізгояў.

А Раман у адказ усміхнуўся. І была гэта такая ўсмешка, што Друцкі зразумеў: не абразіў, не зняважыў ён скутага, а пасяліў у ім цвёрдасць. І ён не вытрымаў, пайшоў, грукнуў дзвярыма.

Прыступка. Прыступка. Яшчэ прыступка.

Спускаюцца белыя, футрай аблямаваныя кабцікі. Дзеўка з нагамі лебедзя. Што? У лебедзя чорныя ногі? Я сам ведаю. А ногі ўсё ж былі лебядзіныя.

Ударыў недзе першы далёкі ўдар звана. Упаў у цішыню, як камень у ваду. І адразу закружляла, закаркала вараннё, быццам камякі сажы ўзляталі і асядалі на стрэхі. Яна магла толькі чуць іхні крык. Але затое яна адчувала: пругкі і цяжкі мокры вецер быццам далонню штурхаў у твар. І яна ішла насустрач гэтаму ветру.

Дэспат падвёў яе да воза:

– Бяры. Не табе б, ворагу роду чалавечага, такую дзеўку.

– Добра, – сказаў Раман, – час нас з табою рассудзіць. І шмат грахоў табе даруецца, Зяновіч, за тое, што ты яе вёў. Дай табе бог на тым свеце жаданай сустрэчы, калі на гэтым не атрымалася.

– А за гэта табе дзякуй, – сказаў Дэспат і змоўк.

Зноў упаў чорны ўдар звана. А ў Рамана валасы амаль што сталі дыбам, і ён цягнуўся да яе, а твар плакаў без слёз такой тугою, такой пяшчотай, якую і адшукаць цяжка на зямлі.

Звон ударыў.

І яна працягнула да чалавека на возе рукі, быццам да святла нябачнага.

– Раман, вазьмі мяне.

Чыясьці рука падхапіла яе, дапамагла падняцца. І там, наверсе, яе з трапяткой прагнасцю, пяшчотна і асцярожна схапілі яго абрубкі, прыцягнулі да грудзей.

Ён стаяў, абапіраючыся спіною на слуп, стаяў з перакошанымі бровамі. Стаяў, прыпаўшы вялікім ротам да яе валасоў. І ў вялізных вачах было такое, чаго лепей не бачыць на гэтай богам праклятай, лютай, грэшнай зямлі.

А яна прынікла попельна-залацістай ускалмачанай галоўкай да яго грудзей, там, дзе білася сэрца.

Бледны твар, пушыстыя веі апушчаны. І ўсмешка – быццам бачыць шчаслівы сон.

І твар ваяўніка плакаў без слёз.

Я здзівіўся, такая яна была таненькая ў яго руках...

І ўсе людзі маўчалі.

...Таненькая, таненькая.

І поруч са мною нейкі шляхцюк, пакрыты шрамамі, чалавек з тых, што смяецца на хаўтурах, груба сказаў:

– Куды яму яе. Пад гэтай сволаччу коні падаюць. Сам бачыў.

Я маўчаў усе апошнія дні, таму што ведаў: разяў я рот, і я пачну крычаць, і гэты грык ніколі не скончыцца. Але больш я ўжо не мог.

Я павярнуўся да яго і прашыпеў горлам:

– Паважай ланцугі, сволач. Пакінь, іначай...

– Іначай? – нахабна спытаў ён.

– Іначай дрэнна будзе. Ты што, не бачыш, што поруч таксама дваранін? Я табе заткну горла.

Ён змоўк. І гэта было добра. Іначай скончылася б забойствам.

Марудны ўдар звона заглушыў ляскание бізуна.

Шкапы, напружваючыся, зрабілі першыя крокі. Паплыў над галовамі слуп з двума людзьмі. Ракутовіч падняў гавалу, і раптам у велічэзных яго вачах загарэлася нейкая цяжкая іскра.

Я зразумеў: гэта была іскра крыўды. На каго? Не гневаўся ж ён нават на ката.

Я паглядзеў туды, куды глядзеў ён. Над галерэяй, у акне на рагу палаца, я ўбачыў змяты страшны твар чалавека, які ўчапіўся пальцамі ва ўзорныя краты акна. У вузкіх вачах гэтага чалавека нават дурань заўважыў бы розум, іскру божую, жвавасць. Але я заўважыў у іх яшчэ нешта. Гэта была зайздрасць, страшная чалавечая зайздрасць да таго, хто ехаў на ганебным, падобным на труну возе.

Гэта быў Сапега.

І раптоўна па ўсім замкавым двары, па ўсіх пераходах раскаціўся дзікі, страшны па сіле голас, якога палохаліся ў бітвах ворагі.

– Леў! Леў! – роў голас.

І ў таго, хто роў, грыва, якую развейваў вецер, падала на лоб. А на падзёртых голых грудзях ляжала прыгожая сляпая галава.

– Леў, ты стаў лісіцай! Калі будзеш ваўком – памрэш, як сабака.

Кінуўся твар у акне. Яму засталося толькі кідацца і зайздросціць. Ён жа не мог так.

Заляскатаў воз. Моўчкі паваліліпа абодва яго бакі людскія гурты.

І на непакрытыя галовы падалі нясцерпна рэдкія ўдары звана. Расхлябаныя колы воза па самыя восі гразнулі ў вязкім, набрынялым вадою сакавіцкім снезе.

Юрод, што стаяў амаль на дарозе, працягнуў рукі і дрыжачымі пальцамі гладзіў, лашчыў паветра, кранаў яго, як сляпы.

– Сынок... Сынок...

Страшны твар і сляпая галава плылі над натоўпам, усё аддаляючыся і аддаляючыся.

Шалёныя, незразумелага колеру вочы затрымаліся на маім твары.

Зноў упаў удар звана.

І аддаляўся, аддаляўся воз. І вецер гуляў грывай валасоў, гладзіў твар чалавека і сляпыя вочы той, што прыпала да яго.

Я плакаў. Я не саромлюся прызнацца ў гэтым і не саромлюся сваіх слёз.

– Божа, злітуйся над зямлёю, што нараджае такіх дзяцей.

ЦЫГАНСКІ КАРОЛЬ
Аповесць

I

Палявыя гваздзікі пахлі ваніллю, як святочны пірог. Міхал Яноўскі ўздыхнуў, зрабіўшы такое адкрыццё, бо любіў хатнія пірагі, а ўжо два дні, як еў хлеб з халодным мясам і не ведаў, ці давядзецца яму яшчэ калі-небудзь пакаштаваць цудоўных праглаў і перапечак. Нават печка, дзе іх звычайна пяклі, больш не належала яму. Яноўшчыну разрабавалі, загонавая шляхта Ваўчанецкага зжэрла ўсё, аж да зялёных, цвёрдых, як палка, груш, а сам ён, Яноўскі, – злачынец, якога, напэўна, шукаюць. Трэба хутчэй ехаць да незнаёмага дзядзькі па маці Якуба Знамяроўскага. Ён, кажуць, моцны чалавек, не пабаіцца Ваўчанецкага, ён абароніць. Дзядзька павінен сустрэць яго ветліва, паспачуваць, а там – хто ведае – можа, адбярэ ў Ваўчанецкага запаскуджаную Яноўшчыну і зганьбаваныя магілы продкаў. Ён гэта зробіць! Ён сіла, а сіла – усё на зямлі.

Цікава толькі, чаму сустрэчныя ў адказ на запытанні Міхала стрымана ўсміхаюцца (Ого! Паспрабавалі б яны ўсміхнуцца нахабна!) і кажуць:

– А-а, цыганскі кароль. Вам трэба па гэтай дарозе, пане.

Па маладосці год і легкадумнасці Міхал не звяртаў увагі на “важлівыя дробязі”, і ўсё яму было хоць бы што. У сіле ён звыкнуў бачыць дабрадзейнасць, хоць скончыў школу пры калегіуме і павінен быў ведаць на прыкладах з Катула, што не заўжды дабрачынны Цэзар і што курульнае[1] крэсла часта займае вадзянка. Бацька, чалавек, настроены па-старасвецку, таксама выбіваў з яго такія думкі цытатамі з Сымона Буднага. Гэта не дапамагала. Свет быў няўстойлівы, моцныя пагражалі адусюль, кароль не мог абараніць, схізматаў не крыўдзіў толькі лянотны. Катул быў паганец, а Буднага яшчэ дзвесце год назад абвінавацілі ў амярзіцельнай швейцарскай ерасі, і таму ён не меў рацыі. Сіла, і толькі сіла!

Ён не ведаў яшчэ, чым канчае кожная грубая сіла, і таму амаль весела падганяў каня ў напрамку да Знамяроўшчыны. Надзея калыхала яго.

Як добра, як прамудра ўсё на божым свеце!

Каля самай дарогі стаяў нацэлены кудысьці аглоблямі воз без каня. Абады колаў былі збітыя, і воз стаяў як быццам на чатырох сонцах, бо спіцы нагадвалі праменні.

---

[1] Сенацкае.

Каля воза хадзіў, скрабучы патыліцу, чорны кучаравы чалавек. Срэбная, паўмесяцам, завушніца. Вопратка, як з сабачага вяселля. Цыган.

– Што гэта ты робіш, чалавеча?

– Рапарую воз. Да заўтра пасяджу.

– А потым?

– А потым павязу на сабе дадому. – Цыган павярнуў да Яноўскага нядобры чарнабровы твар.

– Што ж гэта ты так... забаўляешся? – іранічна спытаў Яноўскі.

Цыган пакалупаў пальцам у цыбуку і раптам выбухнуў:

– Конь, бачыце, яму спадабаўся. Даём яму ад кожнага здабытага дзесятка аднаго каня. Ад катлоў таксама... Па закону... Мала. Я спрачаўся. Ну і вось. Гэта ж ганьба цыгану так цяжка працаваць за сваю ж маетнасць. Абады з колаў пазбівалі... Каб яго везлі на такіх колах, калі ён атрымае па заслугах рану ў жывот: са спіцы на спіцу, з байрака на байрак.

– Хто гэта? – спытаў непаразумела Міхал.

– Хто?! Знамяроўскі! Кароль наш, каб яму кадук... Я казаў: жывіце вольна, роме. Не, пасадзілі на сваю галаву шляхцюка. Ён быў голы як бізун, а цяпер ён кароль. Дзівуйцеся на цыганскую дурасць: першы раз такое дзіва бачыце... Каровін праснак!

Яноўскі слухаў, здзіўляючыся з бясконцых перыядаў, аж пакуль не абрыдла. Уласна кажучы, варта было правучыць нахабніка за непачцівыя словы пра шляхту, але цыган так гаротна і тужліва стагнаў, што Міхалу стала шкада яго.

І ён паехаў далей на сваёй шкапе, якая бразгала напалову адарванай падковай.

Шлях збочыў ад пушчы. Ля рачулкі, пад дубамі, паказаліся шатры – нешта каля сотні, – агні каля іх, зграбныя постаці цыганак і куцапыя – цыганоў. Чуліся крыкі дзяцей, стук молата па кавадле, брэх сабак.

Дзесяткі два гэтых сабак, жоўтых, са стаячымі вушамі, абкружылі конніка з відавочным намерам зжэрці. Гледзячы на іх рэбры і чырвоныя зяпы, Яноўскі падумаў, што гэта можа здарыцца, але ад вогнішча наблізілася чацвёра цыганоў. Сабак адагналі. Чорныя, як д'яблы, худыя, у калматых кажушках, з чырвонымі павязкамі вакол галавы, з ражнамі ў руках, цыганы вельмі нагадвалі разбойнікаў.

– Куды едзеш, бацю?– спытаў паважны, прыкметна сівы цыган.

– Прапусці, – замест адказу з гонарам сказаў Яноўскі. – Я беларускі шляхціц.

Гэта гучала, як “не руш мяне, я рымскі грамадзянін”.

Цыган павольна агледзеў Яноўскага ад высокіх кабцяў, пацёртых ля стрэмяў, ад скураных нагавіц, пацямнелых ад конскага поту, і аж да звычайнай, зусім не панскай магеркі з абламаным пяром. Пасля плюнуў на зямлю і спаважна паказаў Міхалу на слуп, ля якога яны стаялі. Слуп быў упрыгожаны дошкай з сілуэтам каня з надпісам:

Знамяроўскае каралеўства, бог хай літуе яго. Душ русінскіх два ста, егіпецкага племя – ад зямлі ўсёй весі. Халупы. Жыдзішкі, Чэрнеў брод. Пры іх зямля ворная і пасавіска. Урочышчы Альховы востраў і Княгініна, а таксама тэж балота Недабыліха. Не торкайся з табунамі, калі гонар беражэш і не хочаш на смерць прыправіцца.

Яноўскі прачытаў варварскі надпіс, і ў яго пачала пацепвацца шчака.

– Я не з табунамі? – спытаў ён з жудасным спакоем.

Цыган у адказ пачухаў грудзі пад кажухом.

– Вяртайся, бацю, або давай грошы за праезд крэса. Тут табе не задрыпанца якога зямля, а яго крулеўскае мосці пана Якуба Знамяроўскага з Ліды. Наша, цыганскае, царства! Калі грошай няма, дык прызнавай яго за караля, злазь са сваёй спірэпы і шыбуй пешака да палаца. Не – атрымай дубцы і гэн хоць да д’ябла! Дзевяць год мы тут гаспадары, прывілею зацвердзіў кароль польскі, хоць мы ім платы падпіраць можам, калі захочам.

– Я табе паразмаўляю, цыганская храпа! – Яноўскі выцягнуў шаблю, хоць добра бачыў, што ражны ў цыганоў даўжэйшыя.

Цыган у адказ флегматычна сунуў амаль пад нос конніку кулак, падобны на валасаты гарбуз, і... атрымаў плазам удар па галаве.

– На калені, хлопы!!!

У той самы момант яго атакавалі. Ён закруціўся, адмахваючыся шабляй і атрымліваючы адчувальныя штуршкі ражноў. Адзін з нападаючых спрытным ударам ражна па падкаленных жылах каню прымусіў жывёліну спатыкнуцца. Яноўскі прыпомніў, што цыганы мастакі адным такім ударам зваліць быка, які імчыць “на поўны намёт”, і таму, не чакаючы ганебнага фіналу, сцёбнуў каня карбачом пад пах і так пусціўся дарогаю, што толькі пыл закурэў.

Каня ўдалося стрымаць толькі тады, калі за паваротка дарогі ўстаў ва ўсёй прыгажосці “стальны град” цыганскага каралеўства. Злева была рэчка, справа, з-за далёкіх узгоркаў, выглядалі стрэхі

вёскі, а паміж ракою і вёскай, бліжэй да ракі, размясціўся "град". З трох бакоў абкружаў яго ці то вельмі запаскуджаны і запушчаны сад, ці то ліставы лес, сярод якога сям-там узнімаліся ў неба чорна-зялёныя конусы ялін. З чацвёртага боку быў выган з атрутна-зялёнай травой і мноствам каровіных праснакоў. Дарога, па якой ехаў Яноўскі, ішла выганам і пераходзіла бліжэй да "града" ў змрочную і вільготную, як нара, алею з пакручаных, хворых ад вільгаці, нізкарослых ялін, алешніку, абламаных кустоў туі, карычкі і хмелю, які буйна абкручваў усё гэта багацце. Нізкія берагі, мярзота пустэчы вакол, глухая крапіва, няўцешны выган.

Ды і палац стаў перад Міхалам ва ўсёй сваёй несамавітай галізне. У той сваёй часціне, што была бліжэй да рэчкі, гэта былі астанкі нейкага храма. Без званіцы, падобны на княжацкі старадаўні саркафаг, храм гэты быў пабудаваны з плоскіх каменных плітак, і на франтоне ледзь выступалі збітыя літары "Anno Domini 1550". І тут была пустэча, толькі вітражы ў вокнах блішчалі ўмыта і радасна пад праменнямі нізкага вячэрняга сонца. Будынак, як бачна, адыгрываў ролю камяніцы ("Што гэта за магнат, калі поруч з новым замкам няма старой вежы? Яны-то, праўда, не дапамагаюць, але ж гонар").

З камяніцы цягнулася над пушчай з лопухаў і здзічэлых жоўтых вяргінь "галдарэя" да астатняй часткі палаца.

Гэта была вялізная драўляная хата, складзеная не з бярвенняў, а з чатырохгранных дубовых брусоў. Шалёўка збераглася толькі сям-там, але магутна падтрымлівалі сцены бэлькі, пакладзеныя крыж-накрыж. Дах з пачарнелага дору, галерэя вакол хаты на драўляных слупках. Акенцы малюсенькія, затое ганак на каменных калонах раскошны, хоць і самому каралю сядзець. Ад камяніцы падаў шэры адбітак на хату, сад, на ўсё вакол.

Каля ганка, поруч з пазелянелай гарматай, спаў вартаўнік, адклаўшы ўбок павязку з пер'ямі, голым жыватом да зямлі. У валасах вартаўніка была салома.

Яноўскі спешыўся і крануў яго нагою пад рэбры. Пасля трэцяй спробы вартаўнік ачмурэла ўскочыў, схапіў тлеўшы ў збане фіціль... і як пярун гахнуў над палацам. Грукаючы, пакацілася кудысьці рэха, чорнай хмарай зляцелі з дрэў вароны. У доме пачаўся сапраўдны "аларм" – мітусяніна, крыкі.

І тут адбылося такое, што ў Яноўскага вочы палезлі на лоб.

Зарыпелі дзверы, і на ганак выплыў, як павіч, чалавек у звычайным, але празмерна яркім уборы паюка: залатым цюрбанам з пяром, шаўковым жупане – на голае цела, з яркім шалем замест пояса.

Чалавек узнёс жазло і абвясціў:

– Літасцю бога кароль Якуб Першы. Кароль цыганскі, вялікі намеснік Ліды, уладар Мацыевіцкі і Беларускі, гаспадар усіх мясцін, дзе ступаў капыт цыганскага каня, гаспадар егіпцян беларускіх, падляшскіх, абедзвюх Украін і Егіпта, Якуб – кароль. На калені!

За спіною ў Яноўскага заспявала труба. Трубіў надоешні сонны вартаўнік.

А цырымоніймайстар цягнуў далей:

– Сіла і моц, апора бога, уладар вандроўных сцежак і аброці, за ўсё вышэй – шляхціц!

Зноў заспявала труба. У трубача вісела пад носам вялізная кропля і вочы былі чырвоныя, як у трусіка.

Не паспеў ён скончыць, як у дзвярах з'явіўся чалавек, які аніяк не мог быць уладаром вандроўных сцежак, бо насіў манашую расу. У чалавека была голая галава, патройны падбародак і валасатыя рукі. Яго не паспелі затрымаць, і ён, хістаючыся на нагах, раўнуў:

– Пудзіла першы, гарлачагаловы, рызмананосны, цар белай рэпы, вялікіх і малых гуркоў, вераб'інае пасмешышча і вышэй за ўсё – дурань.

І з размаху, як дзіця сеў задам на падлогу.

– Дзень добры!

Гайдукі схапілі яго за рукі, але ён, упіраючыся, крычаў на ўсё горла:

– Ізыдзіце, грэшнікі! Пакаянне накладу. Блукаеце самі, акі сабакі, шлях свой згубіўшы, пастыраў ганьбіце. Акі Елісей, мядзведзіц на вас напушчу, патрушчу вас аслінай сківіцай!

Елісея гайдукі спалохаліся. А чалавек шчасна спяваў, седзячы на ганку:

Як была я малада
Як была я нежна...

І адразу з гэтым, цалкам лагічна:

Хоць з мядзведзем у бярлог,
Абы не ў бацькі.

За гэтым відовішчам Міхал не заўважыў, што ў дзвярах ужо стаяў сам кароль, заспаны, азызлы, і моцна соп носам. На ім была кашуля да пупа, і на галаве срэбны абруч. Якуб нагадваў Апалона, калі богу было пад сорак год і ён густа зарос дрымучымі валасамі.

Ніводнай сівінкі ў патлах, нізкі лоб, шырокія грудзі, доўгія магутныя рукі, караткаватыя для тулава ногі, што моцна стаялі на зямлі. І твар гэты быў вельмі азызлы ў шчоках.

– Ты хто такі?

– Ізыдзі, сатана! – раптам залямантаваў манах. – Няўдобанасімы ты кураед, мясаед, яйкаед!

– Замаўчы, мітрапаліт, – сказаў кароль. – Адцягніце яго куды ў адпаведнае сану месца.

Гайдукі падхапілі манаха і пацягнулі, але ён яшчэ некаторы час упіраўся, напінаўся і пры гэтым роў, пляваўся і вытвараў усякія іншыя дзеянні.

– Ты хто такі? – уладна спытаў Знамяроўскі.

І тут Яноўскі, нечакана для сябе, нізка пакланіўся і сказаў:

– Паслом да цябе, вялікі кароль.

Знамяроўскі ані словам не выявіў здзіўлення.

– Ад каго?

– Ад роду Яноўскіх... Дзядзечка, гэта я , ваш пляменнік, сын вашай траюраднай сястры.

– Гм... яе звалі, здаецца, Ганнай?

– Алёнай, вялікі кароль.

– Так-так, ну да, ну да. Каралі павінны мець добрую памяць, гэта іх дабрачыннасць. Ганна, Алёна – усё адзіна. Чаго ты тут?

– Здарылася жахлівае, вялікі гаспадар. Падступны замах на маетнасць і шляхецкі гонар вашай сястры. Ведаю, што кароль дапаможа, і звяртаюся да вашай літасці.

Знамяроўскаму такая сітуацыя, здаецца, спадабалася.

– Што ж здарылася?.. Э-э... мой малады і неабазнаны друг.

Яноўскі ўпаў на адно калена. З гарачым благаннем у голасе кінуў:

– Сусед наш, Ваўчанецкі, нечакана напаў на наш маёнтак. Мы спалі, у нас было толькі тры гайдукі, не як у вашай літасці. Ён выгнаў нас.

Знамяроўскі пагардліва ўсміхнуўся:

– Чаго ж вы пайшлі?

– У нас не было сілы. Ён спаіў сяброў нашых, і яны не абаранілі нас. Калі нас выгналі, я ўдарыў нахабнага драпежніка нажом.

– Ого, – пажвавеў Знамяроўскі, – мая кроў! Пазнаю! Тыгра! Добра, што нажом, а не сумленнай шабляй. Чаго ж ты просіш?

Яноўскі вырашыў прасіць больш. Тады, можа, дадуць хоць частку.

– Да ног прыпадаю сваяку, якім ганарымся! Да ног каралеўскай крыві! Прашу пакараць захопніка, вярнуць Яноўшчыну. Пасля мы ў братнім падначаленні вашым хочам быць.

Знамяроўскі пачухаў патыліцу, паглядзеў на прыгожага юнака з падвітымі валасамі і буркнуў:

– Добра. Каралі павінны дапамагаць сваякам. Клікну цыганскае рушэнне, і калі будзе маё жаданне, магчыма, і ашчасліўлю цябе, мой бедны, але мужны сваяк. Толькі маёнтак твой... Прыпішаш яго назву да маіх тытулаў. Пажыві, пакуль тое, месяц-другі.

– Дзядзечка, вялікі кароль, – пачаў маліць "пасол", – мае бедныя бацькі памруць з гора.

– Ну! – раптам грозна, але ціха сказаў Знамяроўскі. – Ты робак[1] ля ног маіх. Жыві і прасякайся ўсведамленнем маёй велічы. А пасля паглядзім. І не лямантуй, падобна як шакал і стравус... Ад майго настрою залежыць свет, а ты хто?.. Адпачывай. Пазнаёмся з маім мітрапалітам. Ён годны чалавек і калісьці ахрысціць усіх тваіх язычнікаў. Уласна кажучы, маім дбаннем гэтыя карычневыя д'яблы ўжо ахрышчаны, але сапраўднае схіленне да веры дзядоў закладваецца, бо мітрапаліт мае частыя спатканні з зялёным зміем.

– Добра, – дрыжачым ад крыўды голасам сказаў Яноўскі.

Яму хацелася секануць шабляй гэтага вар'ята, але куды пойдзеш потым, што рабіць самотнаму і слабаму на гэтай грэшнай апалячанай беларускай зямлі?

А Знамяроўскі ўжо дабрадушна ўсміхнуўся:

– Ну-ну. Можа, заўтра ў паход пойдзем, можа, годам пазней, а можа, і ўсё жыццё тут праседзіш, і я табе ў спадчыну каралеўства пакіну, бо я яшчэ ў дзяўкох. Мая свентая воля. Я – кароль. Хачу – плюю, хачу – голым шпацырую, вось, як цяпер.

– Дзякуй вам, ваша вялікасць, – ціха адказаў Яноўскі, – Хай будзе так.

І тады кароль яшчэ раз павысіў голас, звярнуўшыся да слуг:

– Бачыце, як далёка дайшла слава мая, вялікага караля цыганскага. Дастаўныя мы на свеце ўсім, адусюль прыбягаюць пад нашу руку, бо моцныя мы больш, ніж кароль, і бог за нас. І хто памышленне займее парушыць святую манархію нашу, таго сакрушу, знішчу, на каленях прымушу маліць літасці. Вось яна, шыбеніца!

І кароткі палец караля торкнуў у бок гэтай няхітрай прылады ля камяніцы.

– Ідзі пакуль што з маім лейб-медыкусам, – сказаў кароль Яноўскаму. – А пасля мой сейм (бо мы кароль добры і памяркоўны) адобрыць мой вырак.

Ён затупаў быў валасатымі нагамі да дзвярэй, пасля павярнуўся да медыка:

---

[1] Чарвяк.

– Паглядзі яго каня, ці не завёз ён у маю дзяржаву з мэтай падрыву яе дабрабыту конскай хваробы.

Гайдукі ўзнялі ў неба стрэльбы і, калі кароль знік за парогам, далі залп. Вароны зноў сарваліся з камяніцы і, непаразумела каркаючы, памчаліся кудысць.

Лейб-медыкус павёў Яноўскага ў маленькі флігель за домам, які тануў у лопухах. Амаль адразу ля стаўка прагучаў стрэл.

– Што гэта? – тарганууся Яноўскі.

– Пужаюць жаб, каб ліхадзейскім кумканнем сваім не перашкаджалі спаць іх каралеўскай мосці, – з'едліва сказаў медык.

Яноўскаму здавалася, што ён трызніць. І таму ён толькі тады разгледзеў медыкуса, калі яны апынуліся ў маленькім пакоі флігеля, дзе сцены былі амаль заслонены кнігамі на паліцах і вісеў вялікі аркуш пергаменту, выдраны, відаць, з кнігі "Здароўя шлях верны". На аркушы намалёваны чалавек, які стаіць спіною да гледача. На яго голым целе былі намечаны тыя пункты, на якія трэба ставіць банькі.

Медыкус меў год пад пяцьдзесят, быў худы і жоўты. Вочы, якія надта блізка сядзелі адно ад другога, глядзелі разумна і іранічна з-пад калматай чупрыны; нос быў аж празрысты ад бледнасці; на кашчавых плячах вісела чорная мантыя, а на ёй, ля пляча, быў вытканы герб Знамяроўскага і ніжэй, як знак прафесіі, гіпакратаў змей, што абвіў клісцірную трубку.

Выпілі па чарцы дагцыгскай залацістай гарэлкі, селі закусіць, і толькі тут Яноўскага прарвала:

– Слухайце, пан медыкус, гэта ж вар'яцтва нейкае. Мне няма куды падзецца, але нашто вы тут, чаму носіце гэты ганебны шыфр?

Медыкус сумна паглядзеў на Яноўскага разумнымі шэрымі вачыма:

– А ў мяне, пан думае, ёсць выхад? На нашай зямлі дрэнна жывецца вучоным, асабліва калі яны беларусы. І яшчэ... калі яны занадта цікаўныя і хочуць ведаць пра чалавечы трыбух значна больш, чым іншыя. Мяне засудзілі на баніцыю, бо я даставаў з магіл трупы і рабіў забароненае анатаміраванне іх.

Яноўскага перасмыкнула.

– І як вы маглі рабіць такое? Вы што, хацелі б, каб і з вамі так зрабілі пасля смерці?

Медыкус усміхнуўся:

– Калі ласка. Што я буду тады? Тло і смурод.

– Але ж бессмяротная душа... Яна пакутуе...

Субяседнік Міхала выпіў яшчэ чарку гарэлкі і раптам спакойна сказаў:

– А вы ўпэўнены, што... душа ёсць?

– Ну вас, – спалохаўся Яноўскі, – гэтак і да кастра нядоўга.

– Нічога, у нас цяпер цывілізацыя, зацны пане. Не паляць, а вешаюць... Зразумейце, што нават пачуцці не сведчаць пра бессмяротнасць душы. Пачуццяў няма, усё ад току крыві. Кінецца яна ў галаву – чалавек адчувае гнеў, кінецца яшчэ куды – іншы вынік. Так што глупства ўсё! Чалавек менавіта такая самая худоба, як свіння, і адрозніваецца ад яе толькі здатнасцю размаўляць, складаць вершы ды яшчэ тым, што ён бывае горшы за самую горшую свінню.

Ён адклаў убок двухзубы відэлец.

– Вось і засудзілі мяне. А я не магу жыць без маёй зямлі, яна мне дарагая (яшчэ адно глупства чалавечай натуры). Тут я ў бяспецы, і тут іншая дзяржава. Пакіну яе межы – застаецца шыбеніца. А тут мяне абароняць.

– Знамяроўскі моцны чалавек?

– Чалавек не можа быць моцным. Але ён можа выставіць шэсцьсот коннікаў цыганскага рушэння, ды яшчэ ён лідскі шляхціц, у яго сябры. Тут ракою льецца гарэлка, і ўсе гэтыя п’янічкі за яго хоць у агонь. Ды яшчэ сяляне. Так што, калі хто ў гэтай мясцовасці кароль, дык гэта ён... Пракляты богам край вар’ятаў і ёлупаў.

Яноўскі быў згодны з медыкусам: свет звар’яцеў менавіта ў той самы дзень, калі загонавая шляхта Ваўчанецкага адабрала ў Міхала маёнтак. Таму ён адсунуў ад сябе місу, наліў у кубак піва і зручна сеў у глыбокае мяккае крэсла. Медыкус сеў у другое крэсла, побач, і закурыў люльку.

– Дарэчы, як прозвішча пана? – спытаў распешчаны Міхал. – Я быў такі непачцівы... Як вас завуць?

– Ніхто, – раўнадушна сказаў эскулап. – Мяне завуць “Ніхто”.

Яноўскі, як выявілася, яшчэ не перастаў здзіўляцца:

– То бок...

– А нашто вам трэба ведаць гэта? Хіба не я сам поруч з вамі, хіба нельга мяне называць проста медыкус? Або, можа, вы лічыце, што імёны адпавядаюць сутнасці рэчы або чалавека, што іх носіць? Я ведаў магната Кішку, і ён зусім не быў падобны на кішку. Нават для прамой кішкі ён быў занадта тоўсты і брудны. Паўстанец Дубіна быў адзіным на свеце разумным беларусам у свой час. Леў Сапега хутчэй падобны на лісіцу, і я ніколі не бачыў ніводнага Язэпа, які мог бы насіць тытул “прыўкраснага”. Называйце мяне проста медыкусам.

Ён ахутаўся хмарамі тытунёвага дыму, і нечакана з-пад цяжкіх павек бліснулі яго вочы. Сказаў нечакана проста і сумна:

– І нашто гэта каму ведаць, хто абараніў мяне, слабага ў свой час. Людзям не было справы да таго, як памерлі два самыя дарагія мне чалавекі, памерлі з голаду. А я стаяў тады ў клетцы ля муроў нясвіжскага палаца... Дзень, другі, трэці... І няхай яны здыхаюць цяпер, бо гэта я, чалавек, пра імя якога ніхто ніколі не даведаецца, першы на свеце ачысціў аднаму чалавеку мозг ад кавалкаў раструшчанай чарапной косці і наклаў на дзірку ў чэрапе лапік з залатой пласцінкі. І гэты чалавек застаўся жыць.

Яноўскі толькі тут пабачыў, што пляшка з гарэлкай амаль пустая. Медыкус быў відавочна п'яны: зрэнкі яго вачэй зрабіліся чорныя, вялікія і трапяталі, як у атручанага. І аднак Яноўскі не спудзіўся: медыкус валодаў сваім мозгам, і мова яго рабілася ўсё больш рэзкай.

– Не думайце, што я рабіў гэта і многае іншае для людзей. Я не шкадаваў іх, не адчуваў іхняга болю, і, відаць, таму мне ўсё ўдавалася, за што шкадаваць чалавека? Вось ён набудаваў дзівосных палацаў, насаджаў дрэў, вырасціў паэтаў і дойлідаў. А заўтра знойдзецца вар'ят і пачне перапальваць на вапну статуі, разбураць палацы, паліць гарады. І паэта, якога абвясціў ерэтыкам, спальваюць, і з яго праху робяць клісцір сабаку зваёўніка, бо сабака нячыстая жывёліна, і ёй дапамагае клісцір з праху ерэтыка, як хрысціяніну – клісцір з мошчаў святога. Дзікуны і варвары заўжды такімі будуць па прычыне натуры сваёй... Мёртвае дрэва дае прытулак кузуркам, мёртвыя кветкі салодка вянуць, мёртвы чалавек – смярдзіць. Смярдзіць ён, праўда, і жывы...

– Даволі, – сказаў Яноўскі. – Я шляхціц, мне непрыстойна такое слухаць. Але ж вы таксама чалавек. І тыя, што будавалі, былі таксама людзі...

Абодва маўчалі. Потым, калі гэта стала нясцерпна, Міхал спытаў:

– Лепей скажыце мне, як гэта мой дзядзька стаў каралём цыганоў беларускай зямлі?

– Не толькі беларускай, – сказаў медыкус. – І Польшчы, і Літвы, і нават Украіны.

– Як жа ж гэта атрымалася?

– Вельмі проста. – Медыкус як бы цам ачуняў ад ап'янення, бо выраз жаху знік у яго вачах і змяніўся галантнай і трошкі з'едлівай усмешачкай. – Прыблізна ў 1779 годзе Знамяроўскі быў звычайным дробным лідскім шляхціцам. Вы ведаеце, цяпер цяпер шляхціцу стаць багатым – гэта ўсё адно што дачакацца справядлівасці ад пана. Але са Знамяроўскім атрымалася так... У яго вёсачцы было не больш як

сорак халуп, а на стайні стаялі дзве кабылы-свірэпы ды дрыкгант каралеўскі, якога вясной ражнамі на ногі ставілі. За лета коні трохі сыцелі, і, відаць, гэта было прычынай, што на іх паквапіўся нейкі цыганскі табар. Коней укралі. Тут Якуб выявіў сапраўдную адвагу. І не дзіва, іначай давялося б здыхаць з голаду, макам сесці і на месяц брахаць. Ён узяў двух сяброў, сеў на сялянскіх коней і пагнаўся за табарам. Дагналі яго ўночы. Іншы, можа, падумаў бы, а яны ўтрох напалі на цэлы табар, і пачалася бойка. Змялі мужчын, адсцябалі тых, хто супраціўляўся, адабралі ўсіх коней з табара і адлупцавалі ўсіх цыганоў, што ў гэты час там былі. З багатай здабычай рушылі яны дадому, а іх суправаджаў лямант абрабаваных. Нават пярыны цыганскія ўзялі для слуг. Паб'еш чалавека – ён пачынае цябе паважаць. Праз некалькі дзён з'яўляецца да Знамяроўскага дэлегацыя цыганоў Лідскага павета і просіць прыняць іх пад сваю высокую руку – за мужнасць. Пасля з'явіліся з Гародні, Трок, Вільні. Ён усіх літасціва прыняў. Нашто ім было патрэбна галаву торкаць у хамут? Яны не мелі права голасу ў сейме і палічылі, што такі моцны чалавек будзе іх там добра абараняць падчас соймавых спрэчак. Словам, 17 жніўня 1780 года кароль Станіслаў-Аўгуст зацвердзіў шляхціца Якуба Знамяроўскага каралём над усімі цыганамі яго зямлі і даў яму адпаведны прывілей. Загадана мець цыганскую сталіцу ў Эйшышках, але Знамяроўскі не любіць там жыць. Да таго ж, загадай яму мець сталіцу ў раі, ён пабудуе яе ў пекле, бо не хоча падначальвацца нікому, нават каралю. І вось дзевяць год ён трымае пад моцнай уладай усіх цыганоў. Ён стаў багаты: кожны дзесяты конь, кацёл, талер, усё, што належыць цыганам, усё яго. Ён адбірае і больш, калі захоча. За гэта ён абараняе правы сваіх васалаў у сейме, чыніць там знешнюю палітыку сваёй вялікай дзяржавы.

– Якую? Што ён, войны вядзе, ці што? – здзівіўся Яноўскі.

– А чаму не. Збіраецца ж ён памагчы вам. Чым гэта не вайна? Мы цяпер, літасцю нашай шляхты і добранькага пана бога, зрабіліся такім народам, што ў нас цыганскае каралеўства – вялікая дзяржава, а бойка на палявой мяжы – знешняя палітыка...

– Не абражайце беларускай шляхты, – сказаў Яноўскі. – Яна - соль зямлі.

– Любы мой юнача, – мякка сказаў медыкус. – Я сам быў калісьці шляхціцам і дзякую богу, што я цяпер стаў проста чалавекам. Я добра бачу, што вы сніце пра згубленую веліч, якой у шляхты нашай ніколі не было. Быў вялікі наш народ. Ён быў такім пад Крутагор'ем, Піленамі, Грунвальдам, падчас вялікай мужыцкай вайны семнаццатага стагоддзя. І што шляхта зрабіла для яго? Мы спудзіліся

яго сілы, калі ён разбіў татар. У той час мы прадалі нашы вольныя княствы Літве: яна, маўляў, падтрымае нас супраць нашых сярмяжных братоў. Добра, мы асімілявалі Літву, мы пачалі набіраць сілы дзякуючы народу. І тады мы пайшлі на другую здраду: прадалі свой край палякам, адракліся ад веры, мовы, самастойнасці, шчасця, першародства дзеля чачавічнай поліўкі, дзеля ўлады, дзеля ганебных грошай. Злоснаму ворагу прадалі. Soaequdtio iurium – ураўнаванне правоў Літвы і Беларусі з каронаю – гэта было ўраўнаванне ўсіх перад тварам галоднай смерці.

Яноўскі спалохаўся – такі злосны твар стаў у медыкуса. Вочы наліліся крывёй, вусны крывіліся. З невымоўна з'едлівым, гідлівым выразам на твары ён сказаў:

– A pisarz ziemskiego sądy po polsku, a nie po rusku pisać powinien lędzie. Мова наша мілая, паўнагучная, плаўная, дарагая. Як поплаў блакітны! Куды мы яе кінулі, пад чые ногі мы яе затаўклі?

Яноўскі не знайшоў што сказаць.

А медыкус раптам як абмякнуў. Стомлена апусціў плечы:

– Я нічога не маю супруць палякаў. Нягоднікаў там не больш і не менш, як у іншых народаў. Але я нідзе не ведаю горшых паноў, чым там. З такой пагардай да мужыка, з такой насякомай зласлівасцю, з такім адчуваннем сваёй вышэйшасці. Яны і нас заразілі гэтым. І, галоўнае, ніхто не бачыць, што дзяржава коціцца да прорвы. Гандлююць ёй напрапалую, п'юць, гуляюць, як перад гібеллю, раздзіраюць, катуюць народ. І загінуць хутка. Ужо смярдзяць нават. Што ж, нам не будзе лепей ні пад цяжкім нямецкім задам, ні пад уладай дзяржаўнай шлюхі. Там дазволілі ссылаць сялян на катаргу і забаранілі ім скардзіцца на памешчыкаў. Там адсеклі галаву адзінаму сапраўднаму чалавеку нашага стагоддзя – Пугачову. Яму трэба было пасылаць людзей да нас і прасіць дапамогі. І я першы ўзяў бы вілы.

– Слухайце, – перабіў яго Яноўскі, – калі вы будзеце так абражаць шляхту, я вас шабляю ўдару. Я паскарджуся каралю.

– А чаго ад вас і чакаць, – спакойна і вельмі ціха сказаў стары, гледзячы на юнака дапытлівымі вачыма. – Ударыць старога, забыць рыцарства і сумленне, выдаць... Але я скажу вам, што гэта не атрымаецца. Бачыце?

І ён спакойна сагнуў кашчавай рукою срэбны талер, які дастаў з кішэні.

– Да таго ж, Знамяроўскі не памірае кожны месяц ад абжорства і гарэлкі толькі таму, што я мастак сваёй справы. Улічыце. Ён не аддаў мяне Радзівілу, а Яноўскаму не аддасць і пагатоў.

І раптам ласкава паклаў руку на Міхалава плячо:

– Хлопчык вы мой, мне, магчыма, нават радасна бачыць ваш запал і свежую кроў у жылах. Але вы, даруйце мне, вельмі яшчэ дурненькі. Вы сутыкнуліся з нашым правам сілы, вас выкінулі з уласнай хаты. Вось вы сутыкнецеся з уладай, з дэспатызмам паноў – і тады вы зразумееце мяне, калі сэрца ваша баліць за радзіму. Зразумейце, аснова ўсяму – мужык. А мы, як кажа Вальтэр, даём яму выбар: або тры тысячы палак, або тры кулі ў галаву.

– Хто гэта, Вальтэр? – змрочна спытаў Яноўскі.

– Адзін вельмі разумны француз. І няхай мне бог заб'е ў зад самы тоўсты малітоўнік з бібліятэкі Радзівіла, калі Вальтэраў пасеў не зарунее калісьці на зямлі. Можа, нават хутка. І тады нашы дурныя, як слуп, паны пойдуць на кажамякін шасток. Хрэнам ім сядзе ў горле сённяшняя гарэлка... Я вам дам пачытаць ягонага “Кандыда”. Сам пераклаў.

І тут раптам заўсміхаліся. Лядок растаў. Яноўскі вырашыў нічога больш не казаць медыкусу. Непрыемна, вядома, што ён так лае ўсё дарагое яму, Яноўскаму, але рота яму не замажаш. Прынамсі, лае цікава...

Увечары іх паклікалі на гулянку ў “палац” Знамяроўскага. Адмовіцца было нельга, хоць Міхал вельмі стаміўся: па іх прыйшоў узброены гайдук, апрануты на польскі манер, у чыкчыры з вялікімі вызалачанымі гаплікамі і ў жоўтых паўбоціках. Доўгія валасы гайдука былі сабраны ў касу, а дзве невялічкія коскі звісалі на скронях, як яўрэйскія пэйсы.

– Бачыце, – іранічна сказаў медыкус, – вопратка нязручная, шыць яе цяжка. Таму выбіраюць ёлупа з добрай фігурай. І вось здаровы мужык, якому зямлю араць трэба, ходзіць скрозь, як індык, смярдзючка такая.

– Загадана адвесці паноў, – сказала “смярдзючка” густым басам.

– Ну, пакажы ж ты мне свой шчыры беларускі нос, – ласкава сказаў медыкус. – Бачыце, Яноўскі, якая кірпа: за тры сажні курнай хатай тхне, а спытайце яго, што ён павінен рабіць.

Гайдук радасна выцягнуўся і затарабаніў:

– За ксяндзом Геронімам Капуцынам сачыць, каб мёд, што пану варыў, не атруціў; хлопаў брудных карбачамі сцябаць за падступныя, значыцца, намеры; трымаць шаблю панскую. А таксама жыдоў, калі арэнды не заплацяць, біць і бахуроў іхніх браць на панакараля, прымушаючы ў веру хрысціянскую пераходзіць.

– А дзеці твае дзе?

– Па літасці панскай у школцы вучацца.

– На каго?

– На па-ны!!! – гаркнуў гайдук, вырачыўшы вочы.

– А да маткі ў вёску ходзіш?

Гайдук засаромеўся:

– А чорт яе ведае, і дзе яна там жыве.

Медыкуса перасмыкнула:

– Г... ты, братка.

II

"Палац" ззяў агнямі і плошкамі. У зале было амаль пуста, стаялі толькі сталы, якія аж ламаліся ад страў, і простыя лавы. Больш тонкай мэблі тут не было ніколі. За сталамі сядзела ўжо дзесяткі два гасцей, а на канцы стала, бліжэй пад дзверы, загонавая шляхта. Сам Знамяроўскі сядзеў на ўзвышшы на крэсле з высокаю спінкай. Выглядаў па-ранейшаму, толькі нацягнуў на тоўстыя ногі аксамітныя порткі.

– Спазніліся, – раўнуў кароль. – Час пачынаць.

Два гайдукі ўцягнулі з суседніх дзвярэй "мітрапаліта" з сенам у валасах і коса насунулі яму на галаву штосьці падобнае на мітру. Мітрапаліт завесіў галаву і ціха мыкаў, парываючыся нешта сказаць. Паюк, што стаяў за крэслам караля, паклаў перад святым айцом на пюпітр тоўстую біблію.

– Пачынай набажэнства, – сказаў кароль.

Адказам было мычанне.

– Вы што, не маглі працверазіць чалавека?

– Цэбар вады вылілі, не дапамагло, – спуджана замармытаў гайдук.

– Раскрыйце кнігу і торкніце пальцам дзе-небудзь. Ён прывычны, не першы раз так, – параіў медыкус.

І сапраўды дапамагло. Мітрапаліт механічна пачаў чытаць, водзячы асавельымі вачыма за тоўстым, як капыт, пазногцем гайдука.

– Другазаконне, раздзел дваццаць пяты. "Калі б'юцца між сабой мужчыны і жонка аднаго падыдзе, каб адбіць мужа свайго з рук тых, хто б'е яго, і, працягнуўшы руку сваю, схопіць яго за сорамны вуд, то адсякі руку яе..."

– Не тое, здаецца, – закруціў галавою кароль.

Старонку перагарнулі. Шляхта, якая ўстала, і нацягнуўшы шапкі і выцягнуўшы з похваў шаблі на доказ таго, што яна гатова абараняць веру аж да самага скону, таксама пачала круціць галовамі. Мітрапаліт зноў пачаў мармытаць:

– “Каханы мой прасунуў руку сваю праз шчыліну, і нутро маё хвалявалася ад яго”.

– М-м-м, – замыкаў Знамяроўскі, – гартайце далей, д’яблы.

– “Бо адкрыецца сын мой Ісус з тымі, хто з ім, і тыя, хто застанецца, будуць цешыцца чатырыста год. А пасля гэтага памрэ сын мой Хрыстос і ўсе людзі, што маюць дыханне”.

Мітрапаліт часта залыпаў вачыма, нешта ўзважваючы п’янай галавой. Пасля пачаў дробна жагнацца.

– Дык... дык гэта мы 1400 год таму ўсе памерлі... Божа мой!.. Бо-ожа мой!.. А бо-го-го-го-жа мой!.. І яшчэ мала нам за грахі нашы... Гэта атрымліваецца, браткі мае, пекла... І агні... А ты – на ўзвышшы – Люцыпар.

Знамяроўскі пачаў пацепвацца. Гаркнуў, наліваючыся крывёй:

– А ідзі ты ведаеш куды з тваёй бібліяй?

І кінуў:

– Канчай рытуал. Халера на вас, папоўскія храпы.

Госці шумна пачалі рассаджвацца. Мітрапаліт таксама сеў, і яму ў нерухомыя рукі ўсунулі кубак.

– Слухайце, гэта ж кашчунства, – прашаптаў медыкусу Яноўскі.

– Нічога, сынок, вучыся, – таксама шэптам адказаў медыкус. – Яны не паважаюць нават апоры сваёй. А зараз пабачыш, як яны паважаюць сябе.

Пачалі піць і закусваць. Падавалі піва чорнае і белае, настойку “тройчы дзевяць”, кюмель і мёд. Госці, што сядзелі ля Знамяроўскага, елі мядзведжыя шынкі, хрыбтавіну асятровую, смажанага лебедзя і іншыя далікатэсы. Загонавая шляхта – боршч з сасіскамі, разварную ялавічыну, палаткі, гарох са свінінай; сотнямі знішчалі гарачыя, як агонь, наперчаныя біткі. Нягледзячы на тлустую ежу, усе хутка ап’янелі, бо пілі так, як нават Яноўскаму не даводзілася бачыць. Ён звык да штодзённай нормы ўжывання віна шляхецкай вялікай сям’ёй – дванаццаць бутэлек. Першыя чатыры амаль паўсюль выпівалі за першым абедам, у дванаццаць гадзін дня. Другія чатыры – за другім, у чатыры гадзіны. За вячэраю, якая бывала, звычайна, у 10–11 гадзін вечара, канчалі норму і больш не пілі. Дванаццаць апосталаў – дванаццаць бутэлек. А тут на стол усё цягнулі і цягнулі бутэлькі “мядзведзікі”, “удовы”, маленькія бочачкі. Бутэлькі былі розныя: пузатыя, доўгія, пляскатыя з “таліяй” (каб зручна было трымаць у п’янай руцэ). “Мядзведзікі” былі ў выглядзе мядзведзяў, бараноў, ільвоў – гарэлка біла ў іх з ратоў. Але цікавей за ўсё былі “ўдовы”, бутэлькі ў выглядзе абаранка. Удовамі іх звалі таму, што такія

бутэлькі і сапраўды часцей за ўсё ўжываліся ўдовамі. Прычапурыцца жанчына, нальe ў такую бутэльку гарэлкі, насуне на носік абаранак, надзене бутэльку на руку, бліжэй да локця, і ідзе да аўдавелага кума развеяць тугу.

Напіліся да таго, што нейкі шляхцюк пачаў рагатаць, гледзячы на ўласны палец, а другі засяроджана браў з талеркі пірагі, выграбаў з іх пальцам начынку, а астатняе кідаў пад стол, дзе круціліся дацкія сабакі –п’яўкі.

Але стрыжнем вячэры была вялікая чаша, у якую ўваходзіла пяць бутэлек віна і яшчэ тры ў накрыўку. Сапраўдны пітун павінен быў піць не глытаючы, каб віно проста пераліваласся ў горла. Таму з накрыўкі дазволена было піць толькі адным глытком, а самы келіх – у два прыёмы. І нікога не мінала горкая чаша сія.

Пасля яе зала нагадвала поле пабоішча, і гайдукі пачалі ўжо сцягваць некаторых гасцей, што абражалі апетыт параўнальна цвярозых, у “мярцвецкую”. Дзіва, але мітрапаліт стаў амаль цвярозы, і толькі збытак вінных пароў выходзіў праз яго голую галаву, якая курылася, як вулкан.

Знамяроўскі сядзеў арлом. Азызлыя шчокі падабраліся, у карых вачах з’явіўся агеньчык, нос, падобны на піпку, міла чырванеў.

Усё было добра. Дзяржава яго была вялікая, сам ён быў цар цароў, эканоміка была ў парадку, пілі і елі дасхочу. Нават эмігранты з іншых краін (у асобе Яноўскага) прыпадалі да яго ступакоў. Велічны жывот караля ляжаў на каленях, доўгія рукі былі падкладзены пад зад, на твары блукала шырокая ўсмешка, і нават вочы замасліліся ад асалоды. І самыя думкі былі прыемнымі.

Ён мацнейшы за ўсіх, цыганы дрыжаць пад яго позіркам, улада над акругай поўная. Што можа зрабіць яму кароль? Праўда, царыца дабіраецца да яго зямлі, дзеліць Польшчу, але чорт яе бяры. Яму, Знамяроўскаму, і пры царыцы будзе не горш. А калі надта ўжо не спадабаюцца новыя парадачкі – можна разам з падданымі адкачаваць туды, дзе яшчэ будуць залатыя шляхецкія вольнасці. Ды не, не папусціць бог. Гэта ж такая сіла, шляхта! Хоць бы і ён нават?! А добры мой народ заўсёды дапаможа. Ён сваё панства любіць, шануе, ледзь не вышэй за пана бога ставіць. За дзевяць год улады ніхто сур’ёзна нават і не думаў абурацца. А надумаецца – скручу.

– Келіх сюды, свінтухайлы!

А медыкус, седзячы ля Яноўскага, раптам спытаў:

– Ведаеце, чаму тут так п’юць... не на жыццё, а на смерць?

– Людзі тут такія, – разгубіўся Яноўскі, – тут ужо нічога не зробіш.

Медыкус непрыемна скасавурыўся:

– Глупства! Мы любім піць не больш і не менш, як усе іншыя людзі на зямлі. Але мы – гной пад нагамі чужынцаў. Нават у жыцці сваім ніхто ў гэтым праклятым каралеўстве не ўпэўнены. А гарэлка – гэта сябры, гэта – пяць – дваццаць – тысяча шабляў такіх сабутэльнікаў, узнятых на тваю абарону, калі нападзе мацнейшы сусед. Няма цвёрдай улады – пануе моцны, мы пʼём. Простая механіка? П'янствуюць людзі – значыцца каралеўства гіне. Верная прыкмета. П'юць, каб забыць, каб заліць гора і знішчыць няўпэўненасць. Але галоўным чынам, каб прыдбаць сяброў.

І ён спапяляючым позіркам паглядзеў на шляхцюка, які "скакаў", адрываючы на які-небудзь дзюйм ногі ад падлогі, круціў галавою і вывяргаў брыдкую лаянку.

– Дурныя людзі. Усё не па-людску. З самага пачатку толькі і робяць, што гандлююць радзімай. Магутная цыганская дзяржава... П'юць, як свінні. Дзеці нараджаюцца ідыётамі: яны яшчэ ў чэраве маці атручаныя гарэлкай. Ёлупы і юродзівыя! І за ўсё гэта заплацяць нашчадкі. Ім яшчэ рыгнецца за кожную нашу чарку, за кожную ноч распуты. Яны будуць кашчавыя, слабыя на цела і мозг.

Яноўскі хацеў адказаць яму, але пабачыў, што кароль заве яго пальцам. Ён падышоў да яго. Знамяроўскі глядзеў на яго вар'яцкімі вясёлымі вачыма.

– Што , пасол, нудзьгуеш?

– Наадварот, мне весела, вялікі кароль.

– А мне нудна. Насмяшы ты мяне, пляменнічак. Насмяшыш – шкадаваць не будзеш, шчыра кажу. Загаўкай, ці што...

Яноўскі маўчаў. У гэтую хвіліну ён лепей даў бы сябе разрэзаць на кавалкі, абы не смяшыць гэтага тлустага кабана. Ён упарта сціснуў зубы.

Знамяроўскі пазяхнуў.

– Нудна мне з вамі. Адракуся я хутка ад трона і пайду... у манастыр. Буду там сабе бога маліць, бо з дурнямі жыць не хачу. Вас, дурняў, і да Масквы не перавешаеш... Жыць буду ціха, пад званы. Дам ігумену куку ў руку, каб пахаваў мяне ў царкве. Бога, дурня барадатага, модламі падману. Сядзіш вось тут у мяне, гарэлку маю жарэш...

Яноўскі не вытрымаў. З ім яшчэ ніхто так не размаўляў:

– Маўчыце, пан кароль. Як бы не давялося вам казе пад хвост глядзець... Задзярэш зараз пяты, чорт гладкі!

Знамяроўскі зацікавіўся гэтай перспектывай:

– Ану... ану, давай. Паспрабуем. Бач ты, нахаба якая! Прыйшлі ў маю хатку ды б'юць майго татку... Ах ты, падла. Давай... паспрабуем, хто пяты задзярэ.

І крыкнуў гайдукам ля дзвярэй:

– Ану, паршыўцы, цягніце сюды палкі. Рыцарскі турнір!

Праз якую хвіліну абодвум далі тонкія доўгія палкі, і Знамяроўскі з нечаканым спрытам падвёўся і стаў у пазіцыю. Абодва стаялі адзін супраць другога, як баявыя пеўні, і нават чупрынка на галаве караля вельмі нагадвала грабеньчык.

Кароль зрабіў выпад – Яноўскі адбіў ягоную палку. Некалькі хвілін яны скакалі адзін вакол другога, саплі. Толькі і было чуваць:

– Я табе, булавешка дурная, ногі ў спіну пазаганяю.

– Я табе, дзядзечка, дам на пазвон.

– Мазгавешку расквашу, галадранец.

– Бач ты, кароль... (Трах-тах!) А ў самога бажок на нітачцы! (Бах!)

– Свіння не нашага бога! (Грук-грук!)

– У мазгаўні вычаўрыла.

У наступны момант ляпнула, як палкай па гарлачу. Вакол зарагаталі, загігікалі. Яноўскі, адчуваючы, як на галаве наліваецца вялізны гуз, утрапёна замахаў палкай, шмякнуў па нечым.

Кароль мякка схіліўся і заараў носам падлогу.

На адзін момант прыўзняў галаву, памацаў далонню размяжулены нос і сказаў ціха:

– Наша ўзяла... і рыла ў крыві.

І лёг на спіну, паказаўшы небу круглы пукаты жывот.

Да яго кінуліся, пачалі завіхацца, але толькі праз некалькі хвілін ён прыўзняўся, сеў за стол і, гледзячы на племенніка, сказаў:

– Заўтра надвячоркам ідзём у наезд.

Праз гадзіну кароль абдымаў пляменніка, ціскаў яго, лез мокрымі вусамі да яго вуснаў:

– Братка ты мой! Хоць ты і тамцюр цара нябеснага, а я цябе люблю, дальбог, люблю... Даю сваё каралеўскае слова – адабём твой маёнтак... Чуеце, чэрці, кароль слова дае!.. Заўтра ж паедзем. Вось толькі судны дзень учыню.

Яноўскі і медыкус пайшлі з залы, не дачакаўшыся канца гулянкі.

Цёмнае-цёмнае неба ляжала над палацам. З адчыненых вокан далятаў да іх шум неўтаймаванай папойкі.

III

Наступнага дня, ранічкай, ля каралеўскага дома, пад шыбеніцай, сабралася вялікае цыганскае судзілішча. Паставілі высокае крэсла, ля яго сталі два шляхцюкі і два цыганы ў кажухах з доўгімі пугамі на плячы. Сабраўся натоўп, пераважна з егіпецкага племя.

Кісла смярдзела конскім потам, кажухамі, іржавым жалезам. Цыганкі курылі люлькі, часам даючы пасмактаць цыбук мурзатым дзецям. Пасля ўсе прыціхлі. Набліжалася ўрачыстая хвіліна.

Пад спеў труб і грукат старога барабана паважна выйшаў з двярэй кароль Якуб. Сеў, сціскаючы ў правай руцэ нейкі пацямнелы, апраўлены ў золата прадмет.

– Што гэта? – зацікаўлена спытаў Яноўскі ў медыкуса.

Левы кут медыкусавага рота паехаў угару:

– Рэліквія. Дзяржанне той самай пугі, якой ён у дастаслаўны вечар, якім пачалося яго цараванне, лупцаваў канакрадаў. Чым не меч святога Стэфана?

Паюк агласіў высокім хрыпатым голасам:

– Слава. Сіла. Моц. Мы, кароль Якуб Першы... (зноў пацягнуліся тытулы, якія Яноўскі ўжо чуў), добрай воляй нашай пастанавілі імем цыганскай дзяржавы, дабрабыту і славы яе, склікаць сёння вялікае судзілішча, пасля якога, ачысціўшы добры наш народ ад зланамерных людзей, вялікі сейм дзяржавы цыганскай учыніць!

Заспявала труба. На тварах некаторых цыганоў Яноўскі заўважыў іранічныя ўхмылкі. Але ўсе маўчалі.

Першая справа была нецікавай. Нейкі цыган падбіў другога на крадзеж, загадзя ведаючы, што нічога добрага з гэтага не атрымаецца: коней вартуюць добра. Сам падбухторшчык шчасліва ўцёк, а яго няшчаснага саўдзельніка спаймалі і, усклаўшы яму на шыю вуздэчкі, білі, водзячы па вёсцы. Добра хоць, што не забілі да смерці.

Прысуд быў кароткі. Падбухторшчыку заплаціць штраф, трэцяя частка якога пойдзе пацярпеўшаму, і атрымаць дваццаць лоз, каб не быў напярод зламысным. Саўдзельніку – пяць лоз, каб не быў дурнем. Калі стан здароўя не дазваляе яму перанесці экзекуцыю, ён павінен выплаціць палову сваёй часткі ў каралеўскую казну.

– Колькі гэта будзе? – спытаў няшчасны, у якога была абвязана галава.

– Два бітыя талеры.

Саўдзельнік, крэкчучы, пачаў спускаць нагавіцы. Атрымаўшы тое, што належала, ён, абапіраючыся на плечы дзяцей, адышоў убок і лёг жыватом на траву. Яноўскі не заўважыў на твары караля Якуба

пакут сумлення. Знамяроўскі глядзеў пыхліва і паблажліва на стракаты зброд, які віраваў ля яго трона.

Разабралі яшчэ некалькі спраў, і прысуд быў амаль той самы: лозы і штраф у каралеўскую казну. Фінансавыя справы караля відавочна паляпшаліся, і відавочна падаў настрой натоўпу.

Сям-там плакалі, скуголіла нейкая жанчына. Яноўскі заўважыў у вачах некаторых цыганоў і многіх мужыкоў падазроныя агеньчыкі. Але суд ішоў сваёй чаргой.

Новая справа прыцягнула яго ўвагу. З радоў выштурхнулі маладаю дзяўчыну год семнаццаці і засмаглага, вельмі чыста, надзіва чыста апранутага цыгана, які быў, можа, гады на два старэйшы за яе. Рукі яго былі чорныя, скручаныя працай.

– Гэта яшчэ што? – з пагрозай спытаў Знамяроўскі. – Я вам што казаў? Колькі гэта можа цягнуцца? Я забараніў вам жанніца год таму назад.

– Зваляліся, – каротка кінуў “каронны суддзя”, загонавы шляхцюк Знамяроўскага.

Мітрапаліт узвёў вочы да яснага неба.

– Божа, – велягурыста загадаў ён, - даруй ім, гэтым неразумным агнцам тваім, усе іхнія грахі. Не бо, што робяць. У цемры, у граху душы іхнія... цёмныя вашы душы эфіопскія, каб вы здохлі, паскуднікі!

– Я вам што казаў? – страшна спакойна спытаў Якуб.

– Чаму? – выгукнуў цыган. – Чаму нам няможна? Я хрысціянін, поп ахрысціў мяне. Я сышоў з дарогі майго народа, я не хачу гандляваць коньмі. Я меднік, добры меднік. Я хачу чыніць замкі, а не ламаць іх. Вось яны, мае рукі.

Ён гаварыў горача, скажаючы ад хвалявання словы, патрасаючы чорнымі рукамі ў паветры:

– Я хачу асесці ў хаце Яна, яе татулі. Я буду многа працаваць за яе. Я буду аддаваць пану ўвесь заробак. Чаму?

Натоўп глуха зароў. Абражанымі здаваліся не толькі цыганы. Але тут Яноўскі ўбачыў, што Знамяроўскі ўстаў. Кароль быў амаль велічны ў гэту хвіліну. Трапяталі ноздры, вочы кідалі бліскавіцы.

– Маўчаць. Вы…

І адразу стала цішыня.

– Я забараніў. Хто ведае, можа, я і дазволіў бы. Але яны абышліся без дазволу. А хто наважыцца ламаць мой наказ? Ты? Ты? Ты?

Палец яго торкаў у асобных людзей, і тыя хаваліся ў натоўп.

– Ніхто. Я забараніў. Я!.. І гэтага досыць. Паюк!

Рука яго зрабіла жэст у паветры. У той самы час паюк прывычным рухам рукі раздзёр на дзяўчыне летнік і рубок і адкінуў іх на траву. Яноўскі чакаў, што натоўп выбухне крыкамі абурэння, але натоўп маўчаў. Бацьку дзяўчыны яшчэ раніцою заперлі ў пуню.

Яноўскі, здзіўлены маўчаннем, перавёў вочы на людзей і заўважыў дзіўнае: усе, нават хлопец-меднік, якому ў гэтым, здавалася б, не было патрэбы, стаялі, шчыльна заплюшчыўшы вочы, быццам баяліся абразіць галізну. Глядзелі толькі людзі з акружэння Знамяроўскага.

Дзяўчына, не разумеючы яшчэ, што здарылася, глядзела вакол вялізнымі сінімі вачыма. Пасля глуха, з такім болем, што ў Яноўскага абарвалася сэрца, войкнула і закрыла далонямі чырвоны твар. Худыя локцікі дарэмна намагаліся прыкрыць яшчэ слабыя неразвітыя грудзі.

Не маючы змогі апусціць вочы, Міхал глядзеў на тонкую, не аформленую яшчэ постаць, на мяккую акругласць жывата, на плаўную лінію, што падзяляла сціснутыя ногі. Ён хацеў крыкнуць, хацеў спыніць гэту агіднасць, але не мог.

–...і таму, за непаслушэнства загадам каралеўскім і парушэнне законаў чалавечых пра цнатлівасць дзявочую, прысудзіць Алёну Свеціловіч да пакарання лазой.

Дзяўчыну павялі. І тут Міхал сілай сваёй ранняй вопытнасці заўважыў дзіўны выгіб паясніцы і нейкія звязаныя, ненатуральныя рухі клубоў. Голас, якім ён крыкнуў наступнае, быў хрыпаты і рэзкі:

– Пакіньце гэта!.. Вы што ж, не бачыце, што яна цяжарная?!

Знамяроўскі, які ўжо паспеў астынуць, паглядзеў на яго заплыўшымі вачыма і нерашуча сказаў:

– Ну што ж, можна і так. Прынясіце лесвіцу. Мы адлічым лозы, прывязаўшы гэтую распусніцу да прыступак жыватом... каб не скінула.

– Позна, я вам кажу. Яна на трэцім месяцы.

Знамяроўскі, здаецца, нават узрадваўся гэтаму:

– Добра. Я адмяняю загад.

Мітрапаліт пасунуўся да яго і зашаптаў нешта на вуха. Кароль залыпаў вачыма:

– І сапраўды... а як жа слова караля? Не, так не пойдзе...

Ён павагаўся:

– А вось што... Калі лозы ёй пашкодзяць, дык не пашкодзяць шляхецкія абоймы. Хто хоча ўзяць гэту распутніцу ў наложніцы?

– Ёй спачатку трэба паразмаўляць з духоўнай асобай аб сваіх грахах, – сказаў мітрапаліт.

– Гм, – хмыкнуў кароль. – Ну што ж...

Але ў гэты момант медыкус раптам выпаліў:

– Я… я бяру яе. І хай паспрабуе нехта крануць яе пальцам.

І ён рэзкім рухам накінуў на плечы жанчыне сваю мантыю.

Адказам на гэты жэст быў рогат. Забыўшыся на аўтарытэт, кароль захлынуўся смехам, трымаючыся за бакі. Ён пасінеў, у горле яго нешта сіпела і клахтала.

Празрысты нос медыкуса стаў малінавым: гэта быў яго манер чырванець. Ён узяў за плячо знясіленую сорамам, аслупянелую жанчыну і павёў яе.

Здавалася, што на гэтым справа скончыцца, тым больш дзіўным было з'яўленне перад каралём тоўстага цыгана ў кажусе.

– Кепска робіш ты. Чым перашкодзіў табе мой сын?

Кароль глядзеў на яго з лютым гумарком у вачах.

– Ён хоча жаніцца. Кепска скончыцца ўсё, калі роме будуць так крыўдзіць.

У адказ на гэта ў паветры пралунаў гучны пляск.

– Дурань ты, бацька, – прагаварыў цыган, трымаючыся за шчаку.

Але Якуб не звяртаў ужо на яго ўвагі. Ён стаяў над прыціхлым натоўпам, узнімаючы ў паветра свой залаты скіпетр.

– Улюбёныя цыганы! Добры мой народ! Скончыўся суд, і мы, ачышчаныя ад брыдоты, моцныя як ніколі, можам сабраць наш вольны сейм.

Міхалу абрыдла слухаць гэтыя словы. З цяжкім сэрцам выбраўся ён з гамарні і сутыкнуўся з медыкусам, які вяртаўся на сваё месца.

– Навошта вы зрабілі гэта? – з дакорам спытаў Яноўскі. – Разбілі, сапсавалі жыццё людзям.

– Ого, – здзіўлена працягнуў стары цынік, – не пазнаю доблеснай шляхецкай крыві.

І, перш чым юнак паспеў ускіпець, працягнуў:

– Каб я быў бугаём, мяне, на жаль, даўно перадалі б на мяса. Каб нехта сказаў мне: "Пане, зганьбіце гэтую дзяўчыну, а інакш мы вас павесім", – я адказаў бы яму: "Бярыце мяне, менш буду пакутаваць. Адным ганебным успамінам будзе ў мяне менш на зямлі".

І дадаў:

– Гэта, вядома жарты. Людзі не варты спагады, але… я сёння проста не мог. Гэтыя слабыя плечыкі, гэты рух, якім яна закрывала твар, менавіта твар. Што зробіш, я непаслядоўны чалавек. Якуб, уласна кажучы, вельмі добры для шляхціца, мы ўломім яго пасля. Прыйдзе і на яго часіна з добрым гуморам. І няхай дзяўчына чакае гэтай хвіліны ў маёй хаце, а не ў хаце гэтага юрлівага папа.

Роў натоўпу перарваў яго словы. Абодва паспяшаліся праціснуцца да трона. Адбылася нейкая змена. Людзей, якія толькі што стаялі ў пахмурным, пагрозлівым маўчанні, нельга было пазнаць. Палаючыя нянавісцю вочы, ашчэраныя зубы.

І сярод іх стаяў, узвышаючыся над галовамі, Знамяроўскі і крычаў, патрасаючы рукамі:

– Вы бачыце яго (рух у бок Яноўскага), вы бачыце гэтага гожага чалавека, уладара братняй, але маленькай і слабай дзяржавы? Вы бачыце яго сумленныя вочы? Чым ён вінен, што хоча жыць самастойна і шчасліва? Але яму не даюць так жыць. – Голас караля дрыжаў: – Злосны і падступны сусед, адроддзе пекла... як бо яго завуць, гэтае адроддзе пекла, а, Міхал? Вось-вось... Ваўчанецкі яго завуць... падступна напаў на яго, парушыў ягоныя межы. Яго маленькі, даверлівы, добры народ пакутуе пад пятой чужынца, які ломіць яго веру, звычаі, волю. Няўжо вялікая дзяржава цыганская, абаронца справядлівасці і законнай улады, спусціць гэтаму аспіду і васіліску? Не, не будзе гэтага.

Ён прыкрыў рукой вочы і хіснуўся (у паветры моцна запахла гарэлкаю і вайной). Баба, што стаяла непадалёку, раптам загаласіла:

– А-а, божа мой, а што гэта ж з ім, галубчыкам нашым, робіцца? А як жа ж ён жаласна гаворыць!

– Да таго ж, – працягваў кароль, – мы, магчыма, і змаўчалі б, каб гэты Ваўчанецкі не рыхтаваў замаху на нашу волю і незалежнасць. Гэты аспід і васіліск пырскае чорнай жоўцю. Ён сабраў зброю, паставіў пад ружжо сваіх гайдукоў. Ён збіраецца вераломна напасці на нас. Няўжо мы будзем цярпець гэта, мужны народ цыганскі і русінскі? Яны захопяць нашу зямлю, згвалцяць нашых жонак, забяруць нашых коней, цудоўных коней. І не застанецца нават следу цыганскага на зямлі, бо вы будзеце рабамі.

У натоўпе там-сям галасілі бабы. Апакаліптычны жах лунаў над галовамі людзей. Жах і свяшчэнная нянавісць. Чуліся выкрыкі:

– Смерць ім! Бач ты, коней!!! Ражна з'ядуць!

І грымеў голас Знамяроўскага:

– Не, мы самі нападзём на іх. Мы ступім ім на шыю. Мы забяром іхніх коней, мы згвалцім іхніх жонак, мы спалім іхнія хаты. І заззяе ў славе каралеўства цыганскае на векі вякоў. У славе і свабодзе! Нас пакрыўдзілі! З намі бог!

Натоўп роў, стагнаў, задыхаўся. Трэслі кулакамі ў паветры, махалі дубцамі.

– Коні! Коні! Коні!

– Я пайду! І я... І я...

Нехта разважліва бубніў:

– Я не люблю біцца. Але калі яны на нас так, дык мы ім усыплем.

– Бі іх! Смерць драпежнікам!

– Выступаем сёння ўночы! – крычаў Знамяроўскі.

– У-ра! Коні! Коні! Бацька ты наш, літасцівец, уладар!

– Вядзі нас! Вядзі!

Узрушаны натоўп паваліў з плошчы.

IV

Па пыльнай дарозе яны пад'ехалі да пушчы. Ад узлесся да Яноўшчыны заставалася не больш трох гадзін язды. Першая зорка пераліваласяў вышыні кропляю крынічнай вады. Стаялі і марылі паабапал дарогі замглёныя раннім туманам стагі.

Ехалі конна, людна і збройна цэлыя суткі, зрабіўшы два невялікія прывалы. Наперадзе ехала дзесяткаў пяць конных цыганоў у кажухах з рацішчамі, пугамі і фузіямі. Пасля цягнуўся воз з каралеўскай кухняй, шатны воз, воз з трыма хартамі і паляўнічымі сокаламі. Пасля – воз караля, вышынёю ў два сажні, упрыгожаны кілімамі.

За ім – трыццаць вазоў са шляхецкай пяхотай. Гэта былі бясконныя загонавыя шляхцюкі, узброеныя шаблямі і пулгакамі, у чыкчырах і чугах, расшытых пазументамі, але сям-там зацыраваных і нават проста дзіравых. Шляхцюкі ўзмоцнена паядалі вайсковы запас.

Замыкалі шэсце семдзесят мужыкоў на калматых і пузатых коніках.

Усяго сабралася больш за трыста чалавек, якія гарэлі жаданнем адпомсціць за няшчасную, знявечаную краіну каралеўскага пляменніка. Сам Яноўскі ехаў начальнікам галаўнога атрада.

На каралеўскім возе, вышэй за ўсіх, як ідал, сядзеў кароль і глядзеў на дарогу ў падзорную трубу.

Раз-пораз ад яго воза скакаў да Яноўскага коннік:

– Выклікае вялікі кароль і гетман.

Яноўскі ехаў да Якуба.

– А што, каханку мой, ці не бачна дзе на дарозе ворага?

– Не бачна, вялікі кароль.

– Ну глядзі ж. А ці не пад'язджаем мы, маршал, да межаў варожай дзяржавы?

– Не.

– То-то ж бо. Ну, ідзі сабе да авангарда.

Яноўскі ехаў, добра ведаючы, што праз дваццаць хвілін яго паклічуць і зададуць тыя самыя пытанні.

Пасля другога прывалу коннікі чамусьці ўсё намагаліся, седзячы ў сёдлах, зрываць кветкі, што раслі паабапал дарогі. Шлях ззаду быў густа засеяны цыганскімі шапкамі і мужыцкімі магеркамі. Коней пачалі гнаць без літасці.

Ляскаталі колы, грукалі капыты, доўгі шлейф пылу і дыму ад люлек стаяў за атрадам. Сям-там шляхта пачынала скакаць у вазах. Некаторыя вывальваліся ў пыл, іх на хаду ўсцягвалі на салому. Рогат, крыкі. У такт стуку капытоў гучала шалёная песня:

Чым жа ж цябе частаваць,
Ты ж мой міленькі?
Чым жа цябе частаваць,
Голубе сівенькі?
Бізуном, мілая,
Бізуном, мілая,
Бізуном, ух-ха-ха,
Мая чарнабровая.

Трэцяя частка воінаў нерухома ляжала ў вазах. Здавалася, што гэта не на вайну едуць, а вяртаюцца пасля піравай перамогі.

Пушча пачала радзець, калі ноч агарнула зямлю цемрывам і вільготным пахам далёкіх балот. Загрукаталі колы па невялічкім мосце. У таямнічай начной вадзе адбіўся рознакаляровы агеньчык Капелы. Кумкалі палка і дружна жабы ў сітнягах.

Толькі за паўгадзіны да гэтага кароль даў загад маўчаць. Нейкі шляхцюк плакаў на возе.

– Бож-жа ж ты мой? А як жа ж гэта маўчаць? А дзе ж вольнасці нашыя? А хто ж гэта асмеліўся нам рот замазаць? Загінула наша краіна...

Яму ўлілі ў горла кубак віна, і ён змоўк.

Вялізныя начныя дрэвы дыхалі водарам сухога летняга дня, які заблудзіўся ў шатах: шкіпінарам, мятай, яшчэ чымсьці, нявінным, чыстым, бесклапотным.

Заміргаў за павароткаю дарогі жоўты мірны агеньчык. Пасля другі, трэці. У былым доме Яноўскага не спалі. Дом гэты, аднапавярховы, з мезанінам і галерэяй, з дворнымі будовамі, размешчанымі квадратам, быў абгароджаны высокім частаколам з завостраных бярвенняў.

Пад'ехалі да брамы. Яноўскі заляпаў цяжкім чыгунным кальцом. У адказ сабачы брэх і голас:

– Хто там?

– Госці да пана Ваўчанецкага.

У гэты час цыганы зрабілі нешта накшталт дзвюх жывых лесвіц у баку ад брамы. Па спінах залезлі наверх два здаровыя мужыкі.

Яноўскі зусім забыўся на тое, што ў браме ёсць ваўчок. Пыхнула губка, асвяціла ягоны твар.

– А-а, вось які госці! – прахрыпеў голас. – Стары гаспадар... Гэй, варта! Во-ох!.. Што гэта.

Пачуліся прыдушаныя гукі барацьбы. Форткі брамы расчыніліся, і шэры натоўп рынуў на вялізны двор. Пабеглі да дома. І раптам на галерэі нехта пачаў біць у звон. У хаце заварушыліся, забегалі. Пасля жахлівы залп у дзвярэй ірвануў паветра.

Усё закруцілася, як віруха. Аглушаны, збіты з панталыку, Яноўскі, думаючы, што ўсе ўжо забіты, глянуў на атакуючых і не пабачыў страт.

Пасля выявілася, што абаронцы, і ў тым ліку сам Ваўчанецкі, былі п’яныя, як сукіны каты. Іх заспелі проста за позняй вячэраю.

На ганку дома Міхал убачыў дзесяткі тры гайдукоў, якія палілі ў белы свет, і сярод іх самога Ваўчанецкага ў ружовых портках і з шабляю ў руцэ.

– На злом! На злом! – раўлі нападаючыя. – За радзіму! За каралеўства цыганскае! За караля!

Абаронцаў змялі і ўціснулі ў дзверы, дзя яны, устатковаўшыся на сходах, атрымалі нейкую раўнавагу з нападаючымі. Абодва бакі палілі з фузій так, што атынкоўка са столі ляцела вялізнымі кавалкамі, агаляючы драніцы. У абодвух станах ужо меліся кантужаныя і аглушаныя. Палюбоўніца Ваўчанецкага, падтрымліваючы гонар ваяўнічай беларускай матроны, выліла начнік проста на галаву шляхцюку, што ўзначальваў авангард.

– Бі іх! Душы! З намі бог!

– Святы Юры і Русь!

Сілы ўсё ж былі няроўныя. Праз дваццаць хвілін барацьбы ўсе пачулі дзікі звон шкла: атрад “кароннага суддзі” выбіваў шыбы разам з рамамі, пранікаючы ў тыл ворага. Сярод мужных абаронцаў узнікла паніка.

– Нам здрадзілі! – зароў нехта.

Адны абаранялі нарабаванае, другія змагаліся за высокія ідэалы дабра і таму, натхнёныя відовішчам панікі, як ільвы, рынулі на агідных і вераломных ворагаў. Праз хвіліну іх схапілі, скруцілі і, кінуўшы ляжаць на падлозе ў кутку залы, рассыпаліся па пакоях.

Звон шкла, падаючы посуд, трэск фіранак на вокнах. Частка доблесных пераможцаў занялася рэквізіцыяй трафеяў, другая – сыпанула шукаць вінны склеп. Запалалі паходні, загарэлася наводшыбе падпаленая кімсьці адрына, надаючы феерверку яшчэ большую ўрачыстасць.

Бочкі выцягнулі на лужок, выліўшы палову на сходах. Выбівалі днішчы, прыпадалі да чырвоных каскадаў прагна, як атручаныя. У бутэлек адбівалі рыльцы. Запалалі вогнішчы, з хлявоў даляцеў роспачны лямант авечак і неўразумелае, здзіўленае кудахтанне курэй.

Праз гадзіну на вогнішчах смажыліся вялізныя кавалкі ялавічыны, круціліся на ражнах цэлыя авечкі. Разліўное мора віна.

Дзікімі вачыма глядзеў на гэтае спусташэнне Яноўскі. Гэта была галеча. Уварваліся, як дзікія гуны, і знішчылі ўвесь дабрабыт.

А на ганку, асветлены зарывам, стаяў кароль Якуб і, абапіраючыся на шаблю, глядзеў на агонь, як Нерон на пажар вечнага горада.

Паплавец перад ім нагадваў поле бітвы: у карцінных позах ляжалі людзі, збіўшыся ў кучу; блукалі, хістаючыся, параненыя ў бітве з Бахусам.

Шляхта піла ў зале. Елі, пілі, зноў елі і зноў пілі. Ялавічына, бараніна, смажаныя гусі, кюмель, мёд, гарэлка – усё знікала ў бяздонных жыватах, і Яноўскі ледзь не плакаў. Яноўшчына была спустошана да канца. Нарэшце і ён сам пачаў есці і піць. Што ж зробіш?

Стогны з кутка спынілі на хвіліну піраванне. Гэта нагадвала скаргі грэшных душ у пекле, але гэта стагналі пераможаныя:

– Развяжыце, развяжыце нас. Есці хочацца, есці. Разарацца, дык весела.

Кароль Якуб, якога падтрымлівалі пад рукі, падышоў да павержаных.

– Ага, аману просіце. А маёнтак аддасі?

– Аддам, годны рыцар, аддам.

– Кажы – кароль

– Кароль, каханенькі, кароль.

– Дык вось, з маёнтка – прэч. Паспрабуеш зноў захапіць – галаву скручу. Аддасі пану Яноўскаму дваццаць кароў, трыццаць авечак, шэсцьдзесят гусей і іншае – па ліку з'едзенага і выпітага. Іначай – канец табе.

– Добра ўжо, аддам, аддам.

– А дараваць табе – справа гаспадара. Зараз дашлеш аднаго гайдука па бацькоў майго высакароднага пляменніка і другога – па кантрыбуцыю. Каб раніцою ўсё гэта было тут. А зараз – развязаць.

І кароль пацягнуў Ваўчанецкага віцаю ніжэй спіны на знак падначалення, а пасля пацалаваў у вусны.

– Ён вялікі, ён мудры! – зацягнулі старую песню прыдворныя Знамяроўскага. – Ён умее пакараць і ўмее літаваць.

П'янка цягнулася далей. Кароль і Ваўчанецкі брахалі пра старыя подзвігі, цалаваліся, ляпалі адзін аднаго па спіне.

Калі змрок знадворку стаў асабліва густым перад світаннем, двор і дом нагадвалі суцэльнае пабоішча. Героі ляжалі паўсюль, як трупы, смурод цягнуўся ад дагараючай адрыны.

Свіння, што нейкім дзівам не трапіла ў кацёл, хадзіла па двары і, задумленна рохкаючы, цалавала рыцараў у твары.

За сталом засталося не больш дзесяці чалавек. Кароль і Ваўчанецкі кудысьці зніклі. Медыкус дзяўбаў носам.

Яноўскі, якога амаль не трымалі ногі, даплёўся да дзвярэй і, чапляючыся рукамі за сценкі (моц божая: я ад плота, а яна да плота), пацягнуўся калідорам.

І тут ён натрапіў на нешта такое жахлівае, што хмель адразу выскачыў з галавы.

Упоперак калідора ляжалі два гайдукі і сам пан Ваўчанецкі, а на іх, з голаю шабляю, – Знамяроўскі. Ляжалі ў лужыне крыві.

– Здрада! – нема закрычаў Міхал. – Ваўчанецкі завабіў караля і здрадліва забіў яго. О подлыя!

Прыбеглі людзі. Аслупянелыя, сталі яны над трупамі, з-пад якіх негустая чырвоная лужына распаўзалася далей і далей.

– Гора нам! – залямантаваў нехта. – Забілі караля! Упаў ты, паражоны рукою здрадніка! Змагаўся, як леў! Трох забіў!

Медыкус расштурхаў людзей і схіліўся над трупамі. Памацаў пульс. Пасля прыўзняўся і махнуў рукой.

– Што з ім? – трывожна спытаў Міхал.

Медыкус плюнуў:

– Свіння. Выбраў месца, каб апрастацца. Вось што бывае, калі п'юць без меры і не закусваюць. Насматкаўся чырвонага віна, лайдак.

– Можа, дапамагчы чым? – спытаў Міхал, усё яшчэ не разумеючы.

– Нашто?! Ён зрабіў самае лепшае, што можна было. Ну, калі вам так хочацца, дык засуньце яму яшчэ два пальцы ў рот.

У адказ "забіты" кароль моцна захроп, і яму адказаў пяшчотным насавым свістам "здраднік" Ваўчанецкі.

Так скончылася вялікая цыганская вайна, адна з самых славутых войнаў, якія вёў кароль Якуб Першы. Вялікую славу здабылі ў ёй усе мужныя змагары. Але і страты былі вялікія: адзін шляхцюк

адбіў пячонкі, упаўшы з воза; два захлынуліся віном у склепе; пяць чалавек абпіліся да смерці. Яны загінулі за радзіму. Забітых агнястрэльнай і халоднай зброяй не было. Параненых было шэсць. Кантужаных атынкоўкаю – тры. Акрамя таго, “кароннаму суддзі” вышэйпамянёная свіння ад'ела вуха. Свінню за гэта раніцаю прысудзілі да страты і з'елі пад чорнай падліваю. Нарабілі брыдкасцей і насвавольнічалі – у ахвоту.

А калі раніцаю Яноўскі, перадаўшы спустошаны маёнтак бацькам, паехаў паўночнай дарогаю разам з Ваўчанецкім (іх памірылі) да караля Якуба, які яго не адпускаў, на паўдзённай дарозе да Яноўшчыны можна было пабачыць павучальны малюнак: цягнуліся шляхам каровы, бэкалі авечкі, везлі на вазах гусей і бочкі віна. Каля вазоў крочылі пахмурныя хлопы Ваўчанецкага.

Пераможаны, згодна з рыцарскім гонарам, сумленна плаціў кантрыбуцыю сялянскай худобаю. Сам ён аддаў толькі віно.

Дзядзькі ішлі панурыўшыся, пахмурна гледзячы пад ногі. З хат уцякаў пах малака, уцякала няпэўная сялянская сытасць

Курыўся дарогаю пыл.

V

Два дні цягнулася святкаванне перамогі ў палацы Якуба Першага. Гарэлі плошкі, палалі бочкі са смалою. Ляцелі крык, смех, тупанне аб падлогу. У кароткія хвіліны прасвятлення два разы ездзілі на шлях лавіць падарожных людзей у госці. Спаймаўшы мужыка, аддавалі яго гайдукам, каб тыя зацягнулі ў людскую і напаілі там да зялёнага змія.

Калі трапляўся панскі вазок – перараззалі яму конна дарогу, выляталі з-за дрэў, гікалі, хапалі за морды коней, устаўлялі ў колы вялізныя латы, бралі гаспадара ў палон і з пашанаю везлі ў палац, каб не было за сталом пустых крэслаў. А пустых крэслаў ставала ўсё больш і больш. Некаторыя госці захварэлі і не маглі нават рукою варухнуць. Тры загонавыя шляхцюкі ціха сканалі ў задніх пакоях. Адмучыліся.

Яноўскаму ўсё гэта так абрыдла, што ён знікаў з палаца і накіроўваўся куды вочы глядзяць, часцей за ўсё да медыкуса. Той таксама піў, але хоць разумнейшым рабіўся ад гэтага. Сядзеў, мачаючы агурок у соль, хрумстаў ім і, утаропіўшы ў сабутэльніка ярасныя вочы, злосна казаў:

– Бязглудзіца! Не краіна, а плод шалёнай фантазіі бога. Вось мінуў чэрвень 1789 года, ліпень стаіць. Мужыкі пуп падарвалі, а тут гуляюць, як быццам заўтра сканчэнне свету. Не грамада, а авечы статак. Вось прыпомні мае словы: яшчэ і новае стагоддзе не настане,

а гэтая гнілая дзяржава знікне з зямлі. Не будзе яе, духу не станецца. І моцны воўк зжарэ слабага. І хоць бы дзе агеньчык! Па ўсёй зямлі маўчыць хлоп. Жонку яго цяжарную сцёбаюць – ён пану ручкі цалуе, галаву яму прабілі – ён крычыць: “Бацька наш, каралеўская кроў, вядзі!” Душна мне, браце, душна мне. Зусім здохнем, калі хоць дзе-небудзь не запалае.

Яноўскі слухаў яго з дзіўным спакоем. Нібы не яго любую, моцную, вольную дзяржаву лаялі. Нібы зусім не шляхціц ён, а самы звычайны лапаць. Словы медыкуса былі як павольна дзеючая атрута. Міхал па-ранейшаму пагарджаў мужыкамі, але і шляхту не мог любіць – наглядзеўся за гэтыя дні. І гэта было рыцарства, надзея Беларусі, яе блакітная кроў. Паганцы!

К канцу другога дня гулянкі адбылося адразу тры няшчасці: абпіліся да смерці два цыганы і памёр, таксама пасля выпіўкі, той цыган, якому прабілі галаву. Ён быў цыганскі старэйшына і піў ад ганьбы.

У дзень пахавання старэйшыны Яноўскі пайшоў да табара. Дзень быў спакойны, ён дагараў за лясамі чырвонаю стужкай зары, і таямніча вымалёўваліся на гэтым фоне спічастыя цыганскія буданы. Міхал прапусціў момант, калі нябожчыка панясуць у апошні шлях. Ён інстынктыўна не любіў чужой смерці, як кожны малады. Проста хацелася хоць хвіліну пабыць сярод людзей, якія не п’юць і не сваволяць.

Ён здзівіўся, убачаўшы, што трохі зводдаль ад шатра нябожчыка стаіць невялікі маўклівы натоўп, чарнеючы ў цемры.

Каб не перашкаджаць ім, Яноўскі адышоў у супрацьлеглы бок і сеў у хмызах, ля вялікага дуба. Тут ён бачыў усё, а яго не бачылі.

Хвілін пяць стаяла цішыня. Пасля няпэўны, ледзь чутны голас заспяваў дзіўную гартанную мелодыю. Праспяваў дзве-тры ноты і змоўкнуў. Падхапіў другі жаночы голас і павёў яе, скардзячыся, і зноў змоўк... Трэці, чацвёрты голас... Песня мацнела, але да самага канца заставалася нягучнай. І раптам зноў цішыня.

Толькі тут пабачыў Міхал, што ад пушчы цягнецца дзіўная працэсія. Людзі, што праводзілі старэйшыну на месца апошняга заспакаення, ішлі гуськом, па адным. Спачатку – цыганы, пасля – цыганкі.

Ля шатра паступова пачало разгарацца вогнішча, людзі кідалі ў яго сухія палкі. Доўгая маўклівая змяя павольна набліжалася ад пушчы.

Калі яна прайшла палову дарогі, нехта выліў на вогнішча цэбар вады. Засіпелі галавешкі. І адразу запалала вогнішча ля суседняга

шатра. У яго няпэўным святле Яноўскі ўбачыў постаць проставалосай кабеты, якая крочыла насустрач працэсіі, трымаючы ў руках галавешку са згаслага вогнішча. Хустка на плячах кабеты развявалася ад хуткай хады.

Вось яна падышла да першага, падала яму галавешку. Той узяў яе, не аглядаючыся, перадаў цераз плячо наступнаму, а сам вымыў рукі і твар вадою, якую зліла яму з гарлача тая самая кабета. Усе перадавалі галавешку цераз плячо, усе мылі рукі.

Астатняя бабуля, таксама не аглядаючыся, кінула яе на дарогу. Зноў скардзячыся, заспяваў хор. Яноўскі не разумеў слоў, але хваляванне сціснула яму горла.

– Ідзі, ідзі ў свой далёкі шлях, – здавалася яму, спяваў хор. – Галавешка апошняга вогнішча, забытая на дарозе... Круцяцца, круцяцца колы... Няма спакою, няма адпачынку... Мы едзем, мы едзем, спаўняючы даўні запавет... Далёкая дарога... Ідзі ў той край, дзе скончацца бадзянні, дзе цябе не пакрыўдзяць... Круцяцца, круцяцца колы... Бясконцы, вечны наш шлях.

Кабета, размахнуўшыся, кінула палаючую галавешку ў шацёр памёршага, і ён адразу ўзяўся зыркім жоўтым агнём.

– Вось палае твой шацёр, апошні твой шацёр, – здавалася, спяваў хор. – Хутка нічога не застанецца ад цябе на зямлі... Застанецца галавешка на пыльнай дарозе, дым забытых кастроў, і колы твайго племя прарыпяць у цемры далей. Круцяцца, круцяцца колы... Далёкі шлях.

Яноўскі не заўважыў нават, што ўсё скончылася. Абудзілі яго ад задуменнасці крокі і галасы непадалёк. Пад дубам стаяла некалькі цёмных постацяў. Дзіўна, але размаўлялі яны па-беларуску.

– Вось і канец.

– Ад ганьбы памёр чалавек. Ой, роме.

Яноўскаму здалося, што першы голас – голас таго цыгана, якому кароль даў аплявуху тады на ганку, а другі – голас таго няшчаснага, у якога гайдукі Знамяроўскага збілі абады на дарозе.

– Хопіць, – азваўся густы бас. – Плачам справе не паможаш. Але заўтра ён нам адкажа, бізун голы.

За другімі табарамі паслалі?

– Паслалі. Матыс Аўгусцінавіч накіраваў чатырох.

– Добра. Толькі трымайцеся, браты. Так трымайцеся, як толькі можна.

Загаварылі па-цыганску, і Міхал павольна пачаў адыходзіць ад таямнічага зборышча. Толькі па дарозе дамоў ён зразумеў, што супраць Якуба рыхтуюць нешта нядобрае, і, хоць матыў цыганскагу

плачу стаяў яшчэ ў яго вушах, хоць дом Знамяроўскага і вечныя гулянкі яму астабрыдлі, выра шыў папярэдзіць караля. Проста на знак удзячнасці.

Але ў палацы зноў спявалі, зноў даляталі з акон крыкі, брынчанне струн, бразгатанне шкла.

З-пад стала тырчалі ногі мітрапаліта. Кароль Якуб сядзеў на сваім месцы, учапіўшыся ладонню ў нячэсаныя валасы. Карыя вочы былі ўтароплены ў нешта, што бачыў ён адзін. Міхал тарганув яго за плячо.

– Ты хто такоў? – цяжка, як воўк, павярнуўся да яго Знамяроўскі.

– Гэта я, ваша вялікасць, Яноўскі.

– А-а. Ян-ноўскі. А чаго ж гэта ты такі храноўскі? Ты хто такоў?

– Я пасол.

– А-а, пасол. Пасол замежнага каралеўства. Дык чаго ты лезеш сюды, калі кароль ад-п-пачывае ад д-д-дзяржаўных спраў. Ведай этыкет. Пасля прыму, праз тры дні. І не раней... Ведай маю дабрату. Пшоў прэч!

Яноўскі ледзь стрымаўся, махнуў рукою і на папярэджанні і на размову. Д'ябал яго бяры, раз так. Ён зусім сабраўся пакінуць залу, калі раптам галасы амаль усіх гасцей зараўлі нешта адзінае:

– Дзевак! Дзевак!

Гэты раптоўны псіхоз ахапіў усіх. Нават мітрапаліт выкаціўся з месца свайго адпачынку і пачаў крычаць:

– Вачыма намізаюшчых, тонкашчыкалатных, барвянадзясных, палка лабазаючых!!!

Якуб, як заўважыў Яноўскі, быў амаль раўнадушны да жанчын. Таму ён абыякава паклікаў гайдука:

– Адшукай гэтым бабздырам... І сумленных не бяры, гэтыя свінні ўсё адно нічога не разумеюць. Колькі іх тут? Дваццаць цвярозых? Вось столькі гуляшчых і знайдзі ва ўсіх вёсках.

І зноў сеў. Баль працягваўся, а Знамяроўскі ўсё ніжэй апускаў галаву. Яноўскі даўно заўважыў, што хмель налятаў на яго хвалямі.

– Дзевак! Дзевак! – зноў зараўлі госці.

І раптам Якуб устаў. Яноўскі жахнуўся, гледзячы на яго твар. Наліты крывёй, з ашкляне лымі вачыма, страшны. Вялізнай, як цэбар, лапай грукнуў па стале:

– Маўчаць, падлы!

Знямелая цішыня запанавала ў пакоі. Толькі чутна было, як крывая свечка капала воскам на плеш нейкаму п'янаму і той мыкаў у сне.

На твары Якуба краплінамі высыпаў пот.

– Вы – падлы, вы – шчанюкі, п'янюгі, нахабнікі. Дзевак ім, віна! Дзе слава, дзе моц, дзе воля, дзе веліч?! Сны ўсё!!! Сны!!! Сны аб загубленым! З вамі, ці што, царствы пакараць? Вы, можа, воіны, вы, можа, людзі? Лярвы вы, еўнухі, чарвякі! Хто вам дасць больш – таму вы нявесту, маці, зямлю сваю... пад хвост!

Ён заскроб пяцярнёю па абрусе. Вочы сталі дзікімі і вартымі жалю.

– Мерцвякі вы! Людзей вы толькі распінаеце! І я распінаю, і я б'ю. Дзярмо – людзі! Руку, што б'е, ліжуць! Хоць бы хто, хоць бы хто мне па мордзе даў у адказ. Гной прымушу вас есці – будзеце жэрці. Харкну у твар – зад пацалуеце. Шляхта! Соль зямлі!

Ён павольна пачаў спаўзаць набок, вывяргаючы самую чорную лаянку, упаў на падлогу, забіўся ў п'яных сутаргах, рыдаў:

– Мне б... мне б хоць у зубы тады... можа, чалавекам быў бы... Чалавекам.

Яму прыціснулі ногі, трымалі за галаву. Пасля панеслі ў спальню. Запанавала маўчанне, такое цяжкае, што, здавалася, грымні пярун – будзе лягчэй.

І раптам "каронны судзя" выскаліўся, і з горла яго вырвалася:

– Гі-гі-гі-гі!

І адразу загігікалі, ашчэрыліся ўсе. Нясмелы спачатку, смех узмацнеў, пакаціўся хвалямі. Смяяліся доўга, са смакам.

– Дзевак прывёў! – абвясціў гайдук, з'яўляючыся ў дзвярах. – Недабраў толькі гуляшчых, таму з вёскі адну прыхапіў.

І сапраўды, у дзвярах стаялі нарумяненыя дзеўкі. Амаль кожная – капа капою. Вочы падведзеныя, бровы падмазаныя, зубы нахабна выскаленыя.

Усё завіравала. Тыя, што трымаліся на нагах, кінуліся на стракатую юбу. Віск, прытворныя ўскрыкі, смех. Сям-там пачыналі скакаць, сёй-той знікаў з залы. Нейкая таўстуха кінулася на Яноўскага:

– Прыгарні ж ты мяне, красунчык.

Ён з прыкрасцю адмахнуўся, выйшаў у калідор і пайшоў да выхаду. Слабы крык прагучаў за павароткаю калідора. Яноўскі ўбачыў постаць "кароннага суддзі", які паспешліва цягнуў кудысьці за руку дзяўчыну ў белым уборы. Танюткая, сінявокая, яна вельмі нагадала Міхалу тую, што схаваў у сябе медыкус. Тая? Не, не тая. Але падобная. Яна слаба чаплялася за сценку, ён штуршкамі адрываў яе,

цягнуў далей. Спуджаная налётам гайдукоў, напалоханая карцінай оргіі, яна толькі паўтарала перарывістым дзікім голасам:

– Пане! Пане! Пашкадуйце мяне. Я баюся.

“Зараз папросіць ляльку ўзяць з сабою”, – сумна падумаў Яноўскі.

Месяц назад ён прайшоў бы міма. Бацькі яго не заахвочвалі распусты, але гэта ж былі прыгонныя, быдла, створанае для лепшых людзей зямлі. Ды яшчэ і чужое быдла.

– Пане! Пашкадуйце! Памажыце!

І тут Яноўскі прыпомніў постаць той дзяўчыны, прыпомніў медыкуса, што накідваў на яе мантыю, прыпомніў п’яныя яго словы над талеркай з гуркамі, разгром Яноўшчыны, страшны, звярыны крык Якуба сёння ў зале, ногі яго, што біліся на зямлі.

Адзіным скачком ён дагнаў аднавухага, які ўцягваў ужо дзяўчыну ў пакой, і рвануў яго за плячо.

– Пусці. Чуеш, пусці яе.

– А-а, шчанюк... Адчапіся! Мая! – І суддзя пацягнуўся за шабляй. Замест таго каб выцягнуць сваю, Яноўскі сказаў зняважліва:

– Эх ты, соль зямлі...

І разлічана, страшна ўдарыў яго між вачэй. Вораг быў п’яны, толькі гэта і дапамагло Міхалу, калі яны пакаціліся па падлозе, месячы адзін аднаго кулакамі. Міхал хутка высвабадзіўся і, схапіўшы яго за скроні, ударыў галавою аб сцяну, а пасля яшчэ доўга біў яго, біў раз’юшана, глытаючы слёзы ад абурэння на самога сябе, на тое, што на іх амаль аднолькавая вопратка.

У калідоры пачуліся крыкі, тупат ног. Тады Яноўскі хутка выцягнуў ашаломленую дзяўчыну з кутка, штурхнуў у пакой і замкнуў за сабою дзверы. У дзверы адразу пачалі ламацца, пасля пакінулі, пайшлі кудысьці, і стала ціха.

Дзяўчына не плакала, яна проста глядзела на яго з цемры бліскучымі вачыма.

Яноўскі адсмактаў кроў і, каб не было саромна за раптоўны парыў, амаль суха спытаў:

– Як цябе завуць?

– Аглая, – прашаптала яна.

– Які чорт цябе сюды панёс, – сказаў Міхал і пачырванеў.

– Прывялі, пане, – уздыхнула яна. – Адну мяне ўзялі з вёскі. Я ведаю вас. Вы сястру маю абаранілі тады, калі яе хацелі караць... Яна сястра мая.

– Глупства, – разважліва буркнуў Яноўскі.

І таму, што з гэтай дзяўчынай нельга было размаўляць пра мову кветак і прыгоды Дафніса, прыбавіў:

– Кладзіся. Спі. Пойдзеш перад світаннем, калі ўсе заснуць. Зараз небяспечна. Могуць спаймаць за дзвярыма. Спі.

– А вы, васпане?

– Спі. Спі.

– Вы добры, вы вельмі харошы чалавек. Як быццам зусім не пан. Як брат старэйшы. Бог вам заплаціць за гэта, вы будзеце з намі ў раі.

І прывабіла з глыбокім сумам:

– Я толькі думаю часам, ці ёсць ён, бог, – так мы пакутуем.

– Но! – па прывычцы прыкрыкнуў на яе Яноўскі і спалохаўся, бо яна раптам горка, узахлёб заплакала:

– Божа, як страшна! Як страшна!

“Раскапусцілася, Хадора”, – назнарок груба падумаў Міхал і раптам убачыў яе мокры ад слёз мізэрны тварык, вочы, у якіх стаяў сапраўдны жах.

Тады ён, сам не ведаючы, што прымушае яго так абыходзіцца з гэтай мужычкай, сеў поруч з ёю і пацалаваў яе ў лоб.

– Ну што ты, што ты? Нашто плакаць? Усё мінула. Ну, супакойся! У-у, румза. Ну ціха, ціха. Усё будзе добра. Пойдзеш адсюль перад світаннем. Усё абышлося, будзеш сабе жыць. Мужа табе знойдзем добрага, будзеце жыць, гадаваць дзетак.

Ён бачыў, што яна супакойваецца, але бачыў таксама, што ідылія, намаляваная ім, не даходзіць да яе. І раптам яна сказала горка, але амаль спакойна:

– Не, пане. Не абыдзецца. Другі раз не абыдзецца. Усе гэтым канчаюць, хто раней, хто пазней. Няма выйсця.

І таму, што ён усё яшчэ гладзіў яе галаву, адхіснулася ад яго і, прынікшы да сцяны, сказала:

– Я хацела б толькі, каб наступны раз, калі гэта будзе... мне хацелася б, каб гэта былі вы. Бо калі нейкі разлезнік або проста пан... я ўтаплюся тады.

Яноўскаму стала пякуча сорамна. П’янка, наезд, суд – і гэтыя словы, першыя словы, у якіх быў чалавек. За ўсе дні.

Ён сядзеў невядома колькі, сціснуўшы скроні, а пасля ўбачыў, што яна спіць, стомленая перажытым жахам.

І тады ён ціха, як злодзей, чырванеючы ад сораму, паклаў яе на падушкі, нячутна накрыў коўдраю, а сам доўга яшчэ глядзеў ёй у твар.

Пасля ўздыхнуў, сцягнуў з сябе чугу і, разаслаўшы яе ля дзвярэй, расцягнуўся на ёй.

У гэтым была і ганьба, і помслівая асалода, і нейкае светлае, чыстае, трохі сумнае і зусім новае пачуццё.

VI

– Пане, уставайце. Ой, пане, уставайце!

– Што, што такое?

– Ой, пане, дрэннае нешта робіцца за агароджаю.

Яноўскі ўсхапіўся на ногі. Перад ім стаяў адзін з гайдукоў караля, спуджаны ледзь не да смерці. Міхал, здзіўлены, чаму ён спіць на падлозе, нарэшце ўсё ўспомніў і спытаў:

– А дзяўчына дзе?

– Якая дзяўчына? А, гэтая, што тут? – І гайдук ашчэрыўся. – Мы іх раніцою не трымаем. Пайшла дахаты.

– Ну і добра.

З дзённым святлом, хоць і вельмі саслабелыя, вярнуліся забабоны і правілы маралі дзён былых. Яноўскаму было пякельна сорамна за падзеі гэтай ночы. Так, гэтая Аглая цудоўная дзеўка, так, суддзя не чалавек, а брудная свіння, і ён не шкадуе, што ўчора набіў яго. Але суцяшаць, як быццам поруч з табою няшчасная княгіня, але спаць ля дзвярэй, як быццам ты ў спальні каралевы. Бязглуздзіца!

Ён хутка апрануўся, прычапіў шаблю і пабег да дзвярэй. У замку было пуста. На ганку Міхал убачыў натоўп гайдукоў, якія завіхаліся ля гарматы, наводзячы яе на зачыненую браму. Бязладныя крыкі. Нехта сыпле ў жарало порах з картузоў. Мітусяцца, крычаць.

Яноўскі расштурхаў людзей, выбег на двор.

– Што такое?

– Паглядзі сам, – змрочна кінуў нейкі шляхцюк, жоўты з перапою.

Яго вачам адкрыўся жахлівы малюнак: выган перад частаколам быў чорны ад цыганоў. Задзёртыя засмаглыя твары, разяўленыя зяпы. Суцэльны крык. У паветры калы, сякеры, пугі.

Кажухі расхрысталіся на грудзях. У вачах лютасць.

Медыкус стаў поруч з Міхалам. Вочы яго ззялі незразумелым захапленнем.

– Сёння мы, здаецца, загінем.

Міхал кінуў на яго бліскавічны злосны позірк:

– Яны загінуць. Забыліся, на каго ўзнялі меч. Мы п’янюгі, але мы ўмеем ваяваць.

І скінуў шапку.

– Дзякуй табе, божа. Ты яшчэ раз дасі мне перад смерцю пабачыць, як замест віна льецца блакітная кроў.

Медыкус іранічна глядзеў на яго:

– Божа, якія героі!

– Дзе кароль? Дзе госці? – замест адказу спытаў Міхал.

– Дрыхнуць.

– Ну што ж, тым лепей.

І ён спусціўся ўніз. Яму ўдалося згуртаваць атрад з дваццацёх цвярозых шляхцюкоў. Ён паставіў іх трохі воддаль ад гарматы, злева ад брамы, каб ударыць, калі пачнуць прабірацца на двор.

“Каронны суддзя” выбег з дзвярэй, пабачыў, што шляхту ўзначальвае Міхал, і пачаў аддаваць загады гайдукам:

– Смялей, дзецюкі. Радзіма глядзіць на нас. Яна дарагая, яна вялікая. Хто памрэ, таго бог адзясную сябе пасадзіць. За радзіму, за караля!

– На злом! На злом! – раўлі тыя, што асаджалі. – Смерць уладарам!

У браму пачалі біць чымсьці цяжкім. Паляцелі гнілыя трэскі. І тут Яноўскі ўбачыў караля. Апрануты, як на баль, ён махаў у паветры шабляй, стоячы сярод захмялелых гасцей.

– Неба! Радзіма! Кароль! Валі, браткі! Сякерай іх! Друком!

Сэрца Яноўскага палала нябесным ярасным захапленнем. Не, жывая была адвага сотні пакаленняў, жывая была слава! Вось яна, сонная, ля віннай бочкі, убачыла небяспеку, разгарнула крылы і ляціць над галовамі людзей.

Форткі брамы разляцеліся. На двор рынуў натоўп інсургентаў.

– Святы Юры і Русь! Памром! – дзікім голасам закрычаў Яноўскі і кінуўся з шабляю насустрач. Адначасова ён пачуў крык Якуба і ўбачыў яго ўзнесеную шаблю. Не памятаючы сябе, у дзікім захапленні бою, ён урэзаўся ў натоўп, скрыжаваў з кімсьці шаблю, чакаючы, што зараз поруч стануць яшчэ і яшчэ людзі, Гарацыі, героі Плутарха.

Штосьці ўразіла яго. Ён азірнуўся. На пляцоўцы нікога не было, акрамя Якуба і яго. Дзе падзеліся астатнія, цяжка было сказаць. Міхалу здалося толькі, што пад ганкам, у лебядзе, варушыліся чыесьці ногі. Аднак ён біўся.

– Зараз ахне гармата. Вы заскачыце яшчэ.

Страшэнны пярун прагучаў над сечай. Калі дым разышоўся, Міхал убачыў ствол гарматы, амаль раздзёрты на закручаныя палосы, падобны на жоўтую лілею. Поруч з гарматай ляжаў, задёршы дагары зад, “каронная суддзя”.

У тую ж хвіліну шалёны натоўп закруціў Міхала і караля і панёс ад ганка. Іх схапілі, абяззброілі, паставілі воддаль адзін ад другога, скруцілі рукі.

Цыган, што атрымаў тады поўху, узлез на ганак:

– Роме, мы скінулі ярмо, што давіла нас. Цыганская рэспубліка, жыві! Прэч дэспатаў!

Натоўп адказаў крыкамі. Шапкі ўзляталі над галовамі людзей.

– Мы будзем судзіць караля. А ўсіх, што лютавалі, баронячы яго, аддаю ў твае рукі, народ цыганскі. Скончыліся паборы, скончыўся прыгнёт.

– Ура, Ян! Жыві! На шчасце цыганам!

Караля павялі ў палац. На ганку ён крыкнуў:

– Кароль у кайданах – усё роўна кароль!

Яноўскі кусаў вусны ад ганьбы. І гэта былі людзі, гэта былі героі! Лепей было памерці... Адны беглі на гармату – і гэта была быдлячая чарада з пугамі. Другія – узброеныя, магутныя, моцныя! Божа, божа! Засталася смерць. Толькі яна.

Ян падышоў да Міхала:

– Гэты вёў супраць нас шляхту. Ён адзін кінуўся на нас. Войска яго знікла. Праўда гэта, былы пан?

Яноўскі ўскінуў галаву:

– Праўда. І я пагарджаю вамі. Забіце мяне.

Натоўп зароў, замільгалі ў паветры друкі.

– Смерць яму, смерць!

Яноўскі глянуў на неба, якое было сведкам яго смяротнай ганьбы.

– Забівайце. Я хачу смерці. Мне нельга жыць.

Ён узвысіў голас:

– Калі тут не было сёння шляхты, калі тут былі адны свінні, хай хоць адзін памрэ за ўсіх. – І дадаў хрыпла: – Гонар, жыві!

Лаючыся, расштурхаў натоўп нехта калматы і вялізны. Узнёс самаробную дзіду. Яшчэ! Яшчэ! Ударылі злёгку па галаве.

І раптам нешта адбылося. Яноўскі, што закрыў вочы, адчуў, як нешта цёплае прынікла да яго.

– Не дам яго! Чуеце, не дам! Забівайце разам!

Ён зірнуў. Прыціснуўшыся да яго спіною, распасцёршы рукі, стаяла і глядзела проста ў вочы натоўпу Аглая. Глядзела белымі ад ярасці вачыма.

– Вы што, здурэлі?! Тых, што мучылі вас, тых, што здзекаваліся, не чапаць толькі таму, што сёння яны ўцяклі. А гэтага, які нікога не чапаў, які сястру і мяне абараніў, – забіць толькі таму, што

смелы, што не спалохаўся адзін на ўсіх кінуцца? Вы баязліўцы, вы, вы, вы...

– Адыдзі, дзяўчына, – пагрозліва сказаў калматы. – Гэты – наш...

І тут Аглая ляснула яго па шчацэ.

– Твой! Хто гэта твой? Ён, можа? Твае толькі блохі ў кажусе ды крадзеныя коні. Ах ты, халера, казалуп чорны, страшны, рыбак па чужых стайнях. Твой ён? Не! Мой ён, мой! Я тут кожнаму з вас за яго... за яго... за яго...

Цыган з апаскаю адступаў.

– Ён і не пан зусім. Пан не абараняе ад бізуноў прыгонную, пан не будзе біцца з другім панам за дзявочую цноту, не абароніць яе ад усіх, не ляжа на парозе, каб абараніць спакой прыгоннай.

– І ўсё ж я шляхціц, – з гонарам сказаў Яноўскі. – Няма жыцця. Дзякуй табе, харошая, але сёння мне хочацца смерці.

– Сёння яму хочацца... Можа, заўтра табе яе зусім не захочацца, ды позна будзе. Цыганы, родненькія вы мае, не чапайце вы яго, гэтага дурня! Гэта не ён, гэта гонар дурны гаворыць.

І раптам яна, расплакаўшыся, села ля яго ног, абхапілі іх рукамі.

– Не дам... Разам са мною...

Яноўскі адчуў, як вяроўкі ўпалі з яго рук.

– Але, – разважліва сказаў нехта. – Трошачкі маленькай памылкі не зрабілі. Бач ты, як яе разбірае.

– Ды бяры ты яго хоць да д’ябла, – буркнуў другі.

І раптам натоўп цыганоў і мужыкоў зарагатаў такім нутраным гучным здаровым смехам, што стала ясна: нікога пасля яго нельга забіваць. Рагаталі да слёз, рагаталі, узяўшыся за бокі, рагаталі да болю ў грудзях.

І Аглая, баючыся, як бы не перадумалі, цягнула саслабелага Міхала праз натоўп, усміхалася, выцірала слёзы:

– Дзякуй вам, дзякуй вам, родныя.

Пад рогат яна адвяла Міхала да брамы і пасадзіла на траву.

Толькі тут, відаць, нехта заўважыў ля гарматы цела суддзі.

– А гэты мёртвы ці жывы? – спытаў нейкі мужык.

Стары цыган падышоў блізка, схіліўся:

– Нават пратухнуць паспеў.

Ян стаў над нерухомым целам, падміргнуў людзям:

– Мёртвы ён ці жывы, чорт яго ведае. Нума, хлопцы, сцягніце з яго жупан. Не можа гэтага быць, каб шляхціц, калі ён жывы і

цвярозы, голым ляжаў. Калі жывы – суд, калі мёртвы – выкінем на бераг, хай ляжыць.

Гульню падхапілі.

– Ну вядома ж, не можа. Куды там! – чуліся галасы.

Ян паглядзеў на голага суддзю:

– Мёртвы-такі, напэўна. Ану, хлопцы, прынясіце з той пушчы чаго-небудзь.

Прынеслі некалькі вязак вялізнай старой крапівы.

– Не можа ж, людзі, шляхціц згадзіцца, каб яго без посцілкі, на голай зямлі, лупцавалі. Як вы думаеце?

– Не можа. Не можа, – разважліва загулі галасы.

Пачалі шмагаць. Мёртвае цела пачало ад шыі да пятак узнімацца белымі пухірамі.

Яноўскі закрыў вочы. Яго пачало трэсці. Спуджаныя Аглая пацягнула яго за браму. Але Міхал раптам выпрастаўся. Белы як смерць, ён расштурхаў людзей, ненатуральна прама падышоў да суддзі і плюнуў у яго бок:

– Здраднік ты. Праклён на цябе.

І таксама цвёрда пакрочыў да частаколу.

– Мёртвы, напэўна, – збянтэжана сказаў Ян. – Выцягніце яго, хлопцы, на бераг. Не варта аб яго рукі пэцкаць. Стой... Яшчэ слова. Калі ты, падла, паспрабуеш яшчэ хоць пальцам дзевак зачапіць, як ты гэта сёння паспрабаваў, – з пекла дастанем. Цягніце.

Міхал не чуў усяго гэтага. Ледзь дыхаючы, ён дацягнуўся да рэчкі і там, за хмызамі, упаў на гарачы пясок. Аглая села ля яго.

Не бачыць. Не чуць. Памерці тут і не бачыць, як зламалася ўсё жыццё, вера, смеласць, шчасце.

– Свінні! Ах, якія паршывыя свінні! – стагнаў ён, упіваючыся кіпцямі ў далоні.

А Аглая сядзела поруч і гладзіла яго па галаве, як малога:

– Ну не трэба, не трэба. Гаротны ты мой, няшчасны.

– Цяжка мне, цяжка мне, Аглаечка. Што мне рабіць? З кім жыць зараз?

– З людзьмі, – сказала яна.

– Нашто ты ратавала мяне?

Яна змаўчала, і тут Міхал усхапіўся на калені.

– А сапраўды, чаму? – спытаў ён. – Я ж пан, я вораг ваш...

І ўбачыў яе вочы. Сум трапятаў у іх, радасць, яшчэ нешта незразумелае, але, галоўнае, – гонар. Такі сціплы, але цвёрды гонар, якога яму яшчэ яму не даводзілася бачыць. Зломлены, з раздаўленай душою, ён не мог больш.

Ён здаўся. Ён пацягнуўся да яе, упаў перад ёю, абхапіў рукамі стан, прыпаў галавою да ўлоння:

– Ратуй мяне, родная. Ратуй мяне ад мяне самога, ад іх. Яны страшныя, яны агідныя.

Яна схілілася над ім, прыціснула буяную галаву бліжэй да ўлоння.

– Суцешся, суцешся. Засні. Засні.

VII

Ён прачнуўся, калі месяц пачаў спускацца ў рачныя воды. Сітнягі ледзь шапацелі пад напорам плыні, крычаў вадзяны бугай.

Ад палаца слаба далятаЛі спевы, не парушаючыя цішыні. Ён прачнуўся, адчуў, што галава яго ўсё яшчэ ляжыць на каленях дзяўчыны, якія слаба пагойдваюцца, бы ў такт нячутнай калыханцы. Значыць, яна так і не зварухнулася ўвесь гэты час. І ён ляжаў, выпрастаўшыся, жадаючы, каб гэта цягнулася яшчэ і яшчэ. Месяц заліваў люстра ракі. Блакіт.

Дзе ён? Што з ім? Дзіўныя сілы ў душы. Быццам зніклі разам са сном цені дзён былых. Усё проста на зямлі, усё ясна.

Месяц – гэта так, зямля – гэта так, людзі, каханне. А што такое ўсё, што было, усе прывілеі, усе подзвігі, вайна, шляхта? Крык п’янага Якуба? Або, можа, зад кароннага суддзі?

Дзе яны, куды яны зніклі? Чаму ён такі вольны і спакойны? Кахаць – гэта так. Жыць, толькі жыць. Вось яна, сіла зямлі, улілася ў яго праз гэтую, якую ён не ведаў яшчэ некалькі дзён назад. Зноў ад яе? Зноў піць, біцца на шаблях, зноў... Ах, толькі не гэта!

Ён прыўзняў твар, глянуў на яе. Распусціла косы, прыкрыла твар ягоны ад сонца яшчэ ўдзень. Так і сядзіць. Твар блакітны, у вачніцах сінія цені. Глядзіць на яго так, быццам сама нарадзіла.

Прамаці Ева. Толькі яны ўдваіх існуюць на гэтай грэшнай, самай лепшай зямлі.

Яна зразумела, відаць, што заснуў на яе каленях адзін – і ён быў слабы і бездапаможны, – а прачнуўся зусім другі – і ў ім моц моцных. Зноў адчула сябе слабай, аддаўшы сілу, якая не належала ёй, зноў вярнулася да думак іхняй першай ночы.

– Уставайце. Месяц плыве. Цяпер я ўжо не патрэбна вам. Я пайду, мяне шукаюць.

Замест таго каб устаць, ён узяў яе руку, прыцягнуў да сябе і пацалаваў у жорсткую далонь.

– Рука, – сказаў ён. – Пальцы.

Яна пацягнула руку:

– Не трэба гэтага, не трэба. Яны не такія, не для вас. Гэта адно гора. І мне не трэба падзякі.

– Яны для мяне, – проста сказаў ён. – Толькі для мяне. Хай паспрабуе хто-небудзь забараніць мне цалаваць іх... усё жыццё. Няўжо ты думаеш, што я змяняю гэтыя рукі на іншыя, што я адпушчу цябе. Не будзе такога, як мінулую ноч, але я застануся. Гэта маё месца тут, мне тут зручна...

– Пане... – пачала яна, спуджаная пяшчотнай уладнасцю гэтага голасу.

– Пан памёр у сне. Тут ляжыць просты чалавек. Адам. Яму добра са сваёй Евай.

І ён прыцягнуў яе да сябе, пабачыў у вачах адбіткі зор. Яна прасунула далонь між сваёй шчакой і яго вуснамі, але ён адсунуў яе ротам...

А раніцаю ўзышло сонца.

VIII

– Устаць, суд ідзе!

Пад вялізным дубам, на лавах, сядзелі шэсць цыганскіх старэйшын. Высокая рада. Яны адклеілі на хвіліну зады ад лавы, калі з'явіўся выбраны цыганскі суддзя – той самы Ян, што выдумаў забаву з крапівою, пракурор – нейкі захожы шкаляр, і "аблакат" – саладкамоўны малады цыган з хітрымі і чорнымі вачыма.

Вакол судзілішча расселіся проста на траве цыганы з навакольных табараў і нешматлікія мужыкі. За гэтую ноч цыганскія масы паспелі раскалоцца на памяркоўных і шалёных. У памяркоўных балела галава пасля ўзліванняў Бахусу, і хацелася пахмяліцца. Шалёныя спазніліся і таму палалі свяшчэнным гневам. Сядзелі няўважныя. Размаўлялі.

Устаў суддзя:

– Народ цыганскі. Сёння мы, упаўнаважаныя на гэта, судзім былога караля цыганоў Беларусі, Літвы і Падляшша Якуба Знамяроўскага, аспіда нячыстага, ваўка і змея.

– Чаму былога? – ляніва спытаў адзін высокі радца.

– А таму, што сёння на тайным пасяджэнні суд цыганскі вырашыў прымусіць караля падпісаць абдыкацыю, сірэч адрачэнне. Хай будзе існаваць зныня і да веку рэспубліка цыганская.

– А што, гэта нядрэнна, – абазваўся ўсхваляваны малады голас.

– Хвіга табе, а не нядрэнна, – ускіпеў другі высокі радца, чалавек з жахлівым шрамам, які перасек вока і левую палову аблічча. – Нам тут за рэспубліку ўсе навакольныя паны скуру здзяруць. Дзе мець прытулак? Дзе коней хаваць, каб улада не дацягнулася? Дзе самому схавацца? Пад крыламі моцнага караля... Ты, можа, рэспубліку тую ў капусту пакладзеш? Ці ў дождж на плечы накінеш? Смаркач ты! Паспяшаліся тут з вашай мужыцкай рэспублікай. Палац штурмавалі, гармату сапсавалі, караля скруцілі, пабілі яго людзей. А зараз збірайся тут, думай, як выпраўляць становішча. А ў сейме хто будзе?

Ускочыў на камень і непачціва перабіў радцу галава партыі шалёных, той меднік, якому Якуб забараніў жаніцца.

– А што? Усім галовы прэч. Тут, на плошчы. Дарогі ў белы стан цыганскага шчасця па крыві вядуць. Сячы галавы! І шчасце, і мір тады будуць. Воля!

– Сапраўды добра, – расчулена сказаў хтось. – Воля. Ідзі і бяры каня. Захацеў – едзеш, захацеў – на месцы сядзіш. Коні свабодна сабе перамяшчаюцца з рук у рукі.

– Цю-у! Захлусіўся! Хіба хто на такую волю пойдзе, – загулі галасы.

Суд не атрымліваўся. Ледзь-ледзь удалося прымусіць усіх замаўчаць.

Узяў слова пракурор у доўгай шкалярскай світцы:

– Людцы! Вялікі натоўп цыганскі! Я абвінавачваю караля Якуба ў зложываннях уладаю, несправядлівых прысудах і празмерных паборах.

– Я кароль, – годна сказаў Якуб, што сядзеў пад вартаю на зэдліку.

– Ён не кароль, ён рабаўнік. Quousque tandem abutere, Знамяроўскі, patientia nostre[1]? Ён шмагаў нашых людзей, біў іх, хоць мы вольны народ... э-э... вы вольны народ. Несправядліва, жорстка каралі наш сумленны, абраны народ. Dura lex! Ён зрабіў нас жабракамі. Як мы жылі? Semper rapox, raro каша, miseria наша[2]. Ён узяў у нас нашы звонкія катлы, нашы вазы, нашых цудоўных коней, вараных, пісаных, сплавацісаных, буланых, белых. У іх былі такія цвёрдыя, непарэпаныя, неабрэзаныя капыты, такія роўныя свае непадпілаваныя зубы, такія мяккія насы з чуллівымі валосікамі.

---

[1] Дакуль будзеш ты, Знамяроўскі, злоўжываць цярпеннем нашым.

[2] Жорсткі закон!.. Заўсёды... рэдка... беднасць...

Гарачыя без гарэлкі, моцныя... Ім не трэба было штурхаць кулаком пад пахвіну, калі пакупец крадзецца з саломінкаю да бяльма.

Народ пачаў усхліпваць, сям-там нават рыдалі мужчыны. Пасля пачаліся нясмелыя, але ўсё больш моцныя крыкі:

– Смерць яму! Смерць! Галаву прэч! Разумнік ты наш! Вучоная галава! Смерць каралю!

– Тыран! Забойца! Манарх! – крычаў шкаляр.

Пасля выступіў “аблакат”. Хітра прыжмурыўшы чорныя, як вугаль, вочы, ён сказаў ціха:

– Так, кароль нас абражаў, ён браў з нас дзесяціну і больш. Мы пакутавалі пад яго ігам. Але хіба можа хто-небудзь папікнуць наш народ у тым, што ён жорсткі, што ён крыважэрны? Не, наш народ самы добры, самы мяккі, самы рахманы на зямлі. Я прашу пра літасць. Вось ён сядзіць, гэты няшчасны. Няўжо вы не бачыце, як ён схіліў галаву, як слёзы накіпаюць на гэтах добрых вачах, як ён стрымлівае ўздыханні сардэчныя? Майце жаль у сэрцах сваіх. А вось яго слаўны бацю глядзіць з нябёс на няшчаснага сына і плача. І няўжо вы забудзеце яго дабрату? Ён браў у нас коней, але непараўнальна больш ён даваў нам. У вялікіх паходах і войнах пад яго началам мы прыдбалі ўтрая больш коней, мы хавалі іх тут, і ніхто не асмельваўся іх зачапіць. А якія гэта былі коні! Божа мой, іх грывы былі, як хмары, вочы, як чорныя зоры! А якой славы дастала пры іх дзяржава цыганская! Як баяліся яе ворагі, як слухаў яе голас у сейме сам кароль!

Народ плакаў наўзрыд. Нават радцы, падобныя адзін на аднаго, шырока раскрыўшы зяпы, раўлі густымі галасамі:

– Ы-ы-ы!

– Ну што ж, – перапыніў роў аднавокі радца. – Адвядзіце арыштаванага караля прэч.

І кінуў уладна:

– Я думаю, хопіць. Падурэлі. Нарабілі агіднасцей, напіліся, нажартаваліся. Трэба канчаць. І я старажытнаю ўладай старэйшын даю загад. Гэта канчатковы прысуд.

Натоўп змоўк, і проста на галовы людзей упала кароткае слова:

– Чупна́!

– А што ж, нічога. Часам дапамагае, – загаварылі з розных бакоў.

– Дурні вы! Свінні! Вольнасць сваю прадалі, ёлупы! – крычаў Ян і яшчэ некалькі чалавек. – Хоць бы ён і не чапаў вас пасля, якія вы роме? Блюдалізы вы! Адкачоўваю ад вас!

І ён рушыў разам з часткай людзей да шатроў.

Аднавокі махнуў рукою, і шкаляр стаў чытаць вырак:

– Таго цыганскага круля Якуба Першага за злоўжыванні, морд, падступныя намеры... не складваючы з яго каралеўскага высокага сану, калі дараванне ўсім дасць, хто судзіў яго, не адбіраючы маетнасці дзедзіч ягоных, чупной, сірэч пугай, ад-сцябаць.

Калі ўвесь натоўп рынуў да палаца, дзе павінна было адбыцца пакаранне, калі прыцягнулі ў вялікую залу Якуба, нехта раптам крыкнуў:

– Вы хочаце, каб ён быў вашым каралём, а не думаеце, ці зможа ён быць ім пасля такога. Неба не павінна бачыць каралеўскай ганьбы і крыві, ёлупы вы.

– І праўда, – спуджана сказаў шкаляр. – Што ж рабіць?

Збянтэжанасць пагражала перайсці ў анархію. Сапраўды, нельга пакараць, нельга выканаць прысуд. Сабаку пад хвост аўтарытэт старэйшых. І зноў выратаваў аднавокі:

– Роме, небу нельга бачыць каралеўскай крыві. Таму мы сёння адсцябаем арыштаванага так, каб ганьбы і крыві не бачыў ніхто.

На Знамяроўскага кінуліся і скруцілі яму рукі і ногі. Паставілі. Ён быў бляклы і жоўты, але позірк па-ранейшаму гарэў гардыняй.

– Скручаны кароль – усё ж кароль.

І калі нехта штурхнуў яго, загрымеў:

– Што, над пешым арлом і варона з калом? На калені, хлопы.

Ён думаў, што яму збіраюцца сячы галаву. І толькі калі пабачыў прынесеныя пугі і доўгі вузкі мех, зразумеў, стаў адбівацца галавой і плячыма:

– А, падлы, а цыганскае адроддзе! Ну чакайце...

Яго схапілі, засуналі нагамі ў мех, выцягнуўшы рукі над галавою. Пасля ў тую самую торбу палезла нагамі старая цыганка, вельмі падобная на ведзьму: сівыя пасмы, глыбока праваленыя вочы, кручкаваты нос. Яна лягла на Знамяроўскага, і ледзь пачалі завязваць мех...

– Ав-вой! А як жа ён, нячысцік, кусаецца!

Пачалі сцягваць з галавы мех і краем алавянай талеркі расціскаць зубы Знамяроўскага, якімі ён ухапіў цыганку за жывот. Трымаўся ён моцна, як бульдог. Ледзь расціснулі, падвязалі яму сківіцы хусткай, каб не мог кусацца, цыганку прапхнулі глыбей. Пасля завязалі рукі ў вусці меха, прапуцілі вяроўку і падцягнулі яе пад столь на вялізны гачок.

Кароль павіснуў у паветры. Пад ногі яму падсунулі лаву, каб ён толькі-толькі стаяў на ёй вялікімі пальцамі ног і не мог пручацца.

– Нацягвай! – крыкнуў кат, які стаяў ужо поруч з вялікай пугай у руцэ.

Размаўляў ён назнарок басам, каб пасля не пазналі. Стаяў моцны, каржакаваты, густа аброслы смалянымі кучарамі. Толькі зубы блішчалі на засмаглым твары.

Цыганка нацягнула мех – рэльефна выступіла з-пад яго спіна і два гладкія паўшар'і.

– Ваша вялікасць, вялікі, літасцівы, мудры кароль, – звярнуўся да іх аднавокі. – Вось твой народ, даведзены да адчаю паборамі, рашыўся на такое. Найніжэйша, пакорліва, усепаддана просіць ён не злавацца на гэта, явіць сваю літасць няшчасным. Мы зрабілі ўсё, каб ганьба не дакранулася да твайго чала, каб ні неба, ні людзі не бачылі святых членаў цела твайго, каб ніводны ўдар не трапіў нікуды, акрамя таго месца, якім ты сам пагарджаеш.

Малады цыган прыклаў вялізную мядзяную патэльню да спіны Знамяроўскага; на волі засталося толькі тое, што ніжэй.

– Даруй нам за ўсё. Мы будзем вернымі табе, мы зрабілі гэта толькі таму, каб ты не забыў: нельга занадта крыўдзіць рабоў сваіх. Запомні гэта. Не адбірай нашых коней, акрамя дзесятага, не крыўдзі дзевак, не бі мужыкоў, не трымай вакол сябе людзей прагных. І даруй нам, вялікі.

– Пачынай!

Глуха, як з бочкі, забубнеў голас Якуба:

– Ну я ж вас... Я ж вас... Пачакайце толькі, пачакайце.

Свіснула ў паветры пуга і абвіла ўсё, што ніжэй патэльні. Мех захістаўся ў паветры.

Адлічылі ні многа ні мала сто бізуноў. Лічыла цыганка, што сядзела ў мяху. Пасля няшчаснага пакутніка, вытурыўшы з залы амаль усіх, выцягнулі на волю і паклалі на ложак. Ён адразу скасціўся на падлогу і пачаў качацца па ёй, імкнучыся вызваліцца.

– Хай гэта будзе ўрокам тыранам!

Знамяроўскі лаяўся, пырскаў слінаю, роў так, што звінелі шыбы.

Але варта і тры радцы сядзелі так спакойна, не звяртаючы на яго ўвагі, што ён перастаў вырывацца. Праз дзве гадзіны ён проста ляжаў на жываце і сыпаў вытанчанымі праклёнамі:

– Храпы вы цыганскія, фараоны вы егіпецкія, нячысцікі! Каб вы хадзіць ціха не маглі, каб вас на першым крадзяжы спаймалі, кажухі смярдзючыя, каб вас кол з асіны не мінуў. Што, думаеце, не загоняць яго вам, канакрадам? Во-ой, паганцы вы, хрыстапрадаўцы. Каб на вас вечны дождж.

– Бач ты як... лаецца, – флегматычна пакруціў галавой адзін вартаўнік.

У чатыры гадзіны, пасля працяглага ляжання, Знамяроўскі толькі глядзеў на ўсіх злоснымі, як у тхара, вачыма ды часам прарываўся кароткай лаянкай. Яго хацелі накарміць, але ён выплюнуў кашу ў твар аднавокаму і лаяўся без перапынку гадзіну.

Пасля праклёны пачалі на вачах радзець.

У шэсць гадзін ён упарта маўчаў.

– Даруйце свайму народу. Мы развяжам вас, – пачціва звярнулася да яго дэлегацыя.

У адказ выбух лаянкі да сямі гадзін, аднак нейкі стомлены і зусім не красамоўны. Нават таму, хто круціў галавою, яна не спадабалася.

У восем гадзін трыццаць хвілін вечара Знамяроўскі раптам зарагатаў. Занепакоеныя падданыя кінуліся да яго.

– Развязвай, халуйскія храпы, – крычаў, рагочучы, Знамяроўскі. – Даю вам усім амністыю. Не такая, відаць, свіння – чалавек.

Радцы сталі трымаць кароткую раду, пасля аднавокі звярнуўся да ляжачага:

– І нічога не будзе? Даруеце ўсім нам, ваша вялікасць?

– Развязвайце, д'ябал вас дзяры. Нічога не будзе. Дарую.

– І помсціць, прыгнятаць не будзеце? – асцярожна пыталі ўсе.

– Не буду. Хай вас кадук.

– І дазволіце хлопцу-медніку ажаніцца? І ваяваць не будзеце больш?

– Будзеце вы мяне нарэшце развязваць ці не? Не буду, калі кажу.

– Так, ну яшчэ апошняе, каб нічога такога, як раней, не было. І зусім апошняе – адпусціць на волю сваю прыгонную Аглаю Свяціловічаву.

– Гэта чаму яшчэ? – усклікнуў Знамяроўскі.

– З ёй хоча жанніца ваш пляменнік, Міхал Яноўскі.

Кароль павесіў галаву:

– Хворы чалавек. Безнадзейна хворы. Ды чорт яго бяры, што мне, шкада дзеўку? Хай бярэ. Спакусы ў дзяржаве менш будзе. Толькі дрэнна гэта. Куды падзенецца яго рыцарскі дух? Эх, было нас два на свеце, зараз адзін я застануся. Загінула радзіма! Ну, развязвайце. Клянуся вачыма маці божай, удзелам святога Юрыя – зямлёй сваёю – я буду ціхім каралём, калі вы хочаце.

Салют з фузій раздзёр паветра за вокнамі, калі вяроўкі ўпалі на падлогу.

– Слухайце, людзі. Кароль Якуб у літасці сваёй згадзіўся дараваць вам! Ён хоча правіць ціха і літасціва!

Дружны крык прагучаў паўсюль:

– Кароль! Хай жыве кароль!..

...Вечарам наступнага дня, калі Яноўскі, паразмаўляўшы з Якубам, збіраўся ехаць са Знамяроўшчыны, медыкус зайшоў развітацца з ім. Твар ягоны ззяў небывалым радасным натхненнем.

– Значыцца, едзеш?

– Еду.

– І яна з табою?

Яноўскі азірнуўся на Аглаю, якая стаяла поруч, чырвоная ад шчасця і сораму, засмяяўся, прыціснуў яе да сябе.

– А куды мне без яе? Для мяне зараз адна дарога – з ёю.

Медыкус сеў за стол.

– Сумна мне будзе без цябе, вельмі сумна. Я цябе палюбіў, хлопчык. Бачыш, як атрымалася: ты прыехаў сюды няшчасным шляхціцам, а ад'язджаеш шчаслівым чалавекам... Не баішся, што бацькі яе не прымуць?

– Прымуць, – упэўнена сказаў Міхал. – Дый што мне ў іх? Я еду толькі абвянчацца. Нагі маёй не будзе ў Яноўшчыне. Пасля бацькоў... я вызвалю сваіх людзей. Я не жадаю быць панам. Гэта смерць, гэта жах...

– І я таксама больш не буду тут, – цвёрда сказаў медыкус. – Я еду. Еду вельмі далёка. Мне было сорамна ўчора. Пасля такога запалу скончылася лупцоўкай. Яны далі Знамяроўскаму багатыя падарункі, з пашанаю адвялі ў палац. Хай ён выправіўся, хай будзе выдатна правіць народам – што гэта за народ, калі над ім стаіць адзін? Хіба можна такі народ назваць вялікім? Я добра бачыў, як яны падалі ніцма, як крычалі: "Хай жыве кароль!" Я думаў, што кожны народ мае такі ўрад, якога сам варты, і няма добрых народаў на зямлі. Учора я цвёрда вырашыў атруціцца. Але я цягнуў, невядома чаму. Ці ад недарэчнай прывычкі жыць, ці аб боязі вялікага "нічога"? І я ўзнагароджаны. Шчасце ёсць на зямлі.

– А што такое? – спытаў Міхал насцярожана.

Медыкус схапіў яго далонямі за скроні:

– Любы мой, любы. Пачынаецца новы дзень. Не ўсё яшчэ загублена. Два тыдні назад народ у Парыжы ўзяў і разбурыў Бастылію. Я ўпэўнены: пажар пачаўся надоўга. І хутка паўсюль захістаюцца троны, павее свежы, бурхлівы, магутны вецер. Я шчаслівы. Чалавек не ліжа руку, што б'е яго. Я пайду туды, праскочу неяк да Рыгі. А пасля – морам. Я з'яўлюся да іх, і папрашу, і скажу: "

Вазьміце мяне. Я прыйшоў да вас ад народа, які не менш вас любіць святую волю, які абараняў яе не горш за вас усё жыццё і які зараз не мае волі нават на тое, каб памерці. Гэта недарэчны, любімы мною народ. Сячыце галаву свайму каралю, а пасля пойдзем рабіць тое самае на ўсёй зямлі. І, магчыма, чарга дойдзе і да майго маленькага народа. Ён устане, ён выпрастаецца. І ён пакажа ўсім, якая ён сіла, як ён умее працаваць, ствараць, спяваць... Я іду да іх... Але я хутка вярнуся, пабачыш. І не адзін. І тут сустрэне мяне армія волі... А цяпер бывай... Уцякайце адсюль хутчэй, дзеці. Тут нельга дыхаць. Ідзіце на дарогі, на святло, да людзей".

І ён расчыніў акно.

– Бачыце, сонца сядае. Вялікае сонца нашай зямлі. Яно будзе новым...

– Калі ўзыдзе заўтра, – цвёрда дакончыў Яноўскі, і абняўшы Аглаю за плечы, глянуў ёй у вочы. Пасля яны глянулі на захад, дзе дагараў дымны чырвоны дыск.

ЭПІЛОГ

Нам давядзецца сказаць толькі некалькі слоў пра лёс нашых герояў.

Кароль Якуб Першы выправіўся і, не прыгнятаючы цыганоў, літасціва правіў імі да самай сваёй смерці, якая наступіла ў 1795 годзе.

Паколькі Яноўскі, нягледзячы на ўсю сваю ўдзячнасць, адмовіўся атрымаць у спадчыну цыганскую карону, са смерцю Якуба скончылася і дынастыя. Цыгыны выбралі каралём, і даволі няўдала, таксама лідскага шляхцюка Міласніцкага.

Польшча, дзякуючы гніламу панству, пала. Пачаўся новы перыяд гісторыі Белай Русі. Новыя парадкі не спадабаліся Міласніцкаму, і ён з большасцю заможных цыганоў перакачаваў у 1799 годзе ў Турцыю.

На Беларусі засталася нязначная колькасць цыганоў без дзяржавы, без урадавай арганізацыі.

Яноўскі стрымаў сваё слова, адпусціў на волю пасля смерці бацькоў сваіх сялян. Сам ён жыў працаю рук сваіх разам з жонкаю доўга, шчасліва і небагата. Да канца жыцця ён франдзіраваў перад шляхтай і нават прозвішча сваё змяніў, узяўшы "прыдомкам" да яго прозвішча прыгоннай жонкі. Так прайшлі на зямлі беларускай Свеціловічы-Яноўскія.

Праўда, дзеці яго зноў прыдбалі невялікі маёнтак, адзін з маёнткаў дзядоў, але прыгонных у іх ніколі не было. Рошчына бацькі-вальтэр'янца дала свае плады.

Што ж датычыцца слаўнага медыкуса караля Якуба, то звесткі аб ім, няпэўныя і нешматлікія, кажуць вось што.

У славутым Канвенце адным з дэпутатаў, выбраных за заслугі перад рэвалюцыяй, быў чужак, грамадзянін з невядомай краіны, што звалася па-латыні Alba Russia. Некаторыя сцвярджалі, што па прафесіі ён лекар, як Марат. Ён гэта быў ці не ён – невядома. Але ён адным з першых падаў голас за смерць караля, быў некаторы час урадавым камісарам адной з армій на Рэйне і ў Вандэі.

У страшны дзень, калі Рабесп'ер раздрабіў сабе сківіцу стрэлам з пулгака, гэты чалавек – адзін з нямногіх – да канца абараняў яго і склаў галаву на славутай машыне доктара Гільятэна, якая, як прадажная дзеўка, служыла спачатку рэвалюцыі, а пасля яе ворагам.

Калі гэта быў наш добры знаёмы – шкада. Ён так і не мог вярнуцца на сваю радзіму з воляй на сцягах. Але суцешымся тым, што ён зрабіў усё, што магчыма, што жыццё ягонае было адзіным акордам, у якім не было фальшывых нот.

ЗМЕСТ